Рамза Т.Р.

# СІНТАКСІС

Тэарэтычны курс

Вучэбны дапаможнік

Рамза Т.Р. Сінтаксіс [Электронны рэсурс]: Тэарэтычны курс: Вучэбны дапаможнік. — Электрон. тэкст. дан. (850 кб). — Мн.: "Электронная кніга БДУ", 2003. — Рэжым доступу: http://anubis.bsu.by/publications/elresources/Philology/ramza.pdf . — Электрон. версія друк. выдання, 2003. — PDF фармат, версія 1.4 . — Сістэм. патрабаванні: Adobe Acrobat 5.0 і вышэй.

**МІНСК**

«Электронная кніга БДУ»

2003

© Рамза Т.Р., 2003
© Навукова-метадычны цэнтр
«Электронная кніга БДУ», 2003
www.elbook.bsu.by
elbook@bsu.by

УДК [808.26+808.2]-56(075.8)
ББК 81.2Беи-923
Р21

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра беларусазнаўства Акадэміі кіравання
пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь;
прафесар кафедры беларускай мовы і літаратуры
Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта,
доктар філалагічных навук *Н. Ю. Паўлоўская*

**Рамза Т. Р.**
Р21 Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: Вучэб. дапаможнік / Т. Р. Рамза; Пад агул. рэд. А. Я. Міхневіча. – Мн.: БДУ, 2003. – 202 с.
ISBN 985-445-991-8.

У вучэбным дапаможніку адлюстраваны розныя погляды лінгвістаў на моўныя з’явы ў развіцці сінтаксічнай навукі. Змешчаны матэрыял па новай праграмнай тэме «Тэкст», узоры моўнага аналізу і мікратэксты для самастойнай працы.

Адрасаваны студэнтам вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура». Можа быць карысны для студэнтаў магістратуры, аспірантаў і выкладчыкаў.

**УДК [808.26+808.2]-56(075.8)**
**ББК 81.2Беи-923**

© Рамза Т. Р., 2003
**ISBN 985-445-991-8**
© БДУ, 2003

# ЗМЕСТ

**Прадмова** ........ 5
**Сінтаксіс як узровень мовы і раздзел граматыкі** ........ 9
Сінтаксіс і іншыя ўзроўні мовы ........ 9
Паняцце аспектаў сінтаксісу і яго раздзелаў ........ 11
Сінтаксічныя адзінкі ........ 13
*Літаратура* ........ 16

## СІНТАКСІС СЛОВАЗЛУЧЭННЯ

**Словазлучэнне** ........ 18
Пытанне пра словазлучэнне ў беларускім мовазнаўстве ........ 18
Дыферэнцыяцыя словазлучэнняў ........ 24
Тыпы семантыка-сінтаксічных адносінаў паміж кампанентамі словазлучэнняў ........ 27
*Літаратура* ........ 30

**Сувязь у словазлучэнні** ........ 31
Тыпалогія сувязі ........ 31
Разнавіднасці падпарадкавальнай сувязі ........ 35
Спецыфіка сувязі кіравання ў беларускай мове ........ 39
*Літаратура* ........ 44

**Спалучальнасць** ........ 45
З гісторыі развіцця паняцця валентнасці ........ 45
Спалучальнасць і валентнасць, іх тыпы ........ 48
Спалучальнасць розных часцін мовы ........ 52
*Літаратура* ........ 55

## СІНТАКСІС СКАЗА

### *СТРУКТУРНЫ АСПЕКТ СКАЗА*

**Сказ і выказванне** ........ 57
Мадэль сказа і сінтаксічныя пазіцыі ........ 57
Паняцце прэдыкатыўнасці ........ 60
Вербацэнтрычная тэорыя сказа ........ 65
*Літаратура* ........ 67

**Прэдыкатыўная аснова двухсастаўнага сказа** ........ 68
Дзейнік, яго прызначэнне, спосабы выражэння ........ 68
Выказнік, яго прызначэнне, спосабы выражэння ........ 70
Праблема каардынацыі дзейніка і выказніка ........ 77
*Літаратура* ........ 83

**Даданыя члены сказа** ........ 84
Традыцыйнае вучэнне аб членах сказа ........ 84
Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў ........ 89
Дэтэрмінаваныя члены сказа ........ 92
*Літаратура* ........ 95

**Аднасастаўныя сказы** ........ 96
Лінгвістычны статус аднасастаўных сказаў ........ 96
Дзеяслоўныя аднасастаўныя сказы ........ 100
Іменныя аднасастаўныя сказы ........ 107
*Літаратура* ........ 114

**Складаны сказ** ........ 116
Паняцце пра складаны сказ ........ 116
Прынцыпы класіфікацыі складаных сказаў ........ 117
Разнавіднасці складаназалежных сказаў ........ 119
*Літаратура* ........ 125

### *КАМУНІКАЦЫЙНЫ АСПЕКТ СКАЗА*

**Актуальнае чляненне выказвання** ........ 126
З гісторыі распрацоўкі актуальнага члянення ........ 126
Выказванне, яго тыпы ........ 128
Сродкі актуальнага члянення і актуалізацыі ........ 130
*Літаратура* ........ 136

### *СЕМАНТЫЧНЫ АСПЕКТ СКАЗА*

**Выказванне і прапазіцыя** ........ 137
Паняцце семантычнага сінтаксісу ........ 137
Семантычная структура сказа: дыктум і модус ........ 139
Семантычныя тыпы прэдыкатаў і актантаў ........ 141
*Літаратура* ........ 144

## СІНТАКСІС ТЭКСТУ

**Тэкст як аб'ект лінгвістыкі** ........ 146
Паняцце тэксту і дыскурсу ........ 146
Напрамкі даследавання тэксту ........ 148
*Літаратура* ........ 150

**Камунікацыйная цэласнасць тэксту** ........ 152
Паняцце тэматычных паслядоўнасцей, іх тыпы ........ 152
Рэматычныя дамінанты мікратэкстаў ........ 154
Функцыянальна-сэнсавыя тыпы тэксту ........ 158
*Літаратура* ........ 162

**Структурная цэласнасць тэксту** ........ 163
Граматычная прырода звышфразавага адзінства ........ 163
Сродкі міжфразавай сувязі ў мікратэксце ........ 169
Віды сувязі ў тэксце ........ 174
*Літаратура* ........ 179

## ДАДАТКІ

**Мікратэксты для моўнага аналізу з практычнымі заданнямі** ........ 181
Схема аналізу мікратэксту ........ 181
**Тэрміналагічны паказальнік** ........ 198

# ПРАДМОВА

Вучэбны курс сучаснай беларускай мовы на беларускім, рускім, славянскім і замежным аддзяленнях філалагічных факультэтаў універсітэтаў – гэта цэлы лінгвістычны цыкл, які скіраваны на паглыбленне ведаў студэнтаў-філолагаў пра сістэму беларускай мовы, пашырэнне іх мовазнаўчай дасведчанасці і фарміраванне лінгвістычнага светапогляду. Раздзел «Сінтаксіс» у гэтым цыкле займае адно з важных месцаў і лічыцца ці не самым складаным, бо звязаны з разуменнем працэсу маўлення.

Абавязковай умовай і неад’емным складнікам сённяшняй універсітэцкай адукацыі ёсць знаёмства студэнтаў з сучасным станам лінгвістычнай навукі і павышэнне іх навукова-тэарэтычнага ўзроўню, што і вызначыла кірунак гэтага дапаможніка.

Калі ў сучаснай еўрапейскай сінтаксічнай навуцы дыскусійнае відавочна дамінуе над агульнапрынятым, то сінтаксічная думка на Беларусі трымаецца, як правіла, у пэўных традыцыйных рамках (прынамсі, выдадзеныя падручнікі па беларускім сінтаксісе не даюць глыбокага ўяўлення пра якія-небудзь спрэчныя і праблемныя моманты). Тым часам у беларускай сінтаксічнай навуцы суіснуюць розныя напрамкі і канцэпцыі, гіпотэзы і дыскусійныя падыходы.

Менавіта гэтым фактам абумоўлена асноўная задача дапаможніка – «вывесці» студэнтаў за рамкі школьнай праграмы, «школьнага» сінтаксісу, а значыць, не толькі апісаць сінтаксічны лад мовы (праз пэўныя дэфініцыі і класіфікацыі), але па магчымасці паказаць станаўленне і развіццё беларускай сінтаксічнай навукі, абапіраючыся на апублікаваныя навуковыя і ву-

чэбныя выданні. Для рэалізацыі пастаўленай задачы мэтаскіравана прыцягваўся да ўвагі тэарэтычны матэрыял, які падмацоўваўся разнастайнай цытацыяй прац беларускіх і замежных лінгвістаў, пэўнымі каментарыямі і спасылкамі. Такі падыход у прэзентацыі матэрыялу прадугледжвае і шырокі спіс літаратуры пасля кожнай праблемнай тэмы, прычым без традыцыйнага падзелу яе на асноўную і дадатковую. Мяркуецца, што цытата з таго ці іншага аўтара ці спасылка на пэўнае выданне заахвоціць студэнтаў пазнаёміцца з самім арыгіналам, але выбар пры гэтым застаецца за студэнтам.

У адрозненне ад школьных падручнікаў тэарэтычны дапаможнік не ва ўсіх выпадках падае гатовае рашэнне праблемы, а часам, аналізуючы матэрыял, толькі прапануе пэўны шлях ці скіроўвае да яго.

Зразумела, што не ўсе пытанні, якія належыць разглядаць у курсе вышэйшай школы, маюць у сучаснай сінтаксічнай навуцы адназначнае рашэнне, аднак студэнты мусяць ведаць пра розныя пункты гледжання, разбірацца ў іх асноўных палажэннях і мець уласную думку адносна гэтых тэорый. Мэта прапанаванага дапаможніка бачылася ў тым, каб адабраць, сістэматызаваць і адлюстраваць розныя погляды лінгвістаў на адну і тую ж моўную з'яву, паказаць дыскусійнасць асобных меркаванняў і падыходаў і пры гэтым акрэсліць уласную аўтарскую пазіцыю пры развязванні палемічных пытанняў. Жанр вучэбнага дапаможніка абавязаў аўтара аддаваць перавагу тым ідэям, якія з'яўляюцца найбольш пераканальнымі, адпаведнымі айчыннай сінтаксічнай традыцыі, але ўлічваць пры гэтым і каштоўны досвед навуковых даследаванняў іншых краін. Гэта мэта прадвызначыла адбор разгледжаных тэм для кнігі і яе структуру.

Дапаможнік уключае тры раздзелы: «Сінтаксіс словазлучэння», «Сінтаксіс сказа», «Сінтаксіс тэксту», якім папярэднічае агульная ўводная тэма пра паняцце сінтаксісу, а таксама два дадаткі. У першым раздзеле падаецца матэрыял, які ў дастатковай ступені не асвятляўся ў раней выдадзеных вучэбных

дапаможніках, як: «Пытанне пра словазлучэнне ў беларускім мовазнаўстве», «Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі словазлучэння», «Спалучальнасць і валентнасць» і інш. У другім раздзеле зроблена спроба размежаваць тры аспекты вывучэння сказа: фармальна-сінтаксічны, камунікацыйны і семантычны. У адпаведнасці з гэтым уводзяцца паняцці *мадэль сказа* і *функцыянальна-сінтаксічныя пазіцыі*, *вербацэнтрычная тэорыя, сінкрэтызм членаў сказа, дэтэрмінанты і сітуанты*, размяжоўваюцца тэрміны *сказ* і *выказванне, актуальнае чляненне* і *актуалізацыя*, даюцца зыходныя паняцці семантычнага сінтаксісу: *прапазіцыя, ці дыктум, модус, прэдыкаты і актанты.* У трэцім раздзеле асвятляюцца пытанні сінтаксісу тэксту: прэзентуюцца кірункі яго даследавання ў айчынным мовазнаўстве, дэманструюцца разнавіднасці лінейнага камунікацыйнага разгортвання тэкстаў, кваліфікуюцца тыпы міжфразавай сувязі і сродкі яе забеспячэння, адзначаюцца тыпы рэматычных дамінантаў і іх граматычнае выражэнне.

Адзін з дадаткаў зарыентаваны на адпрацоўку навыкаў па новай праграмнай тэме «Тэкст», таму ён структураваны ў адпаведнасці з тэарэтычным матэрыялам дапаможніка і складаецца з шэрагу заданняў і спецыяльна адабраных мікратэкстаў. Тут змяшчаецца схема моўнага аналізу тэксту і ўзоры яго поўнага разбору. З прапанаваным дадаткам можна працаваць як самастойна, так і пры выкладчыку. Другі дадатак – гэта тэматычны паказальнік тэрмінаў, выкарыстаных у прапанаваным выданні, з указаннем старонак іх ужывання.

Вучэбны дапаможнік «Сінтаксіс. Тэарэтычны курс» напісаны ў адпаведнасці з праграмай «Сучасная беларуская мова» (Мн., 1998) для студэнтаў філалагічных факультэтаў універсітэтаў і з’яўляецца вынікам уласнай лектарскай практыкі аўтара на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Дзеля захавання аднастайнасці ва ўсёй кнізе выкарыстоўваюцца беларускамоўныя тэрміны на *-цыйн-*

тыпу *камунікацыйны, намінацыйны, праспекцыйны* і да т. п., а таксама поўная форма множналікавых назоўнікаў у родным склоне, як: *адносінаў, зносінаў, абставінаў, суадносінаў*. Паколькі гэта толькі першая спроба стварыць сучасны падручнік па беларускім сінтаксісе, то са шчырай удзячнасцю будуць прынятыя ўсе крытычныя заўвагі, рэкамендацыі, парады па змесце і структуры кнігі.

Выказваю шчырую падзяку афіцыйным рэцэнзентам прапанаванага дапаможніка – кафедры беларусазнаўства Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, у прыватнасці доктару філалагічных навук прафесару Л. А. Антанюк, і прафесару кафедры беларускай мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта доктару філалагічных навук Н. Ю. Паўлоўскай, якія сваімі крытычнымі заўвагамі і слушнымі прапановамі садзейнічалі яго паляпшэнню. Асаблівая ўдзячнасць за каштоўныя парады, рэкамендацыі і падтрымку доктару філалагічных навук прафесару А. Я. Міхневічу, а таксама членам кафедры сучаснай беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

*Аўтар*

# СІНТАКСІС ЯК УЗРОВЕНЬ МОВЫ І РАЗДЗЕЛ ГРАМАТЫКІ

## Сінтаксіс і іншыя ўзроўні мовы

Тэрмін ***сінтаксіс*** (ад грэч. *syntaxis* 'пабудова, парадак, спалучэнне') прадугледжвае два яго разуменні: 1) гэта адзін з узроўняў мовы, характэрныя для яе сродкі і правілы стварэння маўленчых адзінак; 2) раздзел навукі (граматыкі), які вывучае гэты ўзровень: спалучальнасць і парадак размяшчэння сінтаксічных формаў слоў у выказванні, агульныя ўласцівасці сказа як аўтаномнай адзінкі мовы і выказвання як часткі тэксту [*Арутюнова*, 1990, *448*].

Згодна з меркаваннем французскага лінгвіста Эміля Бенвеніста, сістэма мовы члeніцца на ўзроўні, прычым строга захоўваецца прынцып іерархіі: кожны наступны ўзровень больш складаны, чым папярэдні [*Бенвенист*, 1974]. Адзінкі больш высокага ўзроўню складаюцца з адзінак больш нізкага. Зыходным лічыцца фанетычны ўзровень, а найвышэйшым – сінтаксічны. Натуральна, адрозненні выяўляюцца як у структурнай арганізацыі адзінак гэтых узроўняў, так і ў іх функцыянальнай прызначанасці. Вельмі спрошчана такі падзел (пры ўзрастанні складанасці знізу ўверх) можна адлюстраваць графічна (табл. 1).

*Табліца 1*

**ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ ПРЫЗНАЧАНАСЦЬ АДЗІНАК РОЗНЫХ УЗРОЎНЯЎ МОВЫ / МАЎЛЕННЯ**

| Узровень | Адзінкі мовы / маўлення | Асноўная функцыя |
|---|---|---|
| сінтаксічны | сказ / выказванне | камунікацыйная |
| лексічны | семема / лексема | намінацыйная |
| марфемны | марфема / морф | носьбіт значэння |
| фанетычны | фанема / гук | адрозненне слоў |

«У адрозненне ад іншых «узроўняў» ці «ярусаў» мовы <...> сінтаксіс непасрэдна суадносіцца з працэсам мыслення і працэсам камунікацыі: адзінкі іншых узроўняў моўнай сістэмы ўдзельнічаюць

у фарміраванні думкі і камунікацыйнага яе выражэння толькі праз сінтаксіс» [*Золотова*, 1973, *6*]. Таму, маючы свае «аўтаномныя» значэнні і функцыі, адзінкі «больш нізкіх» узроўняў – лексемы, марфемы, фанемы страчваюць іх пры пабудове выказвання, пераходзячы з узроўню знакаў на ўзровень фігур[1], паколькі становяцца толькі яго часткай, і тут «праяўляецца агульная суаднесенасць паміж цэлым і яго элементамі: пры спалучэнні ў цэлае часткі не застаюцца нязменнымі, але набываюць новыя ўласцівасці, якімі па-за цэлым яны валодалі толькі патэнцыяльна» [*Гак*, 1973, *354*]. «Выказванне, – зазначае У. Р. Гак, – як і любы знак, абагульняе, таму што яно ўказвае не на ўсе элементы і дэталі сітуацыі, а толькі на некаторыя, што служаць апірышчам для наймення і разумення» [тамсама, *353*]. Такім чынам, выказванне інтэгруе ўсе адрозныя іншыя ўзроўні, што вылучаюцца ў працэсе аналізу мовы, і ў адносінах да яго «словы, марфемы, канструкцыі, інтанацыйная структура ёсць фігуры – асіметрычныя шматзначныя элементы знакавага тыпу» [*тамсама*, *357–358*].

Сінтаксіс як адзін з раздзелаў граматыкі займаецца вывучэннем сінтаксічных канструкцый, заканамернасцей і спосабаў іх утварэння, магчымасцей спалучэння і функцыянавання ў тэксце. Відавочна, што ў такой сваёй ролі сінтаксіс самым непасрэдным чынам звязаны з іншымі раздзеламі граматыкі (у шырокім яе разуменні): найперш з лексікалогіяй і марфалогіяй, а таксама з прасодыкай і апасродкавана з фанетыкай. Адрозненне паміж сінтаксісам і марфалогіяй (як раздзеламі, што апісваюць граматычны лад мовы) навукоўцы абгрунтоўваюць так: «Калі прадметам марфалогіі з’яўляецца вывучэнне сістэмы формаўтварэння слоў і наогул марфалагічнай структуры слоў, то ў сінтаксісе важна ведаць правілы ўжывання пэўных формаў слоў у словазлучэннях і сказах, важна высветліць, па якіх законах, дзякуючы формам слоў, фарміруюцца словазлучэнні і сказы, якую функцыю выконваюць тыя ці іншыя формы часцін мовы ў словазлучэннях і сказах розных тыпаў і якія сінтаксічныя адносіны ўстанаўліваюцца паміж словам у працэсе іх спалучэння» [*Булахаў*, 1959, *6*]. Але, як указваюць моваведы, ні ў якім разе сінтаксіс як навуку нельга зводзіць толькі да вучэння пра спалучэнні слоў (словазлучэнні), а неабходна разглядаць значна шырэй – «як вучэнне аб спалучальнасці слоў» [*Михневич*, 1968, *107*].

[1] Пра адрозненне ўзроўню знакаў і ўзроўню фігур гл. [*Мартынаў*, 1964; 1965].

Існуюць розныя меркаванні даследчыкаў наконт аб'екта і прадмета сінтаксічнай навукі, напр.: «Спосабы арганізацыі слоў у словазлучэнні і ў сказы, а таксама тыпы словазлучэнняў і сказаў з'яўляюцца аб'ектам сінтаксічнага вывучэння мовы» [*Булахаў*, 1959, *5*]. У прапанаванай рабоце падзяляецца меркаванне, што аб'ект сінтаксісу, як і ўсіх моваэнаўчых дысцыплін, ёсць сама мова, а дакладней, «працэсы і вынікі моўнай намінацыі сітуацый у камунікацыйных мэтах» [*Міхневіч*, 1976, *11*]. Але ў адрозненне ад слоўнай намінацыі, што называе сабой пэўнае паняцце з рэальнага ці нерэальнага свету, сінтаксічная намінацыя называе пазамоўную сітуацыю ўзаемаабумоўленымі і ўзаемазвязанымі вербальнымі сродкамі. Параўн.: ёсць лексемы *я, ты, не, тая, ставаць*, і ёсць створаная Р. Барадуліным «Паэма» з адной фразы, што грунтуецца на сінтаксемах гэтых жа слоў і намінуе, канстатуе сабой ужо пэўную пазамоўную сітуацыю: *Мне цябе не стае // Тае...*

Што датычыць прадмета сінтаксісу, то ім, як і ў «любой іншай вузкай галіне ведаў, можна лічыць толькі яго аб'ект, але кожны раз у тым плане, у тым аспекце, які дыктуецца часам і таму бярэцца сінтаксістам у якасці найважнейшага» [*тамсама*, *13*]. У такім выпадку прадмет сінтаксісу не можа быць зададзены раз і назаўсёды, ён мяняецца ў залежнасці ад той навуковай парадыгмы, якая на пэўным этапе лінгвістычнай думкі становіцца прыярытэтнай.

## Паняцце аспектаў сінтаксісу і яго раздзелаў

На сённяшні дзень у беларускамоўнай вучэбнай і дапаможнай літаратуры адлюстраваны традыцыйны падыход да аналізу сінтаксічных з'яў, вынікам якога ёсць (у пераважнай большасці) толькі разгляд фармальнага аспекту сказа[2]. Разам з тым сказ – адзінка шматаспектная, і існуе мноства сінтаксічных тэорый, што з розных бакоў асвятляюць яго арганізацыю, а грунтам для іх узнікнення якраз і паслужыла размежаванне падыходаў у яго даследаванні.

У рускім мовазнаўстве ідэю пра «партытурную» будову сказа яшчэ ў 1935 г. выказаў У. Р. Адмоні [*Адмони*, 1961]. Ён лічыў, што сэнсавы змест сказа не аднамерны, а «ўяўляе сабой цэлы шэ-

[2] На гэты факт ужо звернута ўвага ў энцыклапедычным даведніку «Беларуская мова» [*Міхневіч*, 1994, *484*].

раг ліній, якія паралельна разгортваюцца і сінтэзуюцца і ўтвараюцца з цэлага шэрага паралельных лексічных і граматычных значэнняў, што накладаюцца адно на адно» [*тамсама*, *5*]. Працягам гэтых ідэй было даследаванне ім аспектаў сказа, якіх ён вылучаў сем: логіка-граматычны, мадальны, паўнаты сказа, месца сказа ў разгорнутым маўленні, аспект пазнавальнай устаноўкі моўцы, камунікацыйнай задачы сказа, ступень яго эмацыянальнасці [*Адмони*, 1968, *233–234*].

Колькасць аспектаў сказа, што вылучаюцца рознымі даследчыкамі, вар'іруецца, але інварыянтнымі (нязменнымі) застаюцца лагічны, структурны (фармальны), функцыянальны, семантычны і камунікацыйны. Базай для *лагічнага аспекту* ёсць вытлумачэнне суадносінаў мыслення і мовы, і менавіта з лагічным тэрмінам «прэдыкат» звязана асноўная прымета сказа / выказвання – прэдыкатыўнасць. Прадметам *структурнага аспекту* сказа ёсць адлюстраванне сістэмы сінтаксічных сувязяў у выказванні; прадметам *функцыянальнага* – характарыстыка яго кампанентаў-складнікаў з пункту гледжання іх фунцыянальнай прызначанасці; прадметам *семантычнага* – вызначэнне агульнатыпавой семантыкі сказа і яе арганізацыі; *камунікацыйны аспект* даследуе актуальнае чляненне, сродкі актуалізацыі інфармацыйнага цэнтра выказвання.

Вылучэнне ўсіх гэтых аспектаў досыць умоўнае (бо аб'ект даследавання – адзін і той жа), але неабходнае для таго, каб больш дэталёва разгледзець любую сінтаксічную адзінку не толькі ў плане яе формы, але і зместу, і функцый, і камунікацыйных інтэнцый моўцы ці таго, хто піша. Так, фраза з верша Я. Купалы *Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому,* з пункту гледжання структурнага сінтаксісу, аднасастаўны развіты сказ, галоўны член якога ў форме безасабовага дзеяслова *не сядзіцца* пашыраны ўскосным дапаўненнем *хлопчыку* і акалічнасцю месца *ў хаце*; з пункту гледжання семантычнага сінтаксісу – гэта суб'ектны сказ, семантычным суб'ектам якога з'яўляецца рэцыпіент *хлопчыку*, а семантычны прэдыкат перадае тыпавое значэнне 'мімавольны стан суб'екта' з лакалізацыяй месца *ў хаце*; з пункту гледжання камунікацыйнага сінтаксісу, адлюстроўваючы інверсійны парадак слоў (*не сядзіцца хлопчыку, хлопчыку малому*), дзе рэма папярэднічае тэме, што дазваляе актуалізаваць як стан, так і ўзрост дзіцяці праз парадак размяшчэння кампанентаў выказвання, лагічны націск і інтанацыю. У адрыве ад кантэксту і ў залежнасці ад інтэнцый моўцы гэты сказ мог бы мець некалькі сваіх маўленчых разнавіднасцей, параўн. зыходны варыянт: *Не сядзіцца ў хаце хлопчыку <u>малому</u>* і магчымыя: *Не сядзіцца*

*ў хаце малому хлопчыку, Хлопчыку малому не сядзіцца ў хаце, Хлопчыку малому ў хаце не сядзіцца* і інш.

Сінтаксіс мэтазгодна разглядаць у суаднесенасці з этапамі маўлення (ад простага да складанага), а таму прававерна вылучаць тры яго раздзелы: 1) сінтаксіс часцін мовы, дзе вывучаюцца спалучальнасныя магчымасці слова (сінтаксічныя валентнасці), спосабы іх рэалізацыі (дапасаванне, кіраванне, прымыканне і інш.) і адносіны, што імі перадаюцца (азначальныя, аб'ектныя, акалічнасныя і да т. п.); 2) сінтаксіс сказа, дзе апісваецца яго структура, камунікацыйныя тыпы (паведамленне, пытанне, пабуджэнне, жаданне), прэдыкатыўнасць і мадальнасць, семантыка і сінанімічныя пераўтварэнні як простага, так і складанага сказаў, а таксама віды і спосабы перадачы злучальнай і падпарадкавальнай сувязі; 3) сінтаксіс тэксту, дзе даследуецца актуалізацыя сказа: тыя мадыфікацыі, якія ён зазнае пры ўваходжанні ў маналагічны ці дыялагічны тэкст [*Арутюнова*, 1990, *449*]. На такім падзеле і грунтуецца структура дапаможніка.

## Сінтаксічныя адзінкі

Традыцыйна асноўную сінтаксічную адзінку намінуюць *сказам*. Аднак больш прававерна прытрымлівацца пункту гледжання В. Матэзіуса, які прапанаваў размяжоўваць паняцці *мадэль сказа* (=*структурная схема*) і *выказванне* (=*фраза*)[3]: «<...> сказ як адцягненая мадэль з'яўляецца сінтаксічнай формай і мусіць быць аднесенай да мовы», а ў маўленні ж «сказ рэалізуецца як канкрэтнае выказванне» [*Матезиус*, 1967, *237*]. У такім разе тэрмін *сказ* мусіць адпавядаць паняццю *мадэлі сказа,* а дэфініцыя, што звычайна даецца сказу, у прынцыпе ёсць азначэнне *выказвання*, таму што любое канкрэтнае выказванне належыць маўленню, але ствараецца яно згодна з абстрактнай мадэллю, што належыць мове і прысутнічае ў свядомасці носьбіта мовы. Значыць, ***мадэль сказа*** (=***сказ***) – гэта адцягнены ўзор, паводле якога будуецца канкрэтнае выказванне. А ***выказванне*** – гэта такая адзінка паведамлення, якая арганізавана паводле пэўнага ўзору (сказа), мае граматычную, сэнсавую, інтанацыйную завершанасць і служыць для вербальных зносінаў.

[3] На неабходнасць увядзення ў беларускае мовазнаўства вядомага ў агульнай тэорыі граматыкі адрознення паміж выказваннем і сказам указваў А. Я. Міхневіч [*Міхневіч*, 1976, *27*].

Першаснай мінімальнай адзінкай сінтаксічнага «будаўнічага» матэрыялу з'яўляецца сінтаксема (=сінтаксічная форма слова[4]). Паводле Г. А. Золатавай, ***сінтаксема*** – гэта мінімальная, далей непадзельная семантыка-сінтаксічная адзінка мовы, якая адначасова выступае як носьбіт элементарнага сэнсу і як канструкцыйны кампанент больш складаных сінтаксічных пабудоў (словазлучэння, сказа, тэксту). Так, сінтаксема[5] – перш за ўсё кампанент словазлучэння, аднак у пэўных выпадках яна можа быць канструкцыйным кампанентам сказа і нават ператварацца ў сказ (пераходзіць з дакамунікацыйнага ўзроўню на камунікацыйны): *Дзікі жывуць у лесе. У лесе зацішна. У лесе* і *Маці купіла мне энцыклапедыю. Мне было ніякавата*, але **Мне*.

Якраз паводле функцыянальнай прыметы – здольнасці сінтаксемы ўдзельнічаць у структуры сказа – Г. А. Золатава ўсе склонавыя і прыназоўнікава-склонавыя формы падзяляе на тры тыпы: звязаныя, абумоўленыя і свабодныя [*Золотова*, 1998, *50*]. ***Звязаныя сінтаксемы*** – гэта кіруемыя сінтаксічныя формы, што пашыраюць слова ў складзе словазлучэння, таму яны здольныя

---

[4] Калі паняцці *словаформа* і *слоўная форма* ўведзены ў навуковы ўжытак Ц. П. Ламцёвым [*Ломтев*, 1958, *17–21*], то паняцце *сінтаксемы* як функцыянальнай сінтаксічнай адзінкі (сінтаксічнага інварыянта) распрацаваў і выкарыстаў у лінгвістыцы А. М. Мухін [*Мухин*, 1964], але ў тым выглядзе, на якім грунтуецца гэты матэрыял, прапанаваны Г. А. Золатавай [*Золотова*, 1967; 1998]; улічваецца таксама і інтэрпрэтацыя М. У. Усеваладавай [*Всеволодова*, 2000].

[5] Паводле М. У. Усеваладавай, *сінтаксема* – гэта марфалагічная форма слова (для назоўніка – уключаючы прыназоўнік, калі ён ёсць) з улікам значэння, што вызначаецца класам слоў-утваральнікаў, і здольнасці заняць вызначаныя пазіцыі ў сінтаксічных пабудовах. Для таго каб пэўным чынам вызначыцца сярод іншых паняццяў формы слова – словаформа, слоўная форма і сінтаксічная форма слова, – М. У. Усеваладавай адзначаны іх характэрныя прыметы. Словаформа – гэта канкрэтная форма канкрэтнага слова ў тэксце. Так, у выказванні *Моцна запахла бэзам* яны такія: *моцна, запахла, бэзам*. Слоўная форма – гэта марфалагічная форма слова без указання на лексіку, што ўтварае саму форму; гэта ўзровень высокай абстракцыі. Таму ў вышэйназваным выказванні слоўныя формы будуць наступныя: $Adv$, $Vf_{3s}$, $N_5$. Сінтаксема (сінтаксічная форма слова) (1) у адрозненне ад паняцця «слоўная форма» ўключае не толькі марфалагічную форму, але і лексіку, што яе ўтварае; (2) у адрозненне ад паняцця «словаформа» яна можа быць звернута не толькі да канкрэтнага слова, а і цэлага класа слоў; (3) у адрозненне ад першай і другой, яна ўлічвае семантычны і сінтаксічны патэнцыял формы, г. зн., асаблівасці яе функцыянавання ў сінтаксічных пабудовах [*Всеволодова*, 2000, *156–159*].

выкарыстоўвацца толькі ў прыслоўнай пазіцыі і прадвызначаны галоўным словам, прадказваюцца ім і залежаць ад яго: *верыць людзям*, *водгук апанента*, *у глыбокім сумёце*.

***Абумоўленыя***, ці канструкцыйна-абумоўленыя, ***сінтаксемы*** здольныя функцыянаваць як адзін з кампанентаў сказа пэўнай мадэлі: *Ён тут за шэфа*; *Няма запалак*; *З дысцыплінай не ладзілася*; *Яму стала сумна*; *У мяне кацяня.*

***Свабодныя сінтаксемы*** здольныя займаць практычна любую з пералічаных пазіцый; могуць функцыянаваць у якасці загалоўкаў: *Пра час і пра сябе. Перад навальніцай. У садзе і агародзе. На ростанях.*

Трэба зазначыць, што адна і тая сінтаксема ў розных выказваннях можа выконваць розныя функцыі, што залежыць ад яе пазіцыі ў структуры пэўнага сказа[6], напр.: *Ля вогнішча* (свабодн.); *Ля вогнішча заўсёды пачуваешся вельмі ўтульна і рамантычна* (абумоўл.); *У вызначаны час усе сабраліся ля вогнішча* (звязан.).

Сінтаксемы ў працэсе разгортвання выказвання ўтвараюць пэўныя спалучэнні слоў альбо словазлучэнні.

***Спалучэнне слоў*** разумеецца як любая звязанасць знамянальнага слова са знамянальным ці знамянальнага з незнамянальным, накшталт: *блакітны і сіні, на Беларусі, ані шолаху*; у той час як спецыфічнай рысай словазлучэння ёсць тое, што яно аб'ядноўвае сінтаксемы з граматычнага пункту гледжання самастой-

---

[6] Вылучаныя Г. А. Золатавай тры групы сінтаксем М. У. Усеваладава адрознівае яшчэ па дзвюх якасцях: па ступені праяўлення ў іх дэнататыўнай ролі і па суаднесенасці між сабой формы і значэння. Таму ў яе інтэпрэтацыі свабодныя ёсць такія сінтаксемы, якія незалежна ад кантэксту маюць самастойны сэнсавы змест, што забяспечваецца ўзаемадзеяннем лексічнага значэння слова і яго формы. Такая дэнататыўная роля (значэнне) захоўваецца і па-за выказваннем. Да гэтай групы аднесены сінтаксемы з катэгарыяльным прасторавым значэннем: *у лесе, ля ракі, за хатай* і пад.; з катэгарыяльным значэннем прычыны: *ад роспачы, са страху, з-за непагадзі* і пад.; з катэгарыяльным значэннем часу: *у траўні, увесь дзень, ранкам, штопанядзелак* і пад.; з катэгарыяльным значэннем дэлебератыўнага аб'екта: *пра дзяцей, наконт экзаменаў* і пад.; з катэгарыяльным значэннем інструмента: *відэльцам, мылам, на таксі* і пад. Абумоўленыя сінтаксемы праяўляюць свой змест, сваю ролю толькі ў семантычнай (!) структуры сказа. Найперш гэта фармальныя дзейнік і выказнік. Звязаныя сінтаксемы не маюць – пры ізаляваным прад'яўленні – ніякага самастойнага значэння, але выяўляюць яго толькі ў складзе словазлучэння, у пазіцыі пры пэўным слове: *часопіс сябра, восем студэнтаў, захапляцца кінастужкай* [*Всеволодова*, 2000, *160–163*].

ныя, але нераўнапраўныя[7] тыпу: *лёс-айчым, у апантаных мроях, бракуе часу.*

***Словазлучэнне*** – гэта сэнсава-граматычнае аб'яднанне дзвюх і болей сінтаксем у ланцужку выказвання, што ўзнікае толькі ў яго складзе ў адпаведнасці з пэўнымі задачамі камунікацыі і служыць для перадачы семантыка-сінтаксічных адносінаў паміж паняццямі пазамоўнай сітуацыі. Словазлучэнне не з'яўляецца ўласна адзінкай сінтаксісу, бо яно – кампанент выказвання і вылучаецца толькі з яго.

Асноўнай адзінкай на ўзроўні мікрасінтаксісу (што даследуе ізаляваныя аўтаномныя выказванні) з'яўляецца сказ / выказванне, а на ўзроўні макрасінтаксісу (аб'ект якога – вусныя і пісьмовыя тэксты) – тэкст. ***Тэкст*** – «тая моўная адзінка, якая выступае ў камунікацыі як адносна завершаны адрэзак зносінаў, – як адзінка структураваная і арганізаваная паводле пэўных правілаў, што нясе кагнітыўную, інфармацыйную, псіхалагічную і сацыяльную нагрузку зносінаў» [*Колшанский*, 1984, *89*]. Прычым цэласным і закончаным тэкстам можа быць як адно выказванне (мінітэкст) (гл. прыведзеную вышэй «Паэму» Р. Барадуліна ды рознага кшталту прыказкі, прымаўкі, афарызмы і пад.), так і шматтамовыя тэксты (раманы, трылогіі і пад.).

Апошнім часам з пазіцый сінтаксісу даследуецца і ***дыскурс*** – «складаная камунікацыйная з'ява, якая ўключае, акрамя тэксту, яшчэ і экстралінгвістычныя фактары (веды пра свет, думкі, устаноўкі, мэты адрасата), неабходныя для разумення тэксту» [*Дейк*, 1989, *8*].

## ЛІТАРАТУРА

*Адмони, 1961*: Адмони В. Г. Партитурное строение речевой цепи // НДВШ. Филологические науки. 1961. № 3. С. 3–15.

*Адмони, 1968*: Адмони В. Г. Типология предложений // Исследования по общей теории грамматики. М.: Наука, 1968. С. 232–291.

[7] У гэтыя тэрміны можа быць укладзены і іншы змест. «Словазлучэннем называецца спалучэнне дзеяслова ці імя са звязанай сінтаксемай (*падняць ветразі, кіраваць аддзелам, пад'ём сцяга, кіраўніцтва аддзелам*), гэта спалучэнне ўзаемна неабходнае, а звязаная сінтаксема ўдзельнічае ў сказе толькі пры слове-кіроўцу, іншых пазіцый у яе няма. Спалучэннем слоў называецца злучэнне знамянальнага слова са свабоднай ці абумоўленай сінтаксемай (*пасяліцца ў лесе, вогнішча на беразе, цягнуць з рамонтам, цяжкасці з паперай, сварка між братамі*), якія могуць выкарыстоўвацца і ў іншых пазіцыях, незалежна ад дадзенага дзеяслова ці імя» [*Золатава*, 1988, *19*].

*Арутюнова*, 1990: Арутюнова Н. Д. Сінтаксіс // Лингвистический энциклопедический словарь. М.: СЭ, 1990. С. 448–451.

*Бенвенист*, *1974*: Бенвенист Э. Уровни лингвистического анализа // Бенвенист Э. Общая лингвистика. М.: Прогресс, 1974. С. 129–140.

*Булахаў*, *1959*: Булахаў М. Г. Уводзіны // Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Сінтаксіс. Мн.: Дзярж. вуч.-пед. выд-ва Мін. асветы БССР, 1959. С. 5–11.

*Всеволодова*, *2000*: Всеволодова М. В. Теория функционально-коммуникативного синтаксиса. Фрагмент прикладной (педагогической) модели языка: Учеб. М.: Изд-во МГУ, 2000. 502 с.

*Гак*, *1973*: Гак В. Г. Высказывание и ситуация // Проблемы структурной лингвистики 1972. М.: Наука, 1973. С. 349–372.

*Дейк*, *1989*: Дейк Т. А. ван. Язык. Познание. Коммуникация: Сб. ст. М.: Прогресс, 1989. 310 с.

*Золотова*, *1973*: Золотова Г. А. Очерк функционального синтаксиса русского языка. М.: Наука, 1973. 352 с.

*Золотова*, *1998*: Золотова Г. А. и др. Коммуникативная грамматика русского языка / Г. А. Золотова, Н. К. Онипенко, М. Ю. Сидорова. М.: МГУ, 1998. 524 с.

*Колшанский*, *1984*: Колшанский Г. В. Коммуникативная функция и структура языка. М.: Наука, 1984. 174 с.

*Ломтев*, *1958*: Ломтев Т. П. Основы синтаксиса современного русского языка. М.: Гос. учебн.-пед. изд-во Мин-ва просвещения РСФСР,1958. 166 с.

*Матезиус*, *1967*: Матезиус В. О системном грамматическом анализе // Пражский лингвистический кружок: Сб. ст. М.: Прогресс, 1967. С. 226–238.

*Мартынов*, *1964*: Мартынов В. В. Уровни и планы языка как языковой системы // Тезисы докладов к симпозиуму по проблеме «Методы различения и отождествления единиц языка». Мн., 1964. С. 1–2.

*Мартынаў*, *1965*: Мартынаў В. У. Метады рашэння некаторых тыпавых этымалагічных задач // Беларуская мова. Даследаванні па лексікалогіі. Мн.: Навука і тэхніка, 1965. С. 185–189.

*Михневич*, *1968*: Михневич А. Е. Некоторые вопросы изучения синтаксических (подчинительных) связей слов в работах советских и чехословацких лингвистов. Вопр. языкознания. 1968. № 5. С. 106–112.

*Міхневіч*, *1976*: Міхневіч А. Я. Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы. Мн.: Навука і тэхніка, 1976. С. 11–18.

*Міхневіч*, *1994*: Міхневіч А. Я. Сінтаксіс // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелЭн, 1994. С. 484–486.

*Мухин*, *1964*: Мухин А. М. Функциональный анализ синтаксических элементов. М.; Л.: Наука, 1964. 292 с.

# СІНТАКСІС СЛОВАЗЛУЧЭННЯ

## СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

### Пытанне пра словазлучэнне ў беларускім мовазнаўстве

Сінтаксіс словазлучэння ў беларускай лінгвістыцы пачаў вывучацца і распрацоўвацца толькі з другой паловы XX ст., а менавіта з калектыўнай працы «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы» (1959) (раздзел «Словазлучэнне» напісаны М. Г. Булахавым). Тагачасныя ж сінтаксічныя даследаванні датычыліся толькі сінтаксісу сказа, пачынаючы ад «Беларускай граматыкі для школ» (1918) Б. Тарашкевіча, «Сынтакса беларускае мовы» (1926) Я. Лёсіка і заканчваючы калектыўным падручнікам «Сінтаксіс беларускай мовы» (1939), што выйшаў пад рэдакцыяй Я. Коласа, К. Гурскага і Г. Шкляра. Варта зазначыць, што, разумеючы сінтаксіс як навуку «аб злучэнні слоў у мове» [*Лёсік*, 1926, *8*], яны і разглядалі іх [спалучэнні слоў] непарыўна ад сказа.

Пачынаючы з 60-х гг. XX ст., сінтаксіс словазлучэння разглядаўся як асобная сінтаксічная праблема, паколькі менавіта тут найбольш яскрава праяўляюць сябе адметнасці той ці іншай мовы. Беларускую сінтаксічную навуку гэтага часу прадстаўляюць манаграфічныя працы А. Я. Міхневіча (1965), Л. П. Падгайскага (1971), А. І. Наркевіча (1972), М. С. Яўневіча (1977), Т. П. Бандарэнкі (1981), прысвечаныя асобным тыпам словазлучэння, а таксама дзве калектыўныя акадэмічныя граматыкі: «Граматыка беларускай мовы» (1966), у якой раздзел «Словазлучэнне» напісаны А. І. Наркевічам, М. Г. Булахавым, П. П. Шубам, і «Беларуская граматыка» (1986), дзе гэты раздзел напісалі А. Я. Міхневіч і Л. А. Антанюк.

Сённяшнім часам у беларускім мовазнаўстве існуе некалькі пунктаў гледжання на словазлучэнне. Разыходжанні закранаюць

як разуменне яго сутнасці («гатовая» гэта адзінка, што існуе «да сказа», ці толькі адзінства, якое ўтвараецца непасрэдна ў выказванні), так і разуменне яго аб'ёму, магчымых кампанентаў, значэння і функцыі.

Большасць айчынных сінтаксістаў разглядае словазлучэнне ў вузкім яго аспекце: як «свабоднае сэнсавае і фармальнае аб'яднанне двух (або болей) паўназначных слоў, звязаных падпарадкавальнымі адносінамі» [*Міхневіч*, 1986, *6*]. Такога ж пункту гледжання трымаюцца А. І. Наркевіч, Л. П. Падгайскі, М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко, М. В. Абабурка, Э. Д. Блінава, Н. В. Гаўрош, М. Ц. Кавалёва, В. У. Ляпёшкін, В. І. Рагаўцоў і інш.

Разам з тым несупадзенне меркаванняў у прыхільнікаў названага падыходу датычыць канцэптуальных разыходжанняў у вытлумачэнні прыроды словазлучэння, што мае вынікам і адрозныя трактоўкі яго функцыі. Калі адны з іх гавораць, што функцыя словазлучэння – адлюстраванне пэўных адносінаў паміж тымі ці іншымі паняццямі, з'явамі і прадметамі акаляючага свету [*Наркевіч*, 1966, *7*; *Падгайскі*, 1971, *15*; *Бандарэнка*, 1981, *4*; *Міхневіч*, 1994, *514–515*], то іншыя ўказваюць на намінацыйную функцыю [*Абабурка*, 1992, *180*]: «у адрозненне ад слоў словазлучэнні абазначаюць складаныя паняцці, выступаюць як розныя віды «складаных назваў» [*Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *6*], «называюць прадметы, прыметы і розныя з'явы рэчаіснасці» [*Ляпёшкін*, 1989, *7*]. Гэтым самым толькі адзін з прыёмаў лінгвістычнага аналізу (вылучэнне са сказа) процістаўляецца «аўтаномнасці» словазлучэння (існуе «да сказа»).

Цалкам супрацьлеглы пункт гледжання на аб'ём словазлучэння належыць Г. Н. Клюсаву. Сутнасць яго трактоўкі ў тым, што пад словазлучэннем разумеецца *любое двухчленнае спалучэнне лексем*, у тым ліку і службовых слоў са знамянальнымі ці між сабой. Пры гэтым гранічнымі выпадкамі словазлучэння, з аднаго боку, лічыцца сказ (а дакладней, спалучэнне дзейніка і выказніка), а з другога – складанае слова, утворанае ў выніку лексікалізацыі словазлучэння, напр.: *пад вечар* → *падвечар, з-пад ілба* → *спадылба* і г. д. Тыповы выпадак словазлучэння, паводле Г. Н. Клюсава, – быць часткай сказа, таму і ў прапанаванай дэфініцыі падкрэсліваецца яго сінтаксічны аспект: «Сэнсава-граматычнае аб'яднанне («складванне») двух ці больш слоў, узятае не ў выражальна-камунікацыйным, а ў сінтаксічна-канструкцыйным, спалучальна-камбінаторным плане (г. зн. як канкрэтнае праяўленне сувязі слоў), называецца словазлучэннем» [*Клюсаў*,

1972, *21*]. Надаючы службовым лексемам статус кампанентаў словазлучэння нароўні са словамі самастойнымі, ён размяжоўвае тры тыпы аб’яднанняў у залежнасці ад іх часцінамоўнай прыналежнасці і сэнсава-граматычнай будовы.

1. Словазлучэнні дэтэрмінацыйныя, у якіх службовыя словы розных відаў (часціцы, выклічнікі, мадальныя словы і прыназоўнікі) абмяжоўваюць і мадыфікуюць значэнні самастойных часцін мовы, накшталт: *не бачу, ледзь відаць, няўжо так?, ці праўда?, ну і дзянёк!, ух які дождж!, мабыць, світае; можа, пачакаць?, на ўроку, пад вечар, з радасцю, каля вогнішча, на здароўе!* і г. д.

2. Словазлучэнні спалучальныя (канекцыйныя), што ўключаюць бяззлучнікавыя і злучнікавыя аб’яднанні аднародных членаў тыпу: *сябры-таварышы, жыць-пажываць; раз, два, тры, чатыры; поле, выган, сенажаць; дзень і ноч, так ці не так* і г. д.

3. Словазлучэнні падпарадкавальныя (субардынацыйныя), што аб’ядноўваюць галоўны і залежны ад яго кампанент, напр.: *прасіць прабачэння, усход сонца, верш Купалы, слуцкія паясы, збірацца ісці* і да т. п. [*тамсама*, *24–25*].

Г. Н. Клюсавым цалкам адпрэчваецца намінацыйная функцыя словазлучэння, паколькі кожнае са слоў свабоднага словазлучэння захоўвае ў ім сваю сэнсавую самастойнасць і спалучальную прадуктыўнасць; і толькі прызнае яе [гэтую функцыю] за звязанымі (непадзельнымі) словазлучэннямі, у якіх сэнс не выводзіцца з сумы яго кампанентаў, а «сапраўды выражаецца адно паняцце пры дапамозе больш чым аднаго слова (параўн.: *чытаць мараль, белы грыб, белы верш, белая варона, белая костка* і г. д.)» [*тамсама*, *29*].

Трэці падыход займае становішча між названымі палярнымі трактоўкамі, паколькі шырэйшы, чым першы, але значна вузейшы за другі. Яго прэзентуе канцэпцыя М. Г. Булахава, адлюстраваная ў «Курсе сучаснай беларускай літаратурнай мовы» (1959), замацаваная і пашыраная ў падручніку Л. І. Бурака [*Бурак*, 1987], згодна з якой да словазлучэння адносяцца аб’яднанні *мінімум двух самастойных слоў*. А таму імі проціпастаўляюцца прэдыкатыўныя (спалучэнне дзейніка і выказніка) і непрэдыкатыўныя словазлучэнні, да якіх адносяцца падпарадкавальныя і злучальныя. «Асноўным адрозненнем непрэдыкатыўных словазлучэнняў ад прэдыкатыўных з’яўляецца тое, што ім не ўласціва мадальна-часавае значэнне, бо яны фарміруюць намінацыйныя, а не прэдыкатыўныя адносіны» [*Бурак*, 1987, *17*].

Непрэдыкатыўныя словазлучэнні, паводле гэтай канцэпцыі, уключаюць дзве разнавіднасці: паратаксічныя (грэч. *parataxis* ‘злучэнне’) і гіпатаксічныя (грэч. *hypotaxis* ‘падпарадкаванне’). «Паратаксічныя словазлучэнні ўяўляюць сабой незамкнуты рад кампанентаў, якія звязаны пры дапамозе злучнікаў ці бяззлучнікавым спосабам, з’яўляюцца раўназначнымі і займаюць пазіцыю аднолькавых членаў у сказе: *дзень і ноч; глядзець ды смяяцца; малы, але дужы; (раслі) бярозы, елкі, хвоі* <...>. Гіпатаксічныя словазлучэнні ствараюцца замкнутым радам кампанентаў, якія звязаны пры дапамозе прыназоўнікаў або беспрыназоўнікавым спосабам, з’яўляюцца нераўназначнымі і займаюць пазіцыю розных (неаднолькавых) членаў сказа: *палёт у космас, памахаць рукой, чырвоны ад марозу, ціха шумець, бераг шырокай ракі*» [*Бурак*, 1987, *18*].

Сярод прыхільнікаў гэтай трактоўкі больш звужана разумее аб’ём словазлучэння В. У. Ляпёшкін, які вылучае прэдыкатыўныя словазлучэнні, што маюць мадальна-часавае значэнне, утвараюць ядро сказа і яго граматычную аснову, і непрэдыкатыўныя, што «не маюць такой прыметы і ўтвараюцца на аснове падпарадкавальнай сувязі: *прыезд брата, добрыя весткі, спазніўся знарок*» [*Ляпёшкін*, 1989, *6*].

Разыходжанне поглядаў Л. І. Бурака і М. Г. Булахава грунтуецца на двух прынцыпова адрозных палажэннях. Па-першае, на думку М. Г. Булахава, «словазлучэнне – такое сэнсава-граматычнае аб’яднанне двух або некалькі самастойных слоў у складзе сказа, якое служыць для выражэння адносінаў паміж асобнымі паняццямі, абазначанымі словамі» [*Булахаў*, 1959, *6*], а паводле Л. І. Бурака, асноўная функцыя словазлучэння – «служыць будаўнічым матэрыялам для сказа, уваходзіць у склад яго ў якасці канструкцыйнага кампанента» [*Бурак*, 1987, *19*] і «выступаць як своеасаблівыя складаныя або разгорнутыя назвы адпаведных з’яў» [*тамсама*, *13*]. Па-другое, М. Г. Булахаў вылучае прэдыкатыўныя словазлучэнні як разнавіднасць падпарадкавальных (паколькі бачыць між дзейнікам і выказнікам сувязь дапасаванне), але выносіць іх за рамкі ўласна словазлучэнняў; у той час як Л. І. Бурак разглядае іх як асобны тып (арганізаваны на сувязі каардынацыя (гл. больш дэталёва *78*), хаця таксама лічыць іх прэрагатывай сінтаксісу сказа.

Падсумоўваючы вышэйадзначаныя меркаванні беларускіх сінтаксістаў адносна словазлучэння, варта сказаць, што больш правамерна разглядаць словазлучэнне як субардынацыйнае спалучэнне сінтаксем, якое ўтвараецца толькі ў межах выказвання і вылучаецца непасрэдна з яго, таму што «ў мове няма канкрэт-

ных, загадзя падрыхтаваных на кожны выпадак словазлучэнняў (калі не лічыць фразеалагізмаў). Іншая справа – наяўнасць у ёй пэўных мадэляў, спосабаў утварэння канкрэтных словазлучэнняў» [*Падгайскі*, 1971, *11*]. Адсюль і функцыя словазлучэння не намінацыйная, а «адлюстравальная» – вербальна перадаваць прадметна-лагічныя адносіны, што існуюць ці ўзнікаюць паміж з’явамі рэчаіснасці.

Калі ж такіх адносінаў не ўзнікае, то няма падстаў лічыць тое ці іншае спалучэнне слоў словазлучэннем. Найперш гэта датычыць спалучэнняў службовых слоў (прыназоўнікаў і звязкі *быць*) са знамянальнымі, параўн.: *пакласці на паліцу* і *на паліцы* (у першым выпадку аб’ектна-акалічнасныя адносіны, а ў другім – толькі называнне месца), *была на заліку* і *была нервовая* (у першым выпадку акалічнасныя адносіны, а ў другім – толькі намінуе прымету). У такім разе неабходна адрозніваць, у якіх спалучэннях *быць* – гэта паўназначны дзеяслоў, а значыць, утварае словазлучэнне, і ў якіх гэта службовае слова, а значыць, у наяўнасці толькі пэўнае спалучэнне слоў. Паўнавартасным кампанентам словазлучэння дзеяслоў *быць* выступае ў словазлучэннях з прасторавымі, часавымі ці іншымі акалічнаснымі адносінамі, напр.: *быў на поплаве, была з гадзіну, былі з нагодай* і да т. п.; а пры азначальных адносінах ён толькі дапамагае перадаць прымету (службовая функцыя), напр.: *быў вясёлы, была за агранома, быў у роспачы*[8] і інш.

«Словазлучэнні з’яўляюцца прасцейшымі сінтаксічнымі адзінствамі, якія існуюць не асобна ад сказа, а ўваходзяць у яго як састаўныя часткі і атрымліваюць у ім свае канкрэтныя функцыі і значэнні» [*Булахаў*, 1959, 7], а таму толькі нароўні з выказваннем (у яго складзе) яны выконваюць і намінацыйную, і камунікацыйную функцыі.

Разам з тым назыўная функцыя, якую мае кожная лексема, уласціва несвабодным словазлучэнням, паколькі яны абазначаюць сабой адно паняцце, параўн.: *Малькі час ад часу муцілі ваду* і *Яна і тут ваду муціць*. У першым выпадку – наяўнасць паняццяў ‘муціць’, ‘вада’ і аб’ектных адносінаў між імі; у другім – адсутнасць гэтых паняццяў, а значыць, і такіх адносінаў, затое наяўнасць ацэначнага паняцця ‘знарок заблытваць каго-небудзь’. Параўн. таксама выказванні: *Хлопчык махнуў рукой* і *Бацька на*

[8] Параўнайце іншы пункт гледжання, дзе спалучэнне *быў у паліто* падаецца як словазлучэнне з сувяззю *кіраванне* [*Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *10*].

*яго дзівацтвы рукой махнуў*; *Паляўнічыя надумалі страляць варон* і *На ўроку вучні стралялі варон; Воўк з'еў сабаку* і *У гэтай справе ён сабаку з'еў*. Таму, як адзначаецца ў навуковай літаратуры, свабодныя і несвабодныя словазлучэнні – адзінкі розных узроўняў мовы (сінтаксічнага і лексічнага) і вывучаюцца ў розных раздзелах мовазнаўства – сінтаксісе і фразеалогіі.

Між тым у мастацкай літаратуры і ў гутарковай мове непадзельныя словазлучэнні могуць выкарыстоўвацца як свабодныя з мэтай стварэння камічнага эфекту ці як пэўны мастацкі прыём, напр.:

– *Нашто вам браць якога-небудзь смаркача, калі ёсць вопытны работнік, які па гэтай справе <u>сабаку з'еў</u>.*
– *Сабака – гэта, відаць, не самае большае, што ён з'еў.*

(*К. Крапіва.* Брама неўміручасці)

Свабодныя словазлучэнні не валодаюць узнаўляльнасцю, бо не існуюць у гатовым выглядзе ў мове як адзінкі намінацыі падобна да слоў (інакш яны ўсе павінны былі б быць у слоўніку). Выключэнне складае несвабодны тып, дзе словазлучэнне абазначае адзінае, нерасчлянёнае паняцце (найчасцей гэта тэрміны): *рухальна-каардынацыйныя здольнасці, цэнтральная нервовая сістэма, жаночая рыфма, рэжым кароткага замыкання, сістэма калектыўнай бяспекі, прыняць барцоўскую паставу* і да т. п.

Такім чынам, у адрозненне ад слова словазлучэнне – гэта сукупнасць граматычна арганізаваных кампанентаў, таму паводле сваёй структуры словазлучэнне неаднакампанентнае, расчлянёнае. Словазлучэнні маюць бінарную іерархічную структуру, бо маюць слова, якое пашыраецца, – галоўнае, і слова, якое пашырае, – залежнае, прычым сістэма яго формаў абапіраецца на сістэму формаў галоўнага слова. Пры гэтым словазлучэнне не валодае ўласнай парадыгмай формазмянення, бо змяненні накшталт *галінка бэзу, галінцы бэзу, з галінкай бэзу; жвавы хлопчык, жвавага хлопчыка, жваваму хлопчыку; стукаю моцна, стукаеш моцна, стукае моцна* і г. д. звязаныя з парадыгмай стрыжнёвага слова.

Словазлучэнне і выказванне падобныя тым, што ў аснове іх пэўныя мадэлі, згодна з якімі ўтвараюцца разнастайныя іх маўленчыя варыянты. Адрозніваюцца ж яны паводле свайго статусу, структуры і функцый. Выказванне – камунікацыйная адзін-

ка, словазлучэнне – некамунікацыйная; выказванне – самастойная, сэнсава і інтанацыйна завершаная адзінка, словазлучэнне – прасцейшае сінтаксічнае адзінства ў яго структуры, што не мае моўнай самастойнасці; выказванне можа быць аднаслоўным, словазлучэнне складаецца мінімум з двух кампанентаў; выказванне можа арганізоўвацца на аснове прэдыкатыўнай, падпарадкавальнай і злучальнай сувязі (а калі яно аднаслоўнае, то ўвогуле без сувязі), а словазлучэнне ўтвараецца толькі на аснове падпарадкавання (злучальная сувязь у складаных словазлучэннях пашырае адзін з яго кампанентаў).

## Дыферэнцыяцыя словазлучэнняў

Традыцыйна дыферэнцыяцыя словазлучэнняў грунтуецца на трох параметрах[9]:

1) колькасці складнікаў – простыя / складаныя;

2) ступені зліцця кампанентаў – свабодныя / несвабодныя;

3) часцінамоўнай прыналежнасці галоўнага слова – іменныя, дзеяслоўныя, прыслоўныя.

Адносна структуры словазлучэння меркаванні лінгвістаў не супадаюць, бо ў іх розныя падыходы. Калі адны з іх улічваюць колькасць кампанентаў (паўназначных слоў) [*Наркевіч*, 1966, *7–8*; *Міхневіч*, 1986, *6*; 1994, *514*; *Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *6*], то іншыя – наяўнасць адной ці больш сувязі, на аснове якой арганізавана словазлучэнне [*Бурак*, 1987, *19–21*; *Ляпёшкін*, 1989, *6*], у выніку чаго адно і тое спалучэнне, напр.: *дзяўчына з блакітнымі вачыма* або *чалавек вялікіх здольнасцей*, разглядаецца першай групай лінгвістаў як складанае, а другой – як простае. У дадзеным выпадку аўтар дапаможніка падзяляе «колькасны» пункт гледжання на структуру словазлучэння, бо ў процілеглым выпадку словазлучэнне атаясамліваецца з членамі сказа (а гэта іншы ўзровень аналізу).

***Простыя словазлучэнні*** складаюцца з двух паўназначных слоў, адно з якіх пашыраецца іншым: *дождж-вадалей, ехаць аўтобусам, заляцацца да дзяўчыны, кошык суніц, вельмі маркотны*. Але да простых словазлучэнняў адносяць і такія, што

[9] Лінгвісты, што прытрымліваюцца шырокага пункту гледжання на аб’ём словазлучэння, вылучаюць, натуральна, яшчэ адзін параметр – прэдыкатыўнасць / непрэдыкатыўнасць.

ўключаюць у свой склад аналітычную форму слова[10], адна з якіх не мае самастойнага лексічнага значэння, а выражае толькі граматычнае (звязка *быць*, займеннік *самы*, форма кампаратыва *больш, менш*), напр.: *буду чытаць павольна, зараз будуць палуднаваць; самае глыбокае возера, самае кемлівае дзіця, больш трывалы трос, менш рэдкая з'ява*.

У ***складаныя словазлучэнні*** ўваходзяць тры і больш паўназначныя словы, напр.: *стары настольны каляндар, зімовая экзаменацыйная сесія, летнія падрыхтоўчыя курсы, дзёрзкая на язык дзяўчына, смачны на выгляд яблык, даць параду скасаваць дамову, жоўтыя і чырвоныя паветраныя шары*.

«Складаныя словазлучэнні, суадносныя з простымі, узнікаюць або шляхам шматступеньчатага лінейнага пашырэння (*новы дом – зусім новы дом – зусім новы дом брата*), або шляхам замены аднаго з членаў словазлучэння яго функцыянальна-семантычным эквівалентам (*чатырохпавярховы будынак – будынак у чатыры паверхі, дом адзінаццаць – дом нумар адзінаццаць, абяцаць дапамагчы – даць абяцанне аказаць дапамогу*)» [*Міхневіч*, 1994, *514*]. Разам з тым адзначаецца і той факт, што значная колькасць словазлучэнняў не суадносіцца з простымі, напр.: *шаша Брэст–Мінск, прынцып «падзяляй і пануй», вёска Валова Гара, лётаць з ранку да вечара* [*тамсама*]; параўн. яшчэ: *чалавек высокага росту* – магчыма *высакаsuccessful чалавек; чалавек сярэдняга веку* – немагчыма *сярэдневяковы чалавек*[11].

У залежнасці ад сэнсавай і сінтаксічнай лучнасці сінтаксем у выказванні прынята вылучаць свабодныя (сінтаксічныя) і несвабодныя (фразеалагічныя) словазлучэнні.

***Свабодныя словазлучэнні*** ўтвараюць словы, якія «захоўваюць сваё самастойнае лексічнае значэнне і могуць свабодна ўступаць у граматычныя адносіны з іншымі словамі» [*Булахаў*, 1959, *18*].

---

[10] Мовазнаўцы, што бяруць пад увагу колькасць сувязяў, як простыя разглядаюць і спалучэнні, у якіх залежны кампанент (1) складаная назва: *прыехаць у Старыя Дарогі, наведаць Новае Сяло*; (2) сінтаксічна непадзельнае адзінства: *чалавек высокага росту*, *дзяўчынка сямі гадоў*; (3) фразеалагічная адзінка: *своечасова даць лататы* [*Бурак*, 1987, *19*; *Ляпёшкін*, 1989, *8*]. У такім разе як простыя трэба разглядаць і спалучэнні з фразеалагізаванымі дзеяслоўнымі ўтварэннямі канцылярскага, кніжнага характару: *рабіць агляд памяшкання* (=аглядаць памяшканне), *праяўляць цікавасць да справы* (=*цікавіцца справай*), *планаваць з улікам перспектывы* (=*планаваць на перспектыву*), *прымаць удзел у спаборніцтвах* (=*удзельнічаць у спаборніцтвах*), што наўрад ці правамерна.

[11] Прыклад узяты з [*Клюсаў*, 1972, *25*].

Кожны з кампанентаў мае сваю функцыю ў яго складзе і можа замяшчацца іншымі словамі пэўнай катэгорыі ў адпаведнасці з камунікацыйным заданнем: *размаўляць ціха* (*шэптам, гучна, доўга, памяркоўна, па-беларуску...*). Колькасную абмежаванасць у такім выпадку задае семантыка галоўнага слова, паколькі дапускае выбраную спалучальнасць: *чытаць словы, тэкст, часопіс...* але не *дрэва, мрою, вочы*.

***Несвабодныя словазлучэнні*** складаюцца са слоў лексічна несамастойных, г. зн. са слоў з аслабленым ці страчаным лексічным значэннем, і абазначаюць адно нерасчлянёнае паняцце. Пэўны кампанент іх, як правіла, мае пераносны сэнс, а таму не можа спалучацца з іншымі словамі: *белы вугаль, набіць руку, каліва з'есці, трымаць язык за зубамі* і пад. Яны выступаюць у пазіцыі аднаго члена сказа і сваёй семантыкай і функцыяй блізкія асобнаму слову. Сярод іх адрозніваюць сінтаксічна і фразеалагічна непадзельныя.

***Сінтаксічна непадзельныя*** – словазлучэнні, лексічна звязаныя і нечлянімыя ў пэўным кантэксце (яны выяўляюцца толькі ў канкрэтных сказах): *Арол застаецца арлом // І з адным крылом* (Р. Барадулін); *Мова іх на першы погляд здаецца самай простай і бязвіннай, як дзіцячая гутарка* (З. Бядуля); *Гняздо бусла знаходзіцца на высокай алешыне са зрэзанай вяршалінай* (В. Вольскі); *«Звяждоўскі варты чалавек», – проста сказаў Алесь* (У. Караткевіч); *– Што ж яго прасіць з голымі рукамі? Трэба было завезці які гасцінчык* (В. Дунін-Марцінкевіч).

***Фразеалагічна непадзельныя*** – словазлучэнні, лексічная несамастойнасць кампанентаў якіх выяўляецца ў любым кантэксце. Яны – прадмет фразеалогіі, а ў сінтаксісе могуць разглядацца як адзіны кампанент структуры сказа: *з дня ў дзень лынды біць, зранку быць не ў гуморы, наважыцца даць драла, тэорыя «мастацтва для мастацтва», плакаць горкімі слязьмі, перыяд «халоднай вайны»*.

У адпаведнасці з колькасцю часцін мовы, здольных выконваць ролю галоўнага кампанента, у беларускай мове вылучаецца шэсць тыпаў словазлучэнняў: дзеяслоўныя, назоўнікавыя, прыметнікавыя, займеннікавыя, лічэбнікавыя і прыслоўныя [*Міхневіч*, 1986, *6*]. У некаторых даследаваннях гэты падзел больш абагульнены за кошт іменнай групы, паколькі лічэбнікавыя і займеннікавыя словазлучэнні не разглядаюцца як самастойны тып, таму вылучаюць: дзеяслоўныя, іменныя і прыслоўныя. Так, сярод іменных вылучаюць дзве групы: субстантыўныя, у якіх ролю галоўнага слова выконваюць назоўнікі, займеннікі з абагульнена-прадметным значэн-

нем, а таксама розныя субстантываваныя часціны мовы, і ад'ектыўныя, у якіх ролю галоўнага слова выконвае прыметнік, парадкавы лічэбнік, абагульнена-якасны займеннік [*Булахаў*, 1959, *18*; *Гурскі*, 1962, *6*; *Наркевіч*, 1966, *9*; *Падгайскі*, 1971, *17*; *Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *8*; *Ляпёшкін*, 1989, *18*].

## Тыпы семантыка-сінтаксічных адносінаў паміж кампанентамі словазлучэнняў

***Семантыка-сінтаксічныя адносіны*** – гэта граматычнае значэнне словазлучэння, што грунтуецца на аснове ўзаемадзеяння лексічных значэнняў кампанентаў словазлучэнняў і іх граматычных формаў. Калі ж спалучэнне кампанентаў не перадае сінтаксічных адносінаў, яно не з'яўляецца словазлучэннем.

Усю шматлікасць семантыка-сінтаксічных адносінаў можна звесці да некалькіх тыпаў, мінімум – трох: аб'ектныя, атрыбутыўныя і акалічнасныя [*Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *7*; *Ляпёшкін*, 1998, *7*]. М. Г. Булахаў вылучае дзевяць такіх тыпаў: аб'ектныя, суб'ектныя, азначальныя, азначальна-колькасныя, абмежавальныя, прасторавыя, часавыя, прычынныя, мэтавыя, што ў кантэксце могуць канкрэтызавацца [Булахаў, 1959, *19*]. У прапанаваным дапаможніку аўтар услед за іншымі сінтаксістамі спыняецца на пяці тыпах адносінаў, якія маюць свае разнавіднасці: суб'ектныя, аб'ектныя, азначальныя, акалічнасныя і колькасныя, а таксама змешаныя, ці кантамінаваныя [*Наркевіч*, 1972, *27*; *Міхневіч*, 1994, *514*].

***Азначальныя (атрыбутыўныя) адносіны*** ўказваюць на прадмет і яго прымету, таму ўзнікаюць пры семантыка-граматычным узаемадзеянні назоўніка (часціны мовы, якой натуральна мець вызначальныя для яго прыметы) з такімі часцінамі мовы, агульнае значэнне якіх здольнае абазначаць прымету, – прыметнікамі, дзеепрыметнікамі, указальнымі, прыналежнымі, азначальнымі, няпэўнымі займеннікамі, парадкавымі лічэбнікамі: *зорнае неба, чорная кава, гэткае здарэнне, твая залікоўка, увесь горад, якісьці хлопец, нечы адказ, трэцяе выпрабаванне, першая экзаменацыйная сесія.*

Але атрыбутыўныя адносіны ўзнікаюць і тады, калі ў якасці залежнага кампанента выкарыстоўваюцца іншыя часціны мовы:

● прыназоўнікавыя і беспрыназоўнікавыя формы назоўніка: *дыскета з гульнямі*, *вядро для смецця*, *валасы па плечы*, *каханне без узаемнасці*, *абрус у гарошак*, *тэлефон маці*;

● прыслоўі: *магазін насупраць, будынак справа, дарога дадому;*

● дзеяслоў у форме інфінітыва: *жаданне працаваць, рашэнне выслухаць, магчымасць адпачыць, неабходнасць паехаць.*

***Аб'ектныя адносіны*** ўказваюць на дзеянне і прадмет, на які дзеянне пераходзіць прама ці ўскосна або толькі арыентуецца на яго; узнікаюць пры семантыка-граматычным узаемадзеянні дзеясловаў (у тым ліку іх формаў – дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў) з назоўнікамі і радзей з формай інфінітыва. Найперш такія адносіны характэрныя для пераходных дзеясловаў, якія пашыраюцца вінавальным склонам прамога аб'екта: *купіць боты, напісаць ліст, чакаць сябра, лавіць рыбу, абіраць яблыкі, пасадзіць дрэва, раздрукаваць нататку.*

Аб'ектныя адносіны ўзнікаюць і пры спалучэнні дзеясловаў ці назоўнікаў з іншымі склонамі назоўнікаў без прыназоўнікаў:

● з родным часткі: *выпіць соку, пакаштаваць ягад, купіць хлеба*;

● з давальным асобы ці прадмета, да якіх скіравана дзеянне: *пярэчыць выкладчыку, давяраць чалавеку, рэкламаваць спажыўцам, ліст сябру, даручэнне студэнту, характарыстыка супрацоўніку*;

● з творным прылады: *секчы тапаром, пісаць алоўкам, маляваць пэндзлем, капаць рыдлёўкай, насіць кошыкам, лавіць вудай;*

а таксама

● з прыназоўнікавымі формамі назоўнікаў: *гаварыць пра жыццё, дзякаваць за дапамогу, парадзіцца з бацькам, дабудаваць да сцяны, паслаць па доктара, атрымаць ад дзядулі;*

● з займеннікамі, лічэбнікамі, субстантываванымі прыметнікамі, колькасна-іменнымі спалучэннямі: *паклікаць яго, убачыць траіх, наведаць хворага, запрасіць семнаццаць чалавек;*

● з інфінітывам, набліжаным да вінавальнага склону прамога аб'екта і дзеясловамі руху (у якасці галоўнага слова): *даць запаліць – даць цыгарэту, прынесці абедаць – прынесці абед.*

Аб'ектныя адносіны характэрныя і для словазлучэнняў з галоўным словам прыметнікам: *падобны да бацькі, гатовы да сяўбы, здольны да навукі, ласкавы з дачкой* і інш., а таксама назоўнікамі (што суадносяцца з дзеясловамі): *паведамленне пра навальніцу, спагада да людзей, маркота па дзецях, рэцэнзія на кнігу, сузмесце на артыкул.*

***Суб'ектныя адносіны*** ўказваюць на дзеянне і яго ўтваральніка, узнікаюць у словазлучэннях з дзеясловамі і дзеепрыметнікамі залежнага стану. Залежная форма назоўнікаў у іх абазначае дзеяча

ў творным склоне: *чытаецца наведвальнікамі, зацягнулася хмарамі, вызвалены арміяй, перакулены вадой, зламаныя ветрам, вернуты братам*; па аналогіі могуць быць і субстантыўныя словазлучэнні: *абмеркаванне ўрадам, вызваленне прызыўной камісіяй*, а таксама з родным склонам: *прыезд бацькі, гоман людзей, з'яўленне аўтамабіля, ад'езд капітана, смех дзіцяці, довады абаронцы*, бо ўстанаўліваюцца адносіны 'дзеянне і дзеяч'.

***Акалічнасныя адносіны*** ўказваюць на дзеянне і яго прымету ці на прымету прыметы; уласцівыя словазлучэнням дзеяслоўным, бо яны спадарожнічаюць пэўным дзеянням і станам і абапіраюцца на лексічную працэсуальнасць. Сярод іх вылучаюцца:

- уласна акалічнасныя: *хутка рухацца, успамінаць часта, пісаць акуратна, загадкава ўсміхацца, добра падмацавацца;*
- часавыя: *прыехаць раніцай, вярнуцца праз год, пазнаёміцца на Каляды, здарылася апоўначы, збірацца а пятай, сустрэцца ўвосень;*
- прасторавыя: *ісці полем, хадзіць каля лесу, выйсці з-за дрэва, жыць за два кіламетры ад сталіцы, гуляць уздоўж марскога берага;*
- прычынныя: *памыліцца праз хваляванне, спазніцца з-за непагадзі, скакаць ад радасці, сказаць здуру, ускочыць спрасонку;*
- мэтавыя: *сказаць жартам, зрабіць наўмысна, паехаць у адпачынак, падараваць на памяць, трымаць для выпадку;*

***Колькасныя адносіны*** маюць значэнне меры, колькасці, часткі, сукупнасці; узнікаюць з-за сэнсавай недастатковасці галоўнага слова[12]: *чатыры вуглы, пуд зерня, дзень хадзьбы, палова вёскі, мех бульбы, шклянка сырадою, кубачак кавы, лыжка цукру; сустрэцца два разы, чакаць з тыдзень, аб'ехаць вёсак дзесяць, правучыцца тры семестры.*

Акрамя таго вылучаюць словазлучэнні з кантамінаванымі адносінамі – ***змешаны тып***, семантыка-сінтаксічныя адносіны ў якіх узаемадзейнічаюць, утвараючы комплексныя значэнні: *прыехаць па рэчы* (аб'ектныя – па што? і акалічнасныя – з якой мэтай?), *пацярпець праз брата* (аб'ектныя – праз каго? і акалічнасныя прычыны – з якой прычыны?), *канспект аднакурсніка* (азначальныя – чый? і суб'ектныя – каго?).

Такім чынам, семантыка-сінтаксічныя адносіны залежаць ад лексічнага значэння слоў (параўн.: *дыскутаваць з калегамі* і **дыскутаваць з кветкамі; горача дыскутаваць* і **холадна дыскута-*

---

[12]Нярэдка такія адносіны кваліфікуюцца як *камплетыўныя*.

*ваць; жвавае дзіця* і **жвавае пытанне*) і ад лексіка-граматычных характарыстык яго кампанентаў (параўн.: *імклівы рух, ганарыцца дзецьмі, шпарка занатоўваць*).

## ЛІТАРАТУРА


*Абабурка, 1992*: Абабурка М. В. Параўнальная граматыка беларускай і рускай моў. Мн.: Вышэйш. шк., 1992. 224 с.

*Анічэнка, 1998*; Анічэнка У. В. Беларуская мова: Дапам. для самаадукацыі. Мн.: Бел. навука, 1998. 206 с.

*Бандарэнка, 1981*: Бандарэнка Т. П. Аднатыпныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Мн.: Навука і тэхніка, 1981. 132 с.

*Булахаў, 1959*: Булахаў М. Г. Словазлучэнне // Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Сінтаксіс. Мн.: Дзярж. вуч.-пед. выд-ва, 1959. С. 5–26.

*Бурак, 1987*: Бурак Л. І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн.: Універсітэцкае, 1987. 320 с.

*Гурскі, 1962*: Гурскі М. І., Булахаў М. Г., Марчанка М. Ц. Беларуская мова: У 2 ч. Мн.: Выд-ва Мін-ва адукацыі, 1962. Ч. 2: Сінтаксіс. 266 с.

*Клюсаў, 1972*: Клюсаў Г. Н. Уводзіны // Клюсаў Г. Н., Юрэвіч А. Л. Сучасная беларуская пунктуацыя. Мн.: Вышэйш. шк., 1972. С. 3–46.

*Лёсік, 1926*: Лёсік Я. Сынтакс беларускае мовы. Менск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. 255 с.

*Ляпёшкін, 1989*: Ляпёшкін В. У. Словазлучэнне // Беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя / Пад рэд. Я. М. Адамовіча. Мн.: Вышэйш. шк., 1989. С. 6–27.

*Ляпёшкін, 1998*: Ляпёшкін В. У. Словазлучэнне // Беларуская мова: У 2 ч. / Пад рэд. Л. М. Грыгор’евай. Мн.: Вышэйш. шк., 1998. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 5–20.

*Міхневіч, 1965*: Міхневіч А. Я. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове. Мн.: Навука і тэхніка, 1965. 114 с.

*Міхневіч, 1986*: Міхневіч А. Я. Агульная характарыстыка словазлучэнняў // Беларуская граматыка: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1986. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 6.

*Міхневіч, 1994*: Міхневіч А. Я. Словазлучэнне // Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А. Я. Міхневіча. Мн.: БелЭн, 1994. С. 513–515.

*Наркевіч, 1966*: Наркевіч А. І. Словазлучэнне // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 7–9.

*Наркевіч, 1972*: Наркевіч А. І. Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове: Структурна-семантычнае апісанне. Мн.: Выд-ва БДУ, 1972. 360 с.

*Падгайскі, 1971*: Падгайскі Л. П. Словазлучэнне ў беларускай мове. Мн.: Вышэйш. шк., 1971. 192 с.

*Рагаўцоў, 2001*: Рагаўцоў В. І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні. Мн.: Універсітэцкае, 2001. 199 с.

*Тарашкевіч, 1929*: Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ / Факсімільнае выданне. Мн.: Нар. асвета, 1991. 112 с.

*Яўневіч, 1977*: Яўневіч М. С. Сінтаксічная сінаніміка ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Мн.: Выд-ва БДУ, 1977. 279 с.
*Яўневіч, Сцяцко, 1987*: Яўневіч М. С., Сцяцко П. У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. Мн.: Вышэйш. шк., 1987. 272 с.

# СУВЯЗЬ У СЛОВАЗЛУЧЭННІ

## Тыпалогія сувязі

Любое (акрамя аднаслоўнага) выказванне нагадвае сабой ланцужок, звёнамі якога ёсць сінтаксемы, аб'яднаныя між сабою пэўнай сувяззю: сэнсавай, граматычнай, асацыяцыйнай і інш.

Сувязь – «гэта спалучэнне слоў, што выражае з дапамогай пэўных сродкаў сэнсавыя адносіны паміж гэтымі словамі» [*Чеснокова*, 1980, *6*]. Сувязь слоў у словазлучэнні і сказе выконвае шэраг функцый:

- служыць для выражэння сінтаксічных адносінаў паміж словамі;
- утварае сінтаксічную структуру сказа і словазлучэння;
- стварае ўмовы для рэалізацыі лексічнага значэння слова [*тамсама*, *7*].

Калі функцыя прэдыкатыўнай сувязі заключаецца ў канструяванні прэдыкатыўнага цэнтра сказа, то непрэдыкатыўная сувязь выконвае функцыю пашырэння як яго ядра, так і іншых кампанентаў сказа. Прычым пашырэнне асобных слоў адбываецца за кошт падпарадкавальных сувязяў некалькімі шляхамі праз: а) далучэнне да галоўнага слова тлумачальнага залежнага; б) сэнсавае тлумачэнне ўсяго прэдыкатыўнага спалучэння; в) пашырэнне простага ці складанага словазлучэння (пры граматычнай фармальнай сувязі з адным словам). Параўн.: *Цвіце гарлачык – Трэці дзень цвіце мой адзіны жоўты гарлачык паміж талерак-лістоў* (Я. Брыль), дзе пункту а) адпавядае словазлучэнне *паміж талерак-лістоў*, б) – *трэці дзень цвіце гарлачык*, в) – *мой адзіны жоўты гарлачык*.

Зыходзячы з таго, што лінгвісты па-рознаму падыходзяць да трактоўкі аб'ёму словазлучэння, адрознымі з'яўляюцца і тыя тыпы сувязі, якія яны вылучаюць паміж яго кампанентамі.

Прыхільнікі шырокага разумення разглядаюць у словазлучэнні паратаксічную і гіпатаксічную сувязь, што мае свае разнавіднасці. Так, Л. І. Бурак у злучальнай сувязі адрознівае:

● з’яднанне (на аснове спалучальных адносінаў): *лес і поле; прыгожы ды вясёлы;* (*бачыць*) *лясы, палі, лугі*;

● раз’яднанне (на аснове супастаўляльных адносінаў) *не дзень, а ноч; стары, але моцны; не сёння – заўтра*;

● пераз’яднанне (на аснове размеркавальных адносінаў): *зімой ці летам; то цёмны, то светлы; або туды, або сюды.*

У падпарадкавальнай – дапасаванне, кіраванне і прымыканне[13] [*Бурак*, 1987, *21–25*].

Аўтар самай шырокай трактоўкі словазлучэння – Г. Н. Клюсаў раскласіфікоўвае сувязь у словазлучэннях па шасці тыпах.

1. Дэтэрмінальная (дэтэрмінацыя) – у спалучэннях часціц, мадальных слоў і прыназоўнікаў з самастойнымі словамі, напр.: *не ідзі, няхай ідзе, пайшоў бы, пакуль што, можа стаміўся* і г. д.

2. Асацыяцыйная сувязь (асацыяцыя) – пры аднародных кампанентах і, як разнавіднасць, у спалучэннях *гусі-лебедзі, ідзе-брыдзе, больш-менш* і г. д.

3. Апазіцыйная сувязь (апазіцыя) – пры выражэнні адносінаў родавідавых паняццяў, агульнага і прыватнага (*рака Свіслач, грамадзянка Мініч, сын Іван*) ці прадмета з яго «субстантываванай» прыметай (*душа-чалавек, агонь-маладзіца*).

4. Аплікацыйная сувязь (аплікацыя) – спалучэнне заведама разнародных па сувязі і сінтаксічных функцыях кампанентаў, напр.: *працаваць за так* (параўн.: *працаваць за грошы, за плату*), *пратрымаць да ні свет ні зара* (Я. Брыль), *пагодка – ого-го!* і г. д.

5. Злучальная (канексія) – спалучальная, супастаўляльная і размеркавальная сувязь аднародных кампанентаў, напр.: *лес і поле; не лес, а поле; і лес, і поле; лес або поле; то лес, то поле* і г. д.

6. Падпарадкавальная (субардынацыя), што праяўляецца ў трох разнавіднасцях: а) беспасрэдна-падпарадкавальная (кіраванне, дапасаванне, прымыканне – без прыназоўнікаў), б) пасрэднападпарадкавальная (сувязь з прыназоўнікамі), в) падпарадкавальна-злучнікавая (сувязь з дапамогай падпарадкавальных злучнікаў: *будзьце як дома, бегчы каб не спазніцца, дом што пры дарозе* і г. д.

Сінтаксісты, што прытрымліваюцца вузкага разумення словазлучэння, натуральна, адзначаюць паміж яго складнікамі толькі падпарадкавальную сувязь.

Размежаванне злучальнай і падпарадкавальнай сувязі заснавана на фармальна-сэнсавых адрозненнях паміж гэтымі паняцця-

---

[13] Упершыню ў беларускім мовазнаўстве гэтыя паняцці выразна акрэслены ў кнізе Я. Лёсіка «Сынтакс беларускае мовы» (1926).

мі, а дакладней, у форме іх адлюстравання. «І падпарадкаванне і злучэнне – уласна-моўныя адносіны, што перадаюць, структурна афармляюць аб’ектыўныя адносіны ў рэчаіснасці» [*Чеснокова*, 1980, *10*]. Між іншым падпарадкавальная сувязь істотна адрозніваецца ад злучальнай па некалькіх прыметах:

- характару сувязі;
- сінтаксічных адносінаў;
- сінтаксічных пазіцый;
- сродкаў сувязі.

Што датычыцца характару сувязі, то ў падпарадкавальных спалучэннях гэта аднабаковая граматычная залежнасць, а ў злучальных – граматычная самастойнасць кампанентаў. Прычым падпарадкавальная сувязь можа быць:

- абавязковай і неабавязковай;
- прадказальнай і непрадказальнай.

Абавязковая (аблігаторная) сувязь выяўляецца тады, калі залежнае слова неабходнае для рэалізацыі значэння галоўнага кампанента, напр.: *чалавек знаходзіўся... у вёсцы, за дрэвам, пад вадой, на сенажаці*; *плашч белага (прыемнага, незвычайнага, дзіўнага, ...) колеру*; неабавязковая (факультатыўная) – калі залежны кампанент толькі магчымы: *Дождж [пакрысе] супакойваўся; Матацыкліст прыцішыў хуткасць [на скрыжаванні]; Яна апранула [новы] плашч.*

Прадказальная падпарадкавальная сувязь назіраецца тады, калі адзін кампанент у выказванні прадказвае форму іншага (вінавальны склон пры пераходных дзеясловах: *прачытаць часопіс, дэкламаваць вершы*; форма прыметніка пры назоўніках: *бурштынавыя каралі, з дзівосным бранзалетам* і пад.). Непрадказальнай будзе сувязь, калі форма залежнага кампанента не вызначаецца ўласцівасцямі галоўнага слова, напр.: *размяшчацца... за горадам, побач, ля вады; вядро ... малака, з-пад малака, для малака, з малаком.* Таму сувязь можа быць абавязковай, але непрадказальнай, неабавязковай, але прадказальнай, а таксама неабавязковай і непрадказальнай. Параўн. сувязь у выказванні: *Дзікія гусі зноў паляцелі нізка над лесам* (Я. Брыль), дзе *дзікія гусі* – прадказальная, але факультатыўная сувязь; *паляцелі над лесам* – абавязковая, але непрадказальная; *паляцелі нізка* і *паляцелі зноў* – і неабавязковая, і непрадказальная).

Злучальную сувязь у сказе адрозніваюць адкрытую і закрытую. Адкрытая перадае пералічальныя або размеркавальныя адносіны, колькасць кампанентаў неабмежаваная, напр.: *Жыццё* –

*экспрэс, ён імчыць ад станцыі Нараджэнне праз станцыю Каханне і Здрада, Надзея і Расчараванне, Радасць і Туга, Самота і Боль. Імчыцца да апошняга свайго прыпынку, толькі ніхто не ведае, калі ён туды прыбудзе* (Л. Арабей); *Дарога не то маладзіць мяне, не то абнаўляе, не то поўніць нечым вельмі патрэбным, жывым, энергічным* (Я. Скрыган).

Закрытая злучальная сувязь аб'ядноўвае толькі два кампаненты, якія супрацьпастаўляюцца ці спалучаюцца (няма пералічэння): *Шчасце – гэта калі не будзённасць, а цудоўныя імгненні...* (С. Акружная); *Я сам не ведаю, чаму люблю аснежныя прасторы і беларускую зіму* (М. Чарот); *Ступаць аднолькава тузе // Ці па лязу, ці па слязе* (Р. Барадулін).

Паводле сінтаксічных адносінаў злучальныя спалучэнні перадаюць суаднесенасць паміж двума ці некалькімі раўназначнымі і ў пэўных адносінах аднапланавымі кампанентамі, таму ў іх аснове значэнне пералічэння ці супастаўлення: *Ты чакай мяне мудра і проста. // Перасіль і бяду, і нуду, і жуду* (Г. Бураўкін). Пры падпарадкаванні адносіны нераўназначныя, субардынацыйныя, таму ў іх аснове канкрэтызацыя ці характарыстыка аднаго з кампанентаў: *Бярозавым святлом упала поўня // У ціха разгайданы ветрам гай* (Н. Мацяш).

Спалучэнні, заснаваныя на злучальнай сувязі, як правіла, уваходзяць у падпарадкавальнае словазлучэнне і займаюць адну сінтаксічную пазіцыю[14] ў сказе (пры тым што такіх спалучэнняў можа ўвогуле не быць у яго структуры). На падпарадкавальных жа словазлучэннях грунтуецца пераважная большасць аб'яднанняў сінтаксем у выказванні, і яны займаюць розныя сінтаксічныя пазіцыі. Так, у фразе *Срэбная нітачка з сонечнай высі звязвае ўчора, і заўтра, і сёння* (Н. Маеўская) сінтаксемы *ўчора, і заўтра, і сёння*, спалучаныя на аснове злучальнай сувязі, падпарадкоўваюцца дзеяслову *звязвае* (што?) і займаюць адну пазіцыю ў сказе – дапаўненне. Астатнія ж словазлучэнні (*срэбная нітачка*, *з сонечнай высі*, *нітачка з высі*) падпарадкавальныя, іх залежныя кампаненты падпарадкоўваюцца розным сінтаксемам, хаця і маюць аднолькавыя адносіны паміж кампанентамі – азначальныя.

Злучальная сувязь у сваіх сродках абапіраецца на інтанацыю і злучнікі, а падпарадкавальная – на граматычныя формы слоў, прычым парадак размяшчэння кампанентаў у іх больш жорсткі:

[14] Апошнім часам у маўленні пашырэнне набываюць спалучэнні, якія, маючы розныя сінтаксічныя функцыі, заснаваныя на злучальнай сувязі, напр.: *калі і хто прыходзіў; кожны і ўсюды апавядаў; зараз і тут жа пакажы* і інш.

*ад жонкі брата* і *ад брата жонкі* (сэнс змяняецца), але: *ад жонкі і брата = ад брата і жонкі* (парадак неактуальны). Інтанацыйнае афармленне таксама адрознае: *Асляпляльна, ярка блішчыць вада пад сонцам* і *Асляпляльна ярка блішчыць вада пад сонцам.*

## Разнавіднасці падпарадкавальнай сувязі

У залежнасці ад характару спалучаных кампанентаў і адносінаў, што паміж імі ўзнікаюць, адрозніваюць тры тыпы падпарадкавання: дапасаванне, прымыканне і кіраванне, якія ў сваю чаргу маюць свае разнавіднасці. Дынаміку вылучэння тыпаў і падтыпаў падпарадкавальнай сувязі ў сучаснай беларускай мове можна праілюстраваць табліцай (табл. 2).

*Табліца 2*

**ТЫПЫ ПАДПАРАДКАВАЛЬНАЙ СУВЯЗІ**

| Лёсік 1926 | Сінтаксіс 1939 | Курс 1959 | Граматыка 1966 | Бурак 1987 |
|---|---|---|---|---|
| • дапасаванне | • дапасаванне<br>*–поўнае*<br>*–няпоўнае*<br>*–паралельнае* | • дапасаванне<br>*–поўнае*<br>*–няпоўнае* | • дапасаванне<br>*–поўнае*<br>*–няпоўнае* | • дапасаванне<br>*–поўнае*<br>*–няпоўнае* |
| • кіраванне | • кіраванне | • кіраванне<br>*–моцнае*<br>*–слабае* | • кіраванне<br>*–моцнае*<br>*–слабае* | • кіраванне<br>*–моцнае*<br>*–слабае* |
| • прымыканне | • прымыканне | • прымыканне | • прымыканне | • прымыканне<br>*–уласнае*<br>*–іменнае* |

Табліца наглядна дэманструе, што істотных разыходжанняў паміж вучонымі ў разуменні тыпаў падпарадкавальнай сувязі няма. Вылучаецца толькі пункт гледжання М. І. Гурскага (Сінтаксіс 1939) на разнавіднасці дапасавання, а таксама меркаванне Л. І. Бурака адносна відаў сувязі *прымыканне* (такая ж класіфікацыя і ў аўтараў Граматыкі (1986)).

***Дапасаванне*** – гэта такі від падпарадкавальнай сувязі, пры якой форма залежнага кампанента прыпадабняецца да формы галоўнага ў родзе, ліку, склоне: *ліпеньскі мёд, трэцяе выпрабаванне, чыясьці дыскета, мой улюбёны летні месяц.*

Асноўная функцыя такой сувязі – перадаць, якому прадмету належыць прымета, што выражае дапасаваная форма.

Асаблівасці дапасавання:

● форма залежнага кампанента не мае самастойнага граматычнага значэння, таму цалкам дубліруе форму галоўнага; прычым дапасоўваюцца сінтаксемы толькі па тых граматычных катэгорыях, якія маюць і залежнае, і галоўнае слова (параўн.: *навуковы часопіс* (супадаюць род, лік, склон) і *навуковыя часопісы* (супадаюць лік, склон, бо ў множным ліку не вызначаецца катэгорыя роду);

● змяненне формы асноўнага кампанента патрабуе тых жа змен дапасаванага: *спелы яблык, спелага яблыка, спеламу яблыку, спелым яблыкам, на спелым яблыку*;

● сувязь прадказальная, але неабавязковая (выключэнне: сінтаксічна непадзельныя спалучэнні: *бабуля з маршчыністым тварам*, *з вечна гнеўнымі падазронымі вачыма* (пры **бабуля з тварам*, *з вачыма*); абавязковасць дапасаванай формы не звязана з сінтаксічнымі ўласцівасцямі галоўнага слова, а абумоўліваецца лексічна ці экстралінгвістычна);

● граматычны сродак сувязі – канчаткі.

Такім чынам, дапасаванне мае чыста сінтаксічны характар (сувязь словаформаў), і «якіх-небудзь новых граматычных значэнняў спалучэнням слоў гэтая сувязь не надае», «аднак пры дапасаванні яскрава праяўляюцца тыя марфалагічныя асаблівасці (катэгорыі), якія ўласцівыя граматычна залежным словам» [*Булахаў*, 1959, *12*].

Адрозніваюць два тыпы дапасавання – поўнае і няпоўнае.

П о ў н а е  д а п а с а в а н н е выяўляецца тады, калі залежны кампанент (прыметнік, дзеепрыметнік, парадкавы лічэбнік, займеннік-прыметнік) паўтарае ўсе граматычныя катэгорыі (у адзіночным ліку – род, лік, склон; у множным – лік, склон), якія мае назоўнік ці іншая субстантываваная часціна мовы: *маляўнічы краявід, першыя вясновыя кветкі, шкадлівае кацянё, напісаная праца, усякае тлумачэнне.*

Н я п о ў н а е  д а п а с а в а н н е ахоплівае не ўсе граматычныя катэгорыі, у якіх можа дапасоўвацца залежнае слова. Звычайна яно выяўляецца, калі сувязь мае характар двухбаковага падпарадкавання (гл. больш дэталёва 91). Гэта адбываецца тады, калі ў склад іменнага выказніка ўваходзіць прыметнік, дзеепрыметнік ці парадкавы лічэбнік, што не дапасуюцца ў склоне да дзейніка: *Другім ішоў чалавек сярэдніх гадоў.* Аднак, як зазначаецца навукоўцамі, «у сучаснай беларускай літаратурнай мове ў такіх выпадках дапасаванне часцей бывае поўнае: *Першая загаварыла Маша* (І. Шамякін); *Быстрой выступіў апошні* (І. Мележ)» [*Булахаў*, 1959, *13*].

Разам з тым у беларускім мовазнаўстве вылучаецца (як адзіны і адасоблены факт) «няпоўнае падпарадкаванне, якое пераходзіць у адносіны паралелізму, г. зн. у раўнапраўныя ўзаемаадносіны дзвюх формаў. У такіх адносінах знаходзіцца прыдатак са словам, з якім ён карэлюе, напр.: *Сход студэнтаў-выдатнікаў*» [*Гурскі*, 1939, *6*]. Слушнасць гэтай заўвагі грунтуецца на тым, што дапасоўваюцца толькі тыя катэгорыі лексем, якія не маюць сваіх уласных катэгорый роду, ліку, склону. У дадзеным выпадку размова ідзе пра самастойную (у граматычным плане) часціну мовы – назоўнік, бо ў прыдатках і спалучаюцца два назоўнікі, што маюць свае ўласныя катэгорыі роду і ліку (сярод іх могуць быць толькі адзіночналікавыя ці множналікавыя). Таму цалкам лагічна гаварыць пра асобую разнавіднасць падпарадкавання, заснаваную на паралелізме адносінаў.

Такога кшталту сувязь некаторыя рускія лінгвісты (Е. М. Галкіна-Федарук, А. А. Камыніна, А. С. Скоблікава і інш.) вызначаюць як ***сінтаксічны***, або ***склонавы, паралелізм***[15]. З дапасаваннем яго лучыць толькі тое, што пры змене склонавай формы галоўнага слова змяняецца форма склону залежнага: *зіма-чараўніца, зіму-чараўніцу; Свіслач-рака, над Свіслаччу-ракою; горад Дзісна, у горадзе Дзісне; прафесар Глебава, з прафесарам Глебавай; гора-крытык, пра гора-крытыка; жанчына-ўрач, праз жанчыну-ўрача* і пад. Але не ўсе прыдаткі арганізуюцца на аснове такой сувязі, частка з іх мае сувязь *прымыканне*, паколькі залежнае слова характарызуе прадмет ці асобу, але мае нязменную форму (у гэтым кантэксце): *рака Нёман – на рацэ Нёман, часопіс «Спадчына» – у часопісе «Спадчына», газета «Культура» – з газетай «Культура», цягнік «Мінск – Берлін»*[16] *– на цягніку «Мінск – Берлін»* і пад. У свой час Я. Лёсік, разглядаючы дапасаванне слоў у сказе *Мы чыталі паэму «Новая зямля»*, канстатаваў, што «прыдатак «Новая зямля» не дапасаваны да слова *паэму*, якое ён паясняе», і зра-

---

[15] Упершыню выраз *паралелізм формаў* быў ужыты Д. Аўсяніка-Кулікоўскім, рускім мовазнаўцам, у 1912 г. для вызначэння сінтаксічнай сувязі паміж прыдаткам і азначаемым словам.

[16] Параўнайце пункт гледжання, дзе ў такога кшталту спалучэннях называецца сувязь *дапасаванне*: «Калі не ўсе формы залежнага кампанента адпавядаюць формам галоўнага кампанента, то дапасаванне лічыцца няпоўным: *горад Масква* (няма дапасавання ў родзе), *вёска Навасёлкі* (няма дапасавання ў ліку), *у газеце «Звязда»* (няма дапасавання ў склоне), *на станцыі Мінск* (няма дапасавання ў родзе і склоне)» [*Бурак*, 1987, *22*].

біў выснову, што «бываюць прыдаткі, не дапасаваныя да таго слова, да якога адносяцца» [*Лёсік*, 1926, *35*].

***Прымыканне*** – такі від граматычнага падпарадкавання, які заснаваны толькі на семантычнай суаднесенасці галоўнага і залежнага кампанентаў.

Асноўная функцыя такой сувязі – ахарактарызаваць дзеянне ці прадмет або асобу.

Асаблівасці прымыкання:

● форма залежнага кампанента нязменная, таму яна ніяк не ўказвае на сувязь з пэўным словам, напр.: *Састарэла вёска даўно, на пенсійную выйшла абслугу* (В. Зуёнак);

● сувязь усталёўваецца на сэнсавай аснове, граматычна ж залежнасць перадаецца з дапамогай інтанацыі і парадку слоў: *Прыступкі знізу разбурыліся – Прыступкі разбурыліся знізу*;

● сувязь слабая, непрадказальная і неабавязковая. (Выключэнне: абавязковае прымыканне інфінітыва да інфармацыйна недастатковых дзеясловаў – фазісных, мадальных: *пачало змяркацца, перастала дажджыць, мусіў ісці, хацелася плакаць, любіў пагаманіць*.);

● граматычны сродак сувязі – толькі лексіка-граматычнае значэнне слоў: *крыху супакоіўся, імкненне стварыць, вельмі соладка, бяжыць спатыкаючыся, ішоў сустрэць, рады ўбачыць*.

Размяжоўваюць два тыпы прымыкання – уласнае і іменнае.

Уласнае прымыканне вызначаецца тады, калі ў якасці залежнага кампанента выступаюць граматычна нязменныя словы: прыслоўі, дзеепрыслоўі, інфінітыў: *вёска наводдаль, льецца не сціхаючы, умеў чытаць і не мог пісаць*, а таксама нязменныя прыметнікі-запазычанні: *мока, хакі, беж, морзе, нета, плісэ* і некаторыя інш., што маюць абмежаваную спалучальнасць: *колер хакі, спадніца плісэ, вага брута*.

Іменнае прымыканне вызначаецца тады, калі ў якасці залежнага кампанента ўжываецца прыназоўнікава-склонавая застылая форма назоўніка, якая прымыкае да галоўнага слова і мае не прадметнае, а акалічнаснае значэнне: *Без часу ліст на дрэвах жоўк* (Я. Колас), *Крычалі да хрыпаты, да знямогі* (К. Крапіва), *Толькі пад вечар вярнуліся мы ў хату* (В. Вольскі). Як іменнае прымыканне варта разглядаць і спалучэнні назоўніка з назоўнікам ці цэлым спалучэннем тыпу: *газета «ЛіМ», часопіс «Arche», станцыя Радашкавічы, горад Мёры, шаша Брэст – Масква, прынцып «не нашкодзь»*.

## Спецыфіка сувязі кіравання ў беларускай мове

***Кіраванне*** – такі «спосаб падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні, пры якім галоўнае слова для рэалізацыі сваіх семантыка-граматычных асаблівасцей спалучаецца з той ці іншай склонавай ці прыназоўнікава-склонавай формай пэўнага значэння» [*Бандарэнка*, 1975, *55*]: *узяць крэдыт, ладзіць з супрацоўнікамі, працаваць над сабой, лыжка солі, спагадлівы да людзей.*

Асноўная функцыя такой сувязі – граматычна выражаць розныя сэнсавыя суадносіны дадзенага прадмета з дзеяннем, прадметам, прыметай, з'явай і пад., параўн.: *перадаць сябру, ...з сябрам, для сябра, ад сябра, праз сябра* і пад.

Асаблівасці кіравання:

● пры змяненні галоўнага кампанента форма залежнага застаецца нязменнай: *кажам* <u>*пра забаву*</u>, *кажам* <u>*пра забаву*</u>, *кажуць* <u>*пра забаву*</u>, *казалі* <u>*пра забаву*</u>;

● у якасці залежнага могуць выступаць толькі словы з прадметным значэннем (назоўнікі і субстантываваныя словы), напр., у выказванні *І восень верасовымі смыкамі адлётную сыграла журавам...* (В. Зуёнак) імі будуць: *сыграла* <u>*журавам*</u>, *сыграла* <u>*смыкамі*</u>, *сыграла* <u>*адлётную*</u>;

● сувязь абавязковая і прадказальная (для моцнага кіравання; у вышэйпрыведзеным паэтычным радку гэта *сыграла журавам, сыграла адлётную*); можа быць непрадказальнай, але абавязковай (для слабага кіравання – *сыграла смыкамі*);

● граматычныя сродкі сувязі: а) канчатак: *пішу курсав*<u>*ую*</u>; б) канчатак і прыназоўнік: *клапаціцца* <u>*пра*</u> *бацьк*<u>*ой*</u>; в) толькі прыназоўнік (пры нязменных словах): *запрасіць* <u>*на*</u> *танга, паехаць* <u>*на*</u> *метро.*

Адрозніваюць кіраванне паводле:

● наяўнасці прыназоўніка – непасрэднае, або беспрыназоўнікавае, і пасрэднае, або прыназоўнікавае;

● характару сувязі – моцнае і слабае[17];

● часцінамоўнай прыналежнасці галоўнага слова – прыдзеяслоўнае, прысубстантыўнае, прыад'ектыўнае, прыадвербіяльнае.

М о ц н а е   к і р а в а н н е – гэта такая падпарадкавальная сувязь, пры якой галоўны кампанент патрабуе ад залежнага форму аднаго пэўнага склону: *ссыпаць зерне, даслаць тэлеграму, не канспектаваць лекцый, баяцца навальніцы, выпіць кубачак кавы.*

[17]Тэрміны былі ўведзены рускім мовазнаўцам А. М. Пяшкоўскім [*Пешковский*, 1956, *285*].

Моцнае кіраванне, на думку некаторых сінтаксістаў, можа быць не толькі пры пераходных, але і пры (1) непераходных дзеясловах: *усміхацца яму, сустракацца з каляжанкай, хвалявацца ад невядомага, здзіўляцца з яе, раіцца з бацькам, радавацца сустрэчы;* (2) непераходных дзеясловах з прасторавым значэннем (пры спалучэннях з якімі прыстаўка дубліруецца ў прыназоўніку): *дайсці да хаты, з'ехаць з гары, адштурхнуцца ад берага*; (3) дзеясловах са значэннем жадання, дасягнення, асцярогі: *жадаць шчасця, марыць пра падарунак, дабівацца рашэння*; (4) назоўніках, суадносных з дзеясловамі: *клопат пра блізкіх, выратаванне жыцця, вызваленне ад захопнікаў;* (5) спалучэннях з колькаснымі адносінамі: *дзесяць рабочых, частка лесу, вагон пяску, гэтулькі гора, кубак чаю*; (6) спалучэннях назоўніка з назоўнікам: *дазвол на паляванне, права на працу, загад рэктара* [*Яўневіч*, *Сяцко*, 1987, *9*; *Ляпёшкін*, 1989, *14*].

Слабае кіраванне адзначаецца тады, калі залежны кампанент, як правіла, можа мець розныя граматычныя варыянты: *пайсці... па сястру, з сястрой, ад сястры, да сястры* і інш.

Праблема моцнага і слабага кіравання непасрэдна датычыцца выпадкаў інтэрферэнцыі – памылак, заснаваных на змешванні дзвюх моў, у нашым выпадку – рускай і беларускай, што абумоўлена сітуацыяй двухмоўя. Каб пэўным чынам папярэдзіць памылковае ўжыванне залежнага слова пры найбольш частотных дзеясловах, а таксама актуалізаваць кадыфікаваную спалучальнасць у беларускай мове, прапануецца параўнанне яе з рускай мовай (табл. 3–4).

*Табліца 3*

**СПЕЦЫФІКА КІРАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ**
**Ў ПАРАЎНАННІ З РУСКАЙ**

| Беларуская мова | | Руская мова | |
|---|---|---|---|
| беспрыназоўнікавае | | | |
| *адцурацца*<br>*выракацца*<br>*зрачыся*<br>*пазбавіцца*<br>*пазбыцца*<br>*сцерагчыся*<br>*унікаць* | (род. скл.)<br>**каго/чаго?** | отрекаться<br>–//–<br>отречься<br>избавиться<br>–//–<br>беречься<br>избегать | *от* кого/чего?<br><br>кого/чего? |
| *апанаваць*<br>*даглядаць*<br>*перапрашаць* | (він. скл.)<br>**каго/што?** | овладеть<br>ухаживать<br>извиняться | кем/чем?<br>*за* кем/чем?<br>*перед* кем? |

| Беларуская мова | | Руская мова | |
|---|---|---|---|
| беспрыназоўнікавае | | | |
| ***! думаць сам сабе***<br>***! чытаць сам сабе***<br>***! гаварыць сам сабе***<br>***! смяяцца сам сабе*** | | *! думать про себя*<br>*! читать про себя*<br>*! говорить про себя*<br>*! смеяться про себя* | |
| *выбачаць*<br>*дараваць*<br>*прабачаць*<br>*(па)дзякаваць*<br>*дапячы* | (дав. скл.)<br>**каму?** | простить<br>–//–<br>–//–<br>благодарить<br>донять | (род. пад.)<br>кого? |
| прыназоўнікавае | | | |
| *падобны* | (род. скл.)<br>**да каго/чаго?** | похожий | (вин. пад.)<br>*на* кого/что? |
| *глуміцца*<br>*жартаваць*<br>*здзекавацца*<br>*злараднічаць*<br>*кпіць* | **з каго/чаго?** | глумиться<br>шутить<br>издеваться<br>злорадствовать<br>издеваться | (тв. пад.)<br>*над* кем/чем? |
| *насміхацца*<br>*пакепліваць*<br>*смяяцца*<br>*цешыцца*<br>*дзівіцца* | **з каго/чаго?** | насмехаться<br>подтрунивать<br>смеяться<br>радоваться<br>удивляться | (тв. пад.)<br>*над* кем/чем?<br>кому/чему?<br>(дат. пад.) |
| *заляцацца* | **да каго?** | ухаживать | *за* кем? |
| *(за)хварэць*<br>*хворы* | (він. скл.)<br>**на што?** | (за)болеть<br>болен | (тв. пад.)<br>чем? |
| *гаварыць*<br>*ведаць*<br>*дбаць*<br>*думаць*<br>*казаць*<br>*клапаціцца*<br>*успамінаць*<br>*нагадаць* | **пра каго/што?** | говорить<br>знать<br>беспокоиться<br>думать<br>говорить<br>заботиться<br>вспоминать<br>напомнить | (предл. пад.)<br>*о* ком/чем? |
| (він. скл.)<br>***! звярнуцца <u>на</u> адрас***<br>***! гаварыць <u>на</u> карысць***<br>***! некалькі разоў <u>на</u> тыдзень***<br>***! спатыкацца <u>на</u> <камень>*** | | *! обратиться **<u>по</u>** адресу (дат. пад.)*<br>*! говорить **<u>в</u>** пользу (вин. пад.)*<br>*! несколько раз **<u>в</u>** неделю (вин. пад.)*<br>*! споткнуться **<u>о</u>** <камень>(вин. пад.)* | |
| *(а)жаніцца*<br>*(с)пазнацца* | (тв. скл.)<br>**з кім?**<br>**з чым?** | жениться<br>испытать | *на* ком?<br>что? |

*Заканчэнне табл. 3*

| Беларуская мова | | Руская мова | |
|---|---|---|---|
| беспрыназоўнікавае | | | |
| *журыцца*<br>*непакоіцца*<br>*нудзіцца*<br>*плакаць*<br>*смуткаваць*<br>*сумаваць*<br>*тужыць* | (месн. скл.)<br>**па кім/чым?** | грустить<br>беспокоиться<br>тосковать<br>плакать<br>печалиться<br>скучать<br>горевать | (предл. пад.)<br>*о* ком/чем? |

*Табліца 4*

## РАЗЫХОДЖАННІ Ў КІРАВАННІ, ЗВЯЗАНЫЯ СА ЗНАЧЭННЕМ ПРЫНАЗОЎНІКАВА-СКЛОНАВЫХ СПАЛУЧЭННЯЎ

| Беларуская мова | Руская мова |
|---|---|
| при ўказанні на велічыню, памер | |
| ● **па + дав. скл.**<br>*капуста па вядру, снег па лапцю*<br>*гурбы па мядзведзю*<br>*кавалкі па метру* | ● **с + вин. пад.**<br>*капуста с ведро, снег с лапоть*<br>*сугробы с медведя*<br>*куски с метр* |
| пры абазначэнні прадмета як мэты руху | |
| ● **па + він. скл.**<br>*прыйсці па разумную параду*<br>*хадзіць па шчаўе* | ● **за + тв. пад.**<br>*прийти за умным советом*<br>*ходить за щавелем* |
| пры ўказанні на нейкую прычыну | |
| ● **праз + він. скл.**<br>*праз вас мяне пакараюць*<br>*праз глупства можна памерці*<br>● **на + він. скл.**<br>*на маю думку*<br>*на свой манер*<br>● **ад + род. скл.**<br>*сказаў ад наіўнасці*<br>*забываўся ад старасці*<br>● **паводле + род. скл.**<br>*паводле загаду*<br>*паводле рашэння*<br>● **з + род. скл.**<br>*з гэтай прычыны* | ● **из-за + род. пад.**<br>*из-за вас меня накажут*<br>*из-за глупости можно умереть*<br>● **по + дат. пад.**<br>*по моему мнению*<br>*по своей манере*<br><br>*сказал по наивности*<br>*забывал по старости*<br><br>*по приказу*<br>*по решению*<br><br>*по этой причине* |

*Заканчэнне табл. 4*

| Беларуская мова | Руская мова |
|---|---|
| пры абазначэнні роду дзейнасці, прафесіі | |
| ● **за + він. скл.**<br>*быць за старшыню*<br>*не прызнаваць за студэнта*<br>*быць за жонку*<br>*узяць за жонку*<br>*узяць за дачку* | ● **тв. пад.**<br>*быть председателем*<br>*не считать студентом*<br>*быть женой*<br>*= жениться*<br>*= удочерить* |
| пры ўказанні на прадмет, з якасцю / уласцівасцю якога робіцца параўнанне | |
| ● **за + він. скл.**<br>*больш за тыдзень, ярчэй за сонца*<br>*старэйшы за сябра*<br>*пазней за ўсіх, перш за ўсё* | ● **род. пад.**<br>*больше недели, ярче солнца*<br>*старше друга*<br>*позже всех, прежде всего* |
| пры абазначэнні адлегласці | |
| ● **за + він. скл.**<br>*стаяць за два крокі ад сцежкі*<br>*недзе кіламетраў за 277* | ● **в + предл. пад.**<br>*стоять в двух шагах от тропинки*<br>*где-то километрах в 277* |
| для ўказання на (дакладны або прыблізны) час | |
| ● **а + месн. скл.**<br>*Сход а чацвёртай гадзіне*<br>*Прыйшоў а самай поўначы* | ● **в + вин. пад.**<br>*Собрание в четыре часа*<br>*Пришел в самую полночь* |
| пры абазначэнні месца | |
| ● **па + месн. скл.**<br>*па высокім небе*<br>*па хатах і дварах* | ● **по + дат. пад.**<br>*по высокому небу*<br>*по домам и дворам* |
| пры абазначэнні з'явы, падзеі, пасля якіх што-небудзь адбываецца | |
| ● **па + месн. скл.**<br>*прыйсці па захадзе сонца*<br>*па вясне пачынаецца лета*<br>*зрабіць па абедзе* | ● **после + род. пад.**<br>*прийти после заката солнца*<br>*после весны начинается лето*<br>*сделать после обеда* |
| пры ўказанні на блізкасць ад якога-небудзь месца | |
| ● **пры + месн. скл.**<br>*сядзець пры дарозе*<br>*крыніца пры лесе* | ● **у + род. пад.**<br>*сидеть у дороги*<br>*родник у леса* |

«Калі спрадвечныя традыцыйныя канструкцыі дайшлі да нас, то гэта сведчыць пра іх устойлівасць у беларускай мове» [*Каўрус*, 1997, *306*], таму і нам варта карыстацца гэтым моўным багаццем. Так, рускамоўнай канструкцыі з прыназоўнікам *па* адпавядае шэраг сінанімічных уласных беларускіх канструкцый беспрыназоўнікавых ці з прыназоўнікамі *на, у, пад, паводле* і інш., напр.: *у гэты час, на гэты час, пад гэты час, гэтым часам; жыць у суседстве, у суседзях, суседзямі, па-суседску; з ініцыятывы, пры ініцыятыве, ініцыятывай, паводле ініцыятывы; пад прымусам, прымусам, з-пад прымусу, з прымусу, прымусова; паводле паходжання, з паходжання, паходжаннем; высокі ростам, доўгі на рост, вышэйшы на рост, вялікі ў росце* і інш. [*Каўрус*, 1997; *Сяцко*, 2002].

## ЛІТАРАТУРА


*Арашонкава*, *Лемцюгова*, *1991*: Арашонкава Г. У, Лемцюгова В. П. Кіраванне ў беларускай і рускай мовах: Слоўнік-даведнік. Мн.: Вышэйш. шк., 1991. 303 с.

*Бандарэнка*, *1975*: Бандарэнка Т. П. Да пытання аб кіраванні як адным са спосабаў падпарадкавальнай сувязі ў словазлучэнні // Бел. лінгвістыка. 1975. Вып. 8. С. 46–55.

*Булахаў*, *1959*: Булахаў М. Г. Словазлучэнне // Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Сінтаксіс. Мн.: Дзярж. вуч.-пед. выд-ва, 1959. С. 5–26.

*Бурак*, *1987*: Бурак Л. І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн.: Вышэйш. шк., 1987. 320 с.

*Гурскі*, *1939*: Гурскі К. І. Сказ і яго структура // Сінтаксіс беларускай мовы. Мн.: Выд-ва АН БССР, 1939. С. 5–12.

*Каўрус*, *1997*: Каўрус А. Сінтаксіс адкрыты і схаваны // Полымя. 1997. № 5. С. 290–307.

*Клюсаў*, *1972*: Клюсаў Г. Н. Уводзіны // Клюсаў Г. Н., Юрэвіч А. Л. Сучасная беларуская пунктуацыя. Мн.: Вышэйш. шк., 1972. С. 3–46.

*Лепешаў*, *2002*: Лепешаў І. Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік. Гродна: ГрДУ, 2002. С. 185–192.

*Лёсік*, *1926*: Лёсік Я. Сынтакс беларускае мовы. Менск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. 255 с.

*Ляпёшкін*, *1998*: Ляпёшкін В. У. Словазлучэнне // Беларуская мова: У 2 ч. / Пад агул. рэд. Л. М. Грыгор'евай. Мн.: Вышэйш. шк., 1998. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 5–20.

*Міхневіч*, *1965*: Міхневіч А. Я. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове. Мн.: Навука і тэхніка, 1965. 114 с.

*Михневич*, *1990*: Михневич А. Е. Словосочетание // Кривицкий А. А. и др. Белорусский язык для говорящих по-русски / А. А. Кривицкий, А. Е. Михневич, А. И. Подлужный. Мн.: Вышэйш. шк., 1990. С. 220–243.

*Наркевіч*, *1966*: Наркевіч А. І. Словазлучэнне // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 7–9.

*Наркевіч*, *1972*: Наркевіч А. І. Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове: Структурна-семантычнае апісанне. Мн.: Выд-ва БДУ, 1972. 360 с.

*Падгайскі*, *1971*: Падгайскі Л. П. Словазлучэнне ў беларускай мове. Мн.: Вышэйш. шк., 1971. 192 с.

*Пешковский*, *1956*: Пешковский А. М. Русский синтаксис в научном освещении. М.: Учпедгиз, 1956. 512 с.

*Рагаўцоў*, *2001*: Рагаўцоў В. І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні. Мн.: Універсітэцкае, 2001. 199 с.

*Сцяцко*, *2002*: Сцяцко П. Сінтаксічныя нормы і іх парушэнні // Сцяцко П. Культура мовы. Мн.: Тэхналогія, 2002. С. 85–95.

*Чеснокова*, *1980*: Чеснокова Л. Д. Связи слов в современном русском языке. М.: Просвещение, 1980. 110 с.

*Яўневіч*, *Сцяцко*, *1987*: Яўневіч М. С., Сцяцко П. У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. Мн.: Вышэйш. шк., 1987. 272 с.

# СПАЛУЧАЛЬНАСЦЬ

## З гісторыі развіцця паняцця валентнасці

Паняцце валентнасці ў лінгвістыцы параўнальна новае, паколькі атрымала сваё развіццё ў 50-я гг. XX ст. У замежнай лінгвістыцы яно акрэслілася нямецкім мовазнаўцам Карлам Бюлерам, які ўказваў, што «словы пэўнага класа слоў могуць мець у сваім атачэнні адну ці некалькі *адкрытых пазіцый*, якія мусяць быць запоўнены словамі іншых вызначаных класаў» [Цыт. па: *Степанова*, *Хельбиг*, 1978, *141*]. Сваё пашырэнне ідэя атрымала пасля выхаду ў свет кнігі французскага лінгвіста Люсьена Тэньера «Асновы структурнага сінтаксісу» (1959), дзе ён абгрунтаваў паняцце валентнасці і ўвёў для яго сам тэрмін. Гэтую з'яву ў мове Тэньер параўноўваў з вядомай уласцівасцю атама ў хіміі і па аналогіі назваў яе *валентнасць*. «Дзеяслоў можна ўявіць сабе ў выглядзе своеасаблівага атама з кручкамі[18], што можа прыцягваць да сябе большую ці меншую колькасць актантаў у залежнасці ад большай ці меншай

[18] «Вобраз «атама з кручкамі» (les atomes crochus) падказаны Тэньеру тэорыяй Дэмакрыта, які сцвярджаў, што атамы – самыя дробныя непадзельныя элементы – праз няроўнасці сваёй канфігурацыі («кручкі») счэпліваюцца між сабой, утвараючы целы. У французкай мове выраз les atomes crochus стаў фразеалагізмам са значэннем 'узаемная сімпатыя', 'падабенства, роднасць душ'» [*Гак*, 1988, *618*].

колькасці кручкоў, якімі ён валодае, каб утрымліваць гэтыя актанты пры сабе. Колькасць такіх кручкоў, што ёсць у дзеяслова, і, значыць, колькасць актантаў, якімі ён здольны кіраваць, і складае сутнасць таго, што мы будзем называць ***валентнасцю*** дзеяслова» [*Теньер*, 1988, *250*]. Варта зазначыць, што і само паняцце, і тэрмін Л. Тэньер адносіў толькі да дзеяслова і вызначаў валентнасць як здольнасць дзеяслова прымаць і ўтрымліваць пры сабе пэўную колькасць актантаў («удзельнікаў»)[19]. Ён выключаў з валентнасных адносінаў «сірканстанты» (акалічнасці – тыя абставіны, што спадарожнічаюць дзеянню)[20].

«З пункту гледжання значэння актант утварае такое адзінства з дзеясловам, што часта без яго значэння дзеяслоў быў бы няпоўным. Сірканстант, наадварот, з'яўляецца элементам цалкам факультатыўным» [*Теньер*, 1988, *141*], параўн.: *Антон вып'е вады* і *Антон крочыць па праспекце*. Калі колькасць актантаў пры дзеяслове абмежаваная і заўсёды лёгка вылічальная (ад 0 да 3 – дзеяч, аб'ект, адрасат), то такой вызначанасці бракуе акалічнасным характарыстыкам – сірканстантам: «Сказ можа не мець ніводнага сірканстанта, а можа мець іх у неабмежаванай колькасці» [*Теньер*, 1988, *138*].

Паняцце валентнасці Л. Тэньер выкарыстоўваў для сінтаксічнай характарыстыкі дзеясловаў, у выніку чаго ім вылучаны чатыры разнавіднасці.

● Безвалентныя – дзеясловы з нулявой валентнасцю. Паводле свайго значэння «дзеясловы без актантаў выражаюць працэс, які разгортваецца сам па сабе і ў якім няма ўдзельнікаў. Гэта датычыцца ў першую чаргу дзеясловаў, што абазначаюць атмасферныя з'явы» [*тамсама*, *121*], напр.: *Дажджыць; Світае*; *Распагодзілася* і пад., што традыцыйна кваліфікуюцца як безасабовыя.

● Аднавалентныя – дзеясловы з адной валентнасцю, напр.: *Ён спіць. Машына зламалася. Жабка скача. Дзіця плача* і пад., што традыцыйна кваліфікуюцца як непераходныя. Паводле сваёй семантыкі такія дзеясловы абазначаюць стан ці працэс унутры суб'екта.

● Двухвалентныя – дзеясловы з дзвюма валентнасцямі, напр.: *Ён пабіў руку. Яна чытае кнігу. Вада змыла сляды.* Такога кшталту дзеясловы выражаюць значэнне дзеяння, якое вымагае свайго пераходу на нейкі аб'ект, таму традыцыйна кваліфікуюцца як пераходныя.

[19] Актанты – гэта заўсёды назоўнікі ці іх эквіваленты [*Теньер*, 1988, *117*].

[20] Сірканстанты – гэта заўсёды прыслоўі (часу, месца, спосабу і пад.) ці іх эквіваленты [*тамсама*, *118*].

● Трохвалентныя – дзеясловы з трыма валентнасцямі, кшталту: *Ён даў мне часопіс. Я дзякую табе за каву*. Паводле свайго значэння гэтыя дзеясловы выражаюць такое дзеянне, якое не толькі пераходзіць на аб'ект, але і камусьці адрасуецца. У традыцыйнай граматыцы для іх не існуе спецыяльнага тэрміна, таму іх адносяць таксама да пераходных.

Разумеючы валентнасць як колькасць удзельнікаў, якімі здольны кіраваць дзеяслоў, Тэньер тым самым сцвердзіў *патэнцыяльную спалучальнасць дзеяслова*, а таму валентнасць можа быць рэалізаванай, а можа і не быць. «Неабходна адзначыць, што зусім неабавязкова, каб усе валентнасці якога-небудзь дзеяслова былі занятыя адпаведнымі актантамі, каб яны былі заўсёды, калі так можна сказаць, насычаныя. Некаторыя валентнасці могуць аказацца незанятымі, ці свабоднымі. Так, двухвалентны дзеяслоў *спяваць* можа быць ужыты без другога актанта, параўн.: *Альфрэд спявае* і *Альфрэд спявае песню*» [*тамсама*, *250*].

Прыкладна ў той жа час (1948) паняцце і тэрмін *валентнасць* з'явіліся ў рускім моваэнаўстве і звязваюцца з імем С. Д. Кацнельсона. Аднак, у адрозненне ад Л. Тэньера, С. Д. Кацнельсон разумеў валентнасць значна шырэй – як агульную спалучальную магчымасць слова, а не толькі дзеяслова: «Пад валентнасцю мы маем на ўвазе значэнне слова, якое падразумяваецца, ці ўказанне, што імпліцытна ў ім змяшчаецца, на неабходнасць папаўнення яго словамі пэўных тыпаў у сказе» [*Кацнельсон*, 1987, *20–21*]. Ім жа адзначалася, што, зыходзячы з гэтага пункту гледжання, валентнасць маюць не ўсе паўназначныя словы, а «толькі тыя з іх, якія самі па сабе даюць адчуванне непаўнаты выказвання і патрабуюць дапаўнення ў выказванні» [*тамсама*, *21*]. Метафарычна вучоны вызначаў валентнасць як «уласцівасць значэння, у якім нібы змяшчаюцца «пустыя месцы» ці «рубрыкі», якія неабходна запоўніць, як рубрыкі ў анкеце» [*тамсама*].

Разам з тым С. Д. Кацнельсон, як і Л. Тэньер, указваў, што «месца» пры дзеяслове трэба адмяжоўваць ад акалічнаснай характарыстыкі дзеяслоўнага дзеяння. «Паколькі кожнае дзеянне адбываецца пры вядомых абставінах месца, часу і г. д., то ўказанні на гэтыя акалічнасці могуць спадарожнічаць кожнаму дзеянню і шырэй – прэдыкатыўнаму слову. Таму ад акалічнасцей часу, месца і г. д. трэба строга адрозніваць выпадкі, калі ўказанні на час, месца і г. д. з'яўляюцца неабходнымі «дапаўненнямі» да прэдыката. Параўн. дзеясловы, што абавязкова патрабуюць часавага дапаўнення: *Ён правёў там дзве гадзіны; Ён прачакаў яго цэлую гадзіну*; адпа-

ведна могуць быць прэдыкаты прасторавага дапаўнення: *Ён прайшоў полем; Ён знаходзіўся тады на Урале* [*тамсама*, *26*].

Такім чынам, калі першапачаткова пад валентнасцю разумелася толькі здольнасць дзеяслова далучаць да сябе пэўныя класы слоў, то ў цяперашні час такая здольнасць экстрапалюецца (пашыраецца) на іншыя часціны мовы. Больш таго, акрамя вылучанай Л. Тэньерам сінтаксічнай валентнасці, размяжоўваюць валентнасць лагічную і семантычную.

## Спалучальнасць і валентнасць, іх тыпы

Валентнасць (ад лац. *valentia* 'сіла') як здольнасць уступаць у сінтаксічныя сувязі з іншымі словамі ёсць толькі адна з праяў спалучальнасці – фундаментальнай уласцівасці моўных адзінак. А значыць, паняцце валентнасці больш вузкае, чым паняцце спалучальнасці. Спалучальнасць адлюстроўвае сінтагматычныя адносіны паміж моўнымі адзінкамі пры іх спалучэнні. ***Спалучальнасць слова*** – «гэта здольнасць слова злучацца з пэўным колам іншых слоў у адпаведнасці з нормамі, уласцівымі для дадзенай мовы, а таксама сукупнасць канкрэтных лексічных адзінак, з якімі злучаецца слова пры абазначэнні пэўнай сітуацыі» [*Шчэрбін*, 1994, *527*].

Адрозніваюць спалучальнасць розных тыпаў у залежнасці ад:

- пазіцыі – *кантактная* (пры супалажэнні моўных адзінак) і *дыстантная* (на адлегласці);
- фактараў спалучальнасці – *абумоўленая* (вызначае наяўнасць у моўных элементах адрозных рысаў) і *адвольная* (вызначаецца толькі прынятай нормай);
- узроўню мовы – *фармальная* і *семантычная* [*Гак*, 1990, *483*]. Між тым дыферэнцыяцыя ў залежнасці ад узроўню мовы прадугледжвае чатыры тыпы спалучальнасці: рэферэнтную, семантычную, сінтаксічную і лексічную [*Шчэрбін*, 1994, *528*].

Вылучэнне А. Я. Міхневічам рэферэнтнай спалучальнасці (лац. *referens* 'які адносіць, супастаўляе') абумоўлена тым, што любое вербальнае спалучэнне – толькі вынік тых адносінаў паміж рэаліямі, што могуць быць у пазамоўнай сітуацыі. «Рэферэнтную спалучальнасць слоў натуральнай мовы нельга зафіксаваць у выглядзе сукупнасці правілаў, бо яна вызначаецца спалучальнасцю ўяўленняў аб пазамоўнай рэчаіснасці, якія ў сваю чаргу адлюстроўваюць сувязі і суадносіны саміх прадметаў, працэсаў і з'яў рэальнасці і абмежаваны грамадскім вопытам носьбіта мовы і моўнага калектыву

ў цэлым. Гэты вопыт пастаянна змяняецца, і іменна з гэтай прычыны ў звычайнай мове нельга дакладна вызначыць усе магчымыя выпадкі ўжывання слова» [*Міхневіч*, 1976, *138*].

Семантычная спалучальнасць слоў з'яўляецца вынікам дзеяння ў мове і маўленні закона «семантычнага дапасавання», г. зн. кампаненты спалучэння не павінны мець супярэчлівых сем» [*Гак*, 1990, *483*]. Так, пры дзеясловах са значэннем ментальнага дзеяння тыпу: *гаварыць, размаўляць, меркаваць, верыць, спадзявацца* і інш. суб'ектам могуць быць толькі адушаўлёныя назоўнікі; пры дзеясловах разбурэння: *ламаць, крышыць, бурыць* і пад. у якасці аб'екта выкарыстоўваюцца канкрэтныя назоўнікі: *аловак, дрэва, горад* і інш. Калі закон «семантычнага дапасавання» не вытрымліваецца, то парушаецца норма. Але такое парушэнне можа быць і наўмысным: па-першае, як пераноснае значэнне, параўн.: *чэрствы хлеб – чэрствы чалавек, чалавек жыве – мара жыве;* а па-другое, як сродак мастацкай выразнасці, кшталту: *Мая душа супрацiўлялася, бо верыла і тым жыла, не чэрсцвела і не ламалася – была такою, як была* (С. Грахоўскі).

Сінтаксічная спалучальнасць слова – гэта «сукупнасць і ўласцівасці патэнцыяльна магчымых пры ім сінтаксічных сувязяў, набор і ўмовы рэалізацыі сінтаксічных сувязяў» [*Котелова*, 1975, *81*].

Лексічная спалучальнасць слоў «па сутнасці з'яўляецца індывідуальнай характарыстыкай гэтага слова, таму што адлюстроўвае яго асабістую здольнасць спалучацца не з любым словам, а толькі з некаторымі» [*Шчэрбін*, 1994, *528*], параўн. спалучальнасць слоў з семай 'жыллё': *сабачая будка, мядзведжы бярлог, пчаліны вулей, мышыная нара, птушынае гняздо, бабровая хатка* і пад. Лексічная спалучальнасць сведчыць пра пэўную «выбіральнасць» лексем, а менавіта: *крэсла* можа быць *з дубу, з пластмасы, з саломы, з каменю ...*, але не *з мукі, з пуху, з вады...* .

Валентнасць, у сваю чаргу, адрозніваюць трох тыпаў:

- актыўная / пасіўная;
- семантычная / сінтаксічная;
- аблігаторная / факультатыўная.

***Актыўная валентнасць*** разумеецца як «здольнасць слова мець пры сабе пэўныя адкрытыя пазіцыі, якія запаўняюцца (павінны ці могуць) іншымі залежнымі ад яго словамі» [*Степанова, Хельбиг*, 1987, *170*], напр.: *трымаць коней, ставіць адзнаку, ад'езд дэлегацыі, прыгажосць далягляду, колер вачэй.* ***Пасіўная валентнасць*** – гэта «здольнасць залежнага слова далучацца да га-

лоўнага, <u>запаўняць</u> пры ім адкрытую пазіцыю» [*тамсама, 170–171*]. Словы, што валодаюць актыўнай валентнасцю, называюцца носьбітамі валентнасці, залежныя словы – валентныя партнёры. Значыць, у названых прыкладах носьбіты валентнасці – *трымаць, ставіць, ад'езд, прыгажосць, колер*, а партнёры – *коней, адзнаку, дэлегацыі, далягляду, вачэй.*

Некаторыя часціны мовы (назоўнікі, прыметнікі) валодаюць як актыўнай, так і пасіўнай валентнасцю, бо могуць быць і носьбітам валентнасці, і партнёрам: *высокі будынак* і *вышыня будынка, здольны студэнт* і *здольны да навукі*. Дзеяслоў жа, як правіла, – носьбіт валентнасці, і толькі ў асобных выпадках, калі ён выступае не ў асабовай, а ў неазначальнай форме, можа быць партнёрам: *належыць прыйсці, неабходна затрымацца, павінны даслаць.*

***Абавязковая (аблігаторная) валентнасць*** прадугледжвае абавязковую наяўнасць адкрытых пазіцый пры пэўных словах для рэалізацыі іх значэння. Да такіх слоў адносяцца перадусім дзеясловы з «няпоўнай прэдыкацыяй» (У. Р. Гак): *мець, ставіць, даваць, рабіць, трымаць, знаходзіцца* і інш.; аддзеяслоўныя назоўнікі: *прыход, пад'езд, афармленне, паведамленне* і да т. п. ***Факультатыўная (неабавязковая) валентнасць*** такія «месцы» таксама мае, але іх запаўненне неабавязковае, хаця магчымае.

Для выяўлення аблігаторных і факультатыўных кампанентаў лінгвістамі прапанаваны «тэст на рэдукцыю» (апушчэнне). Калі пры апушчэнні нейкага члена сказа сам сказ застаецца граматычна правільным, то кампанент факультатыўны, а калі сказ будзе аграматычным, незразумелым, то кампанент аблігаторны, параўн.:

*Брат наведаў нас. – *Брат наведаў.*
*Ён з'еў цукеркі. – *Ён з'еў.*
*Ён есць цукеркі. – *Ён есць.*
*Сястра чытае кнігу брату. – Сястра чытае кнігу. – Сястра чытае.*

Але як аблігаторныя, так і факультатыўныя актанты замацаваныя ў пазіцыйным плане дзеяслова і іх колькасць прадвызначаная.

Ужо С. Д. Кацнельсон указваў, што неабходна адрозніваць валентнасць фармальную і змястоўную. ***Фармальная валентнасць*** звязана з пэўнай словаформай і абумоўлена граматычнай сістэмай пэўнай мовы, больш таго, яна «можа вагацца нават у межах валентнасці аднаго дзеяслова ў залежнасці ад назоўніка, з якім

дадзены дзеяслоў спалучаецца» [*Кацнельсон*, 1987, *22*], параўн.: *паступаць ва універсітэт*, але *паступаць на факультэт; паехаць у Расію*, але *паехаць на Далёкі Усход*, а таксама з нямецкай мовай: *Я віншую свайго тату з днём нараджэння* і *Ich gratuliere meinem Vater zum Geburtstag*; *Маці ганарыцца сваімі дзецьмі* і *Die Mutter ist stolz auf ihre Kinder* (у беларускай мове *віншаваць* **каго** (він. скл.) **з чым** (тв. скл.), а ў нямецкай двойчы адзін склон *gratulieren* ***wem*** (дав. скл.) ***wozu*** (дав. скл.); *ганарыцца* ***кім*** (тв. скл.) – *stolz sein* ***auf*** (він. скл.)).

***Змястоўная валентнасць*** залежыць выключна ад значэння слова, а значыць, марфалогіі не падпарадкоўваецца [*Кацнельсон*, 1978, *21*]. Так, можна *віншаваць* чалавека, сябра, калегу, дзіця ..., але не *дрэва, камень, аловак, падлогу*... і пад.

У цяперашні час часцей карыстаюцца тэрмінамі сінтаксічная (=фармальная) і семантычная, ці логіка-семантычная (=змястоўная) валентнасць[21]. Спрошчана можна сказаць, што ***лагічная валентнасць*** – гэта пазамоўныя адносіны паміж паняційным зместам; яна мае універсальны характар, бо вызначаецца характарыстыкамі з'яў, падзей, дзеянняў, прадметаў рэальнага свету. ***Семантычная валентнасць*** выяўляецца на аснове сумяшчальнасці і спалучальнасці семантычных кампанентаў (прымет, сем); яна «адлюстроўвае той факт, што словы (у якасці носьбітаў валентнасці) патрабуюць пэўных кантэкстных партнёраў з пэўнымі семантычнымі прыметамі і выключаюць іншыя кантэкстныя партнёры з іншымі семантычнымі прыметамі» [*Степанова*, *Хельбиг*, 1982, *155*]. Так, напр., дзеясловы маўлення прадугледжваюць у якасці суб'ектаў людзей, дзеясловы бачання ў якасці аб'ектаў – канкрэтныя прадметы. Такім чынам, яна абмяжоўвае выбіральнасць, што рэгулюе сумяшчальнасць двух слоў. ***Сінтаксічная валентнасць*** прадугледжвае «аблігаторную ці факультатыўную запаўняльнасць ад-

[21] Параўнайце арыгінальны падыход М. У. Усеваладавай, што адрознівае тры тыпы валентнасці: лексічную, лексіка-граматычную і граматычную. Граматычная валентнасць праяўляецца ў граматыцы: у дапасаванні *новую кнігу, у старой хаце*, дзе форма імя «патрабуе» адпаведную форму прыметніка; ці ў нематываваным кіраванні, дзе прыналежнасць дзеяслова да пэўнага класа вызначае выбар розных формаў імя нават пры наяўнасці аднолькавай лексічнай валентнасці: *паведаміць* пра што **каму** – *праінфармаваць* пра што **каго** (сема адрасата). Лексічная валентнасць – гэта ўласцівасць слова як слоўнікавай адзінкі. Лексіка-граматычная – гэта ўласцівасць формы слова адкрываць пазіцыі для кантэкстпартнёраў пэўнай семантыкі. Акрамя таго, лексічная і лексіка-граматычная валентнасць маюць яшчэ тры ўзроўні: лагічны, семантычны і сінтаксічны [*Всеволодова*, 2000, *361–372*].

крытых пазіцый пэўнымі актантамі і рэгулюе іх сінтаксічна-марфалагічную рэпрэзентаванасць часцінамі мовы ў пэўнай форме» [*тамсама*, *156*]. Калі семантычная валентнасць у розных мовах практычна тоесная, то сінтаксічная часта адрозная. Параўн.: бел. *Ён чакае сяброўку;* рус. *Он ожидает подругу*; польск. *Czeka na koleżankię*; ням. *Er wartet auf die Freundin* (у беларускай і рускай мовах вінавальны склон беспрыназоўнікавы, а у польскай і нямецкай – з прыназоўнікам); бел. *Алесь дзякуе бацьку;* рус. *Алесь благодарит отца;* польск. *Ales dziękuje ojcu;* ням. *Ales dankt dem Vater* (калі ў беларускай, польскай і нямецкай мовах давальны склон, то ў рускай – вінавальны); бел. *Яна ў вёсцы за доктара працуе;* рус. *Она в деревне доктором работает*; ням. *Sie arbeitet als Artzin in einem Dorf* (калі ў беларускай і нямецкай мовах прыназоўнікавы вінавальны, то ў рускай – беспрыназоўнікавы творны склон).

## Спалучальнасць розных часцін мовы

Усе мікра- і макратэксты якраз пабудаваныя ці будуюцца на ўласцівасці слова далучацца і быць далучаным да іншага слова ў звязным маўленні. «Здольнасць слоў утвараць словазлучэнні, структура словазлучэнняў, спосабы спалучэння слоў у іх звязаны перш за ўсё з прыналежнасцю таго ці іншага слова да якой-небудзь часціны мовы» [*Бандарэнка*, 1981, *4*]. Патэнцыяльныя магчымасці спалучэння часцін мовы ў сучаснай беларускай мове можна паказаць праз наступную табліцу (табл. 5), дзе па гарызанталі выяўляецца здольнасць спалучацца ў якасці галоўнага слова, а па вертыкалі – быць спалучаным у якасці залежнага (пад увагу браліся найбольш частотныя выпадкі спалучальнасці).

*Табліца 5*

**СПАЛУЧАЛЬНАСЦЬ ЧАСЦІН МОВЫ**

| | Наз. | Займ. | Прысл. | Дзеясл. | Лічэбн. | Прымет. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Назоўнік | + | + | + | + | + | + |
| Прыметнік | + | + | + | + | – | – |
| Дзеяслоў | + | + | + | + | – | – |
| Лічэбнік | + | + | + | – | – | – |
| Прыслоўе | + | + | + | – | – | – |
| Займеннік | + | + | – | – | + | + |

Відавочна, што дамінантнае месца па спалучальнасці сярод часцін мовы займае назоўнік, паколькі яму ўласціва не толькі падпарадкоўваць сабе кожную з часцін мовы, але і спалучацца з імі ў якасці залежнага кампанента (табл. 5). ***Спалучальнасць назоўнікаў*** можна размежаваць па тыпах далучаных слоў: а) з назоўнікамі ці іншымі «апрадмечанымі» словамі; б) з атрыбутыўнымі часцінамі мовы (прыметнікамі, дзеепрыметнікамі, парадкавымі лічэбнікамі, абагульнена-якаснымі займеннікамі); в) з марфалагічна нязменнымі словамі (інфінітывам, прыслоўем, дзеепрыслоўем).

Магчымасць спалучальнасных здольнасцей назоўніка залежыць самым непасрэдным чынам ад спосабу сувязі – беспрыназоўнікавая ці прыназоўнікавая, што ў сваю чаргу абумоўлівае прадуктыўнасць/непрадуктыўнасць пэўнай спалучальнаснай мадэлі. Так, пры назоўнікавых словазлучэннях без прыназоўнікаў самым ужывальным сярод ускосных склонаў залежнага кампанента з'яўляецца родны. «Родны прыйменны можа ўступаць у сінтаксічныя адносіны і ўтвараць словазлучэнні амаль з любым назоўнікам незалежна ад яго граматычнай прыроды і лексічнага значэння» [*Наркевіч*, 1966, *11*], а вось давальны і творны склоны выкарыстоўваюцца значна радзей, бо маюць лексічныя абмежаванні (*гасцінец дзецям, паклон зямлі, захапленне навукай, валасы вожыкам*); форма беспрыназоўнікавых вінавальнага і меснага склонаў цалкам адсутнічае ў прыйменных спалучэннях.

Пры формах прыназоўнікава-склонавых (акрамя роднага) найбольш прадстаўнічай выступае група з залежным словам у вінавальным, творным і месным склонах (*заява на звальненне, пераправа праз Дзвіну, выезд за горад, слоік з мёдам, цётка ва ўзросце, сцяжынка ў дзьмухаўцах, школьнікі на веласіпедах*); малаўжывальным ёсць давальны склон (як правіла, ва ўстойлівых спалучэннях: *сябры па няшчасцю, гарбузы па вядру*).

Пры спалучальнасці назоўніка з атрыбутыўнымі часцінамі мовы абмежаванне можа быць толькі лексічнага кшталту. Спалучальнасць назоўнікаў з нязменнымі словамі спецыфічная ў тым плане, што яна грунтуецца на сэнсе, без аніякіх граматычных паказчыкаў, а найбольш прадуктыўнай групай, хаця і лексічна абмежаванай, ёсць спалучэнні з залежным інфінітывам (*жаданне расказаць, прапанова схадзіць, здольнасць прадбачыць*); з прыслоўямі спалучальнасць назоўнікаў менш пашыраная (*вокны насупраць, праца наўздзіў*), а з дзеепрыслоўямі ўвогуле ў адзінкавых спалучэннях: *язда стоячы, сон седзячы.*

***Спалучальнасць дзеяслова*** (у тым ліку і яго формаў: інфінітыва, дзеепрыметніка, дзеепрыслоўя) пашыраецца практычна на ўсе часціны мовы, за выключэннем лічэбнікаў (і дужа вузка з прыметнікамі). Калі назоўнік – «універсальная» па сваіх спалучальнасных якасцях часціна мовы, то дзеяслоў, наадварот, маючы пэўныя абмежаванні, утварае самую вялікую па колькасці групу, сярод якой абсалютна дамінантнае месца па ўжывальнасці, разнастайнасці значэнняў займаюць спалучэнні дзеяслова з назоўнікамі і абагульнена-прадметнымі займеннікамі. Такога кшталту словазлучэнні «будуюцца ў адпаведнасці з правіламі кіравання, пры якім галоўнае слова – дзеяслоў патрабуе ад залежнага пастаноўкі ў форме пэўнага ўскоснага склону» [*Наркевіч*, 1966, *162*]. Гэтыя спалучэнні могуць быць як беспрыназоўнікавыя, так і прыназоўнікавыя і выражаць самы шырокі спектр значэнняў, ад аб'ектных да акалічнасных, напр.: *баючыся кпінаў, чытаць гадзіну, сядзець крукам, віцца матыльком, дзівіцца з мудрасці, рухацца паўз чыгунку, сустрэць на прыпынку* і інш. Адметнай рысай спалучэння дзеясловаў з атрыбутыўнымі часцінамі мовы з'яўляецца тое, што амаль усе яны ўтвараюць сінтаксічна непадзельныя спалучэнні, якія ў сказе выконваюць функцыю выказніка, кшталту: *рос дужым і вынослівым, стаяў маўклівы* і інш. [*тамсама*, *229*]. Шырока спалучаецца дзеяслоў з інфінітывам, прыслоўем і дзеепрыслоўем па правілах прымыкання, напр.: *старалася дапамагчы, сядзець далавах, квітнець штовясну, бегчы аглядаючыся* і пад.

***Спалучальнасць прыметнікаў*** досыць абмежаваная. Найбольш прадуктыўна яны спалучаюцца з назоўнікамі ва ўскосных склонах (з прыназоўнікамі і без): родным, давальным, значна менш – з творным (*багаты душой, цвёрды воляй, моцны духам*).

Што датычыць спалучальнасці з родным склонам, то гэта зусім невялікая колькасцю група, але вельмі частотная і ўжывальная, асабліва такія прыметнікі, як: *поўны, варты, годны* (сярод якіх практычна неабмежаваны ў сваёй спалучальнасці прыметнік *поўны*): *поўны радасці, варты ўвагі, годны падзякі*. Родны прыназоўнікавы ў прыметнікавых спалучэннях найчасцей перадае прычынныя ці абумоўленыя адносіны: *сіні ад холаду, маўклівы ад прыроды, кемлівы ад нараджэння; млявы ад сну, абыякавы да ўсяго, чулы да слова*.

Актыўна спалучаюцца прыметнікі з якаснымі прыслоўямі, накшталт: *афіцыйна строгі, неспадзявана добры, наўздзіў прыгожы, па-мастацку дасканалы, надзвычай высокі, дастаткова сур'ёзны* і да т. п.

Адносна спалучальнасці прыметнікаў з інфінітывам можна сказаць, што гэта магчыма толькі ў выпадках, калі прыметнік уваходзіць у семантычную групу слоў са значэннем стану [*Булахаў*, 1966, *158*] тыпу: *гатовы чакаць, схільны перабольшваць, ахвочы пасмяяцца, здольны развязаць праблему* і да т. п.

***Спалучальнасць лічэбнікаў*** вельмі абмежаваная – толькі з назоўнікамі ці займеннікамі: *дванаццаць пасажыраў, трое выпускнікоў, двое з нас.* Пэўнакалькасныя лічэбнікі ад *пяці* і вышэй, няпэўнакалькасныя і зборныя лічэбнікі ў назоўным / вінавальным склоне кіруюць назоўнікамі ці субстантывамі, а ва ўсіх астатніх – дапасуюцца як залежныя: *некалькі запалак – некалькім запалкам; двое хлопцаў – з двума хлопцамі.* Лічэбнікі *два, тры, чатыры* ў назоўным склоне выступаюць як члены непадзельнага іменна-колькаснага спалучэння [*Лапаў*, 1966, *159*].

***Спалучальнасць займеннікаў*** абумоўлена іх разрадам. Азначальныя, няпэўныя і адмоўныя могуць далучаць да сябе назоўнікі, займеннікі і лічэбнікі, але пры гэтым такія спалучэнні абмежаваныя значэннем вылучальнасці, напр.: *кожны з вас, хтосьці з дваіх, ніхто з вяскоўцаў* і да т. п.

***Спалучальнасць прыслоўяў*** таксама абмежаваная і адбываецца пераважнай часткай паводле сэнсу. Так, спалучаюцца з прыслоўямі прыслоўі, назоўнікі і займеннікі з прыназоўнікамі. І толькі формы кампаратыва, суперлятыва і адзінкавыя якасна-акалічнасныя прыслоўі могуць прадвызначаць прыназоўнікава-склонавую форму назоўнікаў ці займеннікаў [*Шуба*, 1966, *233*], напр.: *прыкра да слёз, вышэй за слуп, побач з мяжой, удваіх з табой, услед за імі* і пад.

Такім чынам, спалучальнасныя магчымасці кожнай з часцін мовы далёка не аднолькавыя, і залежаць яны ад катэгарыяльных характарыстык пэўнай часціны мовы, ад іх лексічнага значэння.

## ЛІТАРАТУРА

*Антанюк*, *1986*: Антанюк Л. А. Словазлучэнне // Беларуская граматыка: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1986. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 34–113.

*Антанюк*, *2003*: Антанюк Л. А. Словазлучэнне // Плотнікаў Б. А., Антанюк Л. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мн.: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. С. 236–258.

*Бандарэнка*, *1981*: Бандарэнка Т. П. Аднатыпныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Мн.: Навука і тэхніка, 1981. 132 с.

*Булахаў*, *1966*: Булахаў М. Г. Словазлучэнні з прыметнікам // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 92–159.

*Всеволодова, 2000*: Всеволодова М. В. Языковые механизмы // Всеволодова М. В. Теория функционально-коммуникативного синтаксиса: Учеб. М.: Изд-во МГУ, 2000. С. 358–377.

*Гак, 1988*: Гак В. Г. Комментарии // Теньер Л. Основы структурного синтаксиса. М.: Прогресс, 1988. С. 614–622.

*Гак, 1990*: Гак В. Г. Валентность // Лингвистический энциклопедический словарь. М.: Сов. энциклопедия, 1990. С. 79–80.

*Гак, 1990*: Гак В. Г. Сочетаемость // Лингвистический энциклопедический словарь. М.: Сов. энциклопедия, 1990. С. 483.

*Кацнельсон, 1987*: Кацнельсон С. Д. К понятию типов валентности // Вопр. языкознания. 1987. № 3. С. 20–32.

*Котелова, 1975*: Котелова Н. З. Значение слова и его сочетаемость. Л.: Наука, 1975. 163 с.

*Лапаў, 1966*: Лапаў Б. С. Словазлучэнні з лічэбнікамі і займеннікамі // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 159–161.

*Міхневіч, 1986*: Міхневіч А. Я. Словазлучэнні з назоўнікам // Беларуская граматыка: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1986. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 6–33.

*Михневич, 1968*: Михневич А. Е. Некоторые вопросы изучения синтаксических (подчинительных) связей слов в работах советских и чехословацких лингвистов. Вопр. языкознания. 1968. № 5. С. 106–112.

*Міхневіч, 1976*: Міхневіч А. Я. Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы. Мн.: Навука і тэхніка, 1976. 264 с.

*Наркевіч, 1966*: Наркевіч А. І. Словазлучэнні з назоўнікамі і дзеясловамі // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 10–92, 162–233.

*Наркевіч, 1972*: Наркевіч А. І. Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове: Структурна-семантычнае апісанне. Мн.: Выд-ва БДУ, 1972. 360 с.

*Норман, 1994*: Норман Б. Ю. Грамматика говорящего. СПб: Изд-во С.-Петербург. ун-та, 1994. Гл. 5. С. 86–103.

*Падгайскі, 1971*: Падгайскі Л. П. Словазлучэнне ў беларускай мове. Мн.: Вышэйш. шк., 1971. 192 с.

*Степанова, 1973*: Степанова М. Д. Теория валентности и валентный анализ. М.: МГПИИЯ, 1973. 110 с.

*Степанова, Хельбиг*, 1978: Степанова М. Д., Хельбиг Г. Части речи и проблема валентности в современном немецком языке. М.: Высш. шк.,1978. 258 с.

*Теньер, 1988*: Теньер Л. Валентность // Теньер Л. Основы структурного синтаксиса. М.: Прогресс, 1988. С. 250–297.

*Филичева, 1967*: Филичева Н. И. Понятие синтаксической валентности в работах зарубежных языковедов // Вопр. языкознания. 1967. № 2. С. 119–125.

*Шуба, 1966*: Шуба П. П. Словазлучэнні з прыслоўем // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 233–248.

*Шчэрбін, 1994*: Шчэрбін В. К. Спалучальнасць слова // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелЭн, 1994. С. 527–529.

# СІНТАКСІС СКАЗА

## *СТРУКТУРНЫ АСПЕКТ СКАЗА*

## СКАЗ І ВЫКАЗВАННЕ

### Мадэль сказа і сінтаксічныя пазіцыі

Як ужо адзначалася вышэй, сказ і выказванне – дзве адзінкі розных узроўняў: сказ як мадэль належыць мове, выказванне як адзінка зносінаў – маўленню. «Па сутнасці, паняцце сказа як адзінкі структурнага і семантычнага сінтаксісу – гэта схемы, што адлюстроўваюць тыпізаваныя (абстрагаваныя) рысы мноства рэалізацый у выказваннях. Сінтаксічная і семантычная структура робіць яго патэнцыяльнай камунікацыйнай адзінкай і ляжыць у аснове выказвання – адзінкі ўласна камунікацыйнай» [*Формановская*, 1999, *176*]. Значыць, у іх аснове, як і ва ўсіх іншых адзінак мовы, таксама ляжаць пэўныя ўзоры ўтварэння. Кожны з носьбітаў мовы будуе сваё маўленне на аснове досыць стабільных правілаў і сінтаксічных мадэляў, пад якія падводзяцца ўсе яго вусныя ці пісьмовыя выказванні, што і было адзначана ў свой час А. М. Пяшкоўскім: «...Усе мы гаворым па пэўных шаблонах, ужываючы пэўныя формы спалучэнняў, якія засвоеныя намі з дзяцінства разам са словамі і гукамі дадзенай мовы і атрыманыя ў спадчыну нашым пакаленнем ад папярэдніх пакаленняў. Гэтыя шаблоны <...> падаюцца нашай свядомасці з а ў с ё д ы, пра што б мы ні гаварылі і што б мы ні слухалі. Гэта наш с і н т а к с і ч н ы б а г а ж, узяты намі з дзяцінства ў наш жыццёвы шлях, падобны да гукавога багажу, слоўнікавага багажу, семасіялагічнага багажу (значэнняў слоў), што разам утвараюць тое, што мае назву мова <....>. Выдумляць асаблівую чыста індывідуальную сінтаксічную абалонку для нашай думкі, што адпавядала б нашаму індывідуальнаму перажыванню, мы не можам, як не можам выдумляць свае гукі, свае словы, свае значэнні, таму што

ўсё гэта значыла б выдумляць сваю мову, на якой ні з кім немагчыма было б паразумецца» [Цыт. па: *Норман*, 1994, *123*].

Такім чынам, ***сказ,*** ці ***мадэль сказа***, – гэта той адцягнены ўзор, згодна з якім будуецца любое мінімальнае самастойнае выказванне.

Ва ўмовах канкрэтнай камунікацыйнай сітуацыі на выбар той ці іншай сінтаксічнай мадэлі ўплываюць наступныя фактары:

- сама рэферэнтная сітуацыя (дэнататыўны аспект);
- спосаб уяўлення гэтай сітуацыі, бо кожны чалавек па-рознаму «бачыць» адну і тую сітуацыю (падзею, факт) (дэсігнатыўны аспект);
- упарадкаванасць (лад) самой моўнай сістэмы (структурны аспект);
- звязнасць маўлення (сінтагматычны аспект);
- камунікацыйная ўстаноўка моўцы, што ўлічвае фонавыя веды слухача/чытача, размеркаванне сацыяльных «роляў» і «масак» суразмоўцаў, канкрэтныя ўмовы зносінаў і г. д. (прагматычны аспект) [*Норман*, 1994, *146–148*].

Аднак у працэсе спараджэння тэксту ўсе ўзроўні моўнай сістэмы ўзаемадзейнічаюць і ўплываюць адзін на аднаго, таму выбар сінтаксічнай канструкцыі знаходзіцца ў пэўнай залежнасці ад выбару адзінак іншых узроўняў – лексічнага, марфемнага, нават фанемнага, напр.: *Глядзець – гэта і гадаваць, і выхоўваць на чалавека, і выводзіць на чалавека, выводзіць у людзі, выводзіць у свет і зберагаць, хаваць, пільнаваць* (Ф. Янкоўскі). Асабліва наглядная такая абумоўленасць розных узроўняў у творах мастацкай літаратуры, напр., вершаказах А. Разанава.

*Адной сваёй часткай чарот учапервaецца ў грунт, другою – уточваецца ў ваду, трэцяй – урошчваецца ў паветра, і, сам пры гэтым становячыся нечым чацвёртым, у салодкім палёце сторч галавою ўстромліваецца ў чарэнне нябёсаў* («Чарот»).

Паводле Г. А. Золатавай, мадэль сказа – гэта «мінімальна дастатковае спалучэнне ўзаемаабумоўленых сінтаксічных формаў, якія ўтвараюць камунікацыйную адзінку з пэўным тыпавым значэннем» [*Золотова*, 1973, *25*]. Пад тыпавым значэннем разумеецца сінтаксічная абстракцыя, якая абагульняе значэнне мноства выказванняў, што рэпрэзентуюць дадзеную мадэль, а таксама сінанімічных мадэляў, што маюць раўназначныя, але рознаафармленыя кампаненты. Так, тыпавое значэнне ‘суб’ект і яго стан’ прадстаўляецца шэрагам выказванняў, пабудаваных паводле адной мадэлі: *Яму сумна; Ёй страшна; Маці адзінока; Дзіцяці холадна; Сыну балюча; Бацьку няёмка + Хвораму не па сабе* і да т. п.

Агульнапрынятымі сімваламі для абазначэння структурных схем з'яўляюцца лацінскія: N, $V_f$, Pron, Adv, Adj, Inf, Praed і да т. п. Так, структурнай схеме (сінтаксічнай мадэлі) $N_1 - V_f$ адпавядаюць наступныя выказванні: *Дзіця забаўляецца; Прайшоў дождж; Лекцыя закончылася; Сонца свеціць; Суніцы саспелі*; схеме $V_{f3s}$ – *Не спіцца; Дажджыць; Пазалачала; Пацягнула дымам*; Praed – *Холадна; Ціха; Ветрана;* $N_1$ – *Ноч. Халодная зямлянка. Перастрэлка. Цішыня* (П. Броўка) і г. д.

На жаль, у беларусістыцы і да сёння не існуе хоць якога-небудзь апісання структурных мадэляў сказаў і іх тыпавога значэння, таму дапусцім, што іх прыкладна столькі ж, як у рускай мове, каля 40.

Агульная колькасць такіх мадэляў цалкам залежыць ад таго, колькі кампанентаў уключаецца ў яе структуру. Большасць лінгвістаў абмяжоўвае колькасць членаў сінтаксічнай мадэлі двума, што адпавядае прэдыкатыўнаму мінімуму, але некаторыя дапускаюць наяўнасць 3-, 4- і нават 5-кампанентных структурных схем. Такія разыходжанні дазваляюць гаварыць, што ў лінгвістычнай навуцы існуюць два адрозныя пункты гледжання на мадэль сказа. Згодна з адной з іх, структурная схема – гэта адцягнены ўзор, паводле якога можа быць пабудавана граматычна дастатковая прэдыкатыўная адзінка, і ў такім выпадку структурная схема тоесная прэдыкатыўнаму мінімуму (дзейнік + выказнік ці толькі адзіны галоўны член). Другое меркаванне грунтуецца на тым, што мадэль сказа – гэта структура, якая валодае не толькі граматычнай, але і інфармацыйнай дастатковасцю, і ў гэтым выпадку ў структурную схему ўключаюцца і пашыральнікі граматычнай асновы, бо яны лічацца інфармацыйна аблігаторнымі. Зразумела, што першы падыход вызначае меншую колькасць мадэляў, але яны больш адцягненыя, таму што ім адпавядае большая колькасць выказванняў. Другі падыход павялічвае ў шмат разоў колькасць структурных схем, але вызначае іх больш канкрэтна. У адносінах да гэтых двух падыходаў можна гаварыць пра паняцце мінімальных і пашыраных структурных схем, прычым пашыраныя схемы будуюцца на аснове мінімальных (параўн. іх суаднесенасць у табл. 6).

Любую сінтаксічную мадэль утвараюць функцыянальна-сінтаксічныя пазіцыі. «Сказ – гэта пэўная пазіцыйная структура; кожнае пазіцыйнае звяно гэтай структуры прадстаўляе пазіцыі слоўнай формы» [Ломтев, 1958, *46*]. У адносінах да слова «функцыянальна-сінтаксічная пазіцыя выступае ў ролі стабільнага аператара, ячэйкі ў сінтаксічнай структуры выказвання. Трапляючы ў яе, слова атрымлівае статус словаформы і разам з тым права ўдзельнічаць у фарміраванні камунікацыйнай адзінкі» [*Норман*, 1994, *157*].

*Табліца 6*

**СУАДНЕСЕНАСЦЬ СТРУКТУРНАЙ СХЕМЫ З ВЫКАЗВАННЕМ**

| Мінімальная структурная схема | Прыклады | Пашыраныя структурныя схемы |
|---|---|---|
| $N_1 - V_f$ | *Вучні малююць.*<br>*Вучні пішуць дыктоўку.*<br>*Вучні навучаюцца геаметрыі.*<br>*Вучні размясціліся ў класе.*<br>*Вучні смяяліся цішком.* | $N_1 - V_f$<br>$N_1 - V_f - N_4$<br>$N_1 - V_f - N_3$<br>$N_1 - V_f - N_6$<br>$N_1 - V_f - Adv.$ |

Як правіла, кожнай сінтаксічнай пазіцыі адпавядае сваё кола лексікі. Так, у ролі дзеяча часцей выступае назоўнік адушаўлёны, а пазіцыю інструмента займае назоўнік з канкрэтным прадметным значэннем; калі ж у гэтыя пазіцыі трапляюць іншыя словы, адбываецца «семантычны зрух», метафарызацыя, чым і карыстаюцца паэты і пісьменнікі, ствараючы незвычайную спалучальнасць: *Стукае бэзам у вокны вясна. Стукае восень дажджом у акно* (П. Макаль). Тут двайная метафарызацыя, паколькі пазіцыя дзеяча і пазіцыя інструмента замешчаны неўласцівымі ім сінтаксемамі, параўн. таксама: *Неба маланкай расшпілена* (Э. Акулін); *Электразваркаю маланка // Крамсае ўвесь прасцяг глухі* (П. Макаль); *Пазяхае раніца ветрыкам нявыспаным* (Л. Геніюш).

Такім чынам, у канкрэтнай маўленчай рэалізацыі мы заўсёды маем справу з выказваннем, якому ўласцівая суаднесенасць з рэчаіснасцю, пэўнае лексічнае напаўненне і прасадычнае афармленне.

## Паняцце прэдыкатыўнасці

Любы сказ, незалежна ад свайго складу і будовы, характарызуецца прэдыкатыўнасцю[22]. ***Прэдыкатыўнасць*** (ад лац. *praedicatio* ‘выказванне’), «ці выказальнасць, у агульным разуменні – гэта тая сэнсава-граматычная «сіла», якая робіць слова або спалучэнне слоў сказам» [*Клюсаў*, 1972, *18*]. Функцыянальную прызначанасць дадзенай катэгорыі бачаць у тым, што яна адносіць змест выказвання да рэчаіснасці. Услед за В. У. Вінаградавым неабходнымі элементамі-складнікамі прэдыкатыўнасці мовазнаўцы

[22]Тэрмін уведзены ў русістыку В. У. Вінаградавым [*Виноградов*, 1955, *264*].

называюць катэгорыі мадальнасці, асобы і часу[23] [*Булахаў*, 1959, *9*; *Гурскі*, 1962, *14*], якія набываюць у кантэксце шырокае сінтаксічнае значэнне. Прэдыкатыўнасць – гэта граматычнае значэнне сказа, а структурная схема – гэта яго граматычная форма.

***Мадальнасць*** (ад лац. *modus* ‘мера, спосаб’) – семантыка-граматычная катэгорыя, што грунтуецца на спосабах перадачы адносін таго, хто гаворыць (моўцы), да выказвання і выказвання да рэчаіснасці. Змест сказа можа адпавядаць сапраўднай рэчаіснасці або можа не адпавядаць ёй, чым і вызначаецца супрацьпастаўленне двух асноўных мадальных значэнняў – мадальнасці рэальнай (прамой) і мадальнасці нерэальнай (ірэальнай).

У беларусістыцы самай пашыранай з’яўляецца канцэпцыя, што проціпастаўляе *мадальнасць аб’ектыўную* і *суб’ектыўную*. Гэты пункт гледжання адлюстраваны ў энцыклапедыі «Беларуская мова» [*Міхневіч*, 1994, *326*]. Аб’ектыўная мадальнасць кваліфікуецца як адносіны зместу выказвання да рэчаіснасці, – што ўласціва любому сказу, – праз значэнне рэальнасці (сінтаксічны цяперашні, прошлы і будучы часы абвеснага ладу) і ірэальнасці (сінтаксічны ўмоўны лад: пажаданне, пабуджэнне); суб’ектыўная мадальнасць – як адносіны моўцы да зместу паведамлення, – што характарызуе не кожны сказ, бо сродкі суб’ектыўнай мадальнасці «ўтвараюць як бы другі пласт мадальных значэнняў у сэнсавай структуры выказвання, таму што яны накладаюцца на граматычны грунт сказа, што ўжо мае мадальнае значэнне» [*Виноградов*, 1950, *70*]. Гэтая канцэпцыя якраз і зыходзіць ад В. У. Вінаградава, што ўпершыню сказаў пра адрозненне мадальнасці, заключанай у форме самога прэдыката, і мадальнасці, што перадаецца іншымі сродкамі [*тамсама*, *67*].

Разам з тым такое размежаванне досыць штучнае, таму што любое выказванне мае свайго аўтара, і ён не можа быць абыякавы да таго, што ім паведамляецца. Таму іншы падыход да сістэматызацыі мадальных значэнняў быў прапанаваны А. Я. Міхневічам [*Михневич*, 1990] і развіты ў даследаванні Н. Ю. Паўлоўскай [*Паўлоўская*, 2001]. Аўтары гэтай гіпотэзы зыходзяць з таго, што ў мадальнасці знаходзяць выражэнне не толькі характарыстыкі верагоднасці / неверагоднасці, але і воля, імкненні моўцы, а таму гэта дае ўсе падставы абмежаваць кола мадальных значэнняў

[23] У беларускім мовазнаўстве асобнымі навукоўцамі паняцце прэдыкатыўнасці звужаецца толькі да дзвюх катэгорый – мадальнасці і тэмпаральнасці, бо яны лічаць, што існуе шэраг сказаў, якім бракуе выражэння адносінаў да асобы [*Бурак*, 1987, *33*; *Бурака*, 1989, *28*; 1998, *21*].

дзвюма вялікімі групамі – *мадальнасцю верагоднасці* і *мадальнасцю волевыяўлення*, што заснаваныя на адносінах паміж моўцам і з'явай (прадметам паведамлення).

Так, А. Я. Міхневіч зазначае, што ў адным выпадку моўца канстатуе з'яву і пэўным чынам ацэньвае яе (тут з'ява ўздзейнічае на моўцу: «моўца ← з'ява»), таму мадальныя значэнні грунтуюцца вакол ідэі пэўнасці, верагоднасці падзеі, і маюць наступную градацыю: канстатацыя – акцэнтаваная канстатацыя – магчымасць – меркаванне – дапушчэнне – сумненне [*Михневич*, 1990, *306*]. Мадальнасць верагоднасці рэалізуецца праз «складаны набор рознаўзроўневых моўных сродкаў, аб'яднаных значэннем упэўненасці/няўпэўненасці ведаў моўцы пра рэчаіснасць. Сюды ўключаюцца граматычныя катэгорыі індыкатыва, кандыцыяналіса, мадальныя словы (*напэўна, здаецца, верагодна, канечне, вядома* і да т. п.), мадальныя часціцы (*так, наўрад ці, менавіта, напэўна* і інш.), прэдыкаты меркавання (*думаць, лічыць, сумнявацца* і інш.), мадальныя дзеясловы і прэдыкатывы (*магчы, можна* і інш.), парадак слоў (*Рублёў сорак атрымаем*), фразеалагізаваныя адзінкі (*на самай справе, само сабой зразумела* і да т. п.), кампаненты прасодыі» [*Паўлоўская*, 1995, *15*].

У другім выпадку моўца актыўна ўздзейнічае на з'яву («моўца → з'ява»), таму ядром мадальных значэнняў ёсць ідэя волевыяўлення, імператыўнасці, што рэалізуецца праз загад (прадпісанне), прымушэнне (заахвочванне, просьба), перасцярогу (параду), неабходнасць, жаданне (пажаданне) [*Михневич*, 1990, *306*]. Сродкамі выражэння такога кшталту мадальнасці з'яўляюцца «рознаўзроўневыя моўныя адзінкі са значэннем адрасаванага ці неадрасаванага волевыяўлення, арыентаванага на ажыццяўленне якога-небудзь дзеяння. Перш за ўсё, гэта выказванні з перфарматыўнымі дзеясловамі (*раю, дазваляю, прапаную* і інш.), выказванні з формамі дзеяслоўнага індыкатыва (*Возьмеш з сабою падручнік*), кан'юнктыву (*Ты б зайшоў да мяне*), з прэдыкатыўнымі прыслоўямі (*Трэба ісці*), мадальнымі дзеясловамі (*Хачу ўсяго дамагчыся сам*), часціцамі, выклічнікамі (*Кыш адсюль*), транспанаванымі ў сферу імператыва» [*Паўлоўская*, 1995, *17*].

Мадальнасць цесна звязана з тэмпаральнасцю, бо значэнне рэальнасці/ірэальнасці паведамлення заўсёды праяўляецца ў плане пэўнага часу – цяперашняга, прошлага ці будучага.

***Тэмпаральнасць*** (***часавасць***) – «гэта семантычная катэгорыя, што адлюстроўвае ўспрыняцце і асэнсаванне чалавекам часу абазначаемых сітуацый і іх элементаў у адносінах да моманту маўлен-

ня моўцы ці іншага пункту адліку» [*Бондарко*, 1990, *5*]. Паводле меркавання В. У. Вінаградава, сінтаксічны час, нароўні з сінтаксічнай асобай, – неад'емны складнік паняцця прэдыкатыўнасці. Калі марфалагічнае значэнне часу ўласціваe формам дзеяслова як формам слова, што структурна выражаецца сродкамі марфем, то сінтаксічны час – катэгорыя ўзроўню сказа, якая мае свае ўласна фармальныя сродкі выражэння: уласна структурную схему сказа як зыходны член апазіцыі, што выражае сінтаксічны цяперашні час, і дзеяслоўнае слова (знамянальнае і службовае) з яго сродкамі словазмянення. Праз такое адрозненне марфалагічнага і сінтаксічнага часу граматычнымі формамі дзеяслова ва ўмовах кантэксту могуць выражацца такія часавыя значэнні, якія ніяк не суаднесеныя з дадзеным марфалагічным значэннем дзеяслоўнай формы. Параўн. абумоўленае кантэкстам ужыванне сінтаксічнага цяперашняга (што перадаецца марфалагічнай формай цяперашняга часу дзеяслова) для абазначэння дзеяння ў будучым (*Заўтра еду ў Кракаў; Сёння я яшчэ студэнт, заўтра я выкладчык*) ці ў прошлым (*Іду я ўчора на заняткі*), ужыванне сінтаксічнага прошлага (выражаецца марфалагічнай формай прошлага часу дзеяслова) для абазначэння будучага (*Да пабачэння, я пайшоў*) і інш. [*Михневич*, 1990, *245–248*]. У гэтых выпадках пераноснае ўжыванне сінтаксічных часавых значэнняў (сінтаксічны цяперашні ў значэнні будучага ці ў значэнні прошлага, сінтаксічны прошлы ў значэнні будучага і пад.) абумоўлена кантэкстам.

***Персанальнасць (асабовасць)*** – «гэта семантычная катэгорыя, што характарызуе ўдзельнікаў абазначаемай сітуацыі ў адносінах да ўдзельнікаў сітуацыі маўлення – перадусім да моўцы» [*Теория*, 1991, *5*]. Як і катэгорыю мадальнасці і тэмпаральнасці, яе нельга зводзіць да адпаведнай марфалагічнай катэгорыі асобы дзеяслова. «Аднесенасць да асобы неабходна разглядаць шырока, маючы на ўвазе не толькі перасячэнне ўдзельнікаў абазначаемай сітуацыі з удзельнікамі сітуацыі маўлення, але і неперасячэнне, г. зн. адносіны сітуацыі і яе ўдзельнікаў да навакольнага асяроддзя» [*тамсама*, *6*].

Сінтаксічная катэгорыя асобы, разам з катэгорыямі мадальнасці і часу, выражае аднесенасць выказвання да рэчаіснасці праз сітуацыю маўленчых зносінаў, якая ўтвараецца суаднесенасцю ўдзельнікаў. А таму пад сінтаксічнай катэгорыяй асобы варта «разумець адпаведнасць суб'екта – носьбіта дзеяння, стану, прыметы, пра якія паведамляецца ў сказе, – аднаму з трох асоб удзельнікаў/няўдзельнікаў зносінаў» [*Золотова*, 1973, *158*]. З гэ-

тага вынікае, што сказы *Ты чакай мяне доўга. Ты чакай мяне мудра і проста* (Г. Бураўкін); *Гасподзь! Затрымацца дазволь на гэтай грэшнай зямлі* (Р. Барадулін); *Не сніся мне. Навошта снішся мне?* (Н. Мацяш), нягледзячы на марфалагічныя, структурна-сінтаксічныя і мадальныя адрозненні, аб'яднаныя сінтаксічнай катэгорыяй 2-й асобы: суб'ект дзеяння, стану, прыметы ў іх тоесны адрасату маўлення.

Такім жа чынам аб'ядноўваюцца сказы з сінтаксічнай катэгорыяй 1-й асобы (абазначаюць тоеснасць моўцы і суб'екта дзеяння / стану): *Бег да цябе праз буран і імжу. // Поўз да цябе з летуценнем і скрухай. // Болей маўчаць не магу. // Я скажу* (Г. Бураўкін); *Мне з табой бы лепей размінуцца, // Міма праляцець на паўкрыла...* (Г. Бураўкін). Сінтаксічная катэгорыя 3-й асобы выяўляецца ў выказваннях, дзе гаворыцца пра няўдзельніка зносінаў, напр.: *Ёсць словы, ёсць пачуцці, ёсць падзеі. Складаецца з іх нашае жыццё*; *Дзве душы без сустрэч доўга-доўга жылі. І ў кожнай было сваё сонца* (А. Камоцкі); *Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому* (Я. Купала).

Ужо В. У. Вінаградавым адзначалася: «Катэгорыя асобы як структурны элемент сказа з'яўляецца патэнцыяльнай. Яна выражаецца, акрамя асабовых формаў дзеяслова, таксама асабовымі займеннікамі, напр. давальным склонам у спалучэнні з інфінітывам, а ў некаторых канструкцыях, напр., інфінітыўных ці іменных, адвербіяльных і выклічнікавых з імператыўным значэннем – інтанацыяй. Вядома, што ў т. зв. безасабовых ці бессуб'ектных сказах катэгорыя асобы выяўляецца негатыўна <...>» [*Виноградов*, 1955, *270*]. Відавочна, што сінтаксічнае разуменне катэгорыі асобы выводзіць яе за межы толькі марфалагічнага ўвасаблення.

Катэгорыя прэдыкатыўнасці – граматычнае значэнне сказа – рэалізуецца праз сінтаксічныя формы часу і ладу, што ў сукупнасці складаюць ***сінтаксічную парадыгму сказа***. Поўная парадыгма ўключае: формы цяперашняга, прошлага і будучага часу абвеснага ладу, а таксама формы ўмоўнага і загаднага ладу. Зыходнай лічыцца форма цяперашняга часу абвеснага ладу.

Пры структурна-семантычнай класіфікацыі сказаў традыцыйна зыходзяць з некалькіх параметраў і размяжоўваюць іх паводле

- структуры:
  – простыя і складаныя;
  – двухсастаўныя, аднасастаўныя, бессастаўныя;
  – развітыя і неразвітыя;

– поўныя і няпоўныя;
– ускладненыя і няўскладненыя;
- характару прэдыкатыўных адносінаў:
  – сцвярджальныя і адмоўныя;
- мэты выказвання:
  – апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя;
- эмацыянальнай афарбоўкі:
  – няклічныя і клічныя [*Бурак*, 1987, *37–50*].

## Вербацэнтрычная тэорыя сказа

Элементы сінтаксічнай структуры аб'яднаныя паміж сабой пэўнымі адносінамі, і ў пераважнай колькасці выказванняў дамінуе падпарадкавальная сувязь. Тым не менш ёсць цэнтр, вакол якога і групуюцца ўсе кампаненты; пытанне ў тым, што лічыць такім цэнтрам. Меркаванні лінгвістаў адносна гэтай праблемы разыходзяцца. Адзін пункт гледжання (Я. Ф. Карскі, Ц. П. Ламцёў, І. К. Германовіч, Т. П. Бандарэнка, М. Г. Булахаў, М. І. Гурскі, В. У. Ляпёшкін, Н. В. Гаўрош і інш.) грунтуецца на тым, што дзейнік у сказе і назоўнік сярод часцін мовы – цэнтр сказа, яму падпарадкоўваецца выказнік. На сённяшні дзень гэтае меркаванне найбольш пашыранае ў беларускай сінтаксічнай навуцы; згодна з гэтым падыходам прэдыкатыўная сувязь паміж дзейнікам і выказнікам разглядаецца як дапасаванне.

Другі пункт гледжання (Л. І. Бурак, М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко, Л. П. Падгайскі, М. В. Абабурка і інш.) звязаны з традыцыйнай тэорыяй членаў сказа, дзе дзейнік і выказнік разглядаюцца як галоўныя члены сказа, якія каардынуюцца паміж сабой, а таму з'яўляюцца раўназначнымі.

Трэцяя канцэпцыя – вербацэнтрычная, ці «дзеясловацэнтрычная», – з'яўляецца найбольш пашыранай у сучасным мовазнаўстве, але мае адзінкавых прыхільнікаў у беларускім мовазнаўстве, прынамсі, сярод аўтараў вучэбных дапаможнікаў (напр., Г. Н. Клюсаў). Згодна з ёй цэнтральнае месца ў сінтаксічнай структуры сказа займае дзеяслоў як часціна мовы і выказнік як член сказа. «Дзейнік у сказе найбольш статычны элемент: ён толькі называе тое, пра што будзе гаварыцца; ён, так сказаць, задае тэму, развіццё якой знаходзіцца якраз у выказніку. Дзейнік абмежаваны ў сваім называльным значэнні; выказнік, наадварот, мае цэлую гаму значэнняў – быцця, стану, дзеяння, прыметы, уласцівасці, прыналежнас-

ці, мадальнасці і камунікацыйных мэт (загад, пажаданне, пытанне і г. д.)» [*Клюсаў*, 1972, *36*]. Даследчык акцэнтуе ўвагу і на тым, што дзейнік можа мець у сваім падпарадкаванні толькі азначэнне, у той час як выказнік «валодае больш моцнымі разгалінаванымі словазлучальнымі сувязямі. Строга кажучы, дзейнік з'яўляецца азначальным словам да выказніка» [*тамсама*, *37*]. Пацвярджэннем такому меркаванню служыць метад «згортвання» выказвання: любы дзеяслоўны сказ, што мае састаў дзейніка і састаў выказніка, можна згарнуць толькі да дзеяслова-выказніка, таму што пры «ступеньчатай залежнасці адных слоў ад іншых кожнае азначальнае (непасрэдна залежнае) слова можна лічыць як бы ўключаным у азначаемае» [*тамсама*], параўн.: *У зялёным плашчы наросхрыст па гаях вецер чэрвеньскі ходзіць* (Н. Мацяш) → *Па гаях вецер ходзіць* → *Вецер ходзіць* → *ходзіць*. Зыходзячы з таго, што «сказавасць» выражаецца дзеясловам-выказнікам, які ўтрымлівае ў сабе «згорнутую прапазіцыю» (У. Р. Гак), дастаткова толькі дзеяслова, каб «выбудаваць» ланцужок залежнасцей, параўн.: *панаваць* ***хто / што над чым / кім*** → *Панаваць над душой вольны толькі Бог* (Р. Барадулін); *аднімаць* ***хто што ў каго*** → *У птахаў толькі смерць хіба адніме шлях да айчыны, да нябёс яе* (Н. Мацяш).

Вербацэнтрычная тэорыя найчасцей звязваецца з імем Л. Тэньера[24]. Яна заключаецца ў тым, што «дзеяслоўны вузел з'яўляецца цэнтрам сказа, перадае свайго роду маленькую драму: у сказе ёсць дзеянне, а таксама асобы і акалічнасці, пры якіх гэтае дзеянне адбываецца» [*Теньер*, 1988, *117*]. Паводле яго меркавання актанты ствараюць актантную рамку дзеяслова, і дзейнік – такі ж актант, як і любое дапаўненне, а таму на ранг «ніжэйшы» за выказнік.

Звычайна ў маўленчай практыцы разгортванне сінтаксічнай структуры адбываецца аднachасова ў розных кірунках і ад розных пазіцый: *На дзень нараджэння бацька падарыў маленькай дачушцы прыгожую ляльку*. Тут выказванне заснавана на трохкампанентнай схеме 'хто *падарыў* каму што'. Але адна сінтаксема не можа кіраваць вялікай колькасцю падпарадкаваных ёй кампанентаў, бо нельга «гвалціць» магчымасці супадпарадкавання, параўн. некаторую штучнасць выказвання: *У вочы зверху з хлева са страхі гнала сухі белы пыл, як дым* (І. Пташнікаў).

[24] Вербацэнтрычны погляд на структуру сказа распрацоўваўся і да Тэньера. Так, у русістыцы гэта канцэпцыя ў канцы XIX ст. была выказана А. А. Дзмітрыеўскім, які лічыў, што дзеяслоў утрымлівае ў сабе макет сказа, а ў французскім моваздаўстве ўпершыню сказ з маленькай драмай параўнаў А. Сешэ (1926).

Такім чынам, усе функцыянальна-сінтаксічныя пазіцыі ў складзе мадэлі падпарадкоўваюцца прэдыкату-дзеяслову і семантычна ім вызначаюцца, але разгортванне (запаўненне патэнцыяльных валентнасцей) абумоўлена самой пазамоўнай сітуацыяй і стаўленнем моўцы да гэтай падзеі. Так, у беларускай мове дзеяслоў *мазаць* у значэнні ‘пакрываць тонкім слоем’ прадугледжвае тры пазіцыі сінтаксем – дзеяча, аб’екта і інструмента: хто – што – чым = *Маці намазала хлеб маслам*. Гэты ж дзеяслоў са значэннем ‘няўмела маляваць ці пісаць’ адкрывае пры сабе толькі дзве пазіцыі – дзеяча і аб’екта: хто – што = *Ты толькі паперу мажаш!* Калі ж дзеяслоў мае значэнне ‘пэцкаць пры дотыку’, то яго задавальняе адна пазіцыя – дзеяча: хто/што = *Стрыжань мажа*.

Незалежна ад таго, колькі элементаў уваходзіць у сказ, сінтаксічная мадэль як моўная адзінка прынцыпова «двухпавярховая»: узровень вяршыні (дзеяслова-выказніка) і ўзровень падпарадкаваных яму пазіцый [*Норман*, 1994, *143*].

## ЛІТАРАТУРА


*Бондарко*, *1990*: Бондарко А. В. Темпоральность // Теория функциональной грамматики: Темпоральность. Модальность. Л.: Наука, 1990. С. 5–58.

*Булахаў*, *1959*: Булахаў М. Г. Просты сказ // Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Сінтаксіс. Мн.: Дзярж. вуч.-пед. выд-ва, 1959. С. 36–99.

*Бурака*, *1989*: Бурака Н. І. Сказ // Беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя / Пад рэд. Я. М. Адамовіча. Мн.: Вышэйш. шк., 1989. С. 28–38.

*Виноградов*, *1950*: Виноградов В. В. О категории модальности и модальных словах // Виноградов В. В. Избранные труды: Исследования по русской грамматике. М.: Наука, 1975. С. 53–87.

*Виноградов*, *1955*: Виноградов В. В. Основные вопросы синтаксиса предложения // Виноградов В. В. Избранные труды: Исследования по русской грамматике. М.: Наука, 1975. С. 254–294.

*Гурскі*, *1962*: Гурскі М. І., Булахаў М. Г., Марчанка М. Ц. Беларуская мова: У 2 ч. Мн.: Выд-ва Мін-ва адукацыі, 1962. Ч. 2: Сінтаксіс. 265 с.

*Золотова*, *1973*: Золотова Г. А. Очерк функционального синтаксиса русского языка. М.: Наука, 1973. 351 с.

*Карский*, *1956*: Карский Е. Ф. Белорусы. Язык белорусского народа. М.: Изд-во АН СССР, 1956. Вып. 2–3. С. 321–392.

*Клюсаў*, *1972*: Клюсаў Г. Н. Уводзіны // Клюсаў Г. Н., Юрэвіч А. Л. Сучасная беларуская пунктуацыя. Мн.: Вышэйш. шк., 1972. С. 3–46.

*Ломтев*, *1958*: Ломтев Т. П. Основа синтаксиса современного русского языка. М.: Учпедгиз, 1958. 166 с.

*Михневич*, *1990*: Михневич А. Е. Модальность высказывания // Кривицкий А. А., Михневич А. Е., Подлужный А. И. Белорусский язык для говорящих по-русски. Мн.: Вышэйш. шк., 1990. С. 306–309.

*Михневич*, *1990*: Михневич А. Е. Синтаксическое использование времен глагола // Кривицкий А. А., Михневич А. Е., Подлужный А. И. Белорусский язык для говорящих по-русски. Мн.: Вышэйш. шк., 1990. С. 245–248.

*Міхневіч*, *1994*: Міхневіч А. Я. Мадальнасць // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелСЭ, 1994. С. 326–327.
*Норман*, *1994*: Норман Б. Ю. Грамматика говорящего. СПб.: Изд-во С.-Петербург. ун-та, 1994. Гл. 7–8. С. 122–174.
*Паўлоўская*, *1995*: Паўлоўская Н. Ю. Мадальнасць як лінгвістычная катэгорыя. Мн.: МДЛУ, 1995. 24 с.
*Паўлоўская*, *2001*: Паўлоўская Н. Ю. Катэгорыя мадальнасці ў сучаснай беларускай мове. Мн.: МДЛУ, 2001. 206 с.
*Сцяцко*, *1990*: Сцяцко П. У. і інш. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. Мн.: Вышэйш. шк., 1990. 222 с.
*Теньер*, *1988*: Теньер Л. Основа структурного синтаксиса. М.: Прогресс, 1988. 656 с.
Теория, *1991*: Теория функциональной грамматики: Персональность. Залоговость. СПб.: Наука, 1991. Гл. 1: Персональность. С. 5–86.
*Формановская*, *1999*: Формановская Н. И. Лингвистика общения: высказывание vrs предложение // Русский язык, литература и культура на рубеже веков: В 2-х ч. Братислава, 1999. Ч. 1. С. 175–176.

# ПРЭДЫКАТЫЎНАЯ АСНОВА ДВУХСАСТАЎНАГА СКАЗА

## Дзейнік, яго прызначэнне, спосабы выражэння

Член сказа – «гэта частка сказа (асобная словаформа або спалучэнне словаформаў), якая з’яўляецца матэрыяльным выражэннем (увасабленнем) элемента семантыка-сінтаксічнай мадэлі сказа. Таму член рэальнага сказа беларускай мовы з’яўляецца адначасова элементам структуры сказа і носьбітам сэнсавага значэння [*Міхневіч*, 1965, *9*].

***Прэдыкатыўная***, ці ***граматычная***, ***аснова*** простага двухсастаўнага сказа абавязкова ўключае дзве пазіцыі – дзейніка і выказніка. Ужо ў першай «Беларускай граматыцы для школ» Б. Тарашкевіч канстатаваў: «Слова, што азначае прадмет, аб якім кажацца ў сказе, называецца дзейнікам. Выказнік нешта выказвае аб дзейніку: што дзейнік робіць (дзее), або што з дзейнікам дзеецца» [*Тарашкевіч*, 1929, *39*]. Сучаснымі сінтаксістамі акцэнтуецца і іншы істотны момант: «Галоўныя члены валодаюць вельмі важнай уласцівасцю: яны не толькі называюць прадмет маўлення і характарызуюць яго, але і нарошчваюць дадатковыя адценні да свайго асноўнага лексічнага значэння. Разнастайнасць і канкурэнцыя сродкаў іх выражэння часта служыць менавіта гэтай мэце» [*Рабчинская*, 1994, *89*].

***Пазіцыя дзейніка*** ў сказе прызначана для таго, каб увесці прадмет маўлення. Тыповай і найбольш пашыранай формай выра-

жэння дзейніка ў беларускай мове з'яўляецца форма назоўнага склону субстантыва, аднак сінтаксічную пазіцыю дзейніка можа займаць любая часціна мовы і любое спалучэнне слоў (табл. 7). Думка, што ў якасці дзейніка можа быць «кожная іншая часціна мовы – пры ўмове, каб яны мысліліся, як назоўнікі йменныя ў назоўным склоне», падкрэсліваў ужо Я. Лёсік [*Лёсік*, 1926, *23*].

*Табліца 7*

**ВЫРАЖЭННЕ ПАЗІЦЫІ ДЗЕЙНІКА**

| Выражэнне дзейніка | Прыклады |
|---|---|
| ● часціны мовы, што наз. асобу/прадмет/паняцце: | |
| *назоўнікі* | *Сядзіба азвалася роднаю калыханкаю* (Ф. Янкоўскі) |
| *займеннікі* | *Усё пачалося з надзеі* <...> (П. Макаль) |
| субстантываваныя: | |
| *прыметнікі* | *У шчасці нават блізкія хутчэй забываюць адышоўшых* (М. Танк) |
| *дзеепрыметнікі* | *Перажытае адбілася і на яе характары* (Т. Хадкевіч) |
| *лічэбнікі* | *Адзін прыходзіш на свет калючы і адыходзіш – адзін* (Р. Барадулін) |
| ● нязмен. словы і формы: | |
| *інфінітыў* | *Вучыцца ніколі не позна* (Прыказка) |
| субстантываваныя: | |
| *прыслоўі* | *Куды-ы! – плыве па лугавым кіліме* (Р. Баравікова) |
| *прыназоўнікі* | *З-за, з-пад, па-за – пішуцца праз злучок* (Правілы) |
| *злучнікі* | *Але... тут знайшлося сваё «але»* (Я. Колас) |
| *часціцы* | *Хай – часціца клічная.* |
| *выклічнікі* | *Ляцела ўпартае «алё» па правадах паштовых* (М. Калачынскі) |
| *гукаперайманні* | <...> *даляцела векавое «ква-ква! ква-ква!»* (А. Карпюк) |
| *асобныя літары* | *[ч] у беларускай мове паслядоўна цвёрды гук* |
| *часткі слоў* | *Паў – пішацца праз злучок з уласнымі назвамі* (Правілы) |
| ● спалучэнні слоў: | |
| *састаўныя найменні* | *Ціхай радасцю на траве іскрылі мільярды сняжынак* (А. Карпюк) |
| *фразеалаг. звароты* | *І вось у гэтую хвіліну ў хату ўвайшоў не хто іншы як цётка Аўдоля* (А. Чарнышэвіч) |
| *сінтаксіч. непадзельныя спалучэнні* | *Нечаканае «добрае раніцы» вярнула Алега з успамінаў* (Я. Сіпакоў) |
| *сказы* | *Першы раз у жыцці яе вечнае «так трэба» змянілася на «так не трэба»* (З. Бядуля) |

«Тое, што дзейнік выражаецца любой часцінай мовы – скланяльнай, спрагальнай, нязменнай, магчыма менавіта дзякуючы таму, што ён функцыянальна прызначаны для ўводу прадмета маўлення, г. зн. таго, пра што гаворыцца ў сказе. Прадметам характарызацыі ў прынцыпе можа стаць любое слова, любая форма слова, любое спалучэнне слоў» [*Рабчинская*, 1994, *59*, *60*].

Некаторыя мовазнаўцы падаюць класіфікацыю дзейнікаў, зыходзячы са структуры іх кампанентаў [*Бурак*, 1987, *53–58*]. Калі ж разглядаць сказ як мадэль, якую ўтвараюць функцыянальна-сінтаксічныя пазіцыі, то такая класіфікацыя з'яўляецца неактуальнай, бо пазіцыю дзейніка можа займаць не толькі лексема, але і цэлае выказванне, таму няма патрэбы акцэнтаваць увагу на тым, просты гэта дзейнік, складаны ці састаўны, таму што ў любым выпадку тут не ідзе размова пра адрозненне ў перадачы лексічнага і граматычнага значэнняў, што так істотна пры вылучэнні і размежаванні тыпаў выказніка.

## Выказнік, яго прызначэнне, спосабы выражэння

Сінтаксічная ***пазіцыя выказніка*** прызначана для перадачы інфармацыі аб прадмеце маўлення.

У сучаснай беларускай мове паралельна суіснуе некалькі пунктаў гледжання на класіфікацыю выказніка паводле яго структуры. Так, размяжоўваюць выказнікі: 1) простыя (ускладненыя) і складаныя (Граматыка-66); 2) простыя (ускладненыя) і састаўныя (ускладненыя) (Яўневіч, Сцяцко); 3) простыя (ускладненыя), састаўныя і складаныя (Бурак). Між тым разыходжанні найперш закранаюць разуменне простага выказніка і ў нейкай ступені складанага.

Адно меркаванне адносна простага выказніка, упершыню выказанае ў «Сінтаксісе беларускай мовы» (1939), знайшло сваё шырокае замацаванне ў працах большасці беларускіх сінтаксістаў [*Ломтев*, 1956; *Булахаў*, 1959; *Бурак*, 1987; *Ляпёшкін*, 1989; 1998 і інш.] і першай акадэмічнай граматыцы (1966; аўтар раздзела І. К. Германовіч). Аб'ядноўвае прыхільнікаў гэтага пункту гледжання тое, што яны адрозніваюць ***просты іменны*** выказнік. «Маючы на ўвазе спосаб выражэння, выказнік недзеяслоўны не трэба змешваць па тыпу з дзеяслоўным простым выказнікам, а таму просты аднаслоўны імянны выказнік патрэбна выдзяляць у асобны тып», «будзем адрозніваць просты выказнік дзеяслоўны, просты бяззвязачны недзеяслоўны выказнік» [*Гурскі*, 1939, *22*].

Варта зазначыць, што ў Граматыцы-66 сам тэрмін *просты іменны выказнік* не выкарыстоўваецца, а толькі канстатуецца: «Просты выказнік выражаецца дзеясловам, назоўнікам, прыметнікам, лічэбнікам, займеннікам, прыслоўем, безасабова-прэдыкатыўнымі словамі, выклічнікам, фразеалагічнымі і сінтаксічна непадзельнымі словазлучэннямі» [*Германовіч*, 1966, *263*], напр.: *Свіслач, вядома, не Дняпро, не Волга* (М. Паслядовіч); *Вочы ў яго шкляныя – ад сполаху* (З. Бядуля); *Вядома, для цябе ж яна цяпер – усё* (Я. Брыль); *Косы – як крылы ластаўкі – уразлёт* (Я. Брыль); *Купец – усім купцам купец* (І. Мележ). На карысць вылучэння простага іменнага выказніка Л. І. Бурак зазначае, што «адсутнасць звязкі тут з'яўляецца літаратурнай нормай сучаснай беларускай мовы, а не сведчаннем структурнай непаўнаты сказа» [*Бурак*, 1987, *62*].

Процілеглы пункт гледжання адлюстраваны ў манаграфічным даследаванні Я. Ф. Карскага [*Карский*, 1956, *366*], другой акадэмічнай граматыцы (1986; аўтар раздзела Т. П. Бандарэнка), а таксама ў шэрагу навучальных дапаможнікаў [*Гурскі*, 1962; *Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987; *Анічэнка*, 1998 і інш.]. Ён грунтуецца на тым, што іменны выказнік можа быць «толькі састаўным» [*Сцяцко*, 1990, *34*] ці яшчэ складаным [*Бандарэнка*, 1986, *126*].

Разам з тым прыхільнікі розных меркаванняў сыходзяцца ў вылучэнні *ўскладненага простага выказніка*, які перадае дадатковыя сэнсавыя і экспрэсіўныя значэнні: інтэнсіўнасць, працяглasць, няпэўнасць ці малую інтэнсіўнасць, нечаканае, непрадбачанае дзеянне і інш. найперш праз паўтор лексем ды рознага кшталту часціцы: *Жаніліся, нараджалі дзяцей і працавалі, працавалі, працавалі* (Т. Супрановіч); *Жыла-была шчаслівая сям'я – муж, жонка і дачка* (Л. Арабей) (гл. падрабязна [*Германовіч*, 1966, *285–288*]).

*Састаўны выказнік* у залежнасці ад яго складнікаў адназначна разглядаецца як дзеяслоўны або іменны; неардынарным падыходам вылучаецца Граматыка-66, дзе гэты тэрмін увогуле не ўжываецца.

Паняцце і тэрмін *складаны выказнік* выкарыстоўваецца ў Граматыцы-66 у проціпастаўленне простаму, і яго тыпы вылучаюцца ў залежнасці ад колькасці кампанентаў-складнікаў: два, тры ці чатыры [*Германовіч*, 1966, *288–319*]. У дапаможніку Л. І. Бурака гэта трэці тып выказніка, што адрозніваецца ад простага і састаўнога. М. С. Яўневіч і П. У. Сцяцко не вылучаюць такога кшталту выказнікі ў асобную разнавіднасць, а разглядаюць іх як ускладненне састаўнога дзеяслоўнага выказніка [*Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *41*] (табл. 8).

*Табліца 8*

**ТЫПЫ ВЫКАЗНІКАЎ**

| Сінтаксіс 1939 | Граматыка 1966 | Граматыка 1986 | Бурак 1987 | Яўневіч, Сцяцко 1987 |
|---|---|---|---|---|
| • просты *дзеяслоўны* *імянны* | • просты *ускладнены* | • просты *дзеяслоўны* *ускладнены* | • просты *дзеяслоўны* *іменны* *ускладнены* | • просты *дзеяслоўны* *ускладнены* |
| • састаўны *дзеяслоўны* *імянны* | • складаны *2-камп.* *3-камп.* *4-камп.* | • састаўны *дзеяслоўны* *іменны* | • састаўны *дзеяслоўны* *іменны* | • састаўны *дзеяслоўны* *ускладнены* *іменны* |
| • двайны | | • складаны *дзеяслоўны* *іменны* | • складаны *іменны* *дзеяслоўны* *змешаны* | |

Падсумоўваючы вышэйзгаданыя меркаванні моваведаў адносна структурна-семантычных тыпаў выказніка, правамерна зрабіць выснову, што такая тэрміналагічная разнастайнасць мае перадумовай адрознае разуменне найперш ролі звязачнага кампанента, а таксама асноўнага носьбіта лексічнага значэння выказніка. Таму пры вызначэнні тыпу выказніка варта звярнуць увагу на тое, як перадаюцца ў выказніку лексічнае і граматычнае значэнні – сінтэтычна ці аналітычна, бо менавіта гэты фактар мусіць быць зыходным пры размежаванні яго тыпаў. Мэтазгодна ўлічыць, што актуальным для вылучэння простага, састаўнога і складанага выказнікаў ёсць не столькі колькасны параметр (наяўнасць аднаго, двух, трох ці чатырох яго складнікаў), колькі лексіка-граматычнае выражэнне мадальна-часавага і лексічнага значэнняў (у адным ці некалькіх кампанентах). А таму дубліраванне граматычнага значэння ў двух кампанентах тыпу *была вярнулася, будзе рады бачыць, быў ахвотнік паласавацца* ці пашырэнне і ўдакладненне лексічнага значэння ў некалькіх словах тыпу *Міхась – таленавіты юнак* наўрад ці ёсць важкай падставай для вызначэння іх як складаных выказнікаў[25].

Такім чынам, ***просты дзеяслоўны выказнік*** (у тым ліку і ўскладнены) характарызуецца тым, што і лексічнае, і граматычнае значэнні перадаюцца ў ім сінтэтычна: толькі праз адзін кампанент[26].

[25] Параўнайце з [*Бандарэнка*, 1986, *129*; *Бурак*, 1987, *68–69*].

[26] Наяўнасць двух кампанентаў не размяжоўвае выражэнне лексічнага і граматычнага значэнняў у простым дзеяслоўным выказніку, а, як правіла, другі элемент паўтарае граматычныя паказчыкі першага ці / і дадае нейкае лексічнае адценне.

У якасці такога кампанента выступаюць:

а) асабовыя формы дзеяслова абвеснага, загаднага (з часціцамі *хай, няхай, давай(це), глядзі*) і ўмоўнага (з часціцамі *бы, б*) ладоў: *Па яблыку выспелі зоры і падаюць з неба, як з дрэў* (А. Пісьмянкоў); *Хай душа баліць, хай ачысціць боль* (А. Пісьмянкоў); *Да бляску двор замёў усходні вецер* (Я. Янішчыц); *Ты глядзі напішы мне ліст*; *Шпакі на ржышчы пералятаюць з загона на загон чародкамі, нібы маленькія хмаркі* (І. Пташнікаў);

б) аналітычныя формы дзеяслова ў будучым (складаным) і прошлым (даўномінулым) часе са звязкай *быць*: *Жыве і будзе жыць Айчына* <...> (С. Законнікаў); *Быў падумаў, што кветкі пад акном прадае Гелена* (В. Карамазаў);

в) спалучэнне розных формаў дзеясловаў, што выражаюць адно паняцце: *Наш гадзіннік адцікаў-адтакаў, цень былога блукае між дрэў* (А. Пісьмянкоў); *Ідзеш-брыдзеш па гулкай вуліцы з такою сумнай галавой* (С. Законнікаў); *Жыла-была ў пушчы варона* (Я. Пархута); *Дома яны сталі жыць-пажываць у згодзе ды ў ладзе* (Казка);

г) паўторы аднаго і таго дзеяслова ці аднакарэнных дзеясловаў: *Усе хваляць яе не нахваляцца* (Казка); *Заварожвае рака. Яна плыве і плыве, і ўдзень, і ўночы, вакол усё мяняецца, а яна, раўнадушная, плыве і плыве. Як жыццё* (Л. Арабей); *Аднак мяцеліца і не думала сунімацца – сыпала і сыпала* (А. Рыбак);

д) інфінітыў: *Хлусіць, ілгаць – значыць ні сябе, ні людзей не паважаць* (народн.); *Прысеўшы побач на лаўцы каля хаты, я хацеў таксама пагладзіць сабачку, а ён – брахаць і кусацца* (Я. Брыль);

е) усечаныя дзеяслоўныя формы (экспрэсіўныя): *З гуменца бацька шусь у хату* (Я. Колас); *Кавалі стук ды грук – выкавалі тры новыя булавы* (Казка); *Яечка скацілася, трах! – і разбілася; За нары зачапіўся, плясь! – паваліўся* (А. Якімовіч); *І – скок Жабоцька смела ды ў каляіну села* (К. Крапіва);

ж) устойлівыя спалучэнні і фразеалагізмы: *Здавала лета паўнамоцтвы і адлятала ўдалячынь* (А. Пісьмянкоў); *Адшчыраваў пчаліным звонам ліпень, і жнівень вырай на крыло падняў* (С. Законнікаў); *Ужо гады на восень хіляць, хада мая – усё цяжэй* (П. Макаль); *Вадзім пайшоў на папраўку* (Т. Бондар); *А калі ён і цябе вакол пальца абвёў?* (К. Крапіва); *Не спалі ў шапку і польскія патрыёты* (М. Гарэцкі);

з) асабовая форма дзеяслова са спалучэннем *вазьмі ды і (дый)* (уласцівая гутарковай мове): *Вазьмі ды і зрабі сам; Злыя людзі вазьмі і дакажы палячцы* (М. Гарэцкі).

***Састаўны дзеяслоўны выказнік*** уключае два абавязковыя кампаненты: інфінітыў, што з'яўляецца носьбітам асноўнага лексічнага значэння, і дапаможны кампанент, які перадае граматычнае значэнне і дадатковыя адценні лексічнага.

| **Састаўны дзеяслоўны выказнік** | = | **дапаможны кампанент** граматычнае значэнне і дадатковыя адценні лексічнага | + | **інфінітыў** лексічнае значэнне |
|---|---|---|---|---|

Ускладненне дадатковымі значэннямі праз дзеяслоўную звязку (ці яе субстытут) можа быць трох тыпаў:

● фазавае (пачатак, працяг і канец дзеяння): *пачаць, стаць, пусціцца, працягваць, застацца, скончыць, перастаць, кінуць* і інш.: *Ужо дзе-нідзе з дубоў паціху пачалі падаць адзінокія лісты* (П. Пестрак); *Я кінуўся збіраць сшыткі* (Ф. Янкоўскі); *Яраш скончыў распытваць пра здароўе і змоўк* (І. Шамякін); *У нейкі момант Лера перастала слухаць* (Т. Бондар);

● мадальнае (неабходнасць, здольнасць, жаданне, намер, імкненне і да т. п.), што перадаецца праз адпаведныя дзеясловы і прэдыкатыўныя прыметнікі і дзеепрыметнікі: *хацець, магчы, мусіць, імкнуцца, старацца, намагацца, наважвацца, спрабаваць; рад, абавязаны, вымушаны, павінен* і інш.: *Я хацеў дастаць з неба зорку і апёк сабе рукі* (А. Пісьмянкоў); *Слухаю дрэвы, што прагнуць хутчэй апрануцца* (А. Пісьмянкоў); *Першыя жаўрукі спрабавалі цягнуць сваю адвечную песню – без пачатку і канца* (А. Карпюк); *Я ўжо быў гатовы ісці на нараду, але да пачатку яе заставалася яшчэ з гадзіну* (Ф. Янкоўскі);

● эмацыянальнае (ацэнка асноўнага дзеяння), што выражаецца праз дзеясловы *любіць, баяцца, марыць, летуцець, спяшацца, ненавідзець* і інш., а таксама ацэначныя назоўнікі тыпу: *аматар, ахвотнік, мастак, майстра, не зломак* і інш.: *Зямля не любіць пуставаць – жадае быць жыццёвым полем* (Я. Колас); *Як ён марыў прывезці ў палі Беларусі хоць бы частку таго, чым квітнеў Ленінград* (П. Броўка); *Я спяшаўся абтрасаць з сабраных сшыткаў ваду* (Ф. Янкоўскі); *«Вы не аматар адгадваць», – сказала Ядвіся* (Я. Колас); *І майстар быў дзяцюк есці гэтыя абаранкі* (З. Бядуля); *Ён не любіў лічыць да трох у той жахлівы, страшны год* (А. Пісьмянкоў).

Разам з тым мэтазгодна нагадаць, што інфінітыў, які ўваходзіць у склад састаўнога дзеяслоўнага выказніка, называецца *суб'ектным*, паколькі ён (разам з дапаможным кампанентам)

абазначае дзеянне суб'екта-дзеяча. Калі ж дзеянне, што перадае інфінітыў, адрасуецца іншаму суб'екту, то інфінітыў кваліфікуецца як *аб'ектны*, а таму ў сказе ён з'яўляецца не кампанентам выказніка, а дапаўненнем. А пры дзеясловах са значэннем руху выкарыстоўваецца *інфінітыў мэты*, і ён таксама не ўваходзіць у склад выказніка, а вызначаецца як акалічнасць мэты. Параўн.: *Вучні мусілі ведаць радавод полацкай дынастыі, важныя падзеі з мінуўшчыны княства і ўсяго ўсходняга славянства* (У. Арлоў); *Аляксей Пысін раіў вучыцца роднай мове ў вясковых жанчын. Раіў вывучаць не толькі лексіку, якая ў іх багацейшая і чысцейшая, чым у мужчын, але і ўвесь адмысловы склад і лад іхняй гаворкі* (А. Пісьмянкоў); *Маладая ігуменне папрасіла бацьку прыслаць да яе малодшую сястру ў навучанне грамаце, а потым таемна пастрыгла здольную вучаніцу ў манашкі* (У. Арлоў); *У 1187 годзе, рыхтуючыся да прыступу Ерусаліма, султан Саладзін за выкуп дазволіў хрысціянам пакінуць горад разам са сваімі рэліквіямі* (У. Арлоў); *Паехаў Лявон дачкі даведацца* (Ядвігін Ш.); *Спыніўся на павароце перадыхнуць* (Ф. Янкоўскі); *Яна схамянулася, хутка выйшла ў кухню гаспадарыць* <...> (І. Мележ); *Я прыходжу паслухаць світальную мудрасць дубровы* (П. Макаль).

***Састаўны іменны выказнік*** уключае таксама два абавязковыя кампаненты: іменную частку, якая з'яўляецца носьбітам асноўнага лексічнага значэння, і дапаможны кампанент-звязку, што перадае перадусім граматычнае значэнне, а таксама дадатковыя адценні лексічнага.

| **Састаўны іменны выказнік** | = | **дзеяслоў-звязка** граматычнае значэнне і дадатковыя адценні лексічнага | + | **іменная частка** лексічнае значэнне |
|---|---|---|---|---|

У якасці іменнай часткі могуць быць:
- імя (назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік),
- дзеепрыметнік,
- прыслоўе,
- спалучэнні слоў.

Дзеяслоўную звязку выражаюць:
- незнамянальны, ці адцягнены, дзеяслоў (нулявы альбо матэрыяльна выражаны): *быць (быў – будзе – быў бы – будзь – няхай будзе)*, напр.: *Расставанне – заўжды падарожжа ў нязнанае, а не на плаху* (П. Макаль); *У кожнага зорка свая, кожнаму кубак наліты* (С. Законнікаў); *Жыццё – гэта вельмі цяжка, // Асабліва калі па-новаму* (А. Камоцкі); *Еўфрасініным універсітэтам была*

*тагачасная літаратура* (У. Арлоў); *Жонка была на пятым месяцы цяжарнасці* (Л. Арабей); *Ён наогул быў вельмі хуткі на слёзы* (У. Ягоўдзік);

● паўзнамянальныя дзеясловы (з больш канкрэтным значэннем): *стаць, бываць, рабіцца, здавацца, лічыцца, называцца, станавіцца* і інш.: *Зіма ў той год выдалася марозная, ветраная* (Т. Супрановіч); *А медсёстры ды ўрачыхі Лаўрэна лічылі за бацьку* (А Карпюк); *Жыццё здаецца не такім вялікім, як у маленстве некалі ўяўляў* (С. Законнікаў);

● знамянальныя (дзеясловы, што здольныя спалучацца з іменнай прэдыкатыўнай часткай[27]): *бегчы, вяртацца, глядзець, стаяць, сядзець, жыць, працаваць, прыехаць* і г. д.: *Восень стаіць залатая і на зямлі і ў душы* (С. Законнікаў); *Раней і дождж ішоў духмяны* (А. Пісьмянкоў); *Мы верасень гэты назвалі шчаслівым* (П. Панчанка).

***Складаны выказнік*** мэтазгодна вылучаць у тых выпадках, калі аднachасова спалучаюцца элементы састаўнога дзеяслоўнага і іменнага выказнікаў, напр.: *Літаратар павінен быць вельмі чулы да слова* (Я. Скрыган); *А чалавек павінен быць гаспадаром, мець родны край, сваю зямлю і ўласны дом* (С. Законнікаў); *Зямля не любіць пуставаць – жадае быць жыццёвым полем* (Я. Колас);

Мэтазгодна нагадаць і адметныя формы выражэння пазіцыі выказніка ў беларускай мове.

Спецыфічна беларускай моўнай канструкцыяй з'яўляецца такое выказванне, што будуецца на аснове выказніка, утворанага дзеясловам у форме прошлага часу і гэткай жа формы дапаможнага дзеяслова *быць: Анюта была трохі заікнулася яму, каб ішоў жыць да іх, але дзе там...* (Т. Супрановіч). Такі выказнік абазначае даўномінулае дзеянне або дзеянне, якое не было даведзена да канца ці не дало жаданага выніку; дапаможны дзеяслоў, як і асноўны, каардынуецца з дзейнікам у родзе і ліку: *Відаць, той, хто вычараваў яе з мармуру, паабяцаў быў да яе вярнуцца* (М. Танк); *Рыбак спярша хацеў быў выскачыць за дзверы, ды зноў вярнуўся зірнуць у акно* (В. Быкаў). Форма дзеяслова *быць* у такога кшталту выказніках можа ўжывацца і ў ніякім родзе, незалежна ад роду асноўнага дзеяслова (набывае пры гэтым фукцыі часціцы):

[27] Між тым апошнім часам такія спалучэнні кваліфікуюць не як састаўны іменны выказнік, а як просты дзеяслоўны і *дуплексіў*, што намінуе сабой іменную прэдыкатыўную частку (гл. с. 91).

*Маці тады затрымалася было ў вёсцы* (З. Бядуля); <...> *але й яго нястрымны голас было зрываўся і дрыжэў* (П. Броўка).

У склад выказніка можа ўключацца мадальны дзеяслоў *мецца (мець)* у ролі звязкі са значэннем намеру або павіннасці: *Было свята... Меўся ўначы прыехаць з Масквы пан* (М. Гарэцкі); *Лявон меўся паехаць у школу на посную куццю перад Вадохрышчамі* <...> (М. Гарэцкі); *Ноч жа, Богу дзякаваць, мае быць добрая* (Я. Скрыган).

Кадыфікаванай формай прыметнікаў і дзеепрыметнікаў, што займаюць пазіцыю выказніка, з'яўляецца іх поўная форма: *У познюю восень вада пад мастком чыстая і халодная* (К. Чорны); *Капкан ужо засыпаны снегам* (Э. Самуйлёнак).

Калі прыметнікі і дзеепрыметнікі выкарыстоўваюцца ў складзе выказніка са звязкай (*быць, здавацца, рабіцца, стаць* і пад.), то яны маюць форму назоўнага склону (нават пры выражэнні часовай прыметы): *Той дзень быў ціхі, хмурны, сухі і цёплы* (К. Чорны); *Вярнуўся хлопец, але застаўся худы, нязграбны, вуглаваты* (ЛіМ), хаця сустракаецца і форма творнага склону: *Яна здалася занадта маладой, занадта капрызна-прыгожай* (ЛіМ).

Характэрнай асаблівасцю выказніка ў беларускай мове з'яўляецца актыўнае выкарыстанне ў яго структуры назоўнікаў у назоўным склоне, творным беспрыназоўнікавым і вінавальным з прыназоўнікам *за*, калі яны кваліфікуюць асобу па роду яе дзейнасці. Такія формы назоўнікаў могуць быць як з вербальна прадстаўленай звязкай (*быць, з'яўляцца, лічыцца, станавіцца* і пад.), так і з нулявой, напр.: *Мой прадзед быў скрыпач – ён выкрасаў і смех, і плач* (А. Пісьмянкоў); *У суседнім сельсавеце жанчына – старшынёю* (З. Бядуля); *А ён застаўся ў старой Манінай хаце за гаспадара* («Маладосць»).

Канструкцыя з прыназоўнікам *за* нароўні са значэннем 'быць кімсьці', называючы род дзейнасці, заняткаў, прафесію, можа мець і значэнне 'быць замест каго-небудзь' (адрознасць семантыкі вынікае з кансітуацыі): *Мы выбралі яго за брыгадзіра* (К. Чорны); *І палічылі ўсе Асла за шышку* (К. Крапіва).

## Праблема каардынацыі дзейніка і выказніка

Дзейнік і выказнік у сказе ўзаемна суадносяцца: яны звязаныя паміж сабой сэнсам, граматычна і фармальна прыпадабняюцца адзін да аднаго: *Прашумеў каршун. Узвіўся сокал. Дыхае*

*расою сенажаць. Замірае лецейка. Высока зоры прахалодныя звіняць* (Я. Янішчыц).

Аднак у беларускім мовазнаўстве няма адзінства поглядаў на граматычную сувязь паміж галоўнымі членамі двухсастаўнага сказа, бо адны кваліфікуюць яе як д а п а с а в а н н е (Я. Ф. Карскі, Я. Лёсік, М. І. Гурскі, Ц. П. Ламцёў, А. Я. Супрун, І. К. Германовіч, В. У. Ляпёшкін і інш.), другія – як к а а р д ы н а ц ы ю (Л. І. Бурак, Л. П. Падгайскі, Т. П. Бандарэнка, М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко і інш.), трэція – як п р э д ы к а т ы ў н у ю  с у в я з ь [*Лепешаў*, 2002, *184*].

Дапасаванне як сувязь падпарадкавальная прадугледжвае аднабаковую залежнасць адной сінтаксемы ад іншай, а ***каардынацыя*** грунтуецца на ўзаемаабумоўленасці і раўнапраўнасці абодвух кампанентаў прэдыкатыўнай асновы. «Каардынацыя (лац. *co(n)* – разам + *ordinatio* – ‘размяшчэнне па парадку’) – сувязь паміж дзейнікам і выказнікам, якая мае характар узаемнага дапасавання або ўзаемнага падпарадкавання» [*Сцяцко*, 1990, *66*]. Думаецца, што пераважная частка ўсіх выказванняў якраз будуецца на сувязі каардынацыі, і толькі ў вызначанай колькасці граматычных асноў выразна прасочваецца абумоўленасць граматычнай формы выказніка семантыкай і граматычным значэннем дзейніка, перадусім пры колькасна-іменных спалучэннях і нязменных словах.

Як правіла, фармальнае прыпадабненне дзейніка і выказніка не выклікае цяжкасцей, але ёсць і праблемныя выпадкі. У першую чаргу гэта датычыць канструкцый, якія змяшчаюць «*колькасны дзейнік*» (А. Я. Супрун), што мае значэнне множнасці, г. зн. у яго склад уваходзіць лічэбнік ці спалучэнне лічэбніка з назоўнікам, і таму дапасаванне адбываецца не паводле формы, а паводле сэнсу. «Гэта абумоўлена ў значнай меры тым, што ў формах дапасавання павінны так або інакш адбіцца адносіны лічэбніка да ліку і роду, а гэтыя граматычныя катэгорыі лічэбнікаў зазнавалі ў працэсе эвалюцыі лічэбнікаў найбольшыя змены» [*Супрун*, 1972, *265*]. У сучаснай беларускай мове лічэбнік, за выключэннем адзінкавых слоў, не мае ні катэгорыі ліку, ні катэгорыі роду, таму пры колькасным дзейніку і назіраецца ваганне ў граматычных формах ліку выказніка – т. зв. тэндэнцыя да нейтралізацыі ліку выказніка. Самі даследчыкі канстатуюць: «Тут спосаб дапасавання настолькі няўстойлівы, што ў адным і тым жа сказе пры адным і тым жа дзейніку магчыма дваякае дапасаванне: *Часць салдат пайшла ўперад, а рэшта разышліся па хатах* (Я. Колас)» [*Гурскі*, 1939, *27*] або: «амаль усе лічэбнікі дапуска-

юць пры сабе выказнік як у адзіночным, так і ў множным ліку» [*Супрун*, 1972, *269*]. Разам з тым статыстычны падлік і параўнанне з іншымі ўсходнеславянскімі мовамі дазволілі А. Я. Супруну выявіць пераважнасць ва ўжыванні адной з лікавых формаў пры колькасным дзейніку ў беларускай мове. Вучоны прыйшоў да высновы, што на гэта ўплывае найперш характар лічэбніка, які ўваходзіць у склад дзейніка, а таксама парадак размяшчэння выказніка: прэпазіцыя ці постпазіцыя адносна дзейніка.

Множны лік выказніка заўсёды (!) выкарыстоўваецца пры:

● лічэбніках *абодва, абедзве, абое: Абодва прасіліся ў атрад і расказвалі пра сябе – як на духу* (Ф. Янкоўскі); *Абое сур'ёзныя, тоўстыя, габардзінныя сядзяць у кіно* (Я. Брыль). Аддаецца яму перавага і пры:

● лічэбніках *два, тры, чатыры*: *Пачуліся два дзядзькавы стрэлы* (А. Жук); *Чатыры лодкі прыйшлі да берага амаль праз гадзіну* (Я. Брыль); *У аўтобусе пуставалі два крэслы* (Ф. Янкоўскі). Але (!) у часавых канструкцыях з дзеясловамі са значэннем 'прайшло, мінула' і дзеясловам *заставалася* выкарыстоўваецца адзіночны лік выказніка: *Мінулася яшчэ два гады* <...> (У. Арлоў); *Прайшло тры тыдні; Засталося чатыры гадзіны;*

● зборных лічэбніках: *А трое павярнулі і папраставалі па плошчы да шчодра асветленага помніка па нядаўняй цяжкай вайне і вялікай, такой цяжкай перамозе* (Ф. Янкоўскі); *Чацвёра не зводзілі ліхтарыкаў з лодак, лодачнікаў* (Ф. Янкоўскі); *І пяцёра рушылі* (Ф. Янкоўскі). Калі ж выказнік знаходзіцца ў прэпазіцыі, то магчымы і адзіночны лік: *Прыйшло на сход трое старых* (Т. Хадкевіч).

Адзіночны лік пераважае пры дзейніку, у склад якога ўваходзяць:

● неазначальна-колькасныя словы *больш, менш, многа, мала, багата, шмат, колькі, столькі* і пад.: *Сёлета прыляцела шмат шпакоў* (С. Шаўцоў); *Падышло больш студэнтаў* (У. Карпаў); *Прайшло некалькі хвілін* (Ю. Станкевіч); *Сабралася багата людзей* (М. Лынькоў). Што датычыць *некалькі*, то А. Я. Супрун адзначае тут істотную ролю парадку кампанентаў: калі выказнік перад дзейнікам, то – адзіночны лік, а калі наадварот, то – множны: *Прайшло некалькі чародак, але таксама далёка, над самаю сярэдзінаю возера* (А. Жук); *Узвілося некалькі чорных дымных ракет* (М. Лынькоў), але: *Некалькі танкаў прарваліся ў лес* (К. Гурскі).

Паралельна такому меркаванню існуе і іншы пункт гледжання на праблему дапасавання выказніка да колькаснага дзейніка.

Ён дэталёва апісаны ў акадэмічнай граматыцы (1966) (аўтар раздзела І. К. Германовіч) і паслядоўна прасочваецца ва ўсёй вучэбна-навуковай літаратуры (падручнікі Л. І. Бурака, М. С. Яўневіча і П. У. Сцяцко, М. Я. Цікоцкага і інш.). Паводле гэтай канцэпцыі, хістанні ва ўжыванні формаў ліку выказніка абумоўлены найперш лексічным значэннем самога выказніка і адушаўлёнасцю / неадушаўлёнасцю дзейніка. Як правіла, множнаму ліку выказніка аддаецца перавага пры актыўным дзеянні, адзіночнаму – пры перадачы стану ці пасіўнага дзеяння, пераважае множны лік і тады, калі дзейнік абазначае асоб альбо жывых істот, калі ж неадушаўлёныя прадметы – адзіночны лік выказніка [*Германовіч*, 1966, *321–323*; *Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *44–45*; *Цікоцкі*, 1995, *165–167*]. Для большай нагляднасці гэты падыход можна адлюстраваць праз табліцу (табл. 9).

*Табліца 9*

**ДАПАСАВАННЕ ВЫКАЗНІКА ДА КОЛЬКАСНАГА ДЗЕЙНІКА**

| Склад дзейніка | Лік вык. | Значэнне дзейніка і выказніка | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Кольк. лічэбн. | адз. | адцягнен. лік | На табло мігал**а** дваццаць тры (*Чырв. змена*) |
| | адз. і мн. | абазн. асоб | Чатырнаццаць з шаснаццаці збірал**і**ся паступаць у ваеннае вучылішча (*І. Навуменка*) |
| Зборны лічэбн. | адз. | пасіўнасць дзеяння | На санях сядзел**а** двое (*М. Зарэцкі*) |
| | мн. | актыўнасць дзеяння | Трое кінул**і**ся з дарогі <...> (*Ф. Янкоўскі*) |
| Кольк. лічэбн. +Н./Р. ск. імя | адз. | • прыблізная кольк.<br>• абазн. жывёл ці прадметы<br>• акцэнт на кольк. асоб | Чалавек з дзесяць прыехал**а** музыкаў (*М. Лобан*)<br>Стаял**а** пяць асядланых коней (*П. Пестрак*)<br>У цёткі Вярбіцкай был**о** чатыры сыны (*Я. Брыль*) |
| | мн. | • пэўная кольк.<br>• абазн. асоб<br>• актыўнасць дзеяння | На прыбітых да слупоў паліцах дым**яць** тры газнічкі (*С. Грахоўскі*)<br>Чатыры коннік**і** замыкалі абоз (*Я. Колас*)<br>Тры партызаны конна круц**яц**ца пад соснамі (*Я. Брыль*) |

*Заканчэнне табл. 9*

| Склад дзейніка | Лік вык. | Значэнне дзейніка і выказніка | Прыклады |
|---|---|---|---|
| *Колькі некалькі многа няшмат багата* + Р. ск. імя | адз. | • няпэўная кольк.<br>• абазн. прадметы | На зялёнай паляне ўзвышаецца некалькі старых ліп (*А. Адамовіч*)<br>Шмат хат прытулілася да сцяны лесу (*Я. Колас*) |
| *Колькі некалькі многа няшмат багата* + Р. ск. імя | мн. | • актыўнасць дзеяння<br>• абазн. асоб | Імчаліся да фронту некалькі грузавікоў (*І. Мележ*)<br>Некалькі чалавек паціху іранічна рагаталі (*П. Галавач*) |
| *Большасць рад шэраг* + Р. ск. імя | мн. і адз. | адушаўлён. | Большасць дзяўчат глядзелі на Наташу зласліва (*І. Шамякін*)<br>Большасць журналістаў ці начавала ў старшыні калгаса, ці толькі «перакусвала» (*Я. Брыль*) |

Апошнім часам навукоўцы канстатуюць, што ў такіх канструкцыях пад уплывам гутарковага маўлення ўсё большае пашырэнне атрымлівае т э н д э н ц ы я  с э н с а в а г а  д а п а с а в а н н я выказніка да колькаснага дзейніка, г. зн. выказнік набывае форму множнага ліку, бо дапасуецца не да формы галоўнага слова ў колькасна-іменным спалучэнні, а перадае лік рэальна дзеючых асоб [*Бандарэнка*, 1993, *65*]. На аснове аналізу фактычнага матэрыялу, выбранага з твораў І. Шамякіна, даследчыца канстатуе, што выкарыстанне выказнікаў пры такога кшталту спалучэннях звязана «не з актыўнасцю дзеяння, а з больш шырокай семантычнай катэгорыяй – канкрэтнасцю» [*тамсама*, *70*], а таксама з самім характарам паведамлення: у выказваннях выніковага, статыстычнага характару – адзіночны лік, у сказах апавядальнага характару – множны [*тамсама*, *71*].

У родзе выказнік каардынуецца з дзейнікам толькі пры абвесным ладзе дзеяслова прошлага часу адзіночнага ліку і дзеясловах у форме ўмоўнага ладу адзіночнага ліку. Праблема суаднесенасці роду выказніка і дзейніка можа ўзнікнуць у выпадках, калі дзейнік выражаецца:

- абрэвіятурай;
- запазычанымі нязменнымі словамі;
- словамі са значэннем прафесій, пасад, званняў, роду заняткаў.

Калі ў якасці дзейніка выступае абрэвіятура, дастаткова ведаць яе апорнае слова, бо менавіта з яго родам каардынуецца форма выказніка: *Перад Новым годам БЕЛТА перадало радасную навіну* (БЕЛТА – беларускае тэлеграфнае агенцтва); *Арганізавана ТБМ* (ТБМ – Таварыства беларускай мовы). Разам з тым існуе і пэўная колькасць абрэвіятур, якія скланяюцца ў адпаведнасці са сваёй граматычнай формай: *Папер з БелВАКу яшчэ не было* (БелВАК – Беларуская вышэйшая атэстацыйная камісія); *У сённяшнім ЛіМе змясцілі тваю нататку* (ЛіМ – газета «Літаратура і мастацтва»).

Запазычаныя нязменныя словы, што абазначаюць неадушаўлёныя прадметы, належаць да ніякага роду, а таму і выказнік мусіць мець адпаведную граматычную форму: *Замежнае турнэ ўдалося. Інтэрв'ю не ладзілася. Канструктарскае бюро размяшчалася побач. Звонка лілося аргентынскае танга.* Запазычаныя назвы жывых істот, за рэдкім выключэннем, маюць у беларускай мове мужчынскі род, што перадаецца і формай выказніка: *Поні асцярожна ўзяў цукар з далоні. Калібры вылецеў з клеткі (але: Івасі ляжала ў бляшанцы. Цэцэ была ў прабірцы).* Калі ж неабходна акцэнтаваць, што размова ідзе пра самку, то выказнік набывае форму жаночага роду: *Поні прывяла маленькае жарабятка.*

Што датычыць уласных геаграфічных назваў, то выказнік каардынуецца ў сваіх граматычных формах з родавым паняццем, так, *Хонсю* – востраў, *Эры* – возера, *Тарту* – горад, *Дарданелы* – праліў, *Гобі* – пустыня, *Кракатау* – вулкан, *Эйр* – возера, *Хуанхэ* – рака і пад.: *Але Тбілісі, як фенікс, зноў падымаўся, зноў расправўляў крылле, зноў спяваў сваю салаўіную песню* (Б. Мікуліч).

Пры абазначэнні асоб па роду заняткаў, прафесіі, званні, пасадзе выказнік мае форму мужчынскага роду незалежна ад таго, асобу мужчынскага ці жаночага полу называе дзейнік, «паколькі адны прафесіі прынята лічыць пераважна «мужчынскімі», а другія – пераважна «жаночымі», і ў назвах гэтых прафесій няма паралельных марфалагічных сродкаў для ўказання на граматычны род – мужчынскі або жаночы» [*Булахаў*, 1959, *57*]. Але калі ў такога кшталту спалучэннях выкарыстоўваецца ўласнае імя, то выказнік каардынуецца з ім: *Рэктар Баранава адкрыла ўрачыстае пасяджэнне.* У гутарковым жа маўленні пры абазначэнні асоб жаночага полу выказнік найчасцей выкарыстоўвацца ў форме жаночага роду: *прафесар заўважыла, інжынер апавядала, агранам паказала, доктар абследавала.*

## ЛІТАРАТУРА

*Абабурка*, *1992*: Абабурка М. В. Параўнальная граматыка беларускай і рускай моў. Мн.: Вышэйш. шк., 1992. 224 с.

*Анічэнка*, *1998*: Анічэнка У. В. Беларуская мова: Дапам. для самаадукацыі. Мн.: Бел. навука, 1998. 206 с.

*Бандарэнка*, *1986*: Бандарэнка Т. П. Галоўныя члены сказа // Беларуская граматыка: У 2 ч. Мн.: Навука, 1986. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 122–131.

*Бандарэнка*, *1993*: Бандарэнка Т. П. Варыянтнае дапасаванне выказніка да дзейніка колькасна-іменнага спалучэння ў творах І. Шамякіна // Бел. лінгвістыка. 1993. Вып. 42. С. 65–72.

*Булахаў*, *1959*: Булахаў М. Г. Двухсастаўны просты сказ // Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Сінтаксіс. Мн.: Дзярж. вуч.-пед. выд-ва, 1959. С. 36–57.

*Бурак*, *1987*: Бурак Л. І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн.: Універсітэцкае, 1987. 320 с.

*Германовіч*, *1966*: Германовіч І. К. Галоўныя члены сказа // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 251–329.

*Гурскі*, *1939*: Гурскі К. І. Асаблівасці дапасавання дзейніка да выказніка // Сінтаксіс беларускай мовы. Мн.: Выд-ва АН БССР, 1939. С. 26–30.

*Карский*, *1956*: Карский Е. Ф. Белорусы. Язык белорускогo народа. М.: Изд-во АН СССР, 1956. Вып. 2–3. С. 321–392.

*Клюсаў*, *1972*: Клюсаў Г. Н. Уводзіны // Клюсаў Г. Н., Юрэвіч А. Л. Сучасная беларуская пунктуацыя. Мн.: Вышэйш. шк., 1972. С. 3–46.

*Лепешаў*, *2002*: Лепешаў І. Я. Каардынацыя, дапасаванне ці нешта іншае // Лепешаў І. Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік. Гродна: ГрДУ, 2002. С. 182–185.

*Лёсік*, *1926*: Лёсік Я. Сынтакс беларускае мовы. Менск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. 255 с.

*Ломтев*, *1956*: Ломтев Т. П. Грамматика белорусского языка. М.: Учпедгиз, 1956. 336 с.

*Ляпёшкін*, *1989*: Ляпёшкін В. У. Галоўныя члены сказа // Беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя / Пад рэд. Я. М. Адамовіча. Мн.: Вышэйш. шк., 1989. С. 39–59.

*Ляпёшкін*, *1998*: Ляпёшкін В. У. Галоўныя члены сказа // Беларуская мова: У 2 ч. / Пад рэд. Л. М. Грыгор’евай. Мн.: Вышэйш. шк., 1998. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 30–47.

*Михневич*, *1990*: Михневич А. Е. Согласование сказуемого с подлежащим // Кривицкий А. А. и др. Белорусский язык для говорящих по-русски. Мн.: Вышэйш. шк., 1990. С. 252–254.

*Рабчинская*, *1994*: Рабчинская И. А. Функциональные резервы простого предложения. Мн.: Нар. асвета, 1994. 130 с.

*Рагаўцоў*, *2001*: Рагаўцоў В. І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні. Мн.: Універсітэцкае, 2001. 199 с.

*Сцяцко*, *1990*: Сцяцко П. У. і інш. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. Мн.: Вышэйш. шк., 1990. 222 с.

*Супрун, 1972*: Супрун А. Я. Дапасаванне выказніка да колькаснага дзейніка ў беларускай мове // Беларускае і славянскае мовазнаўства. Мн.: Навука і тэхніка, 1972. С. 264–270.

*Тарашкевіч, 1929*: Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ / Факсімільнае выданне. Мн.: Нар. асвета, 1991. 112 с.

*Цікоцкі, 1995*: Цікоцкі М. Я. Сінаніміка форм выказніка // Цікоцкі М. Я. Стылістыка беларускай мовы. Мн.: Універсітэцкае, 1995. С. 161–168.

*Яўневіч, Сцяцко, 1987*: Яўневіч М. С., Сцяцко П. У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. Мн.: Вышэйш. шк., 1987. 272 с.

# ДАДАНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

## Традыцыйнае вучэнне аб членах сказа

Праблема членаў сказа, і ў прыватнасці даданых, у сучаснай лінгвістыцы актыўна абмяркоўваецца і дасюль застаецца нявырашанай. У рускім мовазнаўстве ўвогуле адмаўлялі паняцце *член сказа* ці прапаноўвалі замест яго іншыя тэрміны [*Ломтев*, 1958; *Грамматика*, 1970]. Беларускія мовазнаўцы паслядоўна трымаюцца традыцыйнага пункту гледжання, вылучаючы два галоўныя і тры даданыя члены сказа.

***Члены сказа*** – «гэта сінтаксічныя катэгорыі, пад якія падводзяцца словы (словаформы), некаторыя словазлучэнні, што служаць для выражэння найбольш агульных сінтаксічных адносінаў» [*Чеснокова*, 1991, *16*]. На аснове трох такіх асноўных адносінаў і вылучаны яшчэ з часоў антычнасці тры даданыя члены сказа: азначэнне – на аснове азначальных (атрыбутыўных), дапаўненне – аб'ектных, акалічнасць – акалічнасных. Разам з тым кожнае агульнае значэнне мае шэраг прыватных, што ў сваю чаргу перадаюцца праз сінтаксемы. Таму наяўнасць сінтаксем прадугледжвае і наяўнасць агульных тыпаў – членаў сказа. Напр., агульнае атрыбутыўнае значэнне ўключае ў сябе шэраг прыватных: прыналежнасці (пасесіўнасці) – *мой ланцужок, сестрыно люстэрка, зайцаў след*; якасці (кваліфікатыўнасці) – *высачэзны гмах, выразны голас, кідкая суконка*; колькасці (квантытатыўнасці) – *трэці тыдзень, да пяці гадоў, з дзвюх страў* і інш.

Даданыя члены сказа – паняцце граматычнае, якое звязана са структурнай іерархіяй членаў сказа, а з боку сэнсавай, інфармацыйнай значнасці яны могуць быць зусім не «даданымі» членамі, а сэнсава вызначальнымі. «У тэксце сфакусаванасць на тых ці іншых падрабязнасцях ёсць прамы вынік іх значнасці для моўцы.

Такая сфакусаванасць прадугледжвае суаднесенасць вылучаных дэталяў са «звычайнага становішча спраў» [*Рабчинская*, 1994, *92*].

Паводле сваёй семантыкі дадзеныя члены сказа падзяляюцца на тыповыя (аднaзначныя) і сінкрэтычныя (шматзначныя) [*Бабайцева*, 1988, *86*]. Аднaзначныя члены сказа – азначэнне, дапаўненне і акалічнасць – маюць поўны набор сваіх дыферэнцыяльных прымет, а шматзначныя характарызуюцца дыфузнасцю семантыкі, паколькі сумяшчаюць дыферэнцыяльныя прыметы розных членаў сказа.

***Азначэнне*** – такі дадзены член, які абазначае прымету прадмета і таму абавязкова падпарадкоўваецца слову з прадметным значэннем: *Каля бярозак беланогіх рабіны стройныя стаялі* (Г. Бураўкін). Спецыфічнай асаблівасцю азначэнняў з'яўляецца тое, што яны не выконваюць у сказе структурнай функцыі, але вельмі істотныя з пункту гледжання семантыкі, бо, канкрэтызуючы абазначаны прадмет, дазваляюць больш глыбока паказаць якасці прадметаў і з'яў рэчаіснасці. Нярэдка менавіта азначэнні нясуць асноўную сэнсавую нагрузку пэўнага члена сказа, калі ён выражаны назоўнікам: *Чырвоны сігнал святлафора забараняе рух пешаходам і машынам; Жылі там людзі з розных краёў* (П. Броўка).

Пра сэнсавую нагрузку азначэнняў нярэдка сведчыць і іх актуалізацыя пры парцэляцыі: *Чалавеку патрэбен чалавек. Жывы. Цёплы. З усмешкаю ў сэрцы* (Т. Бондар); *Мы ўбачылі дом. Новы. На высокім падмурку. З вялікімі вокнамі* (ЛіМ) або далучэнні: *Негаваркі Мікалай Міхайлавіч. Распытваць трэба было, падварушваць пытаннямі. І сарамлівы* (А. Адамовіч).

Паводле спосабу выражэння вылучаюць дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні.

Дапасаваныя азначэнні заўсёды выражаюцца словамі, здольнымі да дапасавання: прыметнікамі, дзеепрыметнікамі, займеннікамі-прыметнікамі, парадкавымі лічэбнікамі, напр.: *Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць* (А. Ставер). Але не лічыцца азначэннем прыметнік, што ўваходзіць ва ўстойлівае спалучэнне: *Мінскае мора; Вялікая Мядзведзіца; Восьмае сакавіка*.

Недапасаваныя азначэнні не дапасуюцца да азначаемага слова, а кіруюцца ім ці прымыкаюць да яго; выражаюцца ўскоснымі прыназоўнікава-склонавымі формамі назоўніка, (радзей) прыслоўямі, інфінітывам, непадзельнымі спалучэннямі і цэлымі сказамі: *Батальён з крыкам «ура» падняўся ў поўны рост* (С. Грахоўскі); *Іх галасы ціха гулі недзе ў большым пакоі* (К. Чор-

ны); *Па краіне цырыманіяльным крокам ішоў заклік «эканоміка павінна быць эканомнай»* (Вожык).

У ролі азначэння, выражанага непадзельным словазлучэннем, часцей выступаюць спалучэнні назоўніка ў родным склоне з дапасаваным да яго колькасным лічэбнікам (*дзіця гадоў пяці*); спалучэнне назоўніка з прыметнікам у творным склоне (*дзяўчына з тонкім станам, кацяня з шэрымі вачыма*); словазлучэнні, якія складаюцца з прыметніка і назоўніка ў родным склоне (*голас прыемнага тэмбру, віно лепшага гатунку, валасы невыразнага колеру, хлопец прызыўнога ўзросту*).

***Прыдатак*** – гэта разнавіднасць азначэння, азначэнне-назоўнік, што дапасуецца да назоўніка ў склоне ці ўжываецца толькі ў форме назоўнага склону: *Доўгімі вякамі стаяў дуб-асілак у самай добрай згодзе з суседам Нёманам* (Я. Колас); *Мяне аблягае ноч, але мне свеціць вежа Эйфеля – начны таршэр Парыжа* (Л. Дранько-Майсюк).

Спецыфічнай рысай семантыкі прыдаткаў з'яўляецца тое, што, вызначаючы прадмет, яны даюць яму іншую назву. Гэта і абумовіла субстантыўную форму такога віду азначэння, бо галоўная функцыя назоўніка – намінацыйная.

Прыдатак, надаючы прадмету ці асобе іншую назву, падкрэслівае іх характэрныя рысы. Так, ён абазначае:

а) сваяцкія адносіны, сацыяльную прыналежнасць, прафесію, нацыянальнасць: *дзядзька Антось, бабуля Сцепаніда, вучні-цесляры, рабочы-муляр, хлопцы-беларусы*;

б) уласнае імя: геаграфічныя назвы, назвы прадпрыемстваў, устаноў, газет, мастацкіх твораў і г. д.: *возера Свіцязь, вёска Узмёны,* ААП *«Камунарка», часопіс «Крыніца», аповесць «Сцяна»*;

в) эмацыянальную ацэнку прадмета ці асобы: *дожджык-грыбасей, Дзвіна-красуня, ноч-мачыха, вочкі-свярдзёлкі, дзік-бадзяга.*

Паводле сваёй структуры прыдаткі могуць быць простымі (калі выражаюцца адной словаформай) і складанымі (калі выражаюцца словазлучэннем): *Дожджык-грабеньчык // Клянам грывы чэша* (Н. Маеўская) і *Два снегіры – дзве кропелькі зары – // На шэрую галінку вольхі ўпалі* (Н. Мацяш).

Ад прыдаткаў трэба адрозніваць асацыяцыйныя спалучэнні (*хлеб-соль, каліна-маліна*); антанімічныя спалучэнні (*пытанне-адказ, прыход-расход*), сінанімічныя спалучэнні (*трава-мурава, гусі-лебедзі*), складаныя словы, што з'яўляюцца тэрмінамі (*генерал-маёр, раман-газета*) ці маюць у сваім складзе ацэначнае слова (*жар-птушка, гром-баба*).

Прыдатак далучаецца да азначаемага слова як бяззлучнікавай сувяззю: *Месяц – жоўтая лодка – плыве між воблакаў* (Г. Бураўкін), так і з дапамогай злучнікаў *як, або, ці, гэта значыць*, а таксама слоў *на прозвішча, па мянушцы*: *Заходняя Дзвіна, або Даўгава ў латышоў, – што Волга ў Расіі* (Н. Казлоўская); *Гэта дзеялася тады, калі яму, Лявону, Рыгораваму сыну, на прозвішча Задума, ішоў дваццаты год і ён быў ужо ў апошнім класе сельскагаспадарчай школы* (М. Гарэцкі); *Гэта быў адзін з майстроў вялікіх, звалі яго Люцыян Таполя, а па клічцы проста Багароб* (М. Танк).

Каб адрозніць прыдатак ад азначаемага слова, трэба мець на ўвазе:

● прыдаткі не толькі называюць прадметы, а адначасова надаюць ім своеасаблівыя характарыстыкі: *На травінцы пад вясёлкай крошка-кропелька дрыжыць* (Е. Лось);

● служаць відавой назвай прадмета (у той час як родавую назву выражае паясняемы назоўнік): *Расцвілі ружы-кветкі над краем* (П. Трус);

● не каардынуюцца з выказнікам і не дапасуюцца да азначэння: *Нарэшце пад абед Зіна знайшла нейкую гарадскую аўтабазаўскую машыну-лесавоз* (Р. Сабаленка).

Пры спалучэнні назоўніка ўласнага (імя і прозвішча чалавека) і агульнага прыдаткам з'яўляецца агульны назоўнік, але ў выпадку неабходнасці ўдакладнення асобы, канкрэтызацыі яе, у якасці прыдатка можа ўжывацца імя ўласнае пры агульным. Параўн.: *Ефрасіння Полацкая – дачка полацкага князя Георгія Усяславіча і сястры візантыйскага імператара Мануіла Комніна, унучка князя Усяслава Брачыславіча (Чарадзея)* (Я. Трафімовіч), але: *Праўда, і жонка яго, Люба, лёгкая на нагу кабета была* (А. Кудравец); *Маці – Ганна Юраўна – была з роду Лёсікаў* (М. Лужанін).

***Дапаўненне*** – даданы член сказа, які абазначае аб'ект дзеяння, стану ці прыметы, таму адносіцца да дзеяслова, назоўніка, прыметніка, прыслоўя ці безасабова-прэдыкатыўнага слова: *Гром для хмараў загады піша вогненным пяром* (К. Кірэенка).

Катэгарыяльнае значэнне прадметнасці (аб'екта) абумоўлівае спосабы яго выражэння. Акрамя назоўнікаў і займеннікаў, пазіцыю дапаўнення можа займаць любая іншая часціна мовы, спалучэнне слоў, службовыя часціны мовы пры іх субстантывацыі, сказы, напр.: *Сказаць «Я жадаю паесці», «жадаю паглядзець карціну», «жадаю павесяліцца» – дрэнна. Усюды тут больш натуральна сказаць «хачу»* (Я. Скрыган).

Адрозніваюць прамое і ўскоснае дапаўненне.

Прамое дапаўненне мае граматычную форму:

- беспрыназоўнікавага вінавальнага склону назоўніка ці займенніка пры пераходных дзеясловах, напр.: *Азалаціла восень поле ржышчам* (К. Чорны);
- беспрыназоўнікавага роднага склону са значэннем:
  - часткі аб’екта: *Я наліў яму ў сподак малака* (Я. Брыль);
  - часовага карыстання аб’ектам: *Дзядзька Марцін пазычыў суседу касы* (Я. Колас);
  - аб’екта пры пераходных дзеясловах з адмоўем: *Прося не прыгатавала дзецям снядання* (А. Васілевіч);
  - вялікай колькасці або меры чаго-небудзь пры дзеясловах з прыстаўкамі *на-, пана-, папа-*: *За сваё жыццё ён бярвення папаварочваў і карчоў папакарчаваў* (К. Чорны) (гл. больш дэталёва [*Михневич*, 1990, *260*])

Ускоснае дапаўненне выражаецца ўсімі ўскоснымі склонамі назоўніка, займенніка і іншых субстантываваных часцін мовы як з прыназоўнікамі, так і без іх (акрамя адзначаных вышэй выпадкаў): *Глухому кажуху на вуха пра скруху шэпча завіруха* (Р. Барадулін).

Асаблівай увагі патрабуе *інфармацыйнае дапаўненне* (аб’ектны інфінітыў), што абазначае дзеянне не суб’екта-дзейніка, а іншай асобы, якая часта і не ўказваецца ў сказе: *Андрэй папрасіў бацьку зрабіць рамку для партрэта* (П. Пестрак); *Яму загадалі маўчаць* (І. Мележ); *Мы навучым сваіх дзяцей быць новым народам* (А. Дудараў).

***Акалічнасці*** – даданыя члены сказа, якія абазначаюць абставіны і характар дзеяння, стану ці прыметы: *Ізноў малады па-вясноваму месяц маўкліва плыве над маёй галавой* (Э. Агняцвет).

Выражаюцца акалічнасці прыслоўямі, дзеепрыслоўямі і прыназоўнікава-склонавымі формамі назоўнікаў. У складзе сказа яны спалучаюцца з дзеясловам (часцей за ўсё), а таксама з прыметнікам, прыслоўем, назоўнікам і безасабова-прэдыкатыўнымі словамі.

У адрозненне ад азначэння і дапаўнення класіфікацыя акалічнасцей даецца не паводле граматычнай формы (дапасаванае / недапасаванае, прамое / ускоснае), а паводле значэння.

У першай «Беларускай граматыцы для школ» Б. Тарашкевічам было вылучана пяць такіх груп: часу, месца, прычыны, спосабу і мэты [*Тарашкевіч*, 1991, *42*]; зараз пры больш дэталёвым размежаванні налічваюць дванаццаць і больш разрадаў, але часцей адрозніваюць толькі восем: месца, часу, прычыны, мэты, спосабу дзеян-

ня і ступені, параўнання, умовы, уступкі [*Наркевіч*, 1959; *Бурак*, 1987; *Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987; *Буракa*, 1989; 1998]. Некаторымі лінгвістамі ўсе гэтыя разрады ўключаюцца ў дзве абагульненыя групы – акалічнасці лагічныя, ці сітуацыйныя (месца, часу, прычыны, мэты, сітуацыі), і акалічнасці-характарыстыкі (спосабу дзеяння, меры і ступені) [*Всеволодова*, 2000, *327*].

Пра тое, што акалічнасць па інфармацыйнай значнасці можа мець першаснае значэнне, сведчыць вынясенне яе за межы сказа і пераўтварэнне ў самастойную сінтаксічную адзінку (пры парцэляцыі): *Гула машына. Далёка. Як за краем пушчы* (В. Карамазаў); *Начлежнікі пасвілі коней. На поплаве. Каля самага Нёмана* (Я. Колас); *Машыны не ішлі. Ні ў адзін бок, ні ў другі* (В. Карамазаў).

## Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў

Вядома, што ў прасцейшых выпадках кожны член сказа выражаецца адным словам і супадае з пэўнай часцінай мовы. «Аднак член сказа – адзінка не лексіка-марфалагічная, а змястоўна-паняційная. Таму паралелізм паміж членамі сказа і часцінамі мовы не можа быць паслядоўны. Адна і тая словаформа ў залежнасці ад пазіцыі ў сказе і ад непасрэднай сувязі са сваім азначаемым словам у словазлучэнні можа выступаць у ролі розных членаў сказа, напр.: *Яны хадзілі полем* (акаліч.); *Яны былі задаволены полем* (дап.); *Лес за полем вельмі стары* (азнач.). Нярэдка адзін і той жа член сказа можа быць аднесены да розных паняційных катэгорый, напр.: *Вось вам прадукты на дарогу* (якія? для якой мэты? на які час?)» [*Клюсаў*, 1972, *34–35*].

Лінгвістамі даўно адзначаецца той факт, што «кожнае слова як часціна мовы можа выкарыстоўвацца ў сказе ў сваёй *асноўнай* сінтаксічнай функцыі, функцыі-базіс, якая замацавалася за ім у працэсе развіцця граматычнага ладу мовы і якая з'яўляецца грунтам для фарміравання часцін мовы, і ў *вытворнай*, дэрывацыйнай (г. зн. не ўласцівай дадзенаму слову – часціне мовы) сінтаксічнай функцыі [*Кротевич*, 1960, *12*]. У такім выпадку размова ідзе пра марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа. «Марфалагізаваны член сказа (сінтаксічная катэгорыя) – гэта паўназначнае слова (лексічная катэгорыя), што рэпрэзентуе тую часціну мовы (лексіка-граматычную катэгорыю), для якой дадзеная сінтаксічная функцыя з'яўляецца асноўнай, звычайнай. Калі ж сінтаксічная функцыя, у якой выступае слова, з'яўляецца не

асноўнай, то гэта будзе немарфалагізаваны член сказа» [*тамсама*]. Так, марфалагізаванымі членамі сказа будуць: азначэнне, выражанае прыметнікам, акалічнасць – прыслоўем, дапаўненне – назоўнікам з прыназоўнікам ці без яго; тут форма і змест адпавядаюць адно аднаму. Немарфалагізаваныя члены – азначэнне ці акалічнасць, выражаныя прыназоўнікава-склонавай формай назоўніка, а таму ў іх парушаецца суаднесенасць паміж граматычнай формай і зместам, напр., у сказе *Браслаў раскінуўся на перашыйку між азёрамі* (В. Вольскі) да сінтаксемы *між азёрамі* магчыма паставіць два пытанні – азначэння *якім*? і дапаўнення *між чым*? Тут мэтазгодна гаварыць пра сінкрэтычны член сказа, бо словаформа сумяшчае ў сабе і атрыбутыўнае, і аб'ектнае значэнні (таму што канкрэтызуе назоўнік).

Такім чынам, ***сінкрэтызм*** (грэч. *synkretismos* 'спалучэнне, аб'яднанне') у сістэме членаў сказа – «гэта сумяшчэнне (сінтэз) у адным члене сказа дыферэнцыяльных прымет розных членаў сказа, розных іх функцый» [*Бабайцева*, 1988, *86*].

Сумяшчацца могуць: а) недапасаванае азначэнне і акалічнасць месца, накшталт: *Дзверы ў сенцы былі адчынены* (У. Краўчанка); *Вандроўкі на хутар не дужа вабілі Лабановіча* (Я. Колас); б) недапасаванае азначэнне і дапаўненне тыпу: *Малойцы Сцяпана адпачывалі на пасцелях з імху і сена* (П. Пестрак); в) дапаўненне і акалічнасць прычыны тыпу: *Гучна трэскаліся ад марозу дубы* (І. Шамякін); г) дапаўненне і акалічнасць мэты: *Я прадаў сваю кніжачку сам дзеля ратунку Эльзы* (Э. Самуйлёнак) і г. д. Такога плану сінкрэтызм заснаваны на сінтагматычнай шматзначнасці – «гэта наяўнасць у моўнай адзінкі некалькі значэнняў, якія рэалізуюцца ў словаформе адначасова ў адным тэксце» [*Чеснокова*, 1991, *76*].

Сінкрэтызм членаў сказа «абумоўлены шэрагам фактараў, з якіх асноўнымі з'яўляюцца наступныя: 1) неадпаведнасць формы і зместу; 2) двайныя сінтаксічныя сувязі; 3) сінкрэтычнае катэгарыяльнае значэнне словаформы; 4) эліпсіс дзеяслоўнай формы; 5) лексіка-граматычныя ўласцівасці спалучаных сінтаксем» [*Бабайцева*, 1988, *88*]. Параўн.: *Ад паху мёрзлага лесу закружыла галава* (К. Чорны); *Ячмень вырас адменны – намалочвалі па сорак пяць цэнтнераў* (І. Шамякін); *У лагчыне над Нёманам дружна і заложна кракталі жабы* (Я. Колас); *У яркай квецені палеткі і сады* (А. Астрэйка); *Самыя незабыўныя сны мне сніліся пад страхой тваіх шорсткіх далоняў* (М. Танк).

У сучасным беларускім мовазнаўстве праблему сінкрэтычных членаў сінтаксісты спрабуюць вырашыць, не выходзячы за межы

традыцыйнай класіфікацыі. Так, М. С. Яўневіч і П. У. Сцяцко прапануюць такія тэрміны: азначальнае дапаўненне, што сумяшчае семантыку азначэння і дапаўнення, тыпу: *напамінанне пра сына*; акалічнаснае дапаўненне, што сумяшчае значэнне дапаўнення і акалічнасці спосабу дзеяння, прычыны ці прасторы, тыпу: *ад спёкі гарыць пясок*; акалічнасць з аб'ектным адценнем, дзе пры сумяшчэнні значэнняў пераважае прадметнае, ці дапаўненне з акалічнасным адценнем[28] [*Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *72–73*].

Асобным даданым членам сказа з'яўляецца ***дуплексіў***[29], «які характарызуецца аднačасовай двайной залежнасцю ад імя і дзеяслова і абазначае прымету прадмета, што праяўляецца аднačасова з дзеяннем і з'яўляецца вызначальнай для самога дзеяння. Тэрмін дуплексіў (ад лац. *duplex* 'двайны') адлюстроўвае спецыфіку такога члена сказа як у плане зместу (аб'ядноўвае значэнні двух членаў сказа), так і ў плане выражэння (валодае двайной залежнасцю ад імя і ад дзеяслова – двайной сувяззю)» [*Чеснокова*, 1991, *99*], напр.: *Першыя падалі сігнал аб старым чалавеку вясковыя сабакі* (А. Карпюк). У прыведзеным сказе сінтаксема *першыя* залежыць і ад дзеяслова *падалі*, і ад спалучэння *вясковыя сабакі*, значыць, аднačасова выконвае функцыю і акалічнасці, і азначэння.

Дуплексіў можа спалучаць у сабе значэнні атрыбутыўнае і акалічнаснае, атрыбутыўнае і аб'ектнае; выражацца назоўнікам, прыметнікам, парадкавым лічэбнікам, дзеепрыметнікам, займеннікам, кампаратывам, словам *адзін*, г. зн. такімі сінтаксемамі, якія ўтрымліваюць у сабе сему непастаяннасці, пераменнасці, часовасці, прымета якіх можа замяняцца іншай, напр.: *Вечары апускаюцца маўклівыя і кароткія* (Я. Скрыган); *Васіль ехаў цяпер пануры* (І. Мележ); *Неба гэтымі днямі сінела чыстае і глыбокае* (І. Мележ); *Алесь варочаўся дахаты таксама занепакоены* (П. Броўка); *Толькі пад саменькую раніцу, зусім ужо знясіленая, яна кінулася апранутая на ложак і раптоўна заснула* (А. Рыбак); *Конь стаяў запрэжаны* (Ф. Янкоўскі); *Другім ішоў чалавек сярэдніх год* (М. Лынькоў); *Мікіта зноў застаўся адзін* (М. Зарэцкі).

Між тым Л. Д. Часнаковай падаюцца важкія аргументы разыходжання дуплексіва і іменнага выказніка, пераканаўча паказваецца адрозненне сінтаксічных функцый сінтаксемы *спакойнае* ў наступных выпадках: *спакойнае дзіця* (азначэнне), *Дзіця было*

---

[28] Параўнайце таксама [*Лепешаў*, 2002].

[29] Тэрмін *дуплексіў* прапанаваны рускім лінгвістам Л. Д. Часнаковай у 1972 г.

*спакойнае* (іменная частка выказніка), *Дзіця вярнулася спакойнае* (дуплексіў) [*Чеснокова*, 1991, *120–122*].

У беларускім мовазнаўстве ў дачыненні да такіх лексем выкарыстоўваюць тэрмін ***прэдыкатыўнае азначэнне*** – «дадзены член сказа, што мае двайную сінтаксічную залежнасць: ад выказніка і ад дзейніка ці ад дапаўнення»[30] [*Міхневіч*, 1990, *269*; 1973, *156–157*]. І ў залежнасці ад гэтага адрозніваюць суб'ектнае і аб'ектнае прэдыкатыўныя азначэнні, што могуць выкарыстоўвацца пры дзеясловах са значэннем руху (*ісці, бегчы, плысці, паўзці, вяртацца* і да т. п.), стану (*жыць, стаяць, вісець, расці, нараджацца, паміраць* і інш.), ментальнага дзеяння (*гаварыць, думаць, разважаць, размаўляць, адказваць, пытацца* і інш.), успрымання (*бачыць, глядзець, назіраць, слухаць* і інш.).

## Дэтэрмінаваныя члены сказа

У адрозненне ад дадзеных членаў, што з'яўляюцца прыслоўнымі пашыральнікамі і канкрэтызуюць, удакладняюць значэнне пэўнага слова, лінгвісты вылучаюць свабодныя пашыральнікі, што патлумачваюць граматычную аснову сказа ў цэлым. Гэтыя пашыральнікі ўпершыню тэрміналагізавала і ўвяла ў навуковы абыходак Н. Ю. Шведава як дэтэрмінаваныя члены сказа (дэтэрмінанты): дэтэрмінаваны аб'ект і дэтэрмінаваная акалічнасць [*Шведова*, 1964].

***Дэтэрмінаваныя дапаўненні*** (аб'екты) уваходзяць у структуру сказа не ў якасці залежнага кампанента словазлучэння (што характэрна для дапаўнення), а як свабодная словаформа, ужыванне якой не прадвызначаецца ніякім словам, а абумоўлена зместам граматычнай асновы: *Ад мамы пахла бэзам і ласкавай цеплынёй* (А. Асіпенка); *Мне вельмі падабаюцца спевы ляснога жаваранка* (Я. Колас); *У яго перахапіла дыханне* (У. Караткевіч). Звычайна ў ролі дэтэрмінаваных дапаўненняў выступаюць словаформы ў давальным, а таксама родным склоне з прыназоўнікамі *у, ад, для* і некаторых іншых.

Н. Ю. Шведава кваліфікуе дэтэрмінаванае дапаўненне як «склонавае ці прыназоўнікава-склонавае спалучэнне, якое аба-

[30] Параўнайце іншае разуменне: «Прэдыкатыўнае азначэнне – 1) азначэнне, якое знаходзіцца ў атрыбутыўна-прэдыкатыўных адносінах з дзейнікам ці прамым дапаўненнем; 2) разнавіднасць іменнага састаўнога выказніка са значэннем прыметы: *брат касманаўт*» [*Сцяцко*, 1990, *110*].

значае асобу ці прадмет, што звязана з прэдыкатыўнай асновай сказа адносінамі накіраванасці, значэннем аднесенасці» [*Шведава*, 1964, *80*].

Асновай для кваліфікацыі дэтэрмінаваных дапаўненняў як самастойных пашыральнікаў сказа служаць (у сукупнасці) наступныя прыметы: «а) выражаецца формамі ўскосных склонаў назоўніка ці займенніка без прыназоўніка і з прыназоўнікам, афармленасць і ўжыванне якіх не прадвызначаецца ніякім канкрэтным словам выказвання; б) мае значэнне суб'екта, радзей аб'екта, у адносінах да якога ці ў сувязі з якім праяўляецца сітуацыя, што складае змест асноўнай часткі выказвання; в) уступае з асновай у граматычную сувязь свабоднага далучэння; г) звычайна размяшчаецца ў абсалютным пачатку сказа» [*Малащенко*, 1992, *47*].

***Дэтэрмінаваныя акалічнасці***, як і дэтэрмінаваныя дапаўненні, не залежаць ад канкрэтнага слова ў структуры сказа, а служаць «фонам» якой-небудзь сітуацыі, а таму і ўсяго выказвання ў цэлым, напр.: *Пад акном ройна шумелі старыя ліпы* (І. Шамякін); *На трэці дзень у яго галаве зложыўся пэўны план* (Я. Колас); *З прычыны добрай пагоды і святочнага дня сход асабліва мнагалюдны і шумны* (К. Крапіва). У адносінах да такіх лексем чэшскімі лінгвістамі П. Адамцом і У. Грабэ быў прапанаваны тэрмін ***сітуанты*** (ён жа прыняты рускімі сінтаксістамі Г. А. Золатавай і В. Б. Сірацінінай і інш.), пад якім разумеюцца «аўтаномныя кампаненты адвербіяльнага значэння, якія не вынікаюць з валентнасці прэдыката і якія пазней вызначаюць сказ; яны адносяць увесь змест сказа да пэўнага месца і часу, уключаюць яго ў прычынна-выніковыя адносіны» [*Адамец*, *Грабе*, 1968, *191*]. Такія лексемы перадаюць разнастайныя акалічнасныя характарыстыкі, выконваюць ролю «сітуацыйнай кулісы», маюць «рамачную функцыю»: *Нягледзячы на жнівеньскую цеплыню, Серафіма Іванавіча крыху ліхаманіла* (А. Асіпенка). Н. Ю. Шведавай адзначаўся і той момант, што такіх кампанентаў у структуры сказа можа быць некалькі, напр.: *У першыя верасне́ўскія дні на полацкія вуліцы прыйдзе свята, якога горад яшчэ не ведаў* (У. Арлоў); *Пасля дажджу ў жнівеньскі адвячорак асабліва востра пахла каровамі, полем і малаком, якое каровы неслі* (І. Шамякін).

Сітуанты могуць быць апушчаны без шкоды для структуры і семантыкі сказа, бо яны толькі дапаўняюць асноўную інфармацыю ўказаннем на розныя акалічнасці. Вось гэтай сваёй неабавязковасцю (факультатыўнасцю) сітуанты адрозніваюцца ад дэтэрмінаваных дапаўненняў, наяўнасць якіх (у большасці выпад-

каў) звязваецца з утварэннем пэўных канструкцый (звычайна безасабовых, інфінітыўных і пасесіўных). Хаця ў некаторых выпадках і сітуанты з’яўляюцца неабходным структурным кампанентам безасабовых сказаў са значэннем стану навакольнага асяроддзя ці адчування жывых істот: *На душы зноў пасвятлела* (В. Карамазаў). Параўн.: *Цёпла. Мне цёпла. Пад снегам цёпла. На двары цёпла. У маі ўжо цёпла*.

Прэдыкатыўная аснова сказа, акрамя адзіночных дэтэрмінантаў і сітуантаў, можа пашырацца цэлай дэтэрмінаванай групай – гэта «аб’яднанні рознаіменных неаднародных даданых членаў, якія не ўступаюць у азначальныя ці ўдакладняльныя адносіны адзін з адным» [*Шведова*, 1964, *93*], напр.: *Пад варыўнёю на цвёрдую ўтаптаную дарожку нацерушыла дробнага снегу, як інею* (І. Пташнікаў).

Варта звярнуць увагу, што адназначнага стаўлення да прапанаванага паняцця і тэрміна ў сучаснай лінгвістыцы не існуе. Так, Г. А. Золатава пагаджаецца з вылучэннем дэтэрмінантаў, але толькі пад тэрмінам пашыральнікаў сказа, і толькі ў дачыненні да сітуантаў, тым самым звужаючы гэтае паняцце [*Золотова*, 1973, *105*]. Л. Д. Часнакова, наадварот, сцвярджае, што «тэрмінам *дэтэрмінант* можна абазначыць больш шырокую групу з’яў, чым гэта прынята ў цяперашні час» [*Чеснокова*, 1991, *30–31*]: ад пашыральнікаў словазлучэнняў – зваротаў – простых сказаў да пашыральнікаў складаных сказаў.

Некаторымі лінгвістамі дэтэрмінанты і сітуанты праз іх ролю ў пабудове сказа, а таксама праз характар сувязі выводзяцца за межы традыцыйных членаў сказа. Аднак тое, што вылучаюцца яны, як правіла, сярод ускосных дапаўненняў, а таксама акалічнасцей месца, часу, прычыны і некаторых іншых, дае падставы іншым мовазнаўцам разглядаць такія кампаненты ў якасці членаў сказа. «Вызначаючы месца дэтэрмінантаў у сістэме даданых членаў сказа, асобна падкрэслім, што гэта не новыя даданыя члены, а толькі асобныя выпадкі функцыянавання акалічнасцей і дапаўненняў, спецыфічнай уласцівасцю якіх з’яўляецца асобная пазіцыя ў сказе, што абумоўлівае невыразнасць сувязяў іх з іншымі членамі сказа», а таму «дэтэрмінант – гэта даданы член сказа (акалічнасць ці дапаўненне) з паслабленай сінтаксічнай сувяззю» [*Бабайцева*, 1988, *81*].

У беларускім мовазнаўстве дэтэрмінанты разглядаюцца як даданыя члены: «Дэтэрмінантамі называюцца даданыя члены сказа (акалічнасці і дапаўненні), якія адносяцца да ўсяго сказа, азначаю-

чы яго ў цэлым, а не толькі галоўны член аднасастаўнага ці адзін з галоўных членаў двухсастаўнага сказа» [*Бандарэнка*, 1986, *149*].

Асноўны ж аргумент абсалютнага непрыняцця гэтай канцэпцыі можна звесці да аднаго пастулату: «словаформа ўваходзіць у склад сказа толькі праз сувязь з іншымі словам» [*Всеволодова*, 2000, *166*], а таму «т. зв. *дэтэрмінант* на самай справе заўсёды з'яўляецца пазіцыяй ці прыслоўнай, ці абумоўленай» [*тамсама*, *327*].

## ЛІТАРАТУРА

*Адамец, Грабе, 1968*: Адамец П., Грабе В. Трансформация, синтаксическая парадигматика и члены предложения // Slavia. 1968. Т. 34, № 2. С. 185–192.

*Бабайцева, 1988*: Бабайцева В. В. Система членов предложения в современном русском языке. М.: Просвещ., 1988. 159 с.

*Бандарэнка, 1986*: Бандарэнка Т. П. Даданыя члены сказа // Беларуская граматыка: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1986. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 131–150.

*Бурак, 1987*: Бурак Л. І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн.: Універсітэцкае, 1987. 320 с.

*Бурак, 1994*: Бурак Л. І. Структурнае чляненне сказа // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелЭн, 1994. С. 536–538.

*Всеволодова, 2000*: Всеволодова М. В. Теория функционально-коммуникативного синтаксиса: Учеб. М.: Изд-во МГУ, 2000. С. 319–336.

*Золотова, 1973*: Золотова Г. А. Очерк функционального синтаксиса русского языка. М.: Наука, 1973. 352 с.

*Клюсаў, 1972*: Клюсаў Г. Н. Уводзіны // Клюсаў Г. Н., Юрэвіч А. Л. Сучасная беларуская пунктуацыя. Мн.: Вышэйш. шк., 1972. С. 3–46.

*Кротевич, 1960*: Кротевич Е. В. Слово, часть речи, член предложения. К вопросу о их соотношении. Львов: Изд-во Львов. ун-та, 1960. 19 с.

*Лепешаў, 2002*: Лепешаў І. Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік. Гродна: ГрДУ, 2002. С. 192–194.

*Малащенко, 1992*: Малащенко В. П. О синкретизме детерминантов // Явления синкретизма в синтаксисе русского языка: Сб. Ростов н/Д.: Изд-во Рост. ун-та, 1992. С. 43–56.

*Міхневіч, 1973*: Міхневіч А. Я. «Прэдыкатыўнае азначэнне» ў беларускай і іншых славянскіх мовах // Тыпалогія і ўзаемадзеянне славянскіх моў і літаратур. Мн., 1973. С. 156–157.

*Михневич, 1990*: Михневич А. Е. Синтаксис // Кривицкий А. А. и др. Белорусский язык для говорящих по-русски. Мн.: Вышэйш. шк., 1990. С. 250–273.

*Наркевіч, 1959*: Наркевіч А. І. Даданыя члены сказа // Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Сінтаксіс. Мн.: Дзярж. вуч.-пед. выд-ва, 1959. С. 36–99.

*Рабчинская, 1994*: Рабчинская И. А. Функциональные резервы простого предложения. Мн.: Нар. асвета, 1994. 130 с.

*Сцяцко, 1990*: Сцяцко П. У. і інш. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. Мн.: Вышэйш. шк., 1990. 222 с.

*Тарашкевіч*, *1991*: Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ: Факсімільнае выданне. Мн.: Нар. асвета, 1991. 136 с.

*Шведова*, *1964*: Шведова Н. Ю. Детерминирующий объект и детерминирующее обстоятельство как самостоятельные распространители предложения // Вопр. языкознания. 1964. № 6. С. 77–93.

*Чеснокова*, *1991*: Чеснокова Л. Д. Проблема членов предложения в теоретическом и методическом аспектах. Таганрог: ТГПИ, 1991. 215 с.

*Яўневіч*, *Сцяцко*, *1987*: Яўневіч М. С., Сцяцко П. У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. Мн.: Вышэйш. шк., 1987. 272 с.

# АДНАСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ

## Лінгвістычны статус аднасастаўных сказаў

У пачатку XX ст. у беларускай лінгвістыцы не вылучаліся сказы аднасастаўныя, бо разглядаліся яны, як правіла, у межах няпоўных двухсастаўных, паколькі да няпоўных адносіліся сказы, «у якіх няма навочных дзейніка і выказніка, але яны само сабою мысляцца, напр.: *Працаваць вучыся зрана, у маладыя гады; Далей паложыш – бліжэй возьмеш; Жыта здратавалі коньмі*» [*Лёсік*, 1926, *45*]. Між тым некаторыя іх тыпы тэрміналагізаваліся як сказы адначленныя – іменныя ці дзеясловыя. Так, да сказаў іменных (выражаных адным дзейнікам) адносілі наступныя канструкцыі: *Сорам! Гвалт!; Дзень добры! Дабранач!; Тата! Лыска!; Вады! Спаць!*; да сказаў дзеяслоўных (выражаных адным выказнікам) – тыпу: *Світае; Грыміць* [*тамсама*, *52–54*]. Але ўжо бліжэй да сярэдзіны стагоддзя нароўні са сказамі двухсастаўнымі, што маюць абодва галоўныя члены, сталі адрозніваць і сказы толькі з адным галоўным членам – аднасастаўныя[31]. «Аднасастаўныя сказы з’яўляюцца па сваёй структуры сказамі зусім закончанымі, што не патрабуюць папаўнення адсутнага члена. Гэтым яны адрозніваюцца ад няпоўных сказаў з прапушчаным дзейнікам або выказнікам» [*Рысіна*, 1939, *110*].

Разам з тым і на сённяшні дзень лінгвісты не маюць адзінага погляду на тэрміналагізацыю самога прэдыкатыўнага цэнтра аднасастаўных сказаў. У беларускай сінтаксічнай навуцы выразна

[31] Размежаванне паняццяў двухсастаўныя / аднасастаўныя сказы было праведзена А. А. Шахматавым у кнізе «Синтаксис русского языка» (1941). З яго канцэпцыі вынікала, што аднасастаўныя сказы – гэта асобыя канструкцыі, прэдыкатыўную аснову якіх утварае адзін галоўны член, падобны ці да выказніка, ці да дзейніка двухсастаўнага сказа.

акрэсліліся дзве пазіцыі ў дачыненні да сінтаксічнай характарыстыкі граматычнай асновы такіх сказаў.

Згодна з адной з іх, прэдыкатыўная аснова аднасастаўных сказаў, услед за А. А. Шахматавым, тэрміналагізуецца як *галоўны член*, бо ён адзін арганізуе прэдыкатыўную аснову сказа, не прыстасоўваючы сваю форму ні да якога члена сказа, хаця і прыпадабняецца фармальна да дзейніка ці выказніка. «Аднак паводле значэння галоўны член аднасастаўнага сказа не можа быць атаясамлены ні з дзейнікам, ні з выказнікам двухсастаўнага сказа: ён абазначае незалежную адзнаку ці сцвярджае наяўнасць прадмета, але не выражае адносінаў прадмета і адзнакі, як дзейнік і выказнік двухсастаўнага сказа» [*Бурак*, 1987, *103*]. Больш таго, некаторымі лінгвістамі катэгарычна зазначаецца, што, «характарызуючы структуру дзеяслоўных аднасастаўных сказаў, трэба карыстацца тэрмінам *галоўны член* (аднасастаўнага сказа)», «называць такі член *выказнікам* няправільна» [*Бандарэнка*, 1986, *211*].

Процілеглую пазіцыю абгрунтавала рускі мовазнавец Е. М. Галкіна-Федарук, якая ў многім дапоўніла і пашырыла вучэнне Шахматава пра аднасастаўныя сказы. «Зыходзячы з таго, што дзейнік і выказнік з'яўляюцца цэнтрамі, якія арганізуюць сказ, то неабходна і канструкцыі з адным галоўным членам аналізаваць у адпаведнасці з гэтымі цэнтрамі-арганізатарамі» [*Галкина-Федорук*, 1959, *12*]. Акрамя таго, у апошні час выказнік разглядаецца як член сказа, што азначае не прымету дзейніка, а прэдыкатыўную прымету прадмета маўлення, якая можа быць і не названая ў дзейніку, што тэарэтычна апраўдвае выкарыстанне тэрміна *выказнік* [Бабайцева 1988, 117]. Гэтага пункту гледжання трымаюцца ў беларускай сінтаксічнай навуцы М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко, В. М. Абабурка, Л. А. Антанюк і інш. лінгвісты, таму аднасастаўныя сказы імі падзяляюцца на дзве групы – дзейнікавыя і выказнікавыя [*Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *137*; *Абабурка*, 1992, *189*; *Сцяцко*, 1994, *16*; *Антанюк*, 2003, *261*].

Нярэдка навукоўцы карыстаюцца абодвума тэрмінамі як сінанімічнымі паняццямі дзеля таго, каб пазбегнуць тэрміналагічнага разрыву ў курсе вышэйшай школы і школьнай практыцы.

Значыць, ***аднасастаўныя сказы*** – гэта такія сказы, прэдыкатыўны цэнтр якіх складае адзін галоўны член.

Спецыфіка аднасастаўных сказаў з пункту гледжання іх фармальнай арганізацыі ў тым, што:

- гэта асобы семантыка-структурны тып простага сказа, які арганізуецца на аснове адзінага галоўнага члена;

● адсутнасць другога галоўнага члена – не паказчык яго структурнай непаўнаты;

● калі ў двухсастаўных сказах прэдыкатыўныя адносіны выражаюцца аналітычна, праз адносіны дзейніка і выказніка, то галоўны член займае абсалютна незалежную пазіцыю і прэдыкатыўнасць выражаецца праз пазіцыю аднаго члена сказа – сінтэтычна.

Аднасастаўныя сказы варта размяжоўваць з няпоўнымі.

***Няпоўнымі*** з'яўляюцца сказы з лексічна незамешчанымі сінтаксічнымі пазіцыямі, г. зн. «у якіх фармальна адсутнічае адзін або некалькі членаў сказа, што падказваюцца абставінамі размовы, кантэкстам ці ўласнымі лексіка-граматычнымі сродкамі сказа» [*Лапаў*, 1966, *451*].

Няпоўнымі лічацца сказы з пункту погляду іх структурнай арганізацыі пры супастаўленні з поўнымі мадэлямі; у сэнсе ж перадачы інфармацыі яны паўнавартасныя, камунікацыйна дастатковыя адзінкі (калі абапіраюцца на кантэкст ці маўленчую сітуацыю), напр.: *За дуброваю на Панскім возеры жаласна енчылі кнігаўкі. <u>Лёталі і плакалі</u>* (В. Карамазаў); – *<u>Адзін ільготны</u>, калі ласка* (у касе метро).

Апушчаныя члены сказа лёгка ўзнаўляюцца з кантэксту, але ў большасці выпадкаў пастаноўка іх на свае пазіцыі ў структуры сказа парушае яго лаканічнасць і выразнасць, а ў некаторых выпадках выяўляе ненатуральнасць маўлення, напр.: *За тыдзень «<u>Масквіч</u>» застаяўся пад соснамі, застыў. Не заводзіцца. Скрыгіча толькі, чыркае ды зумкае напуста, не абуджаючы «божай іскры»* (Я. Брыль) (у другім і трэцім сказах прапушчаны дзейнік).

Апускацца могуць як даданыя, так і галоўныя члены ў двухсастаўных і аднасастаўных сказах. Самымі разнастайнымі паводле граматычнага складу з'яўляюцца няпоўныя сказы ў дыялагічнай мове, бо шмат якую вербальную інфармацыю дапаўняюць або замяняюць пазамоўныя фактары: міміка, жэсты, самі абставіны. Таму ў склад няпоўных сказаў уваходзяць толькі тыя кампаненты, якія падтрымліваюць і разгортваюць далейшае паведамленне, напр.: – *Куды, кума, едзеш? – За трыдзевяць зямель, у трыдзесятае царства. – Чаго? – Там, кажуць, курэй і каршуны не дзяруць... – А бараны ў тым царстве ёсцека? – аблізнуўся воўк. – Ды імі там хоць гаць гаці!* (Казка).

У залежнасці ад сферы выкарыстання адрозніваюць дзве разнавіднасці няпоўных сказаў: кантэкстуальныя і сітуацыйныя, «паколькі кантэкст і сітуацыя абумоўліваюць непаўнату саставу

сказа і разам з тым дапамагаюць зразумець гэтыя сказы, нягледзячы на пропуск тых ці іншых членаў» [*Бандарэнка*, 1986, *244*].

Кантэкстуальнымі называюцца няпоўныя сказы з неназванымі членамі сказа, якія згадваліся ўжо ў папярэднім кантэксце: *Шчодра цвіў гэтай вясною сад. Спачатку вішні і грушы, потым – яблыні* (І. Мележ) – апушчаныя выказнікі; *Прапалі парасяты. А былі ж – люба-дарага зірнуць: чысценькія, беленькія, сыценькія – хоць на выставу* (Т. Супрановіч) – апушчаны дзейнік; *У нас цяпер яблыкаў няма куды дзяваць. Сыплюцца, гніюць. Свінням па кашы носім* (А. Жук) – у 2-м сказе прапушчаны дзейнік, у 3-м – дапаўненне.

Сітуацыйнымі называюцца няпоўныя сказы з неназванымі членамі, якія падказваюцца акалічнасцямі ў пэўных абставінах, яны зразумелыя толькі з самой сітуацыі. У такіх сказах маўленчая сітуацыя кампенсуе пропуск, а форма наяўных членаў сказа ўказвае на граматычную сувязь з імі, напр.: – *На вакзал, калі ласка! – Не. У парк еду. – Калі ласка! – Сядайце* (А. Жук); *Ваш праязны!* (у трамваі).

Пераходную групу паміж поўнымі і няпоўнымі сказамі займаюць ***эліптычныя сказы*** (ад грэч. *elleipsis* ‘пропуск’), у якіх адсутнічае дзеяслоў-выказнік, накшталт: *У канверце два лісткі* (Ф. Янкоўскі); *У чэрвені – цяпло, у ліпені – гаркота...* (Т. Бондар); *На сталах рознакаляровыя карты, турыстычныя часопісы, рэкламныя буклеты* (Л. Левановіч). У адрозненне ад няпоўных сказаў, сэнс якіх вынікае толькі з кантэксту ці пэўных абставінаў, эліптычныя сказы – адзінкі сэнсава і сінтаксічна самастойныя, змест якіх зразумелы са структуры саміх сказаў. Пры адсутнасці выказніка ў сказ абавязкова ўваходзяць дадаваныя члены з яго складу (звычайна акалічнасці месца), значэнне якіх якраз і кампенсуе пропуск выказніка, напр.: *На стале тры экземпляры кніжкі* (Ф. Янкоўскі); *Пад вокнамі – бэз* (В. Карамазаў); *На двары – сінь. А на ўсходзе – чырвань* (А. Чарнышэвіч).

На сучасным этапе сінтаксічнай навукі ўсё больш прыхільнікаў набывае гіпотэза, згодна з якой шахматаўскі падзел сказаў на адна- і двухсастаўныя ўжо неактуальны. Так, Г. А. Золатава адзначае, што вылучэнне аднасастаўных сказаў было прагрэсіўным крокам для ўпарадкавання сінтаксічных канструкцый, але зараз, калі размяжоўваюцца паняцці мовы і маўлення, яно вычарпала сябе, таму што за аднасастаўныя сказы 1) прымаліся маўленчыя рэалізацыі двухсастаўных мадэляў з кантэкстным ці сітуацыйным эліпсісам (*Пішу пісьмо; Сёння выдадуць стыпен-*

*дыю; У газеце пішуць пра новае павышэнне цэн; Дзе будзеце сустракаць свята?*) і 2) не было пераадолена марфалагічнае абмежаванне ва ўяўленнях аб спосабах выражэння дзейніка (ён можа быць не толькі ў назоўным склоне) [*Золотова*, 1986, *76*]. А таму, зыходзячы з таго, што сказ служыць акту мыслення (значыць, суб'ект і прэдыкат думкі-суджэння павінны адпавядаць яго двум граматычным цэнтрам), лінгвісты прапануюць разглядаць дзейнік не толькі ў назоўным, але і ва ўсіх астатніх склонах. Так, французскі лінгвіст М. Гіро-Вэбер прапанавала тэрмін *сінтаксічны дзейнік* у дачыненні да іменнага кампанента ў любым склоне, які спалучаецца з выказнікам прэдыкатыўнай сувяззю і ўтварае правільнае і граматычна дастатковае выказванне: *Бацькі не было; Мне пашанцавала; Часу не хапае* [*Гиро-Вебер*, 1979, *66*]. Польская даследчыца Д. Вячорэк прапануе тэрміналагізаваць такога кшталту дзейнікі як *непрамыя* (*ускосныя*, *ненамінатыўныя*) і дыферэнцыруе іх так: генітыўны: *Цудаў на свеце не бывае*; датыўны: *Мне нездаровіцца*; акузатыўны: *Хворага нудзіць*; інструментальны: *Ударыла громам*; *З хворым дрэнна*; лакатыўны: *На акіяне штарміла*; *У скронях закалола* [*Вечорек*, 1991, *73*].

У дадзеным выпадку, як бачна, на ролю дзейніка прапануецца семантычны суб'ект, і тым самым сумяшчаюцца фармальны і семантычны аспекты сказа (дзейнік / семантычны суб'ект і выказнік / семантычны прэдыкат).

## Дзеясловўныя аднасастаўныя сказы

Напачатку класіфікацыя аднасастаўных сказаў у беларускім мовазнаўстве была невыразнай і шмат у чым заблытанай. Так, аднасастаўныя сказы падзяляліся на два тыпы ў залежнасці ад характару галоўнага члена – сказы з выказнікам і сказы з дзейнікам, але адны і тыя канструкцыі траплялі ў абодва тыпы. Параўн. гэтую дыферэнцыяцыю ў розныя гады: у «Сінтаксісе беларускай мовы» (1939), раздзел напісаны С. І. Рысінай, і ў «Курсе сучаснай беларускай літаратурнай мовы» (1959), раздзел падрыхтаваны М. Г. Булахавым (табл. 10). Калі ў першай класіфікацыі яўна адсутнічае лагічнасць і сістэмнасць (сказы клічныя і апісальныя размешчаны ў абодвух тыпах), то больш познія працы пазбаўленыя гэтага недахопу [*Булахаў*, 1959; *Гурскі*, 1962].

*Табліца 10*

**КЛАСІФІКАЦЫЯ АДНАСАСТАЎНЫХ СКАЗАЎ**

| Сінтаксіс 1939 | | Курс 1959 | |
|---|---|---|---|
| Аднасастаўныя сказы | | Аднасастаўныя сказы | |
| • сказы з выказнікам:<br>іменным<br>*клічныя*<br>*указальныя*<br>*апісальныя*<br>дзеяслоўным<br>*пэўна-асабовыя*<br>*няпэўна-асабов.*<br>*абагулена-асабов.*<br>*безасабовыя* | • сказы з дзейнікам<br>*клічныя*<br>*апісальныя*<br>*з колькасна-іменным злучэннем* | • бяздзейнікавыя<br>*пэўна-асабовыя*<br>*няпэўна-асабов.*<br>*агульна-асабов.*<br>*безасабовыя*<br>*інфінітыўныя* | • безвыказнікавыя<br>*намінатыўныя (=назыўныя)* |

У сучаснай лінгвістыцы пры класіфікацыі аднасастаўных сказаў да ўвагі прымаецца не толькі іх фармальна-граматычная характарыстыка, але і семантыка. Калі ўлічваць толькі граматычныя паказчыкі – спосабы выражэння галоўных членаў, то выразна можна вычленіць «марфалагічныя» тыпы такіх сказаў: *Цішыня. Холадна. Змяркаецца. Сціхні! Маўчаць!* Але калі ўзяць такія пары слоў, як *дыхаецца* і *ўсміхаецца*, *гразка* і *моцна*, *цяплынь* і *імкненне*, *зябіць* і *крычаць*, то відавочна, што пры фармальным падабенстве яны адрозніваюцца сваім сінтаксічным патэнцыялам. Першыя могуць арганізоўваць аднасастаўныя сказы, а другія – толькі ўваходзіць у двухсастаўныя ў якасці аднаго з галоўных членаў ці быць даданым.

Пры вылучэнні тыпаў дзеяслоўных аднасастаўных сказаў кіруюцца структурна-семантычным прынцыпам, сутнасць якога ў тым, што пры дыферэнцыяцыі «неабходна ўлічваць семантыку сказа па ступені пэўнасці дзеяння і суадносінаў гэтай семантыкі з формай выражэння галоўнага члена» [*Бандарэнка*, 1986, *210*] (табл. 11).

*Табліца 11*

**АДНАСАСТАЎНЫЯ ДЗЕЯСЛОЎНЫЯ СКАЗЫ**

| Асабовыя | Неасабовыя |
|---|---|
| • пэўна-асабовыя<br>• няпэўна-асабовыя | • безасабовыя<br>• інфінітыўныя |
| • сказы з абагульненым значэннем | |

***Пэўна-асабовыя*** – такія аднасастаўныя сказы, якія абазначаюць дзеянне непасрэдных удзельнікаў маўлення – моўцы ці яго суразмоўцы, таму галоўны член выражаецца дзеясловам 1-й ці 2-й асобы адзіночнага (радзей) множнага ліку цяперашняга або будучага часу абвеснага, а таксама загаднага ладу: *Люблю вясновыя дажджы, чакаю іх, як абнаўлення* (Н. Маеўская); *Табе складаю шчыры свой санет, прапрадзедаў маіх жывая мова…* (Е. Лось); *Ну, дзядзька Паўлюк, бывай і ліхам не памінай* (М. Зарэцкі).

У такіх сказах акцэнтуецца само дзеянне, а значэнне канкрэтнай асобы перадаецца асабовымі канчаткамі дзеяслова (дзейнік *я, ты, мы, вы* тут з'яўляецца збыткоўным).

Лаканічнасць і дынамізм пэўна-асабовых сказаў спрыяе іх актыўнаму выкарыстанню ў афіцыйна-справавым стылі: *Прашу ўключыць мой даклад у канферэнцыю; Звяртаю вашу ўвагу…*; эпісталярным жанры: *Віншую…* , *Жадаю…* , *Зычу…* , у гутарковай мове і творах мастацкай літаратуры, асабліва паэзіі.

***Няпэўна-асабовыя*** – аднасастаўныя сказы, якія абазначаюць дзеянне няпэўнай або невядомай асобы, галоўны член іх выражаецца дзеясловам у форме 3-й асобы множнага ліку цяперашняга, будучага ці прошлага часу, напр.: *У хаце спявалі. Спявалі ціха* (Ф. Янкоўскі); *У дзверы аўдыторыі нясмела пастукалі.*

Няпэўна-асабовыя сказы выкарыстоўваюцца ў трох выпадках:

- калі суб'ект дзеяння вядомы, але няма патрэбы яго называць: *Вас выклікаюць у дэканат; Яго чакаюць дома к абеду; Пасажыраў запрашаюць прайсці на пасадку* (магчымыя ўдзельнікі падказваюцца характарам самога дзеяння і акалічнасцю месца);
- суб'ект дзеяння невядомы: *Звесткі перадалі праз суседа; На балконе тэатра патушылі святло; Да вас прыйшлі;*
- суб'ект дзеяння знарок апускаецца: *Кажуць, што …*; *Мне патэлефанавалі і паведамілі пра гэта; Сёння прынясуць часопісы.*

Такія сказы амаль не выкарыстоўваюцца ў навуковым і афіцыйна-справавым стылі (праз сваю семантыку няпэўнасці), за выключэннем аб'яў, а пашыраны ў размоўным і мастацкім, напр.: *Пра чалавека звычайна мяркуюць па яго справах; Стварылі нам усе ўмовы, // Каб адвучыць ад роднай мовы* (С. Грахоўскі); *Мне кажуць пра прарокаў* (Н. Арсеннева).

Традыцыйна ў беларускім мовазнаўстве сярод групы асабовых сказаў вылучаюць ***абагульнена-асабовыя сказы***. Аднак паводле свайго граматычнага выражэння галоўны член такіх сказаў цалкам супадае ці з формай, якую мае галоўны член аднасастаўнага пэўна-асабовага сказа (дзеяслоў у форме 2-й ці 1-й асобы адзіночна-

га або множнага ліку цяперашняга, будучага часу ці загаднага ладу) або (значна радзей) з формай, якую мае галоўны член нявэўна-асабовага сказа (дзеяслоў у форме 3-й асобы). Адрозненне т. зв. абагульнена-асабовых сказаў ад названых тыпаў заключаецца ў іх семантыцы: яны абазначаюць дзеянне, што ў аднолькавай ступені можа адносіцца да любой асобы, да кожнага: *Добрага чалавека не перахваліш* (М. Лынькоў); *Любіце і шануйце родную мову!* (Я. Колас); *Не патрабуй ад жыцця болей, чым ты варты* (Г. Вашчанка); *Забілі зайца не забілі, але ж, брат, гуку нарабілі* (Я. Колас).

Семантычная асаблівасць такіх сказаў у тым, што яны адлюстроўваюць назіранні, якія звязаны з абагульняльным характарам жыццёвых з'яў і сітуацый. Падкрэсліваюць, што гэтыя назіранні датычацца не канкрэтнага чалавека, а любога, калі ён сутыкаецца з падобнымі праявамі (гэтым абумоўленыя і граматычныя адрозненні ад пэўна-асабовых сказаў, што выражаюць аднесенасць да канкрэтнай асобы): *Ідучы да свайго, не тапчы чужога* (Л. Галубовіч); *Будзем плыць памалу далей, хоць далёка берагі* (Я. Колас). Абагульняльны характар дзеяння і суаднесенасць яго з многімі асобамі дазваляюць перадаваць у такіх сказах паведамленні, якія ўспрымаюцца як выснова або заключэнне адносна розных з'яў і фактаў рэчаіснасці: *Раней чым падумаць, скажы, бо падумаўшы, ужо не скажаш* (М. Коўзкі); *Жывём калгасам, паміраем аднаасобна* (Л. Галубовіч); *Працуй як трэба, то будзеш спаць, хоць шылам калі* (Я. Колас); *Увесь час варушымся, збіраем, канца патрэбам тым не маем* (Я. Колас).

Таму, зыходзячы з іх асноўнай семантычнай прыметы – абагульненасці, абсалютна неправамерна і немэтазгодна вылучаць іх толькі ў групе аднасастаўных асабовых сказаў, таму што такая семантыка ўласціва і інфінітыўным, і безасабовым, а таксама двухсастаўным сказам[32], параўн.: *Справіцца з бядою можна грамадою* (Я. Колас); *Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем, каб душою не ачарсцвець, каб не страціць святое штосьці* (Р. Барадулін); *Кінь ты жарты, чалавеча, бо тут жарты недарэчы* (Я. Колас). Такім чынам, больш карэктна і мэтазгодна гаварыць пра ***сказы з абагульненым значэннем*** як у дачыненні да розных тыпаў аднасастаўных сказаў, так і ў адносінах да сказаў двухсастаўных.

---

[32] Параўнайце падобны пункт гледжання, дзе двухсастаўныя сказы адносяцца да абагульнена-асабовых: *А па дарозе ты з кашом у лес шыбуеш ціхачом* (Я. Колас); *І ў які б бок вы ні пайшлі, усюды вас акружае лес* («Звязда»). «У гэтых сказах дзейнікі *ты, вы* не паказваюць на канкрэтную асобу, а маюць агульны сэнс (наогул «ты», «вы», кожны, усякі)» [*Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *137–138*].

***Безасабовымі*** з'яўляюцца аднасастаўныя сказы, якія называюць працэс або дзеянне ці стан, што адбываюцца незалежна ад актыўнага дзеяча: *Ветрана з самага рання* (А. Вярцінскі); *Непрыкметна неяк развіднела* (В. Быкаў); *А на душы, бы ў склепе, сыра...* (Р. Барадулін).

Паводле марфалагічнай выражанасці галоўнага члена адрозніваюць безасабовыя сказы з галоўным членам, які прадстаўлены:

1) безасабовым дзеясловам: *Душна, ціха вечарэла* (А. Жук); *На адзіноце з дубровай добра думалася* (В. Карамазаў); *За акном змяркаецца* (М. Гамолка); *Чуць марозіла* (І. Шамякін); *Вечна чалавеку нечага бракуе* (А. Кудравец); *Задажджыла. Як восенню* (Т. Бондар);

2) асабовым дзеясловам у форме безасабовасці (форма 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага часу або ніякага роду для прошлага часу): *Здаецца, навальніцу прагнала* (У. Ягоўдзік); *Пахла свежаўскапанай зямлёй* (Л. Дайнека); *Часу катастрафічна не хапае* (А. Кудравец);

3) прэдыкатывам (са звязкай ці без): *Росна і сонечна* (Я. Брыль); *Сіле розуму не трэба* (народн.); *Пуста без цябе* (С. Грахоўскі); *На дварэ было ўжо цёмна, халаднавата і, здаецца, расяна* (Г. Далідовіч); *Ціха зрабілася ў наваколлі* (Р. Барадулін).

Часта прэдыкатывы выкарыстоўваюцца ў спалучэнні з інфінітывам: *Без праўды можна існаваць, а жыць без праўды немагчыма* (С. Грахоўскі); *Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем...* (Р. Барадулін);

4) дзеепрыметнікам залежнага стану (са звязкай ці без): *У маленькім пакойчыку было моцна накурана* (Л. Арабей); *На небе было кучамі насыпана зорак* (М. Гамолка); *З мінулым пакончана* (А. Асіпенка);

5) фразеалагізаванымі канструкцыямі: *Наўсцяж ад гумна было рукой падаць да нізенькай і нейкай адзінокай пры хлеўчуку хацінкі* (В. Быкаў); *Дзяцей як ветрам выдзьмула; Мне неяк стала не па сабе* (М. Зарэцкі); *Праўда, лейтэнанту цяпер было не да курава* (В. Быкаў).

Спецыфічна беларускамоўнымі з'яўляюцца безасабовыя сказы, галоўны член якіх:

- выражаны адмоўным словам *няма*: *Няма вяртання і не будзе* (Н. Гілевіч); *Цярплівей нас няма на свеце, даверлівей за нас няма* (С. Грахоўскі);
- утвораны на аснове ўстойлівых спалучэнняў дзеясловаў тыпу: *брацца, збірацца, хіліцца, ісці* і пад. з прыназоўнікава-склона-

вымі формамі назоўніка: *На дзень занялося* (народн.); *Хілілася да восені. Ужо моцна хілілася. Жоўклі каштаны* (У. Караткевіч); *Бралася пад поўнач* (У. Карпаў); *На дождж верне* (В. Іпатава); *Схіліла з поўдня* (Я. Брыль); *Бралася на трэцюю гадзіну дня* (У. Ягоўдзік); *Збіраецца на дождж* (І. Грамовіч); *На мароз бярэцца* (М. Лобан);

● арганізаваны спалучэннямі адмоўя, інфінітыва і займенніка ці прыслоўя: *У нас цяпер яблыкаў <u>няма куды дзяваць</u>* (А. Жук); *Поту з твару і то <u>няма калі выцерці</u>* (А. Асіпенка); *<u>Гаварыць</u> больш <u>не было аб чым</u>. І маўчанне рабілася нясцерпным...* (У. Караткевіч); *Цяпер ужо <u>не было як заставацца</u> ў хаце. Богша выйшаў* (А. Асіпенка);

● выражаны словамі *відаць, чуваць* і *відно, чутно* ў сцвярджальных ці адмоўных сказах: *У чорных вокнах <u>не відаць было</u> і чырванаватых водсветаў газнічак* (В. Быкаў); *За спакойным тонам пісьма <u>чуваць</u> вялікае хваляванне, можа, нават гора* (У. Дамашэвіч).

Асобны тып безасабовых сказаў складаюць сказы адмоўныя, якія «з'яўляюцца безасабовымі толькі пры адмоўі» [Рысіна, 1939, *115*], а пры яго адсутнасці пераходзяць у асабовыя, параўн.: *Канспекта не было – Канспект быў.*

Безасабовыя сказы ў структуры тэксту ўжываюцца тады, калі патрабуецца адлюстраваць рэальнасць, у якой адбываюцца стыхійныя, некіруемыя чалавекам працэсы і з'явы, перадаць мімавольнасць і некантралюемасць пэўнага фізічнага ці псіхалагічнага стану асобы, непазбежнасць у ажыццяўленні пэўных дзеянняў, іх магчымасць ці немагчымасць. «Безасабовыя» сказы – гэта ўмоўны тэрмін для большасці такіх канструкцый, бо ён адлюстроўвае структурную асаблівасць – адсутнасць дзейніка. А паводле значэння яны якраз могуць перадаваць душэўны стан чалавека ці пэўныя працэсы, што адбываюцца ў яго арганізме ці з ім самім. Так, паводле семантыкі вылучаюць наступныя тыпы безасабовых сказаў, якія ўказваюць на:

а) змену часу сутак: *...Адвечарэла. Ціша – быццам шкло* (Г. Бураўкін); *Развіднялася. Чуліся людскія галасы, конскі храп...* (В. Карамазаў); *Перадсвітальны змрок пачынаў радзець. Святлела на ўсходзе* (У. Караткевіч); *На вуліцы вечарэе* (І. Грамовіч);

б) атмасферна-метэаралагічныя з'явы прыроды і змену надвор'я: *Было ветрана, сцюдзёна, снег, аднак, не ішоў. Можа, нават падмарожвала, але толькі ледзь-ледзь* (В. Быкаў); *Прыпар-*

*вала: збіралася на дождж* (Г. Далідовіч); *Над Гарадком грымела і бліскала* (В. Карамазаў);

г) праявы стыхійных прыродных сіл: *Па разбітай дарозе машыну кідала з аднае ямы ў другую* (М. Лобан); *Матацыкл павяло ўбок* (І. Шамякін); *Страху рве з хаты* (І. Пташнікаў);

д) стан чалавека:

фізічны: *Як касой рэзала бок* (І. Мележ); *Ва ўсіх добра круціла ў жываце ад голаду* (У. Караткевіч); *У галаве думкі мітусіліся, вострыя, калючыя. Аж балюча было ад іх галаве* (М. Зарэцкі); *Шумела ўвушшу* (Л. Дайнека);

псіхічны: *На душы ў капітана было тужліва і роспачна, як толькі і можа быць пасля пахавання* (В. Быкаў); *Усярэдзіне сэрца – пустэльна і гола* (М. Дукса); *Вельмі цяжка чалавеку аднаму* (А. Кудравец);

е) дзеянні міфічнай сілы: *Пашчасціла ж людзям. Куды яго панесла? Яму рупіла пабачыць кветку;*

ж) мадальна-валявыя значэнні: *Сёння нельга жыць душою кволымі* (С. Законнікаў); *Трэба змагацца за самога сябе з самім сабою* (Я. Брыль);

з) сцвярджэнне ці адмоўе: *Коням ёсць дзе пасвіцца, воку ёсць куды глядзець* (У. Караткевіч)*; Не было ні надзей, ні ратунку, ні выйсця, а пакут і разлук назаўжды – цераз край* (С. Грахоўскі).

***Інфінітыўныя сказы*** – аднасастаўныя сказы, галоўны член якіх выражаны незалежным інфінітывам; яны абазначаюць дзеянне магчымае, немагчымае, неабходнае ці пажаданае: *Старадаўняй Літоўскай Пагоні не разбіць, не спыніць, не стрымаць* (М. Багдановіч); *Нам бы шукаць якіх шляхоў далей ад блуду, а не чакаць сярод грахоў вялікіх цудаў* (А. Камоцкі).

Як асобны тып яны вылучаныя толькі ў другой палове XX ст. [*Булахаў*, 1959; *Гурскі*, 1962; *Бурак*, 1987; *Анічэнка*, 1998 і інш.], і таму ёсць важкія падставы, паколькі і структурай, і семантыкай яны адрозніваюцца ад сказаў безасабовых. Так, у безасабовых сказах інфінітыў – складнік галоўнага члена: *трэба схадзіць*, *неабходна прачытаць*, *варта зазначыць* – залежыць ад прэдыкатыва; у інфінітыўных – ён адзін займае пазіцыю галоўнага члена і не залежыць ні ад якога слова.

З дапамогай інфінітыўных сказаў перадаюцца разнастайныя сэнсавыя і эмацыянальныя адцэнні, якія немагчыма выразіць у сказах безасабовых, таму што ў іх дзеянне абстрагавана ад актыўнага дзеяча, а ў інфінітыўных яно скіраванае да нейкай канкрэтнай асобы ці групы людзей. Семантыка інфінітыўных сказаў

уключае спектр значэнняў – ад нерашучасці да грубага загаду. У залежнасці ад мадальных адцэнняў вылучаюць шэраг іх функцыянальных тыпаў [*Булахаў*, 1959, *140–141*]. Гэта сказы, у якіх выражаецца:

● павіннасць і неабходнасць, напр.: *Ехаць заўтра. Ледзь свет* (А. Куляшоў);

● непазбежнасць або прадвызначанасць наступлення пэўнай падзеі кшталту: *Быць бядзе!;*

● немагчымасць дзеяння (з выкарыстаннем часціц *не* або *ці*), напр.: *Каму, як не табе, паслухаць жывую музыку вясны?* (Т. Хадкевіч);

● пажаданасць ажыццяўлення дзеяння кшталту: *Дастаць бы кусок зямлі, пабудаваць сваю хату і жыць, нікога не баяцца, нікому не гнуцца* (Я. Колас);

● пабуджэнне (загад, дазвол і інш.), напр.: *Закрыць дарогу на суткі!* (В. Быкаў);

● нерашучасць, роздум, сумненне ў неабходнасці выканання дзеяння, напр.: *Ісці ці не ісці?* (П. Панчанка) і інш.

● намер высветліць штосьці, меркаванне або запытанне (выкарыстоўваюцца розныя пытальныя сродкі), напр.: *Ён маўчаў. Што сказаць ёй?* (А. Куляшоў).

## Іменныя аднасастаўныя сказы

У лінгвістычнай літаратуры да гэтага часу няма адзінага падыходу да класіфікацыі іменных сказаў. Адны за аснову класіфікацыі бяруць іх семантыку, што вельмі пашырае межы такіх сказаў (сюды ўключаюцца назоўны ўяўлення, назыўныя канструкцыі), іншыя абмяжоўваюцца толькі намінатыўнымі (параўн. розныя пункты гледжання на склад такіх сказаў (табл. 12).

*Табліца 12*

**ІМЕННЫЯ АДНАСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ**

| Граматыка 1966 | Граматыка 1986 | Бурак 1987 | Сцяцко 1994 |
|---|---|---|---|
| ● намінатыўныя | ● намінатыўныя<br>● генітыўныя | ● намінатыўныя<br>● назыўныя<br>● вакатыўныя<br>● генітыўныя<br>● канструкцыі з назоўным уяўлення | ● намінатыўныя<br>● генітыўныя<br>● назыўныя<br>● вакатыўныя |

***Намінатыўнымі*** з’яўляюцца аднасастаўныя сказы, у якіх сцвярджаецца наяўнасць, існаванне прадметаў ці з’яў, напр.: *Верасень. Халодны дождж* (З. Марозаў); *Лістапад. Млявы восеньскі дзень з кроплямі начной вільгаці на голым счарнелым галлі прывакзальнай плошчы* (Я. Скрыган); *Задумёны дзень асенні, ды з хмурынкаю на твары* (Н. Маеўская). Галоўны член у іх прадстаўлены назоўнікам у форме назоўнага склону (адсюль і назва ад лац. *nominativus*), аднак яго пазіцыю могуць займаць і колькасна-іменныя спалучэнні: *Восень сорак другога года. Цёмная, мокрая ноч* (Я. Брыль); *Памор’е. Польшча. Год трыццаць дзевяты* (А. Зарыцкі).

Між тым далёка не кожны назоўнік у назоўным склоне можа ўтварыць такога кшталту сказы. Лексемы тыпу *студэнцтва, адхіленні, прамежак, меншасць, тып* і пад. не маюць такой здольнасці, і асноўная прычына – у семантыцы слова. Намінатыўныя сказы арганізуюцца на аснове лексем, якія намінуюць сабой 1) з’явы, дзеянні і станы, што мысляцца ў часавай працягласці: *дождж, холад, снег, спякота, цішыня, пагоня* або прама ўказваюць на час: *лета, полудзень, ноч* і інш.; 2) прадметы, што заключаюць у сабе значэнне прасторы ці размяшчэння ў прасторы: *стол, кнігі, млын, пляц, вакзал, дарогі* і інш. [*Михневич*, 1969]. А таму намінатыўныя сказы лексічна абмежаваныя словамі, якія здольныя перадаваць значэнне быццёвасці, параўн.: *Зіма. Мароз. Снягі. Завеі. Вясна. Цяпло. Вада. Лілеі... Усё змяняецца бясконца!* (З. Марозаў); *Круглае поле. Узгоркі. Каменне. Лес па краях, як сцяна* (Я. Колас).

Граматычныя прыметы намінатыўных сказаў:

● галоўны член сумяшчае ў сабе функцыю наймення прадмета / з’явы і ідэю яго існавання, быцця: *Дваццаты век. Бары і курганы. Радзінны спеў і пошум Белавежы* (Я. Янішчыц);

● яны толькі сцвярджальныя: *Раніца. Шэрае, нізкае неба. Шэрае, ціхае мора. І свежы, зноў непераможна белы снег* (Я. Брыль);

● маюць толькі рэальную мадальнасць і значэнне цяперашняга часу, а значыць, не валодаюць мадальнымі мадыфікацыямі. «Іх часавае значэнне не граматычнае, бо не мае граматычнай формы выражэння (яна не залежыць ад сітуацыі, ад кантэксту), а ёсць лагічны вынік з самога значэння быцця, існавання прадметаў (з’яў, падзей), яно з’яўляецца вытворным ад іх мадальнасці» [*Гаўрош*, 1975, *11*]: *Цішыня. Бяссонне зор. Акно, не зашклёнае ніводнай згадкай* (Т. Бондар); *Вось і ўрач найвышэйшага класу. Сорак хвілін у змаганні за лёс* (Я. Янішчыц);

● няма прэдыкатыўных адносінаў, а значэнне прэдыкатыўнасці выражаецца інтанацыяй канстатацыі: *Восень. Падаюць яблыкі ў звонкіх садах. Вечар. Сонца расплавіла медныя шыбы* (М. Лужанін).

Большасць сінтаксістаў сярод семантыка-функцыянальных тыпаў намінатыўных сказаў вылучаюць два асноўныя: быццёвыя (апісальныя, экзістэнцыяльныя) і ўказальныя [*Гурскі*, 1962, *50*; *Гаўрош*, 1975, *17–42*; *Бандарэнка*, 1986, *229*]. Калі апісальныя сказы сцвярджаюць быццё пэўнай з'явы, напр.: *Апала раса. Гарачыня. Хмаркі, як пух лябедзіны* (Я. Колас); *Позняя ноч. Цішыня. Старонкі добрай кнігі* (Я. Брыль), то ўказальныя, акрамя паведамлення пра існаванне з'яў, прадметаў, указваюць на іх пры дапамозе ўказальных часціц *вось (во, от), вот, вунь (унь)*, напр.: *Вось старая хатка, садзік невялічкі. Маладых алешнік па краях крынічкі* (Я. Колас); *Вунь і ўзлессе. Асеннія ўсталі яліны* (А. Зарыцкі).

Акрамя названых тыпаў, некаторыя даследчыкі вылучаюць эмацыянальна-ацэначныя і пабуджальна-пажадальныя намінатыўныя сказы [*Бурак*, 1987, *113*; *Бурака*, 1989, *159*]. Эмацыянальна-ацэначныя сказы, паводле меркавання навукоўцаў, сумяшчаюць у сабе канстатацыю быцця, існавання і яе эмацыянальна-экспрэсіўную ацэнку[33], кшталту: *Якія горы! А сады якія! Тут шмат зямнога цёплага дабра* (П. Панчанка); *Ну зіма! Ну пагодка!* (Я. Брыль). Структурная асаблівасць такіх сказаў у наяўнасці эмацыянальна-экспрэсіўных часціц *ну і, ай ды, што за*, а таксама прыметнікаў *які, якая, якія* ў функцыі часціц: *Ну і сонца! Які незвычайны дзень! Што за дзяўчына! Што за натура!* Да пабуджальна-пажадальных адносяць сказы са значэннем волевыяўлення і пажадання: *Агонь!* (І. Мележ); *Пад'ём!* (М. Лынькоў); *Прывітанне!* (Б. Мікуліч) [*Бурак*, 1987, *113–114*].

Большасць лінгвістаў указвае на неабходнасць размежавання шэрагу сінтаксічных канструкцый, што фармальна супадаюць з намінатыўнымі сказамі. Перадусім гэта датычыцца канструкцый назоўнага тэмы.

***Назоўны тэмы***, ці ***назоўны (намінатыўны) уяўлення***, – канструкцыя-аналаг намінатыўным сказам паводле формы[34]:

---

[33] Н. В. Гаўрош і інш. кваліфікуюць іх як ацэначна-быційныя аднасастаўныя сказы, бо ў іх значэнне быцця, існавання на другім плане ў параўнанні са значэннем ацэнкі, якаснай характарыстыкі, што складае асноўны змест такіх сказаў [*Гаўрош*, 1975, *15*].

[34] У якасці асобай канструкцыі яе ўпершыню вылучыў рускі лінгвіст А. М. Пяшкоўскі.

*Маці... Колькі яна перанесла, пагаравала; колькі перацягалі яе плечы нягод і цяжару ў жыцці – і колькі яшчэ пяшчоты ў вачах* (І. Пташнікаў).

Такія канструкцыі маюць пэўныя адрозненні ад намінатыўных сказаў:

● пазбаўлены значэння існавання, быцця (а значыць, і катэгорыі прэдыкатыўнасці); яны толькі называюць прадметы ці з'явы, уяўленне пра якія ўзнікла ў моўцы: *Восеньскі сад... Некалькі антонавак усё яшчэ ўпарта трымаюцца за галлё. Рыжая трава састарэла, чакаючы іх...* (Л. Галубовіч);

● інтанацыйная і семантычная незавершанасць канструкцыі;

● лексічная неабмежаванасць: любы назоўнік можа выкарыстоўвацца ў якасці тэмы;

● функцыя – падкрэсліць, вылучыць той прадмет думкі, інфармацыя пра які будзе толькі ў наступных сказах: *Спадчына. Якое простае слова, і які няпросты яго сэнс! Сапраўды, цяжка ўявіць сабе чалавека без гісторыі, без кроўных сувязей з роднай зямлёй, без адчування сваіх вытокаў, без памяці, без душы, без роду і племені* (В. Вітка);

● інтанацыя незаконачанасці,клічная ці пытальная: *Кнігарні? Яны ў нас, дзякаваць нам самім, багацеюць. Яны прыгажэюць, харашэюць, людненюць. Усё больш людзей бачыш каля кніжных паліц і прылаўкаў* (Ф. Янкоўскі).

Параўн. у адным кантэксце канструкцыю назоўнага ўяўлення і намінатыўныя сказы: *Світанак... Трывога нябёс, зацягнутых хмарамі. Вецер. Пах мора, што вецер прынёс з былога. Пах мокрага вецця* (Т. Бондар).

Не з'яўляюцца разнавіднасцю намінатыўных сказаў і назвы кніг, часопісаў, карцін, надпісы на шыльдах, этыкетках і пад. Між тым у беларускім мовазнаўстве іх вылучаюць у асобны тып аднасастаўных іменных сказаў, т. зв. ***назыўныя*** [*Бурак*, 1987, *115*; *Сцяцко*, 1994, *17*]. Але пераважная частка беларускіх сінтаксістаў увогуле не надае ім статуса сказаў, а кваліфікуе як канструкцыі, што супадаюць па форме з намінатыўнымі сказамі [*Лапаў*, 1966, *447*; *Бандарэнка*, 1986, *231*; *Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *142*; *Бурака*, 1989, *160* і інш.].

Развітыя намінатыўныя сказы трэба адрозніваць ад поўных і няпоўных двухсастаўных сказаў. Цяжкасці размежавання датычацца ў асноўным двух выпадкаў: з наяўнасцю ў іх складзе дапасаванага азначэння ці акалічнасці або недапасаванага азначэння.

Калі пры галоўным члене выкарыстоўваецца дапасаванае азначэнне, то кваліфікацыя сказа як адна- ці двухсастаўнага залежыць ад парадку слоў і інтанацыі: *Снежная пустыня. Цішыня* (І. Шамякін) але: *Вецер парывісты і вільготны. Адліга* (Э. Самуйлёнак); *Раніца. Неба чыстае, высознае* (М. Гамолка). Варта, аднак, улічваць і лагічны націск пры маўленні: калі прыметнік лагічным націскам не вылучаецца, то і ў постпазіцыі ён можа быць азначэннем, а не выказнікам, параўн.: *Ноч глухая, цьма, завея, не відно ні свету* (Я. Колас); *Плот і весніцы. Хаты сонныя. У небе досвіткі. У сэрцы рань* (М. Хадкевіч). Калі ж выдзеліць гэтыя прыметнікі націскам, то сказы мусім разглядаць як двухсастаўныя [*Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *141*; *Бурак*, 1987, *114*].

Калі ж пашырэнне галоўнага члена адбываецца праз недапасаванае азначэнне ці акалічнасць, накшталт: *Над горадам смог* і *Смог над горадам*, то кваліфікацыя сказа як адна- або двухсастаўнага залежыць ад мэты выказвання. Калі мэтай выказвання ў абодвух выпадках ёсць паведамленне пра месца, то тады іх правамерна разглядаць як двухсастаўныя няпоўныя. Калі ж мэта – канстатацыя быцця прадмета, то адбываецца інтанацыйнае зліццё даданага члена з галоўным, і такі сказ разглядаецца як намінатыўны [*Булахаў*, 1959, *143*; *Бандарэнка*, 1986, *232*; *Бурак*, 1987, *125*; *Міхневіч*, 1987; *Яўневіч*, *Сцяцко*, 1987, *142*; *Рагаўцоў*, 2001, *93–94*].

У тыповых жа намінатыўных сказах не можа быць даданых членаў, якія адносяцца да саставу выказніка – дапаўненняў і акалічнасцей. Калі яны ёсць, то гэта сведчыць пра непаўнату сказа, адсутнасць выказніка, параўн. у адным кантэксце: *Асенні дзень. Маркотны сад. І далеч у сівым тумане* (Н. Маеўская). Традыцыйна апошні сказ кваліфікуецца як двухсастаўны няпоўны (Т. П. Бандарэнка, А. Я. Міхневіч, Л. І. Бурак, М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко і інш.), а дакладней, эліптычны.

Паводле формы галоўнага члена супадаюць з намінатыўнымі сказы вакатыўныя[35], што складаюць асобны тып аднасастаўных сказаў (Л. І. Бурак, Н. В. Гаўрош, Т. П. Бандарэнка, Н. І. Бурака).

***Вакатыўныя*** (ад лац. *vocativus* ‘клічны склон’) – аднасастаўныя сказы, якія выражаюць нерасчлянёныя думкі, пачуцці, волевыяўленні да асобы, названай галоўным членам гэтых сказаў (назоўнік ці займеннік у назоўным склоне).

[35] Вылучыў іх як асобны тып аднасастаўных сказаў А. А. Шахматаў.

У адрозненне ад намінатыўных, гэтыя сказы не сцвярджаюць існаванне асобы, а перадаюць адносіны моўцы да яе: *«Сцяпан?» – Вось яно матчына здзіўленне* (Т. Бондар); *«Валошка!» – грымнуў дырэктараў бас* (В. Карамазаў). Пры сваёй блізкасці да зваротка, яны адрозніваюцца і ад яго: зваротак не з'яўляецца самастойнай камунікацыйнай адзінкай, бо, называючы адрасата маўлення, не ўваходзіць у структуру сказа. Вакатыўны сказ не толькі называе асобу, да якой звяртаюцца з маўленнем, але і перадае ўвесь аб'ём інфармацыі, змест паведамлення (ў мастацкіх творах характар інтанацыі, што перадае змест сказа, вызначаецца аўтарскімі рэмаркамі ці сітуацыяй): *«Вы?! – здзівіўся Вадзім, пазнаўшы ў жанчыне, якая стаяла каля матчынай магілы, сваю першую бальнічную сястрычку. – Вы?! Тут?! Я не разумею»* (Т. Бондар).

Паводле формы такога кшталту сказы аднатыпныя (як правіла, сінтаксічна непадзельныя), «таму ў аснову іх класіфікацыі кладуцца не структурна-граматычныя, а функцыянальныя прыметы. Пры гэтым прымаюцца пад увагу такія асаблівасці інтанацыі, ад якіх і залежыць іх сінтаксічная функцыя» [*Бандарэнка*, 1986, *234*]. Адзначаюць тры тыпы вакатыўных сказаў, якія выражаюць:

- заклік, просьбу ці патрабаванне адгукнуцца, адказаць;
- эмацыянальную рэакцыю на слова і дзеянне суразмоўцы (часта з мэтай спыніць выказванне);
- пачуцці, што ўзнікаюць у момант пазнавання ці прыпамінання [*Бандарэнка*, 1986, *234*; *Гаўрош*, 1975, *16–17*], напр.: *«Раман Фаміч!..» – з просьбай і перасцярогай працягнуў здаравяка і перасмыкнуў плячыма* (М. Ракітны); *Бацька спалохана павярнуўся і, убачыўшы яе, выпусціў з рук сетку і раму. «Таня?.. Ты?..» – здзіўлена і радасна прашаптаў ён* (І. Шамякін).

Варта таксама адмяжоўваць генітыўныя сказы ад намінатыўных, хаця некаторыя даследчыкі разглядаюць іх як разнавіднасць апошніх. «Часам першы кампанент у такіх словазлучэннях [*Натоўп народу. Безліч кніг. – Т. Р.*] можа апускацца, і тады функцыю сказа бярэ на сябе форма роднага склону назоўніка. Параўн.: *А трафеяў! Колькі трафеяў! Вось гэта па-баявому!* (А. Куляшоў)» [*Сіцько*, 1994, *17*].

***Генітыўныя*** (ад лац. *genitivus* 'родны склон') – аднасастаўныя сказы, галоўны член якіх выражаны назоўнікам у родным склоне, характарызуе прадмет у колькасных адносінах: *А дарог жа, дарог, ды прасторных якіх!..* (Я. Колас).

Як асобны тып гэтыя сказы вылучаны ў Граматыцы-86 і ў падручніках Л. І. Бурака, Л. А. Антанюк, але часцей яны ўвогуле не разглядаюцца, таму што не ўкладваюцца ў звыклыя рамкі дзейнікава-выказнікавых сказаў. Некаторыя сінтаксісты лічаць іх разнавіднасцю безасабовых сказаў (параўн.: *Вакол ні гуку – Мора народу*).

Незалежнасць сінтаксічнай пазіцыі такога генітыва дае падставы сучасным рускім лінгвістам трактаваць яго як дзейнік (Ю. М. Касцінскі, Г. А. Золатава і інш.): *Клопатаў – па горла! Ягад – хоць прыгаршчамі збірай*. Тут колькаснае значэнне выражана фразеалагічным спалучэннем: *Грошай – кот наплакаў; Рыбы – хоць рукамі лаві*. Але з фармальна-граматычнага боку іх нельга прызнаць за двухсастаўныя, бо дзейнік традыцыйна вызначаецца толькі ў назоўным склоне.

Аднасастаўныя іменныя сказы неабходна размяжоўваць са сказамі бессастаўнымі, якія называюць часцей нячленнымі ці словамі-сказамі.

***Нячленныя***, ці ***нерасчлянёныя, сказы*** (Граматыка-86) або ***словы-сказы*** (Граматыка-66) – непадзельныя сінтаксічныя адзінкі з аднаго слова або ўстойлівага спалучэння слоў, якія выражаюць станоўчы ці адмоўны адказ на чыё-небудзь выказванне, эмацыянальную, мадальна-экспрэсіўную ацэнку, пабуджэнне да чаго-небудзь, запытанне: *– Ты мяне зваў? – Але; – У інтэрнэт так і не патрапіў. – Вось табе і на!*

Калі двухсастаўныя сказы маюць састаў дзейніка і састаў выказніка, аднасастаўныя – толькі састаў галоўнага члена, то нячленныя сказы – увогуле бессастаўныя. Яны прадстаўлены марфалагічна нязменнымі і сінтаксічна непадзельнымі кампанентамі, якія не могуць быць ні галоўным, ні даданым членам сказа, бо не перадаюць сінтаксічных адносінаў. Але такія канструкцыі інтанацыйна афармленыя і выражаюць закончаную думку (у межах пэўнага кантэксту): *У звярынцы служыш? – Ага! – То добра* (А. Карпюк); *Месца для хаты ўжо выбраў? – А як жа* (В. Каваль); *– Мар'я!.. – Ну... – Дык ты кажаш – маркотна табе – Ай...* (М. Зарэцкі).

Спецыфіка нячленных сказаў:

- немагчымасць расчлянення іх фармальнага саставу (галоўная структурная асаблівасць і сінтаксічны крытэрый для адмежавання іх ад іншых тыпаў сказа);
- кантэкстуальнасць, максімальная абумоўленасць іх сэнсавага значэння моўнай сітуацыяй;

● яны не намінуюць сабой сітуацыі ці з'яў рэчаіснасці, а толькі адлюстроўваюць мадальна-экспрэсіўныя адносіны: сцвярджэнне, адмаўленне, запытанне, пабуджэнне, эмацыянальную ацэнку, што абумоўлена не толькі іх функцыянальным прызначэннем, але і марфалагічнай прыродай: яны арганізуюцца са слоў, якія не маюць намінацыйнай функцыі.

Паводле марфалагічнай прыметы адрозніваюць нячленныя сказы, выражаныя:

● часціцамі: *так, не, ну, хіба, няўжо* і інш.;

● мадальнымі словамі: *вядома, праўда, безумоўна, канечне* і інш.;

● непадзельнымі спалучэннямі: *Ды ўжо ж! Вось табе і на! Дзіва што* і інш.;

● формуламі ветлівасці: *дзякуй, калі ласка, бывай*. (Праўда, іх адносіць да слоў-сказаў Граматыка-66, але ўжо ў Граматыцы-86 толькі ўказваецца на блізкасць іх да такіх сказаў, бо ў формуле ветлівасці, як зазначае Л. І. Бурак, няма ні сцвярджэння, ні адмаўлення, ні экспрэсіўна-эмацыянальнай ацэнкі.)

Нерасчлянёныя сказы разам з тым неправамерна разглядаць як няпоўныя, бо, па-першае, іх утвараюць непадзельныя спалучэнні, якія не з'яўляюцца ні галоўным, ні даданым членам сказа, і ў іх адсутнічае граматычная сувязь з папярэднімі сказамі; па-другое, у пэўным кантэксце і ў адпаведнай сітуацыі такія сказы выражаюць закончанае выказванне. Інтанацыя надае ім сэнсавую закончанасць і суадносіць іх змест з рэчаіснасцю, а значыць, служыць сродкам выражэння мадальнасці.

Такім чынам, сферай выкарыстання нячленных сказаў найчасцей выступае дыялагічная (гутарковая) мова.

## ЛІТАРАТУРА

*Абабурка, 1992*: Абабурка М. В. Параўнальная граматыка беларускай і рускай моў. Мн.: Вышэйш. шк., 1992. 224 с.

*Анічэнка, 1998*: Анічэнка У. В. Беларуская мова: Дапам. для самаадукацыі. Мн.: Бел. навука, 1998. 206 с.

*Антанюк, 2003*: Антанюк Л. А. Тыпы сказаў // Плотнікаў Б. А., Антанюк Л. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мн.: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. С. 260–262.

*Бабайцева, 1988*: Бабайцева В. В. Система членов предложения в современном русском языке. М.: Просвещ., 1988. 159 с.

*Бандарэнка, 1986*: Бандарэнка Т. П. Аднасастаўныя сказы. Нерасчлянёныя сказы. Няпоўныя сказы // Беларуская граматыка: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1986. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 210–250.

*Булахаў*, *1959*: Булахаў М. Г. Тыпы аднасастаўных сказаў // Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Сінтаксіс. Мн.: Дзярж. вуч.-пед. выд-ва, 1959. С. 131–146.

*Бурак*, *1987*: Бурак Л. І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн.: Вышэйш. шк., 1987. 320 с.

*Бурака*, *1989*: Бурака Н. І. Аднасастаўныя сказы // Беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя / Пад рэд. Я. М. Адамовіча. Мн.: Вышэйш. шк., 1989. С. 147–160.

*Вечорек*, *1991*: Вечорек Д. К теории двусоставности предложения в практике преподавания // Рус. язык за рубежом. 1991. № 5. С. 72–77.

*Галкина-Федорук*, *1959*: Галкина-Федорук Е. М. Односоставные предложения в современном русском языке // Рус. язык в школе. 1959. № 2. С. 11–18.

*Гаўрош*, *1975*: Гаўрош Н. В. Намінатыўныя сказы ў сучаснай беларускай мове. Мн.: Вышэйш. шк., 1975. 95 с.

*Гиро-Вебер*, *1979*: Гиро-Вебер М. К вопросу о классификации простого предложения в современном русском языке // Вопр. языкознания. 1979. № 6. С. 63–75.

*Гурскі*, *1962*: Гурскі М. І. Тыпы аднасастаўных сказаў // Гурскі М. І., Булахаў М. Г., Марчанка У. П. Беларуская мова: У 2 ч. Мн.: Вышэйш. шк., 1962. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 39–54.

*Золотова*, *1986*: Золотова Г. А. О некоторых теоретических результатах работы над «Синтаксическим словарем русского языка» // Вопр. языкознания. 1986. № 1. С. 26–34.

*Лапаў*, *1966*: Лапаў Б. С. Віды простых сказаў // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 426–460.

*Лепешаў*, *2002*: Лепешаў І. Я. Абагульнена-асабовыя сказы і прыказкі // Лепешаў І. Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік. Гродна: ГрДУ, 2002. С. 194–197.

*Лёсік*, *1926*: Лёсік Я. Сынтакс беларускае мовы. Менск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. 255 с.

*Михневич*, *1969*: Михневич А. Е. К характеристике номинативных предложений // Zeitschrift für Slawistik. 1969. № 5. С. 712–720.

*Міхневіч*, *1987*: Міхневіч А. Я. Аб некаторых сінтаксічных цяжкасцях беларускай мовы // Беларуская мова: Пытанні культуры мовы. Мн.: Нар. асвета, 1987. С. 126–142.

*Рагаўцоў*, *2001*: Рагаўцоў В. І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні. Мн.: Універсітэцкае, 2001. 199 с.

*Рамза*, *1998*: Рамза Т. Р. Безасабовыя сказы. Мн.: Тэхналогія, 1998. 71 с.

*Рысіна*, *1939*: Рысіна С. І. Аднасастаўныя сказы // Сінтаксіс беларускай мовы. Мн.: Выд-ва АН БССР, 1939. С. 110–117.

*Сцяцко*, *1994*: Сцяцко П. У. Аднасастаўны і двухсастаўны сказы // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелЭн, 1994. С. 16–17.

*Яўневіч*, *Сцяцко*, *1987*: Яўневіч М. С., Сцяцко П. У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. Мн.: Вышэйш. шк., 1987. С. 272.

# СКЛАДАНЫ СКАЗ

## Паняцце пра складаны сказ

У беларускай лінгвістыцы XX ст. існавалі два пункты гледжання на прыроду складаных сказаў, што па-рознаму раскрываюць іх сутнасць. Адно меркаванне грунтуецца на тым, што складаны сказ – гэта свайго роду «счапленне» двух (ці больш) простых сказаў: «Складаныя сказы – гэта адзіная сінтаксічная і сэнсавая адзінка, якая ўтвараецца з двух і больш простых сказаў» [*Анічэнка*, 1998, *139*]. Такі пункт гледжання ўласцівы ўсім мовазнаўцам першай паловы стагоддзя: Я. Ф. Карскаму, Б. Тарашкевічу, Я. Лёсіку, Л. С. Рохкінду, Ц. П. Ламцёву, а ў сучасны момант адлюстраваны ў шэрагу дапаможнікаў для ВНУ і школы.

Другі падыход заснаваны на тым, што кампанентамі складанага сказа ёсць не сказы, а прэдыкатыўныя часткі, паколькі свае інтанацыйнае, сэнсавае і граматычнае афармленне яны атрымліваюць выключна ў структуры ўсяго складанага сказа, а таму іх «толькі ўмоўна можна называць сказамі» [*Клюсаў*, 1972, *196*]. Мовазнаўцамі між тым канстатуецца факт, што «да гэтага часу сустракаецца тэрмін «сказ» (параўн.: *галоўны сказ*, *даданы сказ*) для абазначэння састаўных частак складаназалежнага сказа. Недакладнасць у тэрміналогіі стварае ілюзію тоеснасці частак адзінага сінтаксічнага цэлага – складаназалежнага сказа – і асобнай адзінкі – простага сказа» [*Шуба*, 1972, *283*]. Значыць, выкарыстоўваць тэрмін «сказ» у дачыненні да прэдыкатыўных частак складанага сказа некарэктна і неправамерна, чаго і пазбягаюць у сваіх публікацыях П. П. Шуба, Г. Н. Клюсаў, Л. І. Бурак, Т. П. Бандарэнка, А. Я. Міхневіч, Я. М. Адамовіч, М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко і інш.

Такім чынам, ***складаны сказ*** – гэта структурна-сінтаксічнае і сэнсавае цэлае, што ўтвараецца ў выніку аб'яднання дзвюх і больш прэдыкатыўных частак.

***Прэдыкатыўныя часткі*** складанага сказа – такія сінтаксічныя канструкцыі, якія маюць фармальную і сэнсавую арганізацыю, уласцівую простым сказам, але не валодаюць камунікацыйнай цэласнасцю і прызначаныя для функцыянавання ў якасці частак складанага сказа. Значыць, у адрозненне ад простага сказа прэдыкатыўныя часткі складанага пры сваім фармальным падабенстве не маюць:

- інтанацыйнай завершанасці;
- не валодаюць сэнсавай цэласнасцю;

• уключаюць у сваю структуру такія элементы, якія ніяк не могуць выступаць у тоеснай функцыі ў простым сказе (падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы, рознага кшталту карэляты).

Разам з тым просты сказ мае пэўныя адрозненні ад складанага, якія грунтуюцца на тым, што складаны сказ – адзінка больш высокага ўзроўню (хаця ў яе аснове і ляжаць мадэлі пабудовы простых сказаў). Разыходжанні датычацца: а) значэння, б) структуры, в) сродкаў сувязі.

Просты сказ выражае адну катэгорыю прэдыкатыўнасці, што і ёсць яго граматычным значэннем; складаны ж сказ мае некалькі такіх комплексаў (у залежнасці ад колькасці частак), і граматычнае значэнне складаных сказаў – гэта семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж яго прэдыкатыўнымі часткамі.

Складнікамі простага сказа з'яўляюцца сінтаксемы і словазлучэнні (непадзельныя, фразеалагізаваныя), а структуру складанага сказа ўтвараюць прэдыкатыўныя часткі.

Калі ў простым сказе асноўнымі граматычнымі сродкамі сувязі выступаюць сінтаксічныя формы слоў (канчаткі і прыназоўнікі), то ў складаных – прэдыкатыўныя часткі звязваюцца інтанацыяй і карэлятамі, з дапамогай злучнікаў і злучальных слоў.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, можна зазначыць: складаны сказ, як і просты, – таксама адзінка шматаспектная. У фармальна-структурным аспекце ён характарызуецца поліпрэдыкатыўнасцю і разгорнутым наборам канструкцыйных элементаў для сувязі прэдыкатыўных частак. У семантычным аспекце – гэта семантычна цэласная адзінка, значэнне якой не ёсць сума значэнняў яго прэдыкатыўных частак, а толькі сэнсавыя адносіны паміж імі. Паводле камунікацыйнага аспекту складаны сказ характарызуецца адзінствам камунікацыйнага задання і інтанацыйнай закончанасцю, напр.: *Ствараем слова, ці яно нас, недаствораных, стварае, так золь дабельвае радно, і гоіць боль зямля сырая* (Р. Барадулін); *Шчаслівы той, хто шчаслівы ў сябе дома* (Л. Талстой).

## Прынцыпы класіфікацыі складаных сказаў

Класіфікацыя складаных сказаў сінтаксістамі праводзіцца, зыходзячы з розных крытэрыяў, а таму ў цяперашні час у беларускім мовазнаўстве паралельна суіснуюць дзве адрозныя канцэпцыі.

Прыхільнікі першай пры класіфікацыі складаных сказаў бяруць за аснову тып сэнсавых адносінаў паміж іх прэдыкатыўнымі часткамі – злучэнне ці падпарадкаванне. А ўжо потым зыходзяць з прынцыпу афармлення гэтых адносінаў – «чыста інтанацыйна або і інтанацыйна, і марфолага-сінтаксічна» [*Михневич*, 1990, *317*]. У такім разе бяззлучнікавыя сказы разглядаюць і ў групе складаназлучаных, і ў групе складаназалежных, не вылучаючы іх у асобны тып (табл. 13). Такое меркаванне абапіраецца на той факт, што бяззлучнікавыя сказы паводле сваіх сэнсавых адносінаў ніяк не адрозніваюцца ад злучнікавых складаных сказаў. Розніца датычыцца сродкаў сувязі: ёсць яны ці іх няма. Параўн.: *На дол ападаюць дажджом аблачынкі, і цені сябе прызнаюць у галлі* і *Згода цвеліцца, шчасце мроіцца, пра надзею звіняць жаўрукі* (Г. Чарказян); *Галінка трымае расу на вісу – баіцца абразіць зямлёю красу* і *Зорка босая йшла нацянькі, бо спазніцца баялася дужа* (Р. Барадулін); *Выжыць – гэта любой цаною, а жыць – гэта ўсё-такі менш ці больш сумленна* (Я. Брыль) і *Клікнуць хацелася – голас замёр* (П. Броўка).

Названая канцэпцыя бярэ свой пачатак з прац Я. Ф. Карскага, Б. Тарашкевіча, Я. Лёсіка, Ц. П. Ламцёва, але сваё пераканальнае абгрунтаванне атрымала толькі ў публікацыях А. Я. Міхневіча.

*Табліца 13*

**КЛАСІФІКАЦЫЯ СКЛАДАНЫХ СКАЗАЎ НА АСНОВЕ СЭНСАВЫХ АДНОСІНАЎ**

| Складаныя сказы | | | |
|---|---|---|---|
| складаназлучаныя | | складаназалежныя | |
| злучнікавыя | бяззлучнікавыя | злучнікавыя | бяззлучнікавыя |

Несумненна варта ўзгадаць яшчэ падыход Г. Н. Клюсава, які адрознівае і вылучае ў асобную разнавіднасць нароўні са сказамі складаназлучанымі, складаназалежнымі, камбінаванымі і іншымі тыпамі (усяго сем) *асацыятыўныя складаныя сказы* (=бяззлучнікавыя складаныя сказы з незалежнымі часткамі) і *залежна-бяззлучнікавыя складаныя сказы* [*Клюсаў*, 1972, *197*], размежаванне якіх, відавочна, грунтуецца на сэнсавых адносінах паміж іх прэдыкатыўнымі часткамі.

Другая канцэпцыя ў сваёй класіфікацыі абапіраецца перадусім на фармальныя паказчыкі сувязі – злучнікавая ці бяз-

злучнікавая, а потым ужо бярэцца пад увагу тып адносінаў паміж прэдыкатыўнымі часткамі – злучэнне і падпарадкаванне (табл. 14). Такі падыход зафіксаваны ў беларускай лінгвістыцы з выхадам у свет «Курса сучаснай беларускай літаратурнай мовы» (1959), дзе аўтарам прапанаванага раздзела быў Л. І. Бурак. Да прыхільнікаў такога меркавання можна залічыць (зыходзячы з іх друкаваных прац) М. С. Яўневіча, П. У. Сцяцко, Т. П. Бандарэнку, Л. А. Антанюк і інш.

*Табліца 14*

**КЛАСІФІКАЦЫЯ СКЛАДАНЫХ СКАЗАЎ НА АСНОВЕ СРОДКАЎ СУВЯЗІ**

| Складаныя сказы | | | | |
|---|---|---|---|---|
| злучнікавыя | | | бяззлучнікавыя | |
| складаназлучаныя | складаназалежныя | пераходныя | з аднатыпнымі часткамі | з разнатыпнымі часткамі |
| з рознымі відамі сувязі | | | | |

## Разнавіднасці складаназалежных сказаў

***Складаназалежнымі*** з'яўляюцца такія сказы, прэдыкатыўныя часткі якіх аб'ядноўваюцца падпарадкавальнай сувяззю пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ці злучальных слоў: *Ў цэлым свеце няма анічога цяжэй часіны, калі паміраюць пачуцці* (Н. Маеўская); *У ліпах ды клёнах, што падняліся над вуліцаю шырачэзнымі кронамі, толькі часамі шэпчацца ветрык* (Я. Скрыган).

Дыферэнцыяльныя прыметы такіх сказаў:

● іерархічная структура, пры якой адна (даданая) частка залежыць ад іншай (галоўнай);

● наяўнасць падпарадкавальнага злучніка ці злучальнага слова, што ўводзяць даданую частку і размяшчаюцца ў ёй, указваючы тым самым на яе залежнасць і спосаб афармлення.

Разам з тым залежнасць даданай часткі ад галоўнай – часам з'ява выключна сінтаксічная, паколькі сэнсавая значнасць паведамлення прыпадае якраз на залежную частку, накшталт: *Як позна зразумеў, што на зямлі бацькоў няма бязмоўных дрэў, маўклівых валуноў* (М. Танк); *Як паглядзіш, Божа мілы, што з людзямі робіць*

*чын!* (Я. Колас). Падобнае дамінаванне сэнсавай значнасці даданай часткі выяўляецца і тады, калі ў галоўнай частцы размяшчаюцца структурныя кампаненты, што патрабуюць абавязковага свайго разгортвання ў даданай (карэляты, суадносныя словы, асобныя формы дзеясловаў-выказнікаў ці прэдыкатывы, адзін з парных злучнікаў і пад.), напр.: *Гаворка заўсёды пачынаецца не для таго, каб нічога не сказаць* (Б. Мікуліч); *Чакаць тады спакойна можна, калі няма чаго чакаць* (А. Звонак); *Часам бывае, што найкарацейшую дарогу да ісціны дае памылка* (Я. Скрыган); *Калі чалавек шукае, на што спатыкнуцца, то ён нешта знойдзе* (М. Лынькоў).

Сродкамі сувязі галоўнай і даданай частак з'яўляюцца:

- падпарадкавальныя злучнікі (простыя: *што, калі, як, бо, абы, каб, хаця* і інш.), складаныя (*таму што, як быццам, як бы, ледзь толькі, хоць бы* і інш.), парныя (*каб ...то; калі ...то; чым ...тым; як ...дык* і пад.), напр.: *Калі цябе няма, здаецца ўсё не гэтак наўкол, і на душы, і ў небясі* (Р. Барадулін); *Чым больш пакут, тым болей сіл трываць* (Н. Мацяш); *Чалавек адно датуль шчаслівы, пакуль сам умее шчасце даць* (Н. Мацяш);
- злучальныя словы, ці рэляты, што выражаюцца аманімічнымі формамі адносных займеннікаў (*хто, што, які, чый* і пад.) ці займенных прыслоўяў (*куды, адкуль, як, столькі, колькі* і інш.). Яны выконваюць як бы рэтраспекцыйную функцыю і вяртаюць да інфармацыі ў галоўнай частцы, напр.: *А я ў нямыя стукалася дзверы, дзе толькі ад варот і паварот...* (Я. Янішчыц); *Памяць чалавека падобная на скарбніцу, у якой можа захавацца толькі здольнае вытрымаць буры часу і не страціць сваёй цікавасці* (Р. Сабаленка);
- карэляты – указальныя займеннікі, што выкарыстоўваюцца ў галоўнай частцы і патрабуюць свайго тлумачэння; яны, наадварот, маюць праспекцыйную функцыю, напр.: *Я да скону зручаны з той стараною, дзе мама, як зорка, стаіць нада мною...* (Р. Барадулін); *Мы дзеці ўсе датуль, пакуль жывуць матулі* (Хв. Гурыновіч);
- апорныя словы – размешчаныя ў галоўнай прэдыкатыўнай частцы словы, якія пашыраюцца даданай часткай, кшталту: *Прыслухайся, што кажуць капяжы...* (Р. Баравікова); *Было чуваць, як недзе далёка на прыдзвінскім поплаве клякоча бусел* (У. Арлоў);
- парадак прэдыкатыўных частак, які можа быць як фіксаваны, так і свабодны, напр.: *З гадамі вывучуся жыць, бо сталасць*

*розум набывае* (Р. Баравікова); *Калі б я знала, што – ў гадах? – была б да ўчынкаў асцярожнай...* (Р. Баравікова);

● парадыгма – суаднесенасць часава-трывальных формаў і мадальных планаў выказнікаў, напр.: *Чалавек толькі і жыве, пакуль працуе і бачыць вынікі сваёй працы* (Л. Геніюш); *Парадокс часу: час ляціць, як мне гаманіць, і паўзе мухаю, калі слухаю* (М. Коўзкі);

● структурная непаўната адной з частак, што сігналізуе пра яе сэнсавую залежнасць, кшталту: *Зязюля між птушак тым і вядома, што яйкі ў чужыя гнёзды кладзе* (Г. Чарказян); *Указальнікі нязручныя тым, што не пакідаюць выбару* (М. Коўзкі).

Класіфікацыя складаназалежных сказаў, у сваю чаргу, таксама неадназначная: можна гаварыць пра функцыянальную, ці традыцыйную, і структурна-семантычную.

***Функцыянальная,*** ці ***традыцыйная, класіфікацыя*** заснаваная на прыпадабненні будовы складанага сказа простаму: любая даданая частка разглядаецца як разгорнуты сінтаксічны аналаг члена сказа. Параўн. у Б. Тарашкевіча: «Кожную часціну сказу можна развіць у цэлы сказ. Напр.: заместа – *ніхто ня ведае чужога абеду* можна сказаць: *ніхто ня ведае, як хто абедае*» [*Тарашкевіч*, 1929, *129*]. Зыходзячы з гэтага і вылучаюцца асноўныя тыпы залежных прэдыкатыўных частак: «могуць быць даданыя сказы дзейніка, выказніка, дапаўнення, азначэння і розных акалічнасцей, калі яны замяняюць гэтыя часціны і адказваюць на іх пытанні» [*тамсама*].

Хіба названага падыходу заключаецца, з аднаго боку, у тым, што не ўсе залежныя прэдыкатыўныя часткі можна падвесці пад функцыю якога-небудзь даданага члена сказа. Гэта датычыцца ў першую чаргу складаназалежных сказаў з даданымі далучальнымі, параўнання (супастаўлення), выніку (следства), напр.: *У самую касавіцу выдалася добрае надвор'е, што рэдка бывае* (А. Якімовіч); *Ёсць непрыемныя чуткі, таму і перасцерагаю* (М. Машара); *Я Вас чакаў з вясны да сівізны, як вечны вязень раніцу чакае* (Р. Барадулін); *Свішчуць птушкі над балотам, аж гаманіць лес і гай* (Я. Колас).

З другога боку, слабым месцам з'яўляецца і тое, што «ўціскаючы» ўсе разнавіднасці сказаў у межы прапанаваных тыпаў, вызначэнне некаторых з іх з'яўляецца супярэчлівым. Так, напр., сказы накшталт: *Што ні зрабі – усё кепска* (прыказка); *Многа цікавага пачуе той, хто ўмее чытаць кнігу божай прыроды, божага свету, хто цяміць і разбірае іх мову* (Я. Колас) кваліфікуюцца як склада-

назалежныя з даданай дзейнікавай; сказы *Які Рыгорка, такая пра яго й гаворка*; *Якая ў гаспадыні страва, такая ёй і слава* (прыказкі) – з даданай выказнікавай. Але калі трымацца гэтай жа класіфікацыі, то тып даданай часткі вызначаецца паводле пытання (у суаднесенасці з членам сказа), якое да яе ставіцца. І ў дадзеным выпадку цалкам мэтазгодна і правамерна ў першай групе сказаў паставіць пытанне *што?* і *хто?*, а ў другой – *якая?* і вызначаць гэтыя прэдыкатыўныя часткі як дапаўняльныя і азначальныя.

Разам з тым неабходна зазначыць, што ў сучасным беларускім мовазнаўстве дзейнікавыя і выказнікавыя даданыя часткі вылучаюць не толькі ў школьных падручніках, але і ў шэрагу сучасных дапаможнікаў для вышэйшай школы [*Бурак*, 1987, *236–241*; *Яўневіч*, *Сяцко*, 1987, *183–185*; *Адамовіч*, 1989, *198–199*, *203–204* і інш.]. Больш таго, як даданыя дзейнікавыя прапануецца разглядаць сказы накшталт: *Добра, што мы неразлучныя сябры* (Я. Маўр); *Знадворку было чуваць, як бегала вакол хаткі неспакойнае ласяня* (І. Чыгрынаў), дзе галоўная частка, паводле меркавання аўтараў вучэбных дапаможнікаў, мае «форму аднасастаўнага бяздзейнікавага сказа, выказнік якога выражаны безасабовым дзеясловам, безасабова-прэдыкатыўным словам або дзеясловам загаднага ладу» [*Адамовіч*, 1989, *198*; *Бурак*, 1987, *238*]. Алагізм у гэтым выпадку відавочны, паколькі ў прынцыпе, як вядома, немагчыма гаварыць (пры фармальна-структурным падыходзе) пра дзейнік у безасабовых сказах, ды яшчэ пры безасабовых дзеясловах ці прэдыкатывах.

Усё сказанае вышэй дазваляе ўсумніцца ў дастатковай абгрунтаванасці і мэтазгоднасці вылучэння *дзейнікавых* і *выказнікавых* прэдыкатыўных частак складаназалежных сказаў, таму што гэтыя тыпы ёсць не што іншае, як разнавіднасці дапаўняльных ці азначальных прэдыкатыўных частак[36]. Параўн.: *Тое дарага* (што?), *што нялёгка даецца* (прыказка) і *Што каму дапякае, той пра тое і гукае* (пра што?) (прыказка); *Які прывет – такі прыём* (які?), *які тавар – такая плата* (якая?) (Я. Колас) і *Даўно пажалі тое жыта і тыя межы зааралі* (якія?), *што дзядзьку смутак калыхалі* (Я. Колас).

***Структурна-семантычная класіфікацыя*** прадстаўлена ў «Беларускай граматыцы» (1986), раздзел напісаны К. У. Скурат. Зыходным пунктам гэтай класіфікацыі ёсць характар суадно-

[36] У дадзеным выпадку аўтар прапанаванага дапаможніка цалкам падзяляе пункт гледжання на гэтую праблему Г. Н. Клюсава (гл. больш дэталёва [*Клюсаў*, 1972, *210–211*]).

сінаў паміж галоўнай і даданай часткамі: толькі да аднаго слова ці цалкам да прэдыкатыўнай асновы галоўнай часткі «прымацоўваецца» залежная. У якасці *апорнага элемента* галоўнай часткі вылучаюць: указальныя займеннікі ці займенныя прыслоўі, назоўнікі і дзеясловы, прэдыкатыўныя словазлучэнні. Таму складаназалежныя сказы падзяляюцца на дзве вялікія групы: сказы прыслоўныя, ці нерасчлянёнай структуры, і сказы прысастаўныя, ці расчлянёнай структуры [*Скурат*, 1986, *292*].

***Складаназалежныя сказы нерасчлянёнай (прыслоўнай) структуры*** маюць наступныя дыферэнцыяльныя прыметы:

- залежнасць даданай часткі ад аднаго апорнага слова з галоўнай;
- сродкам сувязі служыць злучальнае слова ці асемантычны злучнік;
- наяўнасць карэлята (факультатыўная).

Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі нерасчлянёных складаных сказаў можна звесці да двух тыпаў. Так, для групы з указальнымі словамі, гэта могуць быць:

а б ' е к т н ы я (ролю ўказальнага слова выконвае займеннік *той* ва ўсіх склонах) (калі даданая частка раскрывае займеннікі *той, кожны, усе, усё* і далучаецца з дапамогай злучальных слоў *хто, што*) тыпу: *Самае галоўнае, друг ты мой, гэта тое, каб не страціць усведамлення сваіх памылак...* (Я. Колас); *Кожны, хто хоча ўмацаваць сваё здароўе, павінен займацца спортам* («Чырвоная змена»); *У вачах адлюстравана тое, што ў душы хаваецца на дне* (Я. Непачаловіч); *Тое дарага, што нялёгка даецца* (прыказка);

а т р ы б у т ы ў н ы я (з займеннікамі *той, такі* ў галоўнай часткі), напр.: *Але не маюць шляхі і рэкі зайздроснай памяці той, што можа аднойчы пройдзенае навекі вярнуць з далёкага падарожжа* (А. Куляшоў); (ролю ўказальнага слова выконваюць займеннікі *той, тая, такі, такая, такое, гэтакі, усё*, а таксама прыметнікі найвышэйшай ступені параўнання), напр.: *Туман такі, што людзі, ідучы, натыкаюцца адзін на аднаго* (П. Кавалёў); *Былі такія ночы, што раса выпадала ўсюды і трымалася аж да таго часу, пакуль угрэе сонца* (А. Кулакоўскі).

Складаназалежныя сказы з апорным словам назоўнікам і дзеясловам перадаюць абмежаванае кола адносінаў – азначальныя, суб'ектныя і аб'ектныя (калі дзеясловы маюць значэнне маўленчай, пазнавальнай, эмацыянальнай ці валявой дзейнасці тыпу: *гаварыць, падказаць, ведаць, адчуваць, цешыцца, хацець,*

*уяўляць, вагацца* і пад.), напр.: *Былі людзі, без якіх я не нарадзіўся б, і ёсць людзі, без якіх я не жыў бы, і будуць тыя, дзеля якіх я памру* (Л. Галубовіч); *Кожная дзяржава зацікаўлена, каб расло яе насельніцтва, каб нараджаліся дзеці* (Л. Арабей); *Хацеў бы, каб доля ў хатцы жыла, каб з рэчкай бурлівай нядоля сплыла* (Я. Купала); *Часам Лабановічу здавалася, што школа адстае, што вынікі дасягнуты нязначныя і што наогул ён няважны настаўнік* (Я. Колас); *Памятай, што пасля Грунвальда пра нас даведаліся ва ўсім свеце* <...> (У. Арлоў).

***Складаназалежныя сказы расчлянёнай структуры (прыcастаўныя)*** характарызуюцца тым, што:

- даданая прэдыкатыўная частка спалучаецца з усёй галоўнай, а не з канкрэтным словам;
- злучнік, як правіла, з'яўляецца семантычным (перадае пэўны тып адносінаў);
- карэляты ўтвараюць складаныя злучнікі (тыпу: *для таго каб, дзякуючы таму што* і пад.).

Семантыка-сінтаксічныя адносіны ў такога кшталту сказах носяць акалічнасны характар, а менавіта:

ч а с у: *Калі размаўляюць вочы, заўсёды нямеюць словы* (З. Марозаў); *Бывала, у летнія вечары, як толькі клаліся змрокі, сяло пачынала жыць другім, вечаровым жыццём* (Я. Скрыган); *Шчупак за плоткаю ганяўся, пакуль сам у нерат не папаўся* (народн.);

м э т ы: *Трэба хоць раз у год прайсці басанож баразною за плугам, каб аднавіць сваю даўнюю сувязь з раднёй – зямлёй, камянямі, травою* (М. Танк); *Для таго каб праца давала плённыя вынікі, трэба прывучаць да сталых і сур'ёзных адносін да яе з малых гадоў* (Я. Колас); *Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца* (прыказка);

у м о в ы: *Зрабілі б мы нямала, каб сілы нам хапала* (У. Хадыка); *Як будзе здаровіцца, работа паробіцца* (прыказка); *Калі маўчыць душа, гібее розум* (М. Стральцоў); *Нават глупства можа набыць славу мудрасці, калі яму не пярэчыць* (Я. Скрыган);

п р ы ч ы н ы: *Чалавеку патрэбна ўсмешка незнаёмых вачэй і знаёмых, каб дажджом размытая сцежка стала лёгкай на кручах і стромах* (С. Грахоўскі); *Навуковы сход мае яшчэ адну назву – III СупрунОўскія чытанні, бо прысвячаецца ён памяці мовазнаўцы прафесара Адама Яўгенавіча Супруна (1928–1999)* («Беларускі універсітэт»);

в ы н і к у: *Пачынала змяркацца, так што Івану трэба было вяртацца назад* (С. Грахоўскі); *У хаце нічога іншага не было, дык кожны дзень частавалі хлопца мёдам* (А. Кулакоўскі);

с а с т у п к і: *Гаршчок агорнуты пашанай, хоць ён фаміліі глінянай* (Я. Колас); *Хоць у кішэні пуста, затое ногі сыплюць густа* (Я. Купала); *І жыў ён птушкай пералётнай, хоць, праўда, ў вырай не лятаў* (Я. Колас);

п а р а ў н а н н я: *Дні адпачынку замільгалі, як каляровыя шкельцы ў дзіцячым калейдаскопе* (А. Бутэвіч); *У лесе ні шораху, ні гуку, нібыта вымер свет* (А. Васілевіч); *Ліпень ліпу весела лістае, як цікаўны школьнік свой буквар* (Хв. Гурыновіч).

Пераходную групу паміж сказамі нерасчлянёнай і расчлянёнай структуры займаюць сказы, у якіх ёсць неадпаведнасць паміж іх структурай і зместам. У такіх складаных сказах у галоўнай частцы змяшчаецца карэлят, ад якога залежыць дададная, але выражаюць яны акалічнаснае значэнне (найперш адносіны меры і ступені, а таксама месца), напр.: *Дзе прайшло маленства, там пачынаецца радзіма* (К. Чорны); *Там, дзе еднасці і згоды няма ў людзей, праца іхняя заўсёды марна прападзе* (Я. Купала); *Мароз так цісне, ажно дух займае* (З. Бядуля); *Сонца смаліла так, што курчыўся малады ліст на алешніку* (М. Лынькоў).

## ЛІТАРАТУРА


*Адамовіч, 1989*: Адамовіч Я. М. Складаны сказ // Беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя / Пад рэд. Я. М. Адамовіча. Мн.: Вышэйш. шк., 1989. 303 с.

*Анічэнка, 1998*: Анічэнка У. В. Беларуская мова: Дапам. для самаадукацыі. Мн.: Бел. навука, 1998. 206 с.

*Антанюк, 2003*: Антанюк Л. А. Складаны сказ // Плотнікаў Б. А., Антанюк Л. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мн.: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. С. 287–298.

*Бандарэнка, 1986*: Бандарэнка Т. П. Складаназалежныя сказы // Беларуская граматыка: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1986. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 272–290.

*Бурак, 1966*: Бурак Л. І. Складаны сказ // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 484–574.

*Бурак, 1987*: Бурак Л. І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн.: Універсітэцкае, 1987. 320 с.

*Клюсаў, 1972*: Клюсаў Г. Н., Юрэвіч А. Л. Сучасная беларуская пунктуацыя. Мн.: Вышэйш. шк., 1972. 280 с.

*Михневич, 1990*: Михневич А. Е. Сложное предложение // Кривицкий А. А. и др. Белорусский язык для говорящих по-русски. Мн.: Вышэйш. шк., 1990. С. 317–320.

*Скурат, 1966*: Скурат К. У. Складаназалежныя сказы // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 290–305.

*Тарашкевіч, 1991*: Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ / Факсімільнае выданне. Мн.: Нар. асвета, 1991. 136 с.

*Шуба, 1966*: Шуба П. П. Складаназалежныя сказы // Граматыка беларускай мовы: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1966. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 575–720.

*Шуба, 1972*: Шуба П. П. Аб размежаванні двух узроўняў сінтаксічнага аналізу // Беларускае і славянскае мовазнаўства / Пад агул. рэд. М. Р. Судніка. Мн.: Навука і тэхніка, 1972. С. 283–286.

*Яўневіч, Сцяцко, 1987*: Яўневіч М. С., Сцяцко П. У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. Мн.: Вышэйш. шк., 1987. 272 с.

# *КАМУНІКАЦЫЙНЫ АСПЕКТ СКАЗА*

## АКТУАЛЬНАЕ ЧЛЯНЕННЕ ВЫКАЗВАННЯ

### З гісторыі распрацоўкі актуальнага члянення

Сучасныя даследчыкі часцей за ўсё ўзводзяць гісторыю ўзнікнення ідэй, што ляжаць у аснове актуальнага члянення (АЧ), да працы Анры Вейля «Парадак слоў у старажытных мовах у параўнанні з сучаснымі» (1869). У выніку супастаўлення парадку слоў у старажытных і сучасных яму мовах, ён прыйшоў да высновы, што ў сказе можна вылучыць два віды арганізацыі: парадак праходжання членаў сказа і парадак праходжання ідэй. Пры тым «ідэі» ў складзе сказа могуць быць двух відаў: *зыходны пункт паведамлення* і яго *мэта*. У старажытных мовах тое, што названа зыходным пунктам, размяшчалася, як правіла, у пачатковай пазіцыі, а мэта паведамлення размяшчалася ў канцы сказа [*Теория*, 1992, *192*].

Ідэя бінарнага сэнсавага члянення сказа, выказаная ў рабоце А. Вейля, стала ў далейшым грунтам для значнай часткі работ па актуальным чляненні сказа. Але сама тэорыя актуальнага члянення як самастойная галіна навуковых даследаванняў узнікла толькі ў 20–30-я гг. XX ст., і ля яе вытокаў стаяць чэшскія лінгвісты В. Матэзіус, Ф. Траўнічак, П. Адамец і інш. Сам тэрмін *актуальнае члянення* належыць В. Матэзіусу; ён жа прапанаваў і бінарнае чляненне сказа на *зыход* і *ядро* і разглядаў узаемадзеянне гэтых элементаў як «функцыянальную (камунікацыйную) перспектыву выказвання» [*Матезиус*, 1967, *244*].

Што датычыць беларускай лінгвістыкі, то спецыяльных прац, прысвечаных гэтаму пытанню, тут бракуе. Але, па-першае, існуе шэраг публікацый і даведачных матэрыялаў, якія так ці інакш закранаюць праблему актуальнага члянення беларускага сказа, у прыватнасці работы Л. Ц. Выгоннай, А. Я. Міхневіча, Т. П. Бандарэнкі, Л. І. Бурака, Л. А. Антанюк, Л. І. Сямешкі і інш., а па-другое, «беларускі матэрыял прыцягваецца да па-

раўнання з адпаведным матэрыялам іншых славянскіх моў», праўда, толькі як ілюстрацыя для супастаўлення прасадычных сістэм [*Выгонная*, 1991, *7*].

***Актуальнае чляненне*** – гэта сэнсавы падзел выказвання на тэму і рэму, істотны для дадзенага кантэксту ці сітуацыі. Актуальнае чляненне сказа адпавядае камунікацыйнаму заданню: яно арганізуе сказ для перадачы актуальнай інфармацыі, г. зн. таго аспекту рэчыўнай інфармацыі (звязанай з лексічным напаўненнем і фармальнай арганізацыяй выказвання), які складае сутнасць дадзенай камунікацыі, і дзеля паведамлення якога дадзеная камунікацыя і павінна адбыцца.

Тэрмін *актуальнае чляненне* супрацьпастаўляецца фармальна-сінтаксічнаму чляненню выказвання і падкрэслівае, што яно істотнае (актуальнае) у дадзеным кантэксце ці для дадзенай сітуацыі і цалкам залежыць ад моўцы ці таго, хто піша. Актуальнае чляненне каардынуецца з сінтаксічным, але не падпарадкоўваецца яму, паколькі, па-першае, актуальнае чляненне заўсёды бінарнае (уключае тэму і рэму), нягледзячы на тое, што выказванні маюць розную колькасць кампанентаў; а па-другое, тэмай і рэмай могуць быць любыя члены сказа. Згадаем прыклад з «Паэмай» Р. Барадуліна *Мне цябе не стае // Тае...* Паводле фармальна-сінтаксічнага члянення тут вылучаюцца чатыры члены сказа: галоўны член безасабовага сказа *не стае*, прамое дапаўненне *цябе*, ускоснае дапаўненне *мне* і дапасаванае азначэнне *тае*; згодна з камунікацыйным чляненнем, тут тэмай будзе частка *мне цябе не стае*, а рэмай – сінтаксема *тае*, таму што на яе прыпадае асноўны лагічны націск і ўся сэнсавая нагрузка выказвання.

Як правіла, даследчыкі вызначаюць тры прыметы тэмы:

- гэта «зыходны пункт выказвання» (В. Матэзіус);
- яна актуальна менш значная, чым рэма;
- гэта частка выказвання, якая звычайна вядомая, прадвызначаная папярэднім кантэкстам. «Тэма ўяўляе сабой той пункт выказвання, які вызначае ступень кантэкстуальнай залежнасці гэтага выказвання ад папярэдніх і наступных» [*Слюсарева*, 1981, *113*].

Пры вызначэнні рэмы адзначаецца, што:

- гэта «ядро выказвання» (В. Матэзіус);
- яна актуальна больш значная, чым тэма, бо змяшчае ў сабе асноўны змест паведамлення;
- звычайна з'яўляецца носьбітам «новага», «перадае тое, што вылучае дадзенае выказванне, што не тоеснае раней вядомаму для моўцы» [*тамсама*, *124*]. У прынцыпе тут назіраецца пэўны стылістычны эфект, т. зв. «ілюзія дадзенага» (І. Каўтунова), паколькі

для адрасата ўся інфармацыя (і тэма, і рэма) можа быць новай, але моўца зыходзіць з яе некаторай дадзенасці, будуючы сваё выказванне так, быццам слухач пра гэтыя факты таксама ведае. Возьмем для прыкладу вершаваныя радкі, якія чытаюцца намі ўпершыню, і тым не менш мы вылучаем тут тэму (як інфармацыю вядомую) і рэму (новую інфармацыю – падкрэслена ў тэксце):

*У кожным з нас / жыве Варава,*
*І рэдкім госцем – / Пан Хрыстос.*

(Р. Барадулін)

Адбываецца гэта таму, што любое выказванне будуецца паводле прынцыпу разгортвання інфармацыі: ад тэмы да рэмы, ад дадзенага да новага; і нават калі «дадзенае» ёсць цалкам новае, тым не менш вылучаецца тэма і рэма, хаця разгортванне ў прынцыпе ідзе ад новага да новага (!), напр.: *Заўтра ўсе заняткі здымаюцца*.

Выказванне[37] можа не мець граматычна выражанай тэмы, але пры гэтым рэму – заўсёды, а таму выказванне без тэмы (па-іншаму: з нулявой тэмай) утварае толькі рэма: *Прыйшла зіма. Пахне марознай свежасцю. Наступіла раніца*; параўн. у вершы: *Самоціцца восень. Самоціцца неба* (Т. Дзмітрусёва); *Маленькі жаль. Маленькі боль. Ледзь чутная трывога. Цярпіма* (Т. Дзмітрусёва).

## Выказванне, яго тыпы

***Выказванне*** – «адзінка паведамлення, якая мае сэнсавую цэласнасць і можа быць успрынятая слухачом у пэўных сітуацыях моўных зносінаў» [*Сцяцко*, 1990, *34*]. Для выказвання характэрная камунікацыйная сітуацыя, «кампанентамі якой з’яўляюцца моўца і яго адрасат (ва ўсёй паўнаце сацыяльных і псіхалагічных роляў, фонавых ведаў і нацыянальна-культурных канцэптаў), іх матывы і мэты зносінаў, інтэнцыі, ацэнкі, эмоцыі, адносіны, месца і час стасункаў і г. д.» [*Формановская*, 1999, *176*].

Класіфікацыя выказванняў магчыма паводле:

- экспрэсіўнасці – нейтральныя / экспрэсіўныя;
- структуры – расчлянёныя / нерасчлянёныя (з нулявой тэмай),
  – простыя / са шматступеньчатым актуальным чляненнем;
- аўтаномнасці – сінтагматычна незалежныя / абумоўленыя.

[37] Некаторымі лінгвістамі выкарыстоўваецца тэрмін *фраза*.

Нейтральныя выказванні будуюцца на звычайным размяшчэнні кампанентаў АЧ: тэма → рэма, таму яны пазбаўлены эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкі, з'яўляюцца стылістычна немаркіраванымі. Звычайна тэма супадае з групай дзейніка, але толькі да гэтага тыпу немагчыма звесці ўсю разнастайнасць выказванняў (табл. 15)[38].

*Табліца 15*

**СУАДНЕСЕНАСЦЬ ТЭМЫ І РЭМЫ З ЧЛЕНАМІ СКАЗА Ў НЕЙТРАЛЬНЫХ ВЫКАЗВАННЯХ**

| Тэма | Рэма | Прыклады |
|---|---|---|
| Дзейнік | Выказнік | *Зорка босая / йшла па зямлі.* |
| Выказнік | Дзейнік | *Панаваць над душой / вольны толькі Бог* |
| Дэтэрмінант | Выказ.+дзейнік | *Да слова / бруд не прыстае...* |
| Дэтэрм.+дзейнік | Выказнік | *На Палессі буслы / не заводзяць сям'і...* |
| Група дэтэрмінантаў + выказнік | Дзейнік | *На святыя Каляды і ў зорак далёкіх цяплеюць / пагляды.* (Р. Барадулін) |

Экспрэсіўныя выказванні заснаваныя на змяшчэнні тэмы і рэмы, што праяўляецца ці праз адваротны парадак (рэма – тэма), ці праз сінтаксічную інверсію ў спалучэннях слоў: *Заскрыпеў снег сыпучы / пад маімі нагамі* (М. Багдановіч); *Вясёлка пёркамі паўліна / над лёгкім марывам гарыць...* (Р. Баравікова). Але і пабудаваныя на суадносінах тэма → рэма, выказванні могуць быць экспрэсіўнымі, параўн.: *Ён прадбачыў, прадказваў, прарочыў. // Ён душою крычаў. Ён маўчаў. // Ён з дарогі на сцежку не збочыў. // Ён глухім даравaў, выбачаў* (Р. Барадулін).

Як нейтральныя, так і экспрэсіўныя выказванні могуць быць расчлянёнымі і нерасчлянёнымі. Расчлянёныя выказванні ўтрымліваюць і тэму, і рэму. Структурна няпоўныя выказванні кваліфікуюць як расчлянёныя, хаця яны, як правіла, змяшчаюць толькі рэпліку-рэму, але тэма ў такіх сітуацыях вядомая з кантэксту: *– Пра што вы думаеце, сын мой? – Пра астры* (Л. Дранько-Майсюк). У маналагічных і дыялагічных няпоўных сказах камунікацыйны цэнтр выказвання вылучаецца вельмі яскрава, бо (асабліва калі было пытанне) атаясамліваецца з рэмай: *– Што робіш? – Адпачываю. – А да гэтага што рабіў? – Спаў. – Дык чаму ж ты адпачываеш? – Бо пасля сну і адпачыць добра* (народн.).

[38] Табліца выкарыстана з дапаможніка пад рэд. Л. Новікава «Современный русский язык» (2001).

Нерасчлянёныя выказванні – гэта такія выказванні, у якіх тэма лексічна не выражана, а ўвесь лексічны склад выконвае ролю рэмы, бо ён успрымаецца як адно цэлае. Яны «змяшчаюць уласна ядро выказвання са спадарожнымі словамі» [*Матэзіус*, 1967, *240*], а значыць, толькі новую інфармацыю – без тэмы. Выказванні з нулявой тэмай – гэта звычайна сказы, якія маюць значэнне быццёвасці, наяўнасці, існавання, таму гэта ці намінатыўныя, ці безасабовыя, ці двухсастаўныя сказы з непераходным дзеясловам у якасці выказніка або пераходнага ў значэнні непераходнага, параўн.: *Жыў дзед, жыла баба. Была ў іх курачка-рабка* (Казка); *Пагаслі зоркі. Над зямлёй світае* (С. Законнікаў); *Была глыбокая восень...* (П. Трус).

Простыя выказванні такія, што маюць адзін падзел на тэму (у тым ліку і нулявую) і рэму, а шматступеньчатае АЧ уласцівае, як правіла, сказам складаным, дзе выяўляецца не адзін блок тэма – рэма, а некалькі, напр.: *Яны / пазнаёміліся ў батанічным садзе. Стаяла спёка. Яніна з мужам // глядзелі, / як садоўнік // палівае кветкі* (А. Глобус) (знак / абазначае першы падзел на тэму і рэму, а // – падзел на тэму і рэму ўнутры першага падзелу).

Сінтагматычна незалежныя выказванні ў сваім актуальным чляненні не залежаць ад кантэксту, бо яны адносна аўтаномныя. Як правіла, у такога кшталту выказваннях АЧ супадае з сінтаксічным чляненнем, напр.: *Смяецца рэхам / цішыня. Рачулка / журыцца пратокамі. Маўчыць вірамі / глыбіня. Нябёсы / думаюць аблокамі* (Р. Барадулін).

Сінтагматычна абумоўленыя выказванні абапіраюцца на кантэкст, тэмай у іх з’яўляецца ўжо вядомае, названае раней (часта выкарыстоўваюцца займеннікі), і рэма першага становіцца тэмай наступнага выказвання: *Сонца паволі ўваходзіла ў мора. І мора з радасцю і ласкаю прымала яго ў сябе, лашчыла, атуляла, гладзіла і, нецярпліва выгінаючыся ўсё бліжэй і бліжэй, хавала ў свае воды, у свае глыбіні...* (Я. Сіпакоў).

## Сродкі актуальнага члянення і актуалізацыі

Калі актуальнае чляненне выказвання – гэта падзел на тэму і рэму, то ***актуалізацыя*** – змяненне нарматыўнай структуры выказвання пад уздзеяннем камунікацыйнага задання. Асноўнымі сродкамі актуальнага члянення з’яўляюцца інтанацыя і парадак слоў у іх узаемадзеянні, дадатковымі – рознага кшталту часціцы.

Для актуалізацыі выкарыстоўваюцца розныя дадатковыя прасадычныя, а на пісьме (асабліва часта) графічныя сродкі.

***Інтанацыя*** (лац. *intonare* ‘гучна вымаўляць’ – «сукупнасць фанетычных сродкаў, якія служаць для афармлення фразы і асобных яе частак як адзінага цэлага, а таксама для больш дакладнай перадачы думак і пачуццяў асобы, якая гаворыць» [*Выгонная*, 1990, *232*]. Між тым «традыцыйна інтанацыя адносіцца да з’яў, якія не маюць прамых адносінаў, непасрэднага ўплыву на сінтаксічную структуру. Відаць, гіпнатычнае ўздзеянне на даследчыка аказвае пісьмовая форма маўлення, пісьмовы тэкст, *як бы* пазбаўлены інтанацыйных характарыстык» [*Міхневіч*, 1976, *41*]. Паводле меркавання А. Я. Міхневіча, інтанацыя знаходзіцца не па-за сказам, а па-над сказам і прысутнічае абавязкова (так як і канчаткі, злучнікі і інш. матэрыяльныя носьбіты пэўнага значэння).

Разам з тым даследчыкамі ўказваецца і на адваротны бок гэтай з’явы: «Нельга спрашчаць адносіны між сінтаксісам і інтанацыяй, лічыць, што існуе самая непасрэдная і строга абумоўленая сувязь між пэўнай сінтаксічнай структурай і інтанацыйнай формай яе выражэння, што кожная сінтаксічная адзінка мае толькі ўласцівае ёй афармленне» [*Выгонная*, 1991, *37*]. Так, адзначаюць звычайна пэўныя тыпы інтанацыйных канструкцый (ІК), агульная колькасць якіх зводзіцца адным і лінгвістамі да сямі [*Сямешка*, 1996], а іншымі – толькі да пяці [*Выгонная*, 1990, *234*]. Пад і н т а н а ц ы й н а й  к а н с т р у к ц ы я й разумеецца «тып суадносінаў асноўнага тону, тэмбру, інтэнсіўнасці і працягласці, з дапамогай якога можна перадаць сэнсавыя адрозненні выказванняў з аднолькавай сінтаксічнай пабудовай і лексічным складам або выказванняў з рознай сінтаксічнай пабудовай, але аднолькавым гукавым складам словаформаў» [*Выгонная*, 1991, *171*]. Натуральна, што прадстаўленыя абагульненыя ІК не вычэрпваюць усяго багацця беларускай інтанацыі, але яны адлюстроўваюць тыя тыпы, што найбольш частотныя і ўжывальныя ў маўленні, сярод іх: ІК-1 – перадае завершанасць думкі ў апавядальных сказах тыпу: *Сёння добрае надвор’е*; ІК-2 – запытанне праз пытальныя займеннікі і прыслоўі тыпу: *Як ты пачуваешся? Што параіла доктар?*; ІК-3 – пытанне без пытальнага слова тыпу: *Прымаеш лекі ці толькі народнымі сродкамі абыходзішся?*; ІК-4 – характарызуе часцей няпоўныя сказы тыпу: *І дапамагае?*; ІК-5 – пабуджальныя ці эмацыянальна-ацэначныя сказы, напр.: *Які цуд!* [*Выгонная*, 1990, *234*].

Інтанацыя – гэта і сродак дыферэнцыяцыі сэнсавых адносінаў і сувязяў у выказванні (класічнае: *Пакараць нельга памілаваць*), а таксама універсальны сродак перадачы суб'ектыўнай мадальнасці. У маўленні інтанацыя выступае ў сукупнасці сваіх складнікаў: націск, тэмп, тэмбр, паўзы.

***Лагічны***, ці ***сэнсавы***, ***націск*** дазваляе вылучыць камунікацыйны цэнтр выказвання (асноўнае слова рэмы) пры любым парадку слоў. Калі ў пісьмовым маўленні актуальная інфармацыя змяшчаецца ў канцы выказвання, то пры вусным моўца можа актуалізаваць любое слова, не змяняючы парадку кампанентаў: *Сяброўка засталася на каву* (менавіта *сяброўка*, а не знаёмая); *Сяброўка засталася на каву* (менавіта *засталася*, а не сышла); *Сяброўка засталася на каву* (менавіта *на каву*, а не на чай). Такое інтанаванне не магчымае ў пісьмовым тэксце, таму выказванні выглядалі б так: *Засталася на каву сяброўка*; *Сяброўка на каву засталася*; *Сяброўка засталася на каву*. У іншым выпадку не мяняць парадак слоў дазваляе выкарыстанне дадатковых лексіка-граматычных сродкаў, напр. часціц (але пры гэтым можа зрушыцца сэнсавае адценне), параўн.: *Толькі сяброўка засталася на каву; Сяброўка ўсё ж засталася на каву; Сяброўка засталася толькі на каву.*

***Эмфатычны націск*** – гэта вылучэнне аднаго склада слова праз яго працяглае вымаўленне. З дапамогай эмфатычнага націску перадаюцца эмоцыі і пачуцці моўцы ад ўбачанага ці пачутага (фанетычна праяўляецца ў падоўжаным і напружаным вымаўленні націскной галоснай, а графічна перадаецца праз паўтор літары), напр.:

– *А мёд, што я вам праз дзядзю Франака паслаў, бацькі табе давалі каштаваць?*

*Вочы малой расшырыліся ад жаху:*

– *Неа!*

– *Чаму - у?*

– *Дзе - еду, а мамка знайшла ў ім адарванае ад пчалы крыло - о!*

– *То выкінула б, што знайшла, і – толькі той бяды!*

– *Там яшчэ былі но - огі!.. Ад гэтага зара - аза бывае, мамка каза - ала!*

(А. Карпюк)

***Паўзы*** (лац. *pausa* 'прыпынак'), што ў вусным маўленні абазначаюць перапынак гучання, таксама дапамагаюць вылучэнню камунікацыйнага цэнтра выказвання (на пісьме ім адпавядаюць розныя знакі прыпынку: працяжнік, кропка, шматкроп'е).

Паўзы якраз і выкарыстоўваюцца для актуалізацыі, прыстасоўваючы выказванне да канкрэтнай маўленчай сітуацыі, з мэтай найбольш адэкватнага ўспрыняцця чытачом. А таму ў мастацкіх і публіцыстычных тэкстах ставіцца працяжнік там, дзе па пунктуацыйных правілах яго быць не можа, напр.: *Усё забыць – імгнення і адразу* (Р. Баравікова); *Кароткія – імгненні чалавечага жыцця* (Т. Бондар); *Жыццё – як казка* (Н. Мацяш); *А самых лепшых – час не беражэ* (Я. Янішчыц). Гэтую асаблівасць пастаноўкі працяжніка адзначаюць і навукоўцы, канстатуючы, што «ў беларускіх мастацкіх творах, асабліва ў паэзіі, працяжнік сустракаецца вельмі часта (складаецца ўражанне, што часцей, чым у рускай лірыцы!) і выкарыстоўваецца ён як сродак перадачы такога сінтагменнага члянення фраз, якое спрыяе аўтарскаму разуменню тэксту» [*Выгонная*, 1991, *167*].

Шматкроп'е звычайна прымушае чытача затрымацца, асэнсаваць ужо сказанае перад новай інфармацыяй, накшталт:

*Казаў мудрэц: Яно – і нараканне, і сонца*
*і пякучай цемры сплаў...*
*«Якія вочы мне дало каханне!», але...*
*спярша душу яму аддаў.*

(Р. Баравікова)

Для падкрэслівання інфармацыйнай значнасці пэўных частак выказвання ці толькі асобных слоў у паэтычных тэкстах выкарыстоўваецца *ламаны радок*, што ў дадатак наглядна дэманструе камунікацыйную нагрузку вылучаных адрэзкаў, напр.:

*Наведвайце бацькоў,*
*пакуль яны жывыя,*
*Пакуль дымяцца коміны –*
*нагрэйцеся ў бацькоў.* <...>
*Пішыце ім часцей,*
*спакоем ахінайце,*
*Як ахіналі некалі*
*яны ўсе вашы сны.*

(Р. Барадулін)

Важкім сродкам актуалізацыі (асаблівы ў пісьмовых тэкстах) з'яўляецца ***парадак слоў***, што выконвае ў выказванні тры асноўныя функцыі: граматычную, камунікацыйную і стылістычную [*Чайкун*, 1994, *408*]. Граматычная функцыя не толькі вызна-

чае месца членаў сказа ў выказванні і іх адрозненне, але і арганізуе ў ім спалучэнні сінтаксем. Згодна з гэтай функцыяй, большасць расчлянёных выказванняў пісьмовага маўлення адпавядае наступнаму размяшчэнню яго членаў: дзейнік – выказнік – пашыральнік: *Студэнты / асвойваюць інтэрнэт*; прычым дапасаванае азначэнне – перад азначаемым словам, недапасавае пасля: *Дапытлівыя студэнты з філфака / асвойваюць інтэрнэт* (больш падрабязна гл. [*Бандарэнка*, 1986]). У нерасчлянёных выказваннях схемы $N_1 – V_f$ прэпазіцыя выказніка ёсць не інверсійны, а прамы парадак, напр.: *Зайшло сонца. Надышла ноч.* Камунікацыйная функцыя дапамагае перадачы актуальнага чляненне выказвання і шырэй – любой актуалізацыі сказа. Стылістычная функцыя абумоўлена ўзаемадзеяннем парадку слоў з інтанацыяй праз інверсію. Інверсія – гэта парушэнне прамога парадку праз адваротную пастаноўку (рэма – тэма), а таксама нязвыклае (дыстантнае) размяшчэнне кампанентаў спалучэння. Прамы парадак слоў (тэма – рэма) стылістычна нейтральны, а інверсійны спрыяе перадачы дадатковай семантычнай і стылістычна-экспрэсіўнай афарбоўкі, таму ён розны і адрозны ў вусным маўленні, фальклорных, публіцыстычных і мастацкіх тэкстах. Так, напр., размяшчэнне дапасаваных азначэнняў у постпазіцыі і ў канцы паэтычнага радка дазваляе стылізаваць верш пад фальклорны тэкст:

Слёзы *халодныя*...
Астры *маўклівыя*...
З днямі *асеннімі*, днямі *тужлівымі*...
Плачце!.. Рыдайце пад зорамі *мглівымі*,
Кветкі *забытыя* –
Астры *маўклівыя*!

(П. Трус. Памяцi Максіма Багдановіча)

Для вылучэння камунікацыйнага цэнтра ў выказванні выкарыстоўваюцца і спецыяльныя лексічныя і лексіка-граматычныя актуалізатары, перадусім гэта ***паўтор*** (і лексічны, і лексіка-граматычны, і сінтаксічны), а таксама часціцы і злучнікі.

*Воля – не тое, што рукі развяжуць,*
*зменяць на большую клетку малую.*
*Воля – не тое, што*
*«вольны ты» – скажуць.*
*Воля – то воля, якую адчую.*

(Л. Геніюш)

***Часціцы*** *проста, не, ж, ці, якраз* і інш., а таксама злучнікі, асабліва парныя: *не... а; не... але; не столькі... колькі* і інш. з'яўляюцца актуалізатарамі тэмы ці рэмы: *Паэт / ледзьве стрымліваў свой непачцівы смех* (Л. Дранько-Майсюк) (узмацняе рэму); *А ці мужчыны / ружы прадаюць? // Сапраўдныя мужчыны / дорань ружы* (П. Макаль) (узмацняе тэму).

Актуалізацыі інфармацыйнай значнасці пэўных кампанентаў выказвання садзейнічаюць і шматлікія сінтаксічныя сродкі: парцэляцыя, далучэнне, няпоўныя сказы, назоўны тэмы, ці сегментацыя, устаўныя канструкцыі, звароты, пабудаваныя па мадэлі *што датычыць ..., то...* і інш.

***Парцэляцыя*** (ад лац. *particula* 'часцінка') – «такое чляненне сказа, пры якім змест выказвання рэалізуецца не ў адной, а ў дзвюх і больш інтанацыйна-сэнсавых канструкцыях, размешчаных адна за адной з працяглымі паўзамі» [*Сцяцко*, 1990, *97*]. Выкарыстоўваецца яна з мэтай узмацнення сэнсавай і экспрэсіўнай нагрузкі выказвання. Парцэлятам (у адпаведнасці з аўтарскім жаданнем) можа аказацца любы член сказа: *Я памірала. Тысячу разоў. // Даўжніцаю была зіме і маю* (Я. Янішчыц); *Бяссоннай ноччу думаецца многа. // І светла і не надта. // Як калі* (Т. Дзмітрусёва); *Голас быў ціхі, але малады, дзявочы. Знаёмы. І блізкі, побач* (В. Карамазаў).

Як сінтаксічна-стылістычны эксперымент можна разглядаць парцэляцыю між дзейнікам і выказнікам: *Цяплынь. Бусліны клёкат. // Над поплавам паплыў* (Я. Янішчыц); *Упаў. І толькі крылы за спіной. // Не хочуць знаць аб чорным дні нічога* (Я. Янішчыц).

***Далучэнне*** – гэта «прыбаўленне да асноўнага паведамлення шляхам далучальнай сувязі дадатковых звестак, тлумачэнняў, якія ўзнікаюць не адначасова з асноўнай думкай, а пасля яе выказвання» [*Сцяцко*, 1990, *43–44*], напр.: *Выпусціла птушку. І акно // Зачыніла. І цвіком забіла* (Т. Бондар); *Скіруй свае думкі да Бога // У неба й не бойся жуды. // І лёгкаю стане дарога. // І ты не самотны тады* (Г. Чарказян у перакл. Р. Барадуліна).

Сродкі актуалізацыі выказвання могуць камбінавацца. Аднак іх выкарыстанне залежыць як ад формы тэксту – вусны ці пісьмовы, так і ад яго стылістычнай прыналежнасці (размоўны, рэкламны, навуковы, публіцыстычны, афіцыйны, мастацкі, канфесійны). Акрамя таго, адны з іх уласцівыя толькі вуснаму маўленню (прасадычныя: тэмп, тэмбр, лагічны націск), іншыя – толькі

пісьмоваму (графічныя: вылучэнне праз курсіў, разрадка, асаблівы шрыфт, тлустасць, падкрэсліванне):

Я – *беларус*. Ну, што ж, такая ўжо мая доля...

(Л. Галубовіч)

Але калі я думаю пра людзей,
мне прыходзяць на памяць
словы, якія нібы не тлумачаць
нічога:
с п р а д в е ч н ы  п ы л.

(А. Разанаў)

Сёння б мне нарадзіцца нанова,
Але ўжо не сляпым і глухім,
Каб СУМЛЕННЕ – адзінае слова
Засталося нашчадкам маім.

(С. Грахоўскі)

## ЛІТАРАТУРА


*Антанюк, 2003*: Антанюк Л. А. Функцыянальна-семантычны сінтаксіс // Плотнікаў Б. А., Антанюк Л. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мн.: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. С. 298–306.

*Бандарэнка, 1986*: Бандарэнка Т. П. Парадак слоў у сказе // Беларуская граматыка: У 2 ч. Мн.: Навука і тэхніка, 1986. Ч. 2: Сінтаксіс. С. 250–271.

*Выгонная, 1990*: Выгонная Л. Ц. Інтанацыя // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелЭн, 1990. С. 232–234.

*Выгонная, 1991*: Выгонная Л. Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія. Мн.: Навука і тэхніка, 1991. 215 с.

*Кунцэвіч, 1990*: Кунцэвіч Л. П. Націск // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелЭн, 1994. С. 382–383.

*Матезиус, 1967*: Матезиус В. О так называемом актуальном членении предложения // Пражский лингвистический кружок. М.: Прогресс, 1967. С. 239–245.

*Міхневіч, 1976*: Міхневіч А. Я. Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы. Мн.: Навука і тэхніка, 1976. 264 с.

*Міхневіч, 1994*: Міхневіч А. Я. Актуальнае чляненне // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелЭн, 1994. С. 21–22.

*Слюсарева, 1981*: Слюсарева Н. А. Проблемы функционального синтаксиса английского языка. М.: Наука, 1981. 205 с.

*Сцяцко, 1990*: Сцяцко П. У. і інш. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. Мн.: Вышэйш. шк., 1990. 222 с.

*Сямешка, 1996*: Сямешка Л. І. Прасадычныя сродкі мовы // Сямешка Л. І. і інш. Курс беларускай мовы. Мн.: Універсітэцкае, 1996. С. 103–111.

*Теория, 1992*: Теория функциональной грамматики: Субъективность. Объектность. СПб.: Наука, 1992. Гл. 2: Коммуникативная перспектива высказывания. С. 189–231.

*Формановская, 1999*: Формановская Н. И. Лингвистика общения: высказывание vrs предложение // Русский язык, литература и культура на рубеже веков: В 2 ч. Братислава, 1999. Ч. 1. С. 175–176.

*Чайкун, 1994*: Чайкун П. М. Парадак слоў у сказе // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелЭн, 1994. С. 408–409.

# *СЕМАНТЫЧНЫ АСПЕКТ СКАЗА*

## ВЫКАЗВАННЕ І ПРАПАЗІЦЫЯ

### Паняцце семантычнага сінтаксісу

З сярэдзіны 60-х гг. XX ст. лінгвісты звярнуліся да даследавання семантычнай структуры сказа, паколькі да гэтага часу асноўная ўвага аддавалася яго фармальнай арганізацыі: «будучы раздзелам граматыкі, сінтаксіс стараўся не выходзіць за межы ўласна граматычных катэгорый» [*Арутюнова*, 1976, *5*]. Аналіз семантыкі сказа прывёў да высновы, што сказ, як слова, з'яўляецца намінацыйнай адзінкай. Але яго намінацыя суадносіцца не з паняццем, што ўласціва слову, а з сітуацыяй, падзеяй.

У замежнай лінгвістыцы семантычная арганізацыя сказа стала ся прадметам вывучэння нашмат раней, пачынальнікамі гэтай традыцыі былі Люсьен Тэньер, Шарль Балі, Эміль Бенвеніст, Чарльз Філмар, Францішак Данеш, Ганна Вяжбіцка і інш. Рускі семантычны сінтаксіс ствараўся працамі Ц. П. Ламцёва, Н. Ю. Шведавай, Ю. Д. Апрэсяна, Н. Д. Аруцюнавай, А. В. Падучавай, Т. Б. Алісавай і інш. Сярод беларускіх лінгвістаў грунтоўнасцю сваіх даследаванняў вылучаюцца В. У. Мартынаў, А. Я. Міхневіч, А. К. Кіклевіч.

Упершыню ў беларускім мовазнаўстве адзін з фрагментаў семантычнай структуры беларускай мовы быў разгледжаны ў фундаментальнай манаграфіі А. Я. Міхневіча «Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы» (1976), і ў прыватнасці, т. зв. скрытаграматычныя катэгорыі, якія не маюць спецыфічных марфалагічных паказчыкаў, але шмат у чым вызначаюць спалучальнасць слоў у маўленні – сінтаксічную, лексічную і інш. Зыходзячы з таго, што ў беларускай мове гэтыя катэгорыі аб'ектыўна існуюць, вучоны выявіў і апісаў шэраг селекцыйных значэнняў граматычнага характару, а менавіта: адчужальнасць / неадчужальнасць, партытыўнасць / непартытыўнасць, асертыўнасць / неасертыўнасць і інш.

У гэтым даследаванні былі адзначаны і найбольш актуальныя праблемы вывучэння граматычнага ладу беларускай мовы ў плане семантычнага сінтаксісу, якія да сённяшняга дня застаюцца адкрытымі і патрабуюць сваёй распрацоўкі. Сярод іх: семантычная структура слова з пазіцый сінтаксісу; селекцыйныя (спалучальнасныя) катэгорыі, якія фарміруюць семантыка-сінтаксічныя класы слоў; спосабы выражэння селекцыйных значэнняў у беларускай мове; характар аналітызму граматычнага ладу; межы паміж граматыкай і лексікай (сінтаксісам і семантыкай), а таксама паміж марфалогіяй і сінтаксісам і шэраг іншых [*Міхневіч*, 1976, *21*].

Семантычны сінтаксіс як навука вывучае пэўную частку «агульнамоўнай семантыкі, тыя семантычныя катэгорыі, што вызначаюць граматычную (не індывідуальную) спалучальнасць слоў і ўскрываюцца праз аналіз сінтаксічных структур» [*Міхневіч*, 1976, *16*]. Між тым навукоўцы акцэнтуюць увагу на тым, што «семантычны сінтаксіс трэба разумець не як апісанне сінтаксічных структур з дапамогай пазасінтаксічных адзінак і крытэрыяў семантычнага характару, а як высвятленне семантычных падстаў сінтаксічных заканамернасцей і сінтаксічных функцый пэўных тыпаў значэння» [*тамсама*, *20*].

Найважнейшая выснова семантычнага сінтаксісу можа быць зведзена да таго, што «сказ не ёсць сума значэнняў яго слоў-складнікаў, а гэта асобае ўтварэнне, што мае ўласную арганізацыю і дыктуе свае патрабаванні лексіцы і марфалагічным формам, застаўляючы іх выступаць у тых ці іншых значэннях, а зрэдку «навязваць» і як быццам бы неўласцівыя ім значэнні» [*Шмелева*, 1988, *4*].

Якраз зыходзячы з таго, што значэнне слова звязана з пэўнымі сінтаксічнымі канструкцыямі, А. Я. Міхневіч размяжоўвае два тыпы лексічных сістэм, што адпавядаюць дзвюм асноўным функцыям мовы – намінацыйнай і камунікацыйнай, якія грунтуюцца на функцыянальна адрозных аспектах значэння слова. *Намінацыйная лексічная сістэма* максімальна суадносіцца з прадметна-лагічнай сферай – фіксуе, канстатуе пазнанае і аніяк не выводзіцца з сінтагматыкі; *камунікацыйная лексічная сістэма* непасрэдна звязана са спалучальнасцю слова, яго здольнасцю быць складнікам паведамлення, а таму цалкам выводзіцца з сінтагматычных структур [*Міхневіч*, 1976, *129*, *131*].

У сучаснай лінгвістычнай навуцы існуюць розныя падыходы да даследавання семантыкі сказа. Адзін кірунак (умоўна кажучы, ад сэнсу да формы), заснаваны Ц. П. Ламцёвым, арыентуецца на тое, як фрагменты рэчаснасці (сітуацыі) адлюстроўваюцца

ў сказе, яго семантычнай структуры. Сказ у дадзеным выпадку разумеецца як «сістэма з адносінамі», цэнтрам якой з'яўляецца прэдыкат, што прадвызначае месцы для прадметаў (актантаў), іх колькасць і характар [*Ломтев*, 1972, *24*]. Прыхільнікаў гэтага кірунку (У. Р. Гак, Т. Б. Алісава, В. У. Мартынаў, П. П. Шуба, А. К. Кіклевіч, С. А. Важнік і інш.) аб'ядноўвае арыентаванасць на структуру падзеі, сітуацыю як дэнатат сказа, а таму «ў цэнтры ўвагі даследчыкаў знаходзіцца адлюстраваная ў сказе сітуацыя, фрагмент рэчаіснасці і яе семантычная мадэль – прапазіцыя» [*Белошапкова*, 1989, *678*].

Другі напрамак скіраваны на даследаванне семантыкі сказа, зыходзячы перадусім з яго фармальнай арганізацыі, таму што «размежаванне сказаў розных семантычных структур абавязкова павінна правярацца і карэктавацца іх граматычнымі характарыстыкамі» [*Шведова*, 1973, *483*].

## Семантычная структура сказа: дыктум і модус

Сэнсавая арганізацыя сказа бінарная: яна спалучае ў сабе аб'ектыўны і суб'ектыўны змест (паводле тэрміналогіі швейцарскага вучонага Ш. Балі – дыктум і модус) [*Балли*, 1955, *44*].

***Дыктумны змест сказа*** (лац. *dictum* 'сказанае'), ці ***прапазіцыя***, – гэта моўнае ўвасабленне (адлюстраванне) нейкага «становішча спраў» у рэчаіснасці ці канкрэтнай сітуацыі.

Зыходзячы з гэтай дэфініцыі, зразумела, што змест сказа можа адлюстроўваць падзеі з пазіцыі назіральніка – знешнія ў адносінах да моўцы праявы і з пазіцыі ўдзельніка – падзеі, сітуацыі, звязаныя з самім моўцам (параўн.: *На дварэ мароз; Заквітнелі сады* і *Мне не да гульняў; Мой канспект знік*), гэта з аднаго боку. А з другога, пэўны прадмет пазамоўнага свету ці сам моўца могуць характарызавацца, параўноўвацца, атаясамлівацца ў выніку інтэлектуальных аперацый (тыпу: *Заходняя Дзвіна называецца ў Латвіі Даўгава; Гэта студэнтка – аўтар першай «Кароткай граматыкі беларускай мовы для нямецкамоўных навучэнцаў»; Мне здаецца, Вы занадта ўсхваляваная для прыняцця пэўнага рашэння*). А таму супрацьпастаўляюць падзейныя і лагічныя прапазіцыі.

Калі падзейныя прапазіцыі «фатаграфуюць» рэчаіснасць – падзеі, іх удзельнікаў, накшталт: *Ідзе будаўніцтва дома; Дзеці збіраюць грыбы*, то лагічныя ёсць вынік разумовых аперацый і паведамляюць пра нейкія ўсталяваныя прыметы, улас-

цівасці, адносіны тыпу: *Муха – гэта насякомае; Брат падобны да бацькі*. Адрозненні паміж імі зводзяць да трох аспектаў [*Шмелева*, 1988, *12–14*].

1. Структуру падзейных прапазіцый вызначаюць актанты і сірканстанты – асобы і прадметы, што выступаюць у ролі агенса, пацыенса, каагенса і пад. Структуру лагічных прапазіцый складаюць актанты, якія выступаюць у адной ролі – аб'ектаў лагічных аперацый.
2. Падзейныя прапазіцыі ўводзяцца модусам агульнага значэння назірання: *я бачыў, я чуў* і пад., а лагічныя прапазіцыі ўводзяцца модусам са значэннем інтэлектуальнай дзейнасці: *я думаю (лічу), мяркую (здагадваюся), зразумеў (здагадаўся)* і пад.
3. Асноўны спосаб падзейных прапазіцый – прэдыкатны, г. зн. праз знамянальныя словы (у тым ліку і нулявы знак), накшталт: Ён *выскачыў за дзверы* і *Ён – за дзверы*. Практычна кожная лагічная прапазіцыя можа мець прэдыкатнае выражэнне тыпу *быць падобным*, аднак не менш натуральнае для іх і выкарыстанне службовых слоў (прыназоўнікаў, злучнікаў), параўн.: *З маразамі наступіла зіма / Пасля маразоў усталявалася зіма / Як толькі пачаліся маразы, наступіла зіма.*

Такім чынам, дыктумны змест сказа – адлюстраванне аб'ектыўнай рэчаіснасці ці выніку разумовай дзейнасці чалавека – і ёсць дэнатат сказа[39]. Натуральна, што дэнатат слоў і дэнатат сказа не супадаюць, а адрозненне гэта датычыць перадусім таго, што «дэнататам сказа <...> у адрозненне ад дэнатата слова (назоўніка) у прынцыпе не можа быць «рэч», канкрэтны прадмет. У гэтым сэнсе *намінацыя падзеі* можа быць проціпастаўлена *намінацыі прадмета*» [*Арутюнова*, 1972, *309–310*].

Між тым, адлюстроўваючы нейкі фрагмент рэчаіснасці, значэнне сказа не абмяжоўваецца толькі звесткамі пра навакольны свет і яго асэнсаванне, але і ўтрымлівае адначасова інфармацыю, якая зыходзіць непасрэдна ад моўцы (ацэнка, пачуццё, характарыстыка) – суб'ектыўныя значэнні, што тэрміналагізуецца ў лінгвістыцы як модус сказа. А таму ён заўжды зыходзіць толькі ад самога моўцы.

[39] Паняцце дэнататыўны ўзровень і дэнататыўная структура сказа ў русістыку было ўведзена Ц. П. Ламцёвым [*Ломтев*, 1958] і шмат у чым супадае з паняццем «глыбінная структура», выкарыстаным Н. Хомскім і грунтоўна распрацаваным У. Р. Гакам.

***Модус*** (лац. *modus* 'спосаб') – гэта індывідуальная ацэнка фактаў, што паведамляюцца, якая можа праяўляцца або экспліцытна (праз граматычныя формы, асобыя лексемы, некаторыя канструкцыі), або імпліцытна (прысутнічаць нябачна). Модус сказа залежыць ад:

- умоў і ўмоўнасцей зносінаў;
- рэчаіснасці, з якой трэба суаднесці паведамленне;
- інфармацыі і саміх падзей, якія трэба так ці інакш ацаніць;
- адносінаў паміж суразмоўцамі.

Варта зазначыць, што зрэдку модус супярэчыць дыктуму сказа, напр.: *Так яму патрэбная гэта кніга!* (=зусім непатрэбная); *Зараз я табе раскажу казачку!* (адказ-пагроза, што папярэднічае пакаранню).

Першасным сродкам выражэння модусу сказа з'яўляецца інтанацыя, а з граматычных – інфінітыў у якасці загаду, умоўны лад, службовыя лексемы, кшталту *дарэчы, хіба, няўжо* і да т. п., пабочныя словы і канструкцыі тыпу *вядома, несумненна, мажліва, няма сумненняў* і пад., а таксама словаўтваральныя формы (як правіла, пры адлюстраванні сацыяльных адносінаў паміж суразмоўцамі), параўн.: *Валянціна* і *Валюшка; Віцёк* і *Віктар Ягоравіч* і інш.

## Семантычныя тыпы прэдыкатаў і актантаў

Паслядоўнікі Ц. П. Ламцёва для апісання аб'ектыўнага зместу сказа – яго прапазіцыі – выкарыстоўваюць паняцце мадэлі прапазіцыі, складнікамі якой з'яўляюцца прэдыкат (носьбіт «становішча спраў») і актанты (удзельнікі «становішча спраў»). Тут дарэчы ўзгадаць ужо класічную метафару «сказ – гэта драма ў мініяцюры» (гл. 66).

Пры класіфікацыі прапазіцый зыходзяць з (1) семантычнай прыроды прэдыката і (2) колькасці актантаў пры ім, а таксама іх роляў.

Паняцце «ролі», ці *глыбіннага склону*, упершыню было ўведзена амерыканскім вучоным Ч. Філмарам, як зазначаюць навукоўцы, пад уплывам Л. Тэньера. Класіфікацыя гэтых «роляў» яшчэ не ўсталявалася ў лінгвістыцы канчаткова (бо ў аснову кладуцца розныя крытэрыі і ступень дэталізацыі), і ў русістыцы актыўна распрацоўваецца Ю. Д. Апрэсянам, У. Р. Гакам, Н. Д. Арушонавай, В. В. Багданавым, Г. А. Золатавай, Т. В. Шмялёвай і інш. Прымаючы пад увагу адзначаны факт, а таксама вучэбны

характар прапанаванага дапаможніка, мэтазгодна прывесці толькі мінімальны набор дэнататыўных роляў прапазіцыі.

Перадусім размяжоўваюць два вялікія класы – прэдыкаты і актанты.

***Прэдыкаты (атрыбуты)*** – гэта «дзеянні, адносіны, залежнасці, прыметы (якасныя, колькасныя), што звязваюць актанты адзін з адным» [*Всеволодова*, 2000, *134*].

Адрозніваюць некалькі тыпаў ***семантычных прэдыкатаў***: быццёвы (экзістэнцыяльны), акцыянальны, статальны, рэляцыйны, характарызацыйны (уласна прымета), што могуць праяўляцца ў фізічнай, псіхічнай, інтэлектуальнай ці сацыяльнай сферах [*тамсама*, *136–138*].

***Быццёвы тып прэдыката*** мае падтыпы: п р а с т о р а в ы: *Беларусь <u>размяшчаецца</u> ў цэнтры Еўропы* і ч а с а в ы (які можа прадугледжваць адначасова і месца): *Беларуская літаратурная мова <u>пачала</u> сваё існаванне з пачатку XX ст.*

***Акцыянальныя прэдыкаты*** падзяляюцца на д з е я н н і: *Хлопчык разбурыў пясчаны домік*, а таксама п а д з е і і п р а ц э с ы: *Мяч выкаціўся на шашу; Ласкава свеціць вясновае сонейка.*

***Статальныя прэдыкаты*** выражаюць стан – с т а т ы ч н ы: *Ён хварэе; Я ў роспачы* і д ы н а м і ч н ы: *Арэлі гойдаюцца; Дзяўчына чырванее*, а таксама ў с п р ы н я ц ц е аб’екта суб’ектам: *Я добра разумею яго паводзіны.*

***Рэляцыйныя прэдыкаты*** рэалізуюцца як (1) адносіны актантаў ці з’яў адносна адно аднаго: *Васілёк – палявая расліна; Брат старэйшы за сястру; Яе багацце – паліца кніг*, так і (2) адносіны суб’екта да аб’екта, у прыватнасці інтэлектуальныя і эмацыянальныя: *Дзеці захапляюцца камп’ютэрнымі гульнямі*; (3) адносіны валодання: *Ён мае найноўшую музычную апаратуру.*

***Характарызацыйныя прэдыкаты*** называюць прыметы: *Вочы ў яго вішнёвыя; Снег захоўвае цеплыню; Сукенка – з ільну; М. Багдановіч – беларус.*

***Актанты*** – удзельнікі падзеі (асобы, заонімы, прадметы, сілы прыроды). Як ужо зазначалася вышэй, тэрміны гэтыя ўведзены ў навуковы абыходак Л. Тэньерам, але ў дадзеным выпадку будуць разглядацца выключна як элемент плану зместу, а не як пазіцыя ў структуры сказа, прызначаная для пэўных роляў[40].

---

[40] Пры характарыстыцы тыпаў актантных роляў за зыходную бралася класіфікацыя, прапанаваная Т. В. Шмялёвай [*Шмелева*, 1988, *43–48*].

***Суб’ект*** – гэта іерархічна першы ці адзіны ўдзельнік, які актыўна ўдзельнічае ў ажыццяўленні падзей (прычым ступень актыўнасці можа быць рознай).

Існуюць разнастайныя формы выражэння суб’екта, сярод якіх адзначым наступныя:

а г е н с – актант суб’ектнага тыпу, асоба, што актыўна ажыццяўляе сітуацыю ці «ў адзіночку», ці з’яўляецца галоўным з некалькіх суб’ектаў: *Дзед ахвотна расказваў унуку казкі; Маці з дачкой штораніцы гатуюць сняданне*;

к а а г е н с – актант суб’ектнага тыпу, асоба, што знаходзіцца ў адносінах сумеснай дзейнасці, кааперацыі; ступень раўнапраўнасці можа быць максімальнай: *Алесь і Яна здалі іспыт* і мінімальнай (набывае адценне інструментальнае): *Алесь перадаў часопіс праз брата*;

с і л а – актант суб’ектнага тыпу, стыхія ці прадмет, ажыццяўляе сітуацыі перамяшчэння, разбурэння, вынішчэння; дзеянне не мэтаскіраванае, а стыхійнае: *Ветрам сарвала дах; Плыт знесла вадой*.

***Аб’ект*** – другі актант (у іерархіі актантаў), што залежыць ад першага. Адрозніваюць д э л і б е р а т ы ў н ы а б ’ е к т – разумовых і псіхічных дзеянняў: *Усё часцей прыгадваецца родны кут; Маці думае пра дзяцей* і п е р ц э п т ы ў – аб’ект успрыняцця: *Я яго бачыў*; п а ц ы е н с – актант аб’ектнага тыпу, асоба, што церпіць уздзеянне суб’екта: *Яе крытыкуюць; Маці апранула дзіця*.

***Адрасат*** – тып актанта, асоба, як правіла, трэцяя пасля суб’екта і аб’екта; не церпіць непасрэднага ўздзеяння суб’екта, аднак прымаецца пад увагу пры ажыццяўленні сітуацыі, і ў гэтым сэнсе яго роля несамастойная, залежная: *Ён падараваў ёй букецік валошкаў; Вечарына была прысвечана У. Караткевічу; Яна паведаміла пра гэта дэкану*.

Зыходзячы з зацікаўленасці / незацікаўленасці ў ажыццяўленні сітуацыі, адрозніваюць б е н е ф і ц ы е н с – адрасатны тып актанта, асоба ці калектыў, зацікаўленыя ў ажыццяўленні сітуацыі, і ў выніку яе здзяйснення маюць карысць ці страту (шкоду): *Яму ўручылі ўзнагароду; Іх пазбавілі працы*.

***Інструмент*** – тып актанта, прадмет, выкарыстанне якога садзейнічае ажыццяўленню сітуацыі: *Ён стукнуў па мячыку рукой; Ваду згатавалі на вогнішчы; Ехалі на метро*. Прычым адрозніваюць:

п р ы л а д у – актант інструментальнага тыпу, прадмет, спецыяльна прызначаны для інструментальнага выкарыстання: *Бацька ўскопваў гарод віламі; Я люблю пісаць алоўкам*;

с р о д а к – актант інструментальнага тыпу, рэчыва, што выдаткоўваецца пры ажыццяўленні сітуацыі: *Грады палілі вадой; Цацкі зрабілі з паперы*.

***Партытыў*** – частка любога актанта: *У яе на сэрцы нарастала хваляванне; Ён падобны да маці ўсмешкай*. Самы пашыраны від партытываў – саматызмы.

Даследчыкі звяртаюць увагу на два спосабы сінтаксічнага выражэння прапазіцыі: прэдыкатыўнай і непрэдыкатыўнай канструкцыяй. Калі прапазіцыя выражаецца прэдыкатыўнай канструкцыяй, то гэта і ёсць сказ; прычым фармальна, адлюстроўваючы адно і тое «становішча спраў», сказы могуць адрозніваецца, параўн: *Лекцыя чытаецца студэнтам; У студэнтаў – лекцыя*. Разам з тым і паводле аб’ектыўнага зместу, і паводле граматычнага афармлення яны ўтвараюць простую – монапрапазіцыйную і монапрэдыкатыўную – структуру. Калі ж прапазіцыя афармляецца як непрэдыкатыўная канструкцыя: дзеепрыслоўная, дзеепрыметная, інфінітыўная, ад’ектыўная ці субстантыўная, то фармальна – гэта ўскладненне структуры простага сказа, а змястоўна – ускладненне яго сэнсу. У такім разе «ўзнікае асіметрыя між сэнсавай і фармальнай арганізацыяй сказа: просты паводле граматычнага афармлення сказ набывае складаны аб’ектыўны змест (у ім выражаюцца дзве і больш прапазіцыі), ён нясе ў сабе ўласцівасці монапрэдыкатыўнасці і поліпрапазіцыйнасці» [*Белошапкова*, 1989, *690*]. Так, у сказе *Снег, бялюткі, пушысты, пакрыў усё наваколле* (В. Хомчанка) дзве прапазіцыі: характарыстыкі ‘снег быў бялюткі і пушысты’ і дзеяння ‘снег пакрыў наваколле’ з агульным актантам ‘снег’.

Такім чынам, сваім зместам просты сказ можа быць падобны да складанага, бо можа выражаць некалькі «становішчаў спраў» у фармальна простай структуры.

## ЛІТАРАТУРА

*Антанюк, 2003*: Антанюк Л. А. Функцыянальна-семантычны сінтаксіс // Плотнікаў Б. А., Антанюк Л. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мн.: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. С. 298–306.

*Арутюнова, 1972*: Арутюнова Н. Д. Номинативный аспект предложения // Общее языкознание: Внутренняя структура языка. М.: Наука, 1972. С. 290–320.

*Арутюнова, 1976*: Арутюнова Н. Д. Предложение и его смысл. М.: Наука, 1976. 383 с.

*Балли*, *1955*: Балли Ш. Общая лингвистика и вопросы французского языка. М.: Наука, 1955. 416 с.

*Белошапкова*, *1989*: Белошапкова В. А. Смысловая организация простого предложения // Современный русский язык: Учеб. для филол. спец. ун-тов / Под ред. В. А. Белошапковой. М.: Высш. шк., 1989. С. 675–694.

*Всеволодова*, *2000*: Всеволодова М. В. Теория функционально-коммуникативного синтаксиса. Фрагмент прикладной (педагогической) модели языка: Учеб. М.: Изд-во МГУ, 2000. 502 с.

*Гак*, *1973*: Гак В. Г. Высказывание и ситуация // Проблемы структурной лингвистики 1972. М.: Наука, 1973. С. 349–372.

*Киклевич*, *1999*: Киклевич А. К. Лекции по функциональной лингвистике. Мн.: БГУ, 1999. 215 с.

*Ломтев*, *1972*: Ломтев Т. П. Предложение и его грамматические категории. М.: Изд-во МГУ, 1972. 198 с.

*Ломтев*, *1976*: Ломтев Т. П. Конституенты предложения с глаголами речи // Ломтев Т. П. Общее и русское языкознание. Избр. работы. М.: Наука, 1976. С. 218–139.

*Михневич*, *1969*: Михневич А. Я. О взаимодействии семантики и синтаксиса // НДВШ. Филологические науки. 1969. № 6. С. 101–108.

*Міхневіч*, *1976*: Міхневіч А. Я. Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы. Мн.: Навука і тэхніка, 1976. С. 11–18.

*Міхневіч*, *1994*: Міхневіч А. Я. Сінтаксіс // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелЭн, 1994. С. 484–486.

*Шведова*, *1973*: Шведова Н. Ю. О соотношении грамматической и семантической структуры предложения // Славянское языкознание. VII Междунар. съезд славистов. М.: Наука, 1973. С. 458–483.

*Шмелева*, *1988*: Шмелева Т. В. Семантический синтаксис. Красноярск: Изд-во Краснояр. ун-та, 1988. 53 с.

# СІНТАКСІС ТЭКСТУ

## ТЭКСТ ЯК АБ’ЕКТ ЛІНГВІСТЫКІ

### Паняцце тэксту і дыскурсу

У свой час Э. Бенвеністам было адзначана, што «са сказам мы пакідаем сферу мовы як сістэмы знакаў і ўступаем у іншы свет, у свет мовы як сродку зносінаў, выражэннем якога з’яўляецца маўленне (le diskours)» [*Бенвенист*, 1974, *139*]. Паводле сучасных лінгвістычных падыходаў, зыходнай адзінкай вербальных зносінаў ёсць тэкст, а не выказванне, паколькі любое выказванне не выкарыстоўваецца ізалявана, а ў пэўнай сістэме. «Тэкст, уласна кажучы, галоўная ці нават адзіная выява мовы. Нічога, апрача тэкстаў, для спасціжэння мовы нам не дадзена. Мы размаўляем, ствараючы паведамленні, кожнае з якіх можа разглядацца як тэкст. Тэкст можа складвацца нават з аднаго слова, калі гэта слова выступае ў якасці асобнага паведамлення; напрыклад, калі ў адказ на запытанне «Ты мяне кахаеш?» дзяўчына адказвае «Так» ці «Не», кожны з гэтых яе адказаў з’яўляецца адносна закончаным паведамленнем, а таму можа разглядацца як тэкст. Тэкст можа быць і вельмі доўгім, такім, напрыклад, як «Каласы пад сярпом тваім» Караткевіча, «Вайна і мір» Талстога ці «Сага аб Фарсайтах» Галсуорсі» [*Супрун*, 2001, *259*].

Дэфініцый тэксту, як і азначэнняў сказа / выказвання, існуе вялікая колькасць, таму ў якасці зыходнага пункта возьмем адну: ***тэкст*** (лац. *textus* ‘тканіна, спалучэнне, спляценне’) – гэта «маўленчае камунікацыйнае ўтварэнне, функцыянальна скіраванае на рэалізацыю пазамоўных задач» [*Всеволодова*, 2000, *337*].

Класіфікацыя тэкстаў праводзіцца па розных параметрах, так, адрозніваюць тэксты паводле:

- формы рэалізацыі – пісьмовы / вусны, падрыхтаваны / спантанны;

● колькасці «моўцаў» – маналог, дыялог, палілог;

● прыналежнасці да функцыянальнага стылю (па сферы абслугоўвання) – мастацкі, публіцыстычны, навуковы, справавы, размоўны, рэкламны, канфесійны.

З пункту гледжання камунікацыйнай абумоўленасці размяжоўваюць тры групы тэкстаў.

1. Тэксты, змест якіх заўсёды разгортваецца паводле *аблігаторных інфармацыйных мадэляў*, што склаліся і прынятыя ў пэўнай камунікацыйнай сферы і з'яўляюцца адной з асноўных прымет пэўнага жанру, напр., тэкст інструкцыі да нейкага прыбора, тэкст тэатральнай афішы і да т. п. Без ведання такіх мадэляў немагчыма правільна скампанаваць тэкст такога жанру, і толькі захаванне ўсіх складнікаў мадэлі з'яўляецца для чытача крытэрыем цэласнасці і камунікацыйнай правільнасці.

2. Тэксты, змест якіх разгортваецца паводле *узуальных інфармацыйных мадэляў*, г. зн. такіх, што маюць дастаткова агульны характар, і кампаненты інфармацыйнага мінімуму могуць не толькі пашырацца, але і скарачацца, прычым паслядоўнасць выкладу звестак мае гнуткі характар (водзыў, рэцэнзія, характарыстыка і да т. п.).

3. Тэксты *нерэгламентаваных інфармацыйных мадэляў*, змест якіх не падлягае ніякай жорсткай зададзенасці з боку жанру і камунікацыйнай сферы, хаця і існуюць узоры, на якія яны могуць арыентавацца (прыватная перапіска, большасць жанраў мастацкай літаратуры і да т. п.) [*Кожевникова*, 1979, *53–54*].

Апошнім часам навукоўцамі ўказваецца, што «тэкст неабходна разглядаць як пэўную камунікацыйную адзінку, дзе кантэкстам выступае не толькі дадзенае атачэнне слоў, словазлучэнняў ці выказванняў, а шырокі камунікацыйны кантэкст, які не мае практычна ніякіх фармальных і матэрыяльных абмежаванняў, калі мець на ўвазе, што гэты кантэкст змяшчае ў сабе нявызначанага аб'ёму жыццёвы, а значыць, і вербальны, досвед камунікантаў» [*Колшанский*, 1984, *114*]. У дачыненні да такога разумення тэксту сталі выкарыстоўваць тэрмін *дыску́рс*. Дыскурс (фр. *discours* 'маўленне') – шматзначны тэрмін, які рознымі даследчыкамі ўжываўся ў дачыненні да розных паняццяў: 1) звязнага тэксту; 2) вусна-размоўнай формы тэксту; 3) дыялогу; 4) групы выказванняў, звязаных паміж сабой сэнсам; 5) маўленчага пісьмовага ці вуснага твора і інш.

Першы досвед у стварэнні тэорыі дыскурсу ў рускай лінгвістыцы належыць У. А. Звягінцаву, які ўвёў гэты тэрмін для ўзроўню

вышэйшага, чым сказ. Дыскурс разумеўся як кавалак маўлення, які складаецца з некалькіх выказванняў, аб'яднаных сэнсавай сувяззю [*Звегинцев*, 1976, *170*]. На сучасны момант гэты тэрмін ахоплівае іншае паняцце. «Калі ў 60–70-я гг. дыскурс разумеўся як звязная паслядоўнасць сказаў ці маўленчых актаў, то з пазіцыі сучасных падыходаў – гэта складаная камунікацыйная з'ява, якая ўключае, акрамя самога тэксту, яшчэ і экстралінгвістычныя фактары (веды пра свет, думкі, установкі, мэты адрасантаў), неабходныя для разумення тэксту» [*Дейк*, 1989, *8*].

Значыць, дыскурс разумеецца значна шырэй, чым тэкст, бо ўлічвае і ўсе пазамоўныя факты, якія так ці інакш уплываюць на стварэнне, увасабленне і бытаванне таго ці іншага тэксту. ***Дыскурс*** – «гэта адзінства і ўзаемадзеянне тэксту і пазамоўных умоў і сродкаў яго рэалізацыі» [*Всеволодова*, 2000, *337*]. Акрамя таго, у стылістыцы пад дыскурсам разумеецца сукупнасць усіх тэкстаў, што існуюць і ўтвараюцца для абслугоўвання пэўных галін чалавечай дзейнасці, напр.: *медыцынскі, палітычны, тэхнічны дыскурс.*

## Напрамкі даследавання тэксту

Усе кірункі ў вывучэнні тэксту грунтуюцца на тым, што тэкст – гэта пэўная цэласная пабудова, якая мае сваю граматычную і лексічную структуру[41]; адрозненні падыходаў датычацца аб'екта даследавання.

У беларускім мовазнаўстве шырокае вывучэнне і даследаванне тэксту пачалося ў 70–80-я гг. мінулага стагоддзя выключна ў практычных мэтах – у дапамогу настаўніку. Па сутнасці, гэты самы падыход захоўваецца па сённяшні дзень і зводзіцца, як правіла, да лінгвістычнага аналізу мастацкіх тэкстаў са школьнай праграмы ці рэкамендаваных да прачытання, а таксама метадычных распрацовак па іх інтэрпрэтацыі. Сведчаннем таму грунтоўныя працы А. К. Юрэвіча, Ф. М. Янкоўскага, І. Я. Лепешава, Г. М. Малажай, Н. В. Гаўрош і інш. [*Юрэвіч*, 1975; *Лепешаў*, 1975; 1981; 2000; *Малажай*, 1982; 1992; 1993; 1998; *Гаўрош*, 1975; 2002; *Цікоцкі*, 2002].

Як зазначаецца самімі аўтарамі такіх дапаможнікаў, «мэта лінгвістычнага аналізу – выявіць тыя моўныя сродкі, пры дапа-

[41] Упершыню лексічную структуру тэкстаў і яе параметры ў адрозненне ад граматычнай (сінтаксічнай і марфалагічнай) структуры вызначыў А. Я. Супрун [*Супрун*, 2001].

мозе якіх выражаецца ідэйны і звязаны з ім эмацыянальны змест мастацкага твора» [*Малажай*, 1992, *10*]. Таму пад увагу даследчыкаў трапляюць усе ўзроўні мовы: фанетычны, лексіка-семантычны, граматычны, што дазваляе асэнсаваць факты мовы з пункту гледжання узуса, літаратурнай нормы. Між тым такі падыход прадугледжвае аналіз аказіянальнага, спецыфічнага, што ўласціва пэўнаму твору ці манеры аўтара. «Лінгвістычны аналіз мастацкага тэксту – гэта вытлумачэнне разнастайных моўных фактаў, каменціраванне «моўных цяжкасцей», часцей за ўсё абумоўленых спецыфікай мовы мастацкай літаратуры, эстэтычнай функцыяй слова» [*Лепешаў*, 2000, *4*].

Відавочна, што ў такім выпадку лінгвістычны аналіз перамяжоўваецца з літаратуразнаўчым, чаго і немагчыма пазбегнуць пры пастаўленых мэтах. Адрозненне ад апошняга ў тым, што асноўная ўвага надаецца «дэшыфроўцы» «моўных цяжкасцей» мастацкага тэксту, пад якімі разумеюцца «словы з сэнсавым прырашчэннем, разгорнутыя метафары, розныя выпадкі эфектыўнага выкарыстання амонімаў, амаформаў, амафонаў, амографаў, абыграных мнагазначных слоў, фразеалагізмаў, прыказак, матываванае ўжыванне дыялектызмаў, паланізмаў, русізмаў, аўтарскіх неалагізмаў і г. д.» [*Лепешаў*, 2000, *6*].

У русістыцы выразна вылучаюцца яшчэ тры падыходы да даследавання тэксту ў вучэбна-метадычных мэтах.

1. *Структурны (уласна сінтаксічны) падыход* арыентаваны на вылучэнне і вывучэнне спецыфічнай «надсказавай адзінкі» – звышфразавага адзінства (ЗФА), ці складанага сінтаксічнага цэлага (ССЦ)[42]. Гэты падыход часта звязваюць з метафарай «знізу ўверх», бо ССЦ кваліфікуецца як адзінка, «надбудаваная» над сказам.

2. *Семантычны (уласна тэкставы) падыход* арыентаваны на вывучэнне тэксту ў яго пашыраным значэнні – як завершанага, цэласнага маўленчамысліцельнага твора, незалежна ад яго памераў. Паводле І. Р. Гальперына, тэкст – «гэта твор маўленчай дзейнасці, які валодае завершанасцю, аб'ектываваны ў выглядзе пісьмовага дакумента, літаратурна апрацаваны ў адпаведнасці з тыпам гэтага дакумента; твор, які складаецца з назвы (загалоўка) і шэрага асобых адзінак (звышфразавых адзінстваў), аб'яднаных роз-

[42] У савецкім мовазнаўстве першым вызначыў статус такой адзінкі М. С. Паспелаў (у 1948 г.). Ён жа прапанаваў і паняцце ССЦ, што вызначалася ім як структурна-сэнсавае адзінства, што ўключае два ці некалькі самастойных сказаў, якія характарызуюцца пры гэтым перарывістасцю будовы і разнароднасцю саставу, чым і адрозніваюцца ад складанага сказа.

нымі тыпамі лексічнай, граматычнай, лагічнай і стылістычнай сувязі, што мае пэўную мэтанакіраванасць і прагматычную ўстаноўку» [*Гальперин*, 1981, *18*]. Такі падыход арыентуецца на вывучэнне асобных характарыстык цэласнага тэксту: кагезію, інтэграцыю, праспекцыю і рэтраспекцыю і інш., якія дапамагаюць выявіць асаблівасці функцыянавання сказа ў кантэксце, таму ён звязаны з метафарай «зверху ўніз».

3. *Стылістычны (функцыянальны) падыход* арыентаваны на разгляд функцыянальна-сэнсавых тыпаў маўлення: апісання, апавядання, разважання. Функцыянальна-сэнсавы тып маўлення трактуецца ў гэтым выпадку як фрагмент тэксту, аб'яднаны адзінай задумай і звязаны з вырашэннем адной з трох задач: ці 1) статычна (у адных прасторавых і часавых межах) апісаць фрагмент рэчаіснасці, ці 2) дынамічна апісаць фрагмент рэчаіснасці на працягу пэўнага часу з магчымым перамяшчэннем у прасторы, ці 3) апісаць прычынна-выніковыя сувязі фактаў навакольнага свету [*Ильенко*, 1989, *69–80*].

Разам з тым у сучаснай лінгвістыцы паралельна з вучэбна-метадычным кірункам у аналізе тэксту існуе кардынальна іншы – секміятычны: ён звязаны з ідэяй тэксту «як арганізаванай семантычнай прасторы» (У. М. Тапароў). У аснове гэтай канцэпцыі меркаванне, што тэкст не толькі лінейна-аднамерны, ён шматмерны. Аказваецца, што за «ўнутранай формай слова» стаіць як бы ў згорнутым выглядзе семантычная прастора тэксту, дзе тэкст можа быць роўны міфу. Узнікае ўдалы для даследавання парадокс: прыцягненне аднаго тэксту для аналізу іншага тэксту дае магчымасць выйсці на больш шырокія, ужо пазатэкставыя абагульненні [*Николаева*, 1987, *34–36*].

У беларускай лінгвістыцы такі падыход да аналізу тэкстаў у пэўнай ступені зрэалізаваў у сваіх працах праф. А. Я. Супрун, які першым звярнуўся да такога кшталту распрацовак і стварыў сваю ўласную методыку даследавання структуры тэксту, пры якой семіётыка сталася знітаванай з паўзроўневым аналізам [*Супрун*, 2001].

## ЛІТАРАТУРА

*Бенвенист, 1974*: Бенвенист Э. Уровни лингвистического анализа // Бенвенист Э. Общая лингвистика. М.: Прогресс, 1974. С. 129–140.

*Всеволодова, 2000*: Всеволодова М. В. Теория функционально-коммуникативного синтаксиса. Фрагмент прикладной (педагогической) модели языка: Учеб. М.: Изд-во МГУ, 2000. 502 с.

*Гальперин*, *1981*: Гальперин И. Р. Текст как объект лингвистического анализа. М.: Наука, 1981. 139 с.

*Гаўрош*, *2002*: Гаўрош Н. В. Перыяд – асобая сінтаксічная канструкцыя (да праблемы вывучэння складаных формаў звязнай мовы ў школе) // Роднае слова. Мн., 2002. № 6. С. 52–57.

*Дейк*, *1989*: Дейк Т. А. ван. Язык. Познание. Коммуникация: Сб. ст. М.: Прогресс, 1989. 310 с.

*Звегинцев*, *1976*: Звегинцев В. А. Предложение и его отношение к языку и речи. М.: Изд-во МГУ, 1976. 307 с.

*Ильенко*, *1989*: Ильенко С. Г. Синтаксические единицы в тексте. Л.: ЛГПИ, 1989. 81 с.

*Кожевникова*, *1979*: Кожевникова К. Об аспектах связности текста как целом // Синтаксис текста. М.: Наука, 1979. С. 49–67.

*Колшанский*, *1984*: Колшанский Г. В. Коммуникативная функция и структура языка. М.: Наука, 1984. 174 с.

*Лепешаў*, *1975*: Лепешаў І. Я. Лінгвістычны аналіз і правільнае ўразуменне тэксту // Лінгвістычны аналіз тэксту: Матэрыялы семінара. Мн.: МДПІ, 1975. С. 23–28.

*Лепешаў*, *1981*: Лепешаў І. Я. Лінгвістычны аналіз літаратурнага твора. Мн.: Нар. асвета, 1981. 159 с.

*Лепешаў*, *2000*: Лепешаў І. Я. Лінгвістычны аналіз літаратурнага твора: У 2 ч. Гродна: ГрДУ, 2000. Ч. 2. 122 с.

*Малажай*, *1982*: Малажай Г. М. Лінгвістычны аналіз тэксту: Заданні. Тэксты. Парады. Мн.: Вышэйш. шк., 1982. 270 с.

*Малажай*, *1992*: Малажай Г. М. Лінгвістычны аналіз тэксту. Мн.: Вышэйш. шк., 1992. 365 с.

*Малажай*, *1993*: Кананенка Т. М., Малажай Г. М., Пашкевіч М. І. Праца з тэкстам на ўроках беларускай мовы: Вучэб.-метад. дапаможнік / Пад рэд. Г. М. Малажай. Брэст: «Пірс», 1993. 104 с.

*Николаева*, *1987*: Николаева Т. М. Единицы языка и теория текста // Исследования по структуре текста. Л.: Наука, 1987. С. 28–57.

*Солганик*, *1991*: Солганик Г. Я. Синтаксическая стилистика (Сложное синтаксическое целое). М.: Высш. шк., 1991. 182 с.

*Солганик*, *1997*: Солганик Г. Я. Стилистика текста. М.: Наука, 1997. 256 с.

*Супрун*, *1975*: Супрун А. Я. Верш Я. Коласа «Ручэй» // Лінгвістычны аналіз тэксту: Матэрыялы семінара. Мн.: МДПІ, 1975. С. 68–70.

*Супрун*, *2001*: Супрун А. Я. Исследования по лингвистике текста: Сб. ст. Мн.: БГУ, 2001. 308 с.

*Цікоцкі*, *2002*: Цікоцкі М. Я. Стылістыка тэксту: Вучэб. дапам. для студэнтаў выш. навуч. устаноў філал. профілю / М. Я. Цікоцкі. Мн.: Бел. навука, 2002. 223 с.

*Шанский*, *1990*: Шанский Н. М. Лингвистический анализ художественного текста. Л.: Просвещение, 1990. 415 с.

*Юрэвіч*, *1975*: Юрэвіч А. Л. Да праблемы лінгвістычнага аналізу тэксту // Лінгвістычны аналіз тэксту: Матэрыялы семінара. Мн.: МДПІ, 1975. С. 28–30.

# КАМУНІКАЦЫЙНАЯ ЦЭЛАСНАСЦЬ ТЭКСТУ

## Паняцце тэматычных паслядоўнасцей, іх тыпы

Камунікацыйная цэласнасць тэксту ўвасабляецца ў камунікацыйнай пераемнасці элементаў, якія яго ўтвараюць. Сутнасць яе ў тым, што «кожны наступны сказ у ЗФА абапіраецца ў камунікацыйным плане на папярэдні, рухаючы выказванне ад вядомага, дадзенага да новага, у выніку чаго і ўтвараецца *тэма-рэматычны ланцужок*, які мае канечны характар і тым самым вызначае межы ЗФА» [*Москальская*, 1981, *21*].

Структура тэма-рэматычных ланцужкоў, паводле чэшскага лінгвіста Францішка Данеша, можа быць зведзена да некалькіх асноўных мадэляў[43].

1. ***Простая лінейная тэматычная прагрэсія.*** Гэты тып з'яўляецца найбольш пашыраным і ў той жа час найбольш простай мадэллю. Такая паслядоўнасць грунтуецца на тым, што кожная рэма (Р) становіцца тэмай (Т) наступнага выказвання. Паводле тэрміналогіі Р. Я. Салганіка, адбываецца «сувязь праз прэдыкат» [*Солганик*, 1991, *29*]. Схематычна гэта выглядае так:

$$
\begin{array}{lll}
T_1 \to P_1 & & \\
\quad\ \downarrow & & \\
 & T_2\ (=P_1) \to P_2 & \\
 & \qquad\qquad\ \ \downarrow & \\
 & & T_3\ (=P_2) \to P_3
\end{array}
$$

*У Італіі, у Падуанскім універсітэце, / ёсць славутая Зала сарака. У ёй / размешчаны 40 партрэтаў слаўных з найслаўнейшых людзей зямлі. Сярод іх другі / – Францыск Скарына* («Роднае слова»).

2. ***Тэма-рэматычны ланцужок са скразной тэмай***, ці тэматычная паслядоўнасць з канстантнай тэмай. Паводле тэрміналогіі Р. Я. Салганіка, адбываецца «сувязь праз суб'ект» [*Солганик*, 1991, *29*]. Схематычна гэта выглядае так:

$$
\begin{array}{ll}
T_1 \to P_1 & \\
\quad\ \downarrow & \\
 & T_2\ (=P_1) \to P_2 \\
 & \downarrow \\
 & T_2\ (=P_1) \to P_3 \\
 & \downarrow \\
 & T_2\ (=P_1) \to P_4
\end{array}
$$

[43]Тэрміны і схемы Ф. Данеша даюцца паводле [*Москальская*, 1981, *21–25*].

*Ці задумваліся, які ён, беларус? Што гэта за народ? ...*

*Уласціва нашым людзям / знаходлівасць. Беларус – / вялікі аматар пажартаваць, ён не можа абысціся без гумару. Беларусы / адрозніваюцца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе. Яны / звычайна мяккія, даверлівыя, пазбаўленыя помслівасці.*

(Паводле У. Караткевіча)

У гэтай тэматычнай паслядоўнасці да тэмы, якая прапануецца рэмай уводнага выказвання, далучаюцца новыя рэмы, а сама тэма застаецца нязменнай. На такім тыпе грунтуецца апісанне асобных з'яў, прадметаў, асобы, месца і г. д.

3. ***Тэматычная паслядоўнасць з вытворнымі тэмамі***, што вынікаюць з агульнай. Кампаненты такой паслядоўнасці звязваюцца паміж сабой паралельнай сувяззю. Схематычна яна можа выглядаць так:




*Тым часам канчалася лета. Адгрымелі / ліпеньскія і жнівеньскія навальніцы, гучна адспяваўшы песні лету. Дзень за днём / пусцелі палі. Людзі / ўжо збіралі познія пасевы ярыны. Паспявала / грэчка. Прасторы зямлі / нібы звужаліся ў межах і таілі ў сабе нейкую неакрэсленую і невыказную сумоту.*

(Я. Колас)

Прыведзеныя тры тыпы тэматычных паслядоўнасцей у канкрэтных тэкстах камбінуюцца ў залежнасці ад стылю і зместу тэксту, інтэнцый аўтара і да т. п. Так, часта выкарыстоўваецца камбінацыя першага і другога тыпаў, што схематычна выглядае так:




Адносна гэтага тыпу даследчыкі гавораць пра «развіццё расшчэпленай рэмы». Асноўная яго прымета ў тым, што рэма падвоеная ($Р = Р'_1 + Р''_1$). З яе потым і развіваюцца дзве прыватныя

паслядоўнасці: першая пачынаецца тэматызацыяй першай часткі расшчэпленай рэмы ($T'_2 = P'_1$) і можа развівацца ў выпадку неабходнасці далей. Пасля заканчэння гэтай паслядоўнасці пачынае развівацца другая частка расшчэпленай рэмы ($T''_2 = P''_2$), напр.:

*Сучасная беларуская паэзія прадстаўлена паэтамі ўсіх пакаленняў.*

*Адным з прадстаўнікоў пакалення творчай інтэлігенцыі, якая ўвайшла ў мастацкае жыццё рэспублікі ў пасляваенны час, з'яўляецца Рыгор Барадулін – аўтар кніг «Нагбом», «Неруш», «Вяртанне ў першы снег», «Міласэрнасць плахі» і інш. Яго паэзія шматколерна, пластычна і эмацыянальна ўзнаўляе навакольны свет, адлюстроўвае прыгажосць роднай зямлі, гераізм людзей у Айчыннай вайне, пафас стваральнай працы. Нямала радкоў прысвяціў паэт матчынай хаце, роднай вёсцы <...>.*

*Паэтам публіцыстычнага складу з'яўляецца Генадзь Бураўкін. Яго творы характарызуюцца шырынёй погляду на свет з філасофска-аналітычным асэнсаваннем рэчаіснасці. Паэт піша аб каханні, па-філасофску разважае над тэмамі агульначалавечай значнасці <...>.*

(В. Старычонак)

Варта зазначыць, што ўсе прыведзеныя тыпы паслядоўнасцей – гэта ідэальныя мадэлі. А рэалізацыя іх у канкрэтным тэксце можа быць з пэўнымі адхіленнямі: яны, як правіла, камбінуюцца паміж сабой, а не выкарыстоўваюцца ў такім «чыстым» выглядзе.

## Рэматычныя дамінанты мікратэкстаў

Любое выказванне, як вядома, бінарнае: мае тэму – зыходны пункт паведамлення і рэму – тую інфармацыю, дзеля якой увогуле і адбываецца маўленне. Рэмы ўсіх выказванняў пэўнага мікратэксту можна ўмоўна аб'яднаць пад паняццем рэматычная дамінанта, якая характарызуе тэкставы фрагмент як змястоўнае адзінства. У розных мікратэкстах можа дамінаваць рэма пэўнага семантычнага тыпу, што цалкам залежыць ад зместу, ад выказанай інфармацыі. На сённяшні дзень вылучаюць некалькі асноўных тыпаў рэматычных дамінантаў [*Золотова*, 1979] (табл. 16).

*Табліца 16*

**СУАДНЕСЕНАСЦЬ ТЭКСТУ З ЯГО РЭМАТЫЧНАЙ ДАМІНАНТАЙ**

| Тыпавое значэнне тэкставага фрагмента | Рэматычная дамінанта |
|---|---|
| Апісанне месца | Прадметная |
| Характарыстыка персанажа, прадмета | Якасная |
| Дынаміка дзеяння | Акцыянальная |
| Стан (прыроды, асяроддзя, асобы) | Статальная |
| Змяненне стану, пераход ад стану да дзеяння | Статальна-дынамічная |
| Суб'ектыўна-ацэначнае ўспрыняцце рэчаіснасці | Імпрэсіўная |

Разам з тым «нельга думаць, што ўсялякі тэкст уяўляе сабой тую ці іншую камбінацыю згаданых фрагментаў. Справа больш складаная і таму, што тут апісана толькі частка тыповых фрагментаў, і таму, што ў рэальных тэкстах тыповыя фрагменты ўступаюць у разнастайныя ўзаемадзеянні адзін з адным, звычайныя і незвычайныя» [*Золотова*, 1979, *129*].

***Прадметная дамінанта*** характэрная пры апісанні месца; з часцін мовы дамінуе назоўнік, накшталт:

*Хата была адчынена. Усё ў ёй выглядала па-ранейшаму, як год і два назад: у пярэднім пакойчыку пры акне стаяў няхітры, з таўстых дошак, стол, стаяла грубка, двое дзвярэй абапал грубкі вялі ў маленькія спальныя пакоі; ля парога – два вядры, адно з вадою, другое з бульбянымі шалупайкамі, кошык з бульбаю, пасуднік, і на ім, засланым старой, на дзірках, цыратаю, – чыстыя нажы, лыжкі, відэльцы ў слоіку; чыстыя паўміскі, сподкі, кубкі – на драўлянай сушылцы, змайстраванай Мінам, а на стале, што пры акне, за якім абедалі і вячэралі ўсе, хто тут бываў, – акраец чэрствага хлеба, пачак буйной шэрай солі, галоўка цыбулі* <...>

(В. Карамазаў. Пушча)

***Якасная дамінанта*** адрозніваецца ад прадметнай тым, што яна характарызуе асобу ці прадмет. Асноўная камунікацыйная нагрузка тут прыпадае на словы, якія называюць якасці, прыметы знешнасці, характару пэўнай асобы ці вонкавага выгляду прадмета. З граматычных сродкаў дамінуюць прыметнікі, назоўнікі з якасным значэннем, іменныя спалучэнні, якасныя прыслоўі; не выкарыстоўваюцца дзеясловы дзеяння, а толькі дзея-

словы-звязкі (*быць, бывала, мець, валодаць*) і інш., што выражаюць аднесенасць прыметы да прадмета, а таксама ўжываюцца дзеясловы ўспрымання (*здавалася, адчувалася* і пад.), напр.:

*Вячка стаяў пасярэдзіне апачывальні, глыбока задумаўшыся. Ён быў высокі, дзесяць вяршкоў росту, гнуткі ў поясе, светла-русы, з кароткай барадой, якая злёгку кучаравілася. Касці быў не шырокай, але моцнай, пругкай, створанай для цяжкага мяча і паходнага сядла. Быў апрануты ў прасторную зялёную кашулю з адамашку. Залатая грыўня, знак княжацкага роду, блішчала на смуглай шыі.*

(Л. Дайнека. Меч князя Вячкі)

***Акцыянальная дамінанта*** (ад лац. *actio* 'дзеянне') выяўляе паслядоўнае разгортванне тэксту пры перадачы дынамікі дзеяння (пры адным суб'екце) ці паралельнае (пры некалькіх). З часцін мовы дамінуюць дзеясловы руху і перамяшчэння ў спалучэнні з іменнымі формамі, што абазначаюць арыенцір руху, тыпу:

*Таўстаморды трохтыднёвы шчанюк кінуўся быў яму насустрач па прамеценай ад ганка сцежцы, улез у снег, загруз па вушы і, не дабегшы да марака пару метраў, раптам павярнуў назад, у сенечкі, паўз гаспадыню, якая з голым бярозавым венікам гнала дарожку да калодзежа. З сенечак праз адчыненыя дзверы шчанюк ускочыў у першую хату, потым у другую, з разгону наляцеў на кошку – тая сядзела спінай да дзвярэй і не чакала гэтага, запознена адскочыла ўбок, паспеўшы, аднак, даць лапай шчанюку па абвіслым вуху. Той у сваю чаргу не чакаў такога, заматаў ад болю галавой, але ўспомніў, што на лапы паналіпала снегу, і затрос імі, пырскаючы снегам на падлогу.*

(А. Кудравец. Песня)

***Статальная дамінанта*** (ад гр. *statos* 'нерухомы') выразна процістаўляецца акцыянальнай, яна выкарыстоўваецца пры адлюстраванні стану чалавека, прыроды, рэальнага стану спраў. З часцін мовы дамінуюць прыслоўі і прэдыкатывы, а таксама словы, што перадаюць значэнне прыметы, стану, накшталт:

*Канчалася лета, дагараў адзін з апошніх жнівеньскіх дзён. Вялікае барвовае сонца нізка павісла над асмужанымі дубровамі. На скошаных лугах слаўся сіняваты дымок ад далёкага вогнішча. Было ціха і па-асенняму празрыста ў чыстым высокім*

*небе. Недзе за гаямі плыла працяжная песня, якая трывожыла сэрца і будзіла сум па далёкім маленстве. Быў той час, калі хочацца маўчаць, нічога не думаць і, нікуды не спяшаючыся, глядзець удалеч. І ўсе пасажыры, якія былі на параходзе, адразу прыціхлі, задумаліся, зачараваныя цішынёй і хараством, мяккасцю фарбаў жнівеньскага надвячорка і ледзь чутнаю далёкаю песняю. Кожнаму ўспаміналася сваё.*

(С. Грахоўскі)

***Статальна-дынамічная дамінанта*** выяўляецца пры характарыстыцы паступовага змянення стану. Граматычнымі сродкамі выражэння выступаюць дзеясловы і спалучэнні слоў, што перадаюць змяненне ступені якасці, фазісных пераходаў, страту і набыццё іншых якасцей, напр.:

*Заціхла к позняму вечару рэчка Лабжынка, яе ўжо нават і не відно, калі глядзець збоку. На лузе пацямнела і нібы прытаілася ў чаканні жыватворнай расы густая трава. І раса, пэўна, будзе, вялікая будзе раса, бо дзень сёння быў цёплы, пагодлівы. Ужо цяпер над рэчкай пачынае ўзнімацца шыза-белы туман і вызначаць на лузе ўсе свавольныя звілінкі, якія робіць тут рака. Чароўная шыза-белая лента ўецца па лузе, па вербалозніку і рассцілаецца далёка-далёка, аж да самага небасхілу. А самы канец ленты раптам пачынае чырванець. Чырвань гэтая хутка пашыраецца і што далей, то ўсё больш радзее, пераходзіць у барвовасць, а потым у светлую жаўцізну. Гэта ўзыходзіць месяц.*

(А. Кулакоўскі)

***Імпрэсіўная дамінанта*** (ад лац. *impressio* ‘*уражанне*’) характарызуе тыя тэкставыя фрагменты, у якіх акаляючае асяроддзе, знешні свет перадаюцца праз суб’ектыўна-эмацыянальнае ўспрыняцце аўтарам фактаў рэчаіснасці, праз тое ўражанне, што яго ўзрушыла. Сродкамі выражэння з’яўляюцца прэдыкатывы, якасна-ацэначныя прыметнікі, прыслоўі і адцягненыя назоўнікі адпаведнай семантыкі тыпу:

*Я гляджу на раку, гляджу на яе пазарастаныя вербалозавымі кустамі і алешнікам нізкія, сям-там затопленыя вадою берагі і думаю: якое вялікае і доўгае ў ракі жыццё. Тысячы, мільёны год цячэ і цячэ яна, ад вытоку да вусця, праз лясы, палі, балоты і будзе цячы яшчэ тысячы, мільёны год. Чалавечае жыццё ў па-*

*раўнанні з жыццём ракі – імгненне. Гэтую ж самую Прыпяць бачылі, як бачым цяпер яе мы, нашы далёкія-далёкія продкі, бачылі дзяды нашы, бацькі, а пасля нас будуць бачыць нашыя дзеці, унукі, унукаў унукі і тых унукаў таксама ўнукі... І гэта бясконца – адно пакаленне людзей будзе паміраць, на змену яму прыходзіць новае пакаленне, а рака будзе плыць і плыць, несці і несці свае воды на мора.*

(Б. Сачанка)

Мэтазгодным падаецца гаварыць таксама пра ***сінкрэтычную рэматычную дамінанту*** (ад гр. *sinkretismos* 'злучэнне'), паколькі любы тэкст, як правіла, шматінфармацыйны і нясе паведамленне, якое адначасова па-рознаму характарызуе сітуацыю; напр., сінтэз акцыянальнай і якаснай дамінанты можна кваліфікаваць як акцыянальна-якасную:

*Ад горада да горада, ад сяла да сяла ўюцца, бягуць дарогі. Бягуць праз палі і лясы, лугі, балоты. То цяжка, стомлена ўзлазяць на пагоркі, як бы прагнуць паглядзець, што ж там далей, то весела спадаюць уніз, у лагчыны, нібы хочуць ад некага схавацца. Бітыя, абсаджаныя векавымі бярозамі і ясакарамі, і ледзь прыкметныя ў траве сцяжынкі; дарогі крывыя, з грэблямі на кожным кіламетры і вузенькімі драўлянымі масткамі; дарогі роўныя, як струна, на ўвесь абсяг людскога вока; дарогі кружныя і дарогі прамыя. Хто пратаптаў вас, дарогі, і колькі людзей вас перамерала ўжо сваімі нагамі ўздоўж і ўпоперак, зімою і летам, гразкай вясною і ў дажджлівую восень?*

(Б. Сачанка)

## Функцыянальна-сэнсавыя тыпы тэксту

Функцыянальна-сэнсавымі тыпамі маналагічнага маўлення з'яўляюцца апісанне, апавяданне і разважанне.

***Апісанне.*** Пры гэтым тыпе прадмет маўлення раскрываецца: удакладняецца яго форма, склад, структура, якасці, уласцівасці, прызначэнне і да т. п. шляхам пералічэння прымет, характэрных яму часова ці пастаянна.

Апісанне можа быць разгорнутае (падрабязнае) і сціслае (кароткае), што абумоўлена як зместам паведамлення, так і інтэнцыямі аўтара.

Асаблівасці тэксту апісання:

● семантычныя: статычнасць; адначасовасць, адлюстраванне вонкавага выгляду прадмета / асобы ці ўнутраных якасцей; перадача часовых ці пастаянных уласцівасцей;

● граматычныя: выкарыстанне абвеснага ладу дзеясловаў і суаднесенасць іх часава-трывальных формаў; наяўнасць намінатыўных сказаў, безасабовых сказаў са значэннем стану, эліптычных і няпоўных канструкцый, складаназлучаных і бяззлучнікавых сказаў са значэннем пералічэння.

Разнавіднасці апісання:

– пейзаж, ці агульны выгляд якой-небудзь мясцовасці;
– партрэт чалавека або апісанне знешняга выгляду нейкага прадмета, жывёліны, расліны, пабудовы, прадмета быту і інш.;
– інтэр'ер ці апісанне ўнутранай часткі якога-небудзь памяшкання;
– характарыстыка як пералік істотных асаблівасцей, прымет каго-небудзь, напр., назвы рысаў характару, схільнасцей, роду заняткаў ці ўласцівасцей якога-небудзь прадмета [*Нечаева*, 1974, *60*].

*Надзея Яноўская стаяла і слухала нас. Але гэта была не яна, гэта была мара, лясны дух, казачная здань. Яна была ў сярэднявяковай жаночай вопратцы: сукня, на якую пайшло пяцьдзесят локцяў залацістага аршанскага атласу, паверх яе другая, белая з блакітнымі, адліваючымі срэбрам разводамі і шматлікімі разрэзамі на рукавах і падоле. Стан, сціснуты ў снуроўку, быў перавіты тонкім залацістым снурам, які падаў амаль да зямлі двума кутасамі. А на плячах быў тонкі рубок з белага табіну. Валасы былі ўзяты ў сетку і ўпрыгожаны шлягавым вянком, старажытным жаночым уборам, які трохі нагадваў караблік, зроблены са срэбных ніцей. З абодвух рагоў гэтага карабліка звісаў да зямлі тонкі белы вэлюм.*

(У. Караткевіч. Дзікае паляванне караля Стаха)

***Апавяданне*** – такі тып маўлення, што перадае паведамленне пра дзеянні і станы, якія разгортваюцца.

Апавяданне можа быць разгорнутае і неразгорнутае (быць асобнай рэплікай у дыялогу ці выконваць ролю ўступу да апісання або разважання) [*Нечаева*, 1974, *101*].

Асаблівасці апавядання:

● семантычныя: дынамізм; паслядоўнасць дзеяння / руху, аднесенасць яго да аднаго суб'екта;

● граматычныя: змена мадальных планаў дзеясловаў, чаргаванне часава-трывальных формаў дзеяслова, акалічнасныя словы, што ўказваюць на паступальны рух у часе (*спачатку, потым, зрэдку, раптам* і пад.), выкарыстанне ўстаўных канструкцый, выклічнікаў, усечаных дзеяслоўных формаў, зваротkaў і г. д.

*Яго быццам падштурхнулі ў плечы, подбегам кінуўся да воза, сунуў пад траву сякеру, ліхаманкава ўзяўся запрагаць каня, потым ускочыў на воз, шлеганув каня па азадку лейцамі, і той ад нечаканасці з месца рвануў рыссю, а Ігнат усё круціў лейцамі над галавою, чуў, як ляскацяць колы і амаль не дакранаюцца да зямлі.*

*Калі выехаў з лесу, сэрца абарвалася: гарэла яго вёска, пасярэдзіне, там, дзе яго хата. Дым над пажарам паменшаў, узялося ў сілу полымя, не давала людзям падступіцца і тушыць, ды і тушыць ужо было нельга. Ігнат толькі паўтараў сабе: «Барані Божа, барані Божа!» – лупіў і лупіў лейцамі ўзмакрэлага каня, колы ляцелі над зямлёю, выбіваючы з камення іскры. На поўным кар'еры з-за вербаў уляцеў ён у вуліцу, амаль на самы натоўп вяскоўцаў. Конь сам спыніўся перад людзьмі, закіраваў да плота.*

(А. Жук. Чыгун)

***Разважанне*** – такі тып маўлення, які характарызуецца спецыфічнай моўнай структурай, што ўключае *тэзіс*, яго *аргументацыю* і *выснову*.

У канкрэтнай маўленчай сітуацыі гэты функцыянальны тып можа зазнаваць розныя мадыфікацыі, што зводзяцца да неабавязковага выкарыстання ўсіх трох адзначаных яго складнікаў: яны могуць зліваццa ў адно цэлае (напр., тэзіс і аргументацыя) ці ўвогуле адсутнічаць (напр., выснова).

Разважанне ў розных выпадках вядзецца з рознымі мэтамі: даць ацэнку прадмету маўлення, абгрунтаваць дзеянне ці стан, выявіць прычынную сувязь абумоўленых з'яў, прадпісаць нейкае дзеянне як неабходнае, абгрунтавана штосьці сцвярджаць ці адмаўляць і г. д. Як канстатуюць мовазнаўцы, у мастацкіх тэкстах такі тып маўлення найбольш разнастайны і свабодны ў сваёй арганізацыі, а таму «ў чыстым выглядзе сустракаецца значна радзей, чым у іншых стылях» [*Лосева*, 1980, *84*].

*<...> калі ўзяць гэта як паэтычны вобраз, дык у кожнага з людзей жыццё – футбол на замініраваным полі. Не ведаеш, дзе і калі грымне выбух. І трэба гуляць. Гуляць чэсна, смела, гуляць да канца.*

*Футбольная ігра нечым падобная, дарэчы, на літаратурны твор. У ёй ёсць свой сюжэт: завязка, кульмінацыя, развязка. Ёсць свае героі, як станоўчыя, так і адмоўныя. Ёсць свае крытыкі.*

*Гол – квінтэсенцыя ўсяго. І вось тут паміж футбольнай гульнёй і літаратурай адзіная і, бадай, самая істотная розніца. На футбольным полі гол – гэта долі секунды, якія мячык ляціць у сетку, вокамгненны поспех. Літаратура ж – забіванне гола, якое расцягнулася на ўсё пісьменніцкае жыццё. І часам нават жыцця не хапае...*

(Л. Дайнека. Футбол на замініраваным полі)

Мэтазгодна згадаць і пра ***кантамінавасць*** (ад лац. *contaminatio* 'сутыкненне, змешванне') функцыянальна-сэнсавых тыпаў маўлення, якая праяўляецца ў напластаванні сэнсавых адценняў, уласцівых розным тыпам тэкстаў. Так, з аднаго боку, апісанне і апавяданне могуць ускладняцца прычынна-выніковымі адценнямі, але заставацца пры гэтым апісаннем і апавяданнем. З другога боку, могуць перакрыжоўвацца апісанне і апавяданне, што досыць тыпова пры апісаннях пораў года, з'яў прыроды, партрэтных і біяграфічных характарыстыках, увогуле, пры любой сітуацыі, што патрабуе змянення.

Між тым варта размяжоўваць кантамінаваны функцыянальна-сэнсавы тып і спалучэнне розных функцыянальна-сэнсавых тыпаў у адным мікратэксце. «Кантамінаванае маўленне не з'яўляецца тэматычным спалучэннем розных тыпаў маўлення, а ўнутраным тыпалагічным іх скрыжаваннем на аснове змянення функцыі таго ці іншага тыпу маўлення, што вядзе да ўтварэння новай (трэцяй) моўнай адзінкі, г. зн. кантамінаванага тыпу маўлення» [*Нечаева*, 1974, *202*]. Параўн. два мікратэксты.

I. *Жыў на свеце музыка. Многа хадзіў ён па зямлі ды ўсё граў на скрыпцы. І плакала ў яго руках скрыпка, і такая была ў яго гранні нуда, што аж за сэрца хапала...*

*Плача скрыпка, льюць людзі слёзы, а музыка стаіць і выводзіць яшчэ жалосней, яшчэ нудней. І балела сэрца, і падступалі к*

*вачам слёзы: так і ўдарыўся б груддзю аб зямлю ды ўсё слухаў бы музыку, усё плакаў бы па сваёй долі...*

(М. Багдановіч. Музыка)

Фармальна кантамінаванасць у апісанні выражаецца праз выкарыстанне дзеясловаў з экспрэсіўным значэннем, што перадаюць хуткую змену ў акаляючым асяроддзі, праз ужыванне слоў з акалічнасным значэннем часу для характарыстыкі дзеяння, г. зн. праз лексіка-граматычныя сродкі, уласцівыя апавяданню.

II. *Ці даводзілася вам праязджаць па вёсцы ў канцы лета, калі нітачкі прыгожага засмучэння ўжо снуюцца нявідна і незлавіма ў цёплым паветры, ужо вяшчуюць восень?*

*Ціха ўсё, бязмоўна і бязлюдна. Шэрым ціхамірным пылам пасцелена пустая вуліца. На гародзе, за абціснутым плятнём схіліў на сонца жоўтую з махрамі кружэлачку высокі сланечнік. Абсыпае чырвона-чорныя пялёстачкі добры мак, ужо запозны, і звініць даспелымі мачынкамі ў зубкавых карунках буйнейшымі і дробнымі, на тонкіх шэзых сцебялінках.*

(М. Гарэцкі. Ціхая плынь)

## ЛІТАРАТУРА

*Дымарская-Бабалян*, *1984*: Дымарская-Бабалян И. Н. Сложное синтаксическое целое как единица сверхфразового уровня. Ереван: Изд-во Ереванского ун-та, 1984. 53 с.

*Золотова*, *1981*: Золотова Г. А. Роль ремы в организации и типологии текста // Синтаксис текста. М.: Наука, 1979. С. 113–133.

*Золотова*, *1998*: Золотова Г. А. и др. Коммуникативная грамматика русского языка. М.: МГУ, 1998. 583 с.

*Левковская*, *1980*: Левковская Н. А. В чем различие между сверхфразовым единством и абзацем? // Филологические науки. 1980. № 1. С. 75–78.

*Лосева*, *1980*: Лосева Л. М. Как строится текст: Пособие для учителей / Под ред. Г. Я. Солганика. М.: Просвещ., 1980. 94 с.

*Москальская*, *1981*: Москальская О. И. Грамматика текста. М.: Высш. шк., 1981. 183 с.

*Николаева*, *1972*: Николаева Т. М. Актуальное членение – категория грамматики текста // Вопр. языкознания. 1972 . № 2. С. 48–54.

*Реферовская*, *1983*: Реферовская Е. А. Коммуникативная структура текста в лексико-грамматическом аспекте. Л.: Наука, 1989. 167 с.

*Солганик*, *1991*: Солганик Г. Я. Синтаксическая стилистика: Сложное синтаксическое целое. М.: Высш. шк., 1991. 182 с.

*Цікоцкі*, *2002*: Цікоцкі М. Я. Стылістыка тэксту: Вучэб. дапам. для студэнтаў выш. навуч. устаноў філал. профілю. Мн.: Бел. навука, 2002. 223 с.

# СТРУКТУРНАЯ ЦЭЛАСНАСЦЬ ТЭКСТУ

## Граматычная прырода звышфразавага адзінства

Паняцце *структура* ў прымяненні да тэксту прадугледжвае дзве прыметы – звязнасць і цэласнасць. Тэкст, як зазначаюць навукоўцы, глабальная структура, што ўключае ў сябе глыбінную і паверхневую структуры. «Глыбінная структура – ідэйна-тэматычны змест тэксту, <...>, гэта аўтарскія інтэнцыі, прагматычная ўстаноўка як адзін з дамінуючых фактараў. Паверхневая структура – лінгвістычная форма, у якой змяшчаецца глыбінная структура» [*Тураева*, 1986, *56–57*]. Гэтыя два планы тэксту ўзаемазвязаныя і ўзаемаабумоўленыя, бо ў сукупнасці прагматычная ўстаноўка аўтара і функцыянальная скіраванасць тэксту (ці інакш, прагматычная ўстаноўка тэксту) прадугледжваюць своеасаблівае яго чляненне.

Агульнавядома, што ў аснове размежавання функцыянальных стыляў ляжыць менавіта камунікацыйная функцыя тэксту, якую рэалізуе перш за ўсё яго падзел, ці чляненне, каб чытач / слухач мог адэкватна і цалкам успрыняць інфармацыю. Так, у навуковых тэкстах чляненне на абзацы падпарадкавана паслядоўнасці развіцця думкі і яе аргументаванасці: дзейнічае лагічны прынцып – чляненне тэксту мусіць адпавядаць чляненню думкі (каб сталася зрэалізаванай пазнавальная функцыя мовы). Вызначальным у чляненні мастацкіх тэкстаў ёсць не лагічнасць выкладу інфармацыі, а фактар эмацыянальнага ўздзеяння: аўтар рэалізуе эстэтычна-пазнавальную функцыю, і таму ёй падпарадкоўвае падзел тэксту. Зыходзячы з гэтага факта, пераважная большасць даследчыкаў у якасці мінімальнай адзінкі тэксту разглядае не абзац, а звышфразавае адзінства.

***Звышфразавае адзінства* (*ЗФА*)** – гэта такая тэкставая адзінка, якая складаецца больш чым з аднаго самастойнага сказа і валодае сэнсавай цэласнасцю ў кантэксце звязнага маўлення, выступае як частка завершанай камунікацыі.

Тэрміналагізацыя такога паняцця ў сучаснай лінгвістыцы неадназначная. У якасці сінонімаў выкарыстоўваецца шэраг тэрмінаў: *складанае сінтаксічнае цэлае* (М. С. Паспелаў), *празаічная страфа* (Р. Я. Салганік), *дыскурс* (У. А. Звягінцаў), *звышфразавае адзінства* (Л. А. Булахоўскі), *суперфраза* (А. А. Акішына),

*сэнсавы перыяд*, *выказванне* (В. У. Вінаградаў), *група сказаў* і інш., але найбольшае пашырэнне і прызнанне атрымалі толькі два – *складанае сінтаксічнае цэлае* і *звышфразавае адзінства*. (Аўтар прапанаванага дапаможніка аддае перавагу апошняму.)

Разуменне ЗФА як мінімальнай адзінкі тэксту на сённяшні дзень не з'яўляецца агульнапрынятым, паколькі ў якасці такой адзінкі прапануецца разглядаць *абзац* [*Фридман*, 1993, *6*; *Долгов*, *Папейко*, 2003, *24–25*]. Між тым навукоўцамі досыць пераканальна падаюцца факты на карысць размежавання дзвюх гэтых адзінак, зыходзячы з іх функцыянальнай скіраванасці.

Па-першае, абзац «прысутнічае» толькі ў пісьмовым тэксце, ЗФА ўласцівае як вуснаму, так і пісьмоваму маўленню. Па-другое, абзацу ўласціва прагматычнасць, бо ён заўсёды вынік суб'ектыўнага аўтарскага чляненне тэксту, а ЗФА характарызуецца лагічнасцю, бо яно вынік аб'ектыўнага чляненне і яўна аўтарам не пазначаецца. Па-трэцяе, абзац, маючы суб'ектыўную скіраванасць, можа выступаць у якасці эмацыянальна-выяўленчага сродку тэксту. Асноўнай жа прыметай ЗФА ёсць якраз яго лагічная і сэнсавая завершанасць. Варта згадаць таксама пра пэўную замацаванасць абзаца за навуковым стылем і яго «індывідуальны» характар у мастацкіх тэкстах, што не ўласціва ЗФА. Падсумоўваючы пералічаныя характарыстыкі, можна канстатаваць, што звышфразавае адзінства – структурна-семантычная адзінка тэксту, а абзац, выконваючы ролю «раздзяляльніка і інтэгратара» адначасова, ёсць яго кампазіцыйна-стылістычная адзінка.

«Вонкава відавочным з'яўляецца тое, што ў большасці выпадкаў ЗФА пачынаецца з пачаткам абзаца, але ў астатнім межы гэтых адрозных падзелаў тэксту не заўсёды супадаюць» [*Реферовская*, 1983, *83*]. Адзначаюцца тры тыпы суаднесенасці межаў абзаца з межамі звышфразавага адзінства.

1. Абзац супадае з ЗФА (найбольш пашыранае такое чляненне ў навуковых і афіцыйна-справавых тэкстах) тыпу:

*Штодзённае жыццё чалавека нельга ўявіць сабе без рэчаў. Рэчы – гэта тое, што ён есць, што апранае, што атачае яго ў пакоі, у гаспадарцы, тое, з чым ён працуе. Свет рэчаў – свет культуры, які стварыўся цягам усёй сацыяльнай гісторыі і які паступова аддаляў чалавека ад прыроды, але разам з тым аблягчаў дачыненні з ёю.*

(Т. Валодзіна. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў)

2. Два (і больш) абзацы ўваходзяць у адно ЗФА (вельмі пашырана ў тэкстах мастацкіх), напр.:

*Рэчы дарэчы, калі яны становяцца памочнікамі чалавеку, калі яны яму зручныя і спадручныя, і недарэчы, калі яны пачынаюць панаваць над чалавекам і супярэчыць яму.*

*Рэчы насяляюць чалавечы свет, яго рэчаіснасць, і жыццё чалавека цячэ ў рэчышчы, абумоўленым рэчамі, не могучы выхіліцца з-пад іхняга ўплыву і не могучы заставацца там, дзе застаюцца яны.*

*Чалавек трымаецца за рэчы, як за парэнчы, і яшчэ невядома, хто болей каго не хоча адпусціць ад сябе – ці ён іх, ці яны яго.*

(А. Разанаў. Рэчы)

3. Абзац змяшчае некалькірознатэматычных ЗФА, накшталт:

*Кватаранка пайшла. Услед за ёй рушыла Мар'я. Занясла збанок з малаком Максіму, а затым, вярнуўшыся, зрабіла яшчэ ходку – да настаўніцы. Ные спіна, паясніца, сон усё адно не возьме. Мар'я прысела на лавачцы каля хаты. // Збіраецца на навальніцу. Зямля дыхае назапашаным за дзень цяплом, душна, млосна, наваколле як бы анямела. Дрэвы нават лістом не варухнуць. На дварэ цямней звычайнага, неба наўсцяж аблажана хмарамі: па краях іх паласуюць сухія, без грымот, маланкі.*

(І. Навуменка. Іван ды Мар'я)

Такое разыходжанне паняццяў ЗФА і абзаца мае сваё тлумачэнне ў навуковай літаратуры. «<...> калі ў абзацы на першае месца выступае лагічны аспект, калі прагматычная ўстаноўка аўтара супадае з прагматычнай устаноўкай тэксту, ЗФА тоеснае абзацу. Калі ж абзац служыць сродкам эмфазы, калі заключанае ў ім паведамленне актуалізуецца з дапамогай чырвонага радка, г. зн. калі прагматычная ўстаноўка аўтара прэвалюе над прагматычнай устаноўкай тэксту, ЗФА не ўкладваецца ў межы абзаца. У такіх выпадках абзац або ўключае ў сябе некалькі звышфразавых адзінстваў, або адно ЗФА распадаецца на некалькі абзацаў» [*Левковская*, 1980, *75*]. Несупадзенне межаў ЗФА і абзаца – крыніца шматлікіх эфектаў у мастацкім тэксце.

З пункту гледжання формы, «абзац мае адну перавагу перад ЗФА – ён заўсёды выразна адмежаваны чырвонымі радкамі. Сігналы пачатку і канца ЗФА менш відавочныя, у адных выпадках

яны бясспрэчныя, а ў іншых не маюць фармальнага выражэння, а праяўляюцца толькі ў змястоўнай, семантычнай цэласнасці ЗФА» [*Реферовская*, 1983, *80*].

Сэнсавая цэласнасць і завершанасць – асноўная прымета ЗФА, што перш за ўсё выяўляецца праз адзінства тэмы ўсіх яго выказванняў-складнікаў. Пераход ад адной тэмы да іншай указвае на канец аднаго ЗФА і пачатак наступнага.

Монатэматычнасць ЗФА часта выяўляецца ў *рэкурэнтнасці* (рэгулярнай паўтаральнасці) ключавых слоў, звязаных з тэмай. Рэкурэнтнасць можа выражацца ў літаральным іх паўтарэнні, ва ўжыванні тэматычна блізкіх слоў і сінонімаў, а таксама ў праназміналізацыі (займеннікавых заменах), напр.:

*Самая старажытная філасофская канцэпцыя мовы, якая дайшла да нас, пабудавана на міфолага-рэлігійных уяўленнях пра мову як* ***дар Бога*** *(багоў). Яна існуе ў некалькіх разнавіднасцях: ведычнай (ад назвы «Веды» – старажытнага філасофскага помніка Індыі), канфуцыянскай (Канфуцый – старажытны кітайскі рэлігійны філосаф, мудрэц), біблейскай («Біблія» – збор «свяшчэнных кніг» іудзейска-хрысціянскай рэлігіі). Паводле міфолага-рэлігійнай тэорыі, у аснове свету ляжыць духоўны пачатак. Дух уздзейнічае на матэрыю, якая знаходзіцца ў хаатычным стане, уладкоўвае яе формы. Вянец тварэння духу – чалавек. Для абазначэння духоўнага пачатку ўжываліся тэрміны «Бог», «Дао», ці «Логас» (грэч. logos – слова), таму гэтую канцэпцыю называюць лагасічнай, ці логаснай тэорыяй паходжання мовы. Так, згодна з хрысціянскай філасофіяй, «Слова» існавала да з'яўлення чалавека і непасрэдна кіравала інертнай матэрыяй. Яно (сродак і энергія) стварала свет з першаснага хаосу.*

(Л. Сямешка. Беларуская мова)

У дадзеным тэкставым фрагменце тэмай ЗФА з'яўляецца «Міфолага-рэлігійная тэорыя паходжання мовы». Монатэматычнасць забяспечваецца, па-першае, кантэкстуальнымі сінонімамі: *канцэпцыя – уяўленні – тэорыя – філасофія*; па-другое, паўторам ключавых слоў: *мова, міфолага-рэлігійная тэорыя, духоўны пачатак, Бог, дух, хрысціянства, чалавек*; па-трэцяе, праназміналізацыяй: *канцэпцыя – яна, Слова – яно.*

Між тым у ЗФА могуць адсутнічаць ключавыя словы, на аснове якіх выяўляецца тэма, але ў такім выпадку існуе абагуль-

нальнае паняцце, што зводзіць усе выказванні да адной тэмы, накшталт:

*Эх, і пагодка стаіць на Палессі! У сіняй смузе песцяцца далі. Залатая чырвань лістоў нерухліва звісае на купчастых галінах высокіх вязаў. Цёмныя ночы тояць нейкі ўрачысты спакой, і неба ніжэй нахіляецца да зямлі, каб паслухаць адвечную скаргу. А квяцістыя зоры, нібы дыяменты, усыпаюць усё неба, дрыжаць, пераліваюцца колерамі вясёлкі, аб нечым бязмежна вялікім гамоняць тваёй душы, клічуць шырэй разняць крылле і ляцець у сусвет, каб пабачыць яго веліч і пачуць сваю нязначнасць, рассунуць цесныя граніцы гэтага жыцця і пазнаць яшчэ не зведаную радасць.*

(Я. Колас)

Адзінства тэмы ў тэксце можа падкрэслівацца спецыяльнымі сінтаксічнымі канструкцыямі, самы яркі прыклад таму – **назоўны тэмы:** *Фотакартка... Ідылія лета: рука ў руцэ мы стаім ля язміну. Як далёка цяпер усё гэта, у тумане сівым успамінаў* (Н. Маеўская). Аднак у якасці падобных канструкцый выкарыстоўваюцца і завершаныя выказванні, якія маюць стабільнае прызначэнне – граматыкалізаваць тэму. Такія канструкцыі звычайна распачынаюць звышфразавае адзінства і, як правіла, заўсёды з’яўляюцца *аўтасемантычнымі выказваннямі* (адносна незалежнымі, самастойнымі ў параўнанні з *сінсемантычнымі*, якія залежаць ад папярэдніх). Да іх адносяцца:

● **намінатыўныя сказы:**

Імглістая парная раніца.

На сівым, старым частаколе пры студні – росны круг павуціння. За плотам – цёпла-барвовыя, буйныя кветкі канюшыннай атавы. Над імі – у мокрым лісці – цяжкія, спелыя, *малінавыя* слівы...

Прыгадваецца Лермантаў. Што, хіба не бяссмерце?

(Я. Брыль);

● **безасабовыя сказы:**

...*Хораша на вуліцы пасля дажджу! Зазелянелі вербы, кветнікі, на лісцях дрэў <...> і вяргінь, на траве блішчэла раса, і ў кожнай празрыстай кроплі адлюстроўвалася яскравае жнівеньскае сонца. Мільёны сонцаў зіхацелі на зямлі.*

(І. Шамякін);

● **быццёвыя сказы** (двухсастаўныя сказы са звязкай *ёсць*, што маюць абагульняльнае значэнне):

*Дзеці ёсць дзеці. На вуліцы мы праводзілі большую частку сутак. Надыходзіла лета, і мы з палёгкай скідвалі з ног сандалікі. Шыкам лічылася зрабіць гэта раней за ўсіх. Шыкам было і купанне ў маі ў ледзяной вадзе, калі коркам вылятаеш на бераг.*

(С. Шаўцоў. Рана);

● **двухсастаўныя неразвітыя сказы:**

Былі памылкі. Выпадалі на маю долю мае́ і не мае́.

А ці ж акрэсліў, як далей ісці? Акрэсліў. *Цвёрда і назаўсёды*: на світанні ці на змярканні, золкаю ці ведранаю ноччу, хмурным ці сонечным днём – *заўсёды і ўсюды* жыццё маё будзе не дзеля кавалка хлеба; *найгалоўнейшае, ад чаго не адступлюся*, хоць апынуся ці ў акопах, ці ў шпіталі, хоць буду халодны ці галодны, – маё *роднае слова, родная натура вялікага краю, родная Беларусь. Вы* – мая *радасць* і *ўцеха*, вы – мая *скруха* і *боль*, вы – маё *шчасце, жыццё*.

(Ф. Янкоўскі);

● **пытальныя сказы:**

*Што такое час? Гэта нішто: яго нельга ўбачыць, пачуць, памацаць, панюхаць, папрабаваць на язык; ім нельга заткнуць дзірку ў страсе або ў бюджэце; яго нельга запрэгчы ў плуг, запрасіць на шклянку гарбаты. Час – нешта бясконца бясчулае і бестароннняе; якія б ні адбываліся акты найвышэйшай гуманнасці ці нечуванага здзеку над асобаю чалавека, ён застаецца спакойным і безудзельным. Час – нешта нечувана шпарка-імклівае. Шпаркасць яго прабегу нельга змерыць самымі дакладнымі прыладамі. У той жа час – нешта нязменнае і нерухомае* <...>

(К. Крапіва);

● **клічныя сказы:**

*Неспазнаныя шляхі твае, каханне!*

*Што аб'ядноўвае людзей і што разлучае іх, што прымушае трымцець сэрца і што пакідае яго абыякавым, што кідае чалавека ў абдымкі і што выштурхоўвае з іх – як выштурхоўвае корак маладое, неспакойнае віно? Хто адкажа нам на гэта?*

(Я. Сіпакоў)

Такім чынам, ЗФА – гэта адносна самастойная адзінка звязнага маўлення, сэнсава, структурна і інтанацыйна завершаная,

якая адлюстроўвае адзіную пазамоўную сітуацыю ці асобныя яе аспекты. Асноўнымі крытэрыямі вылучэння ЗФА ёсць сэнсавы (ці тэматычны) і фармальны (ці лексіка-граматычны).

## Сродкі міжфразавай сувязі ў мікратэксце

У звязным маўленні (вусным ці пісьмовым) выказванні суадносяцца адно з адным, і гэтыя адносіны (сінтаксічная сувязь) прэзентуюцца ў іх граматычнай форме. «Адзін з найбольш агульных, пашыраных спосабаў сувязі самастойных сказаў <...> заключаецца ў паўтарэнні, разгортванні часткі структуры якога-небудзь члена папярэдняга сказа ў наступным» [*Солганик*, 1991, *42*]. Сувязь гэтая, як зазначае Р. Я. Салганік, ажыццяўляецца ці «праз суб'ект», ці «праз прэдыкат», г. зн. праз пасярэдніцтва паўтору элементаў суб'екта ці прэдыката папярэдняга выказвання.

Сэнсавая сувязь паміж выказваннямі не існуе сама па сабе: яна грунтуецца на лексіка-граматычных сродках, што матэрыяльна забяспечваюць яе ў звязным тэксце. Некаторыя даследчыкі размяжоўваюць дзве групы такіх сродкаў: а) агульныя як для спалучэння частак складанага сказа, так і для спалучэння самастойных выказванняў (*злучнікі, часціцы, пабочна-мадальныя словы; аднолькавыя часава-трывальныя формы дзеясловаў; займеннікавыя і сінанімічныя замены* і інш.); б) уласна міжфразавыя, што выкарыстоўваюцца толькі для спалучэння самастойных выказванняў (*словы і словазлучэнні, якія не раскрываюць сваёй семантыкі ў межах сказа; лексічны паўтор; простыя неразвітыя двухсастаўныя і аднасастаўныя сказы; асобныя пытальныя і клічныя канструкцыі, намінатыўныя сказы*) [*Лосева*, 1980, *15*].

Класіфікацыя сродкаў міжфразавай сувязі ў ЗФА можа быць дадзена і паводле лексіка-граматычнага крытэрыю: лексічныя, лексіка-граматычныя і ўласна сінтаксічныя.

***Лексічныя сродкі міжфразавай сувязі*** – гэта словы адной лексіка-семантычнай ці тэматычнай групы, сінонімы, антонімы, словы, паміж якімі наладжваецца асацыяцыйная сувязь.

*Зноў <u>раніца</u>.*

*На тэрмометры <u>мінус трыццаць</u>. І <u>сонечна</u>. Бадзёры, паэтычны <u>дзень</u>.*

(Я. Брыль)

(У дадзеным выпадку сродкам сувязі служаць словы адной лексіка-семантычнай групы.)

*Цяжкасці дазваляюць ісці хутчэй. Кісцяпёрая рыба, выйшаўшы на сушу, «пайшла» хутчэй і «дайшла» да чалавека.*

(А. Разанаў)

(Тут сродак сувязі – лексіка-семантычная група слоў як вынік дэрывацыі.)

*У маладосці жыў дробязямі, а час цягнуўся марудна...*
*Цяпер жыву падрабязна, а час пралятае імгненна...*

(Л. Галубовіч)

(Прапанаваны тэкст звязаны з дапамогай кантэкстуальных антонімаў: *у маладосці – цяпер; цягнуўся – пралятае; марудна – імгненна;* лексічных паўтораў *час, жыў*, а таксама паўторам адной семы ў розных словах: *дробязямі – падрабязна.*)

Звязнасць тэксту ажыццяўляецца і з дапамогай ***паўторнай намінацыі*** – разнастайнага абазначэння аднаго і таго ж прадмета (асобы), што ўключае не толькі літаральныя паўторы, але і метафары, назвы па адносінах да роду заняткаў, прафесіі, паводле ўзросту, ацэначнай характарыстыкі і да т. п.

Параўнайце два тэксты.

I. *Ёсць такое паняцце – «імя». Пра значнага, вядомага чалавека так і гавораць: «О гэта імя!»*

*Адам Мальдзіс – імя і не толькі ў кантэксце айчыннай літаратуры. Гаворачы пра гэтую асобу, увесь час даводзіцца паўтараць: «стварыў», «заснаваў», «ініцыяваў», «узначальваў». Так, у свой час Адам Мальдзіс стварыў у Інстытуце літаратуры сектар узаемасувязей літаратур, ініцыяваў і ўзначаліў утварэнне біябібліяграфічнага слоўніка беларускіх пісьменнікаў, дзякуючы яго ж намаганням быў заснаваны Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, дырэктарам якога Адам Восіпавіч быў працяглы час, ім жа заснаваны часопіс «Кантакты і дыялогі»...*

*Цяжка пералічыць усе навуковыя, творчыя дасягненні Адама Восіпавіча, які карыстаецца вялікім аўтарытэтам у навукоўцаў усяго свету.* <...>

*Адам Восіпавіч Мальдзіс – сапраўды значны чалавек, асоба. Яго ведаюць і як цікавага субяседніка з энцыклапедычнай эру-*

*дыцыяй і беларускім досціпам, і палымянага абаронцу беларушчыны, энтузіяста сваёй справы, прынцыповага і сумленнага чалавека*.

(ЛіМ)

II. *Вітольд Бялыніцкі-Біруля – майстра лірычнага «пейзажу настрою», які ўзнік і атрымаў развіццё ў 80–90-я гг. XIX ст. У «пейзажы настрою» аўтары імкнуліся вельмі тонка, эмацыйна перадаць пачуцці і перажыванні чалавека, выказаць сваю любоў да роднай прыроды, зрабіць краявіды адухоўленымі.*

*Беларускі мастак здолеў адшукаць хараство і паэзію ў вельмі простых пейзажах. Непаўторнасць, своеасаблівасць яго творчай манеры выявілася перш за ўсё ў каларыстычным выражэнні: палітра жывапісца абмежаваная шэра-блакітным, зеленавата-шэрым, бэзавым адценнямі; найтанчэйшыя адценні фарбаў, мяккі каларыт надалі творам камернасць, паэтычнасць.*

(Роднае слова)

Калі ў першым ЗФА найбольш ярка прысутнічае эмацыянальная характарыстыка асобы, што і перадаецца адпаведнымі лексічнымі сродкамі (*Адам Мальдзіс, Адам Восіпавіч, Адам Восіпавіч Мальдзіс* → *імя – значны чалавек – асоба – цікавы субяседнік з энцыклапедычнай эрудыцыяй і беларускім досціпам – палымяны абаронца беларушчыны – энтузіяст сваёй справы – прынцыповы і сумленны чалавек*), то ў другім – паўторная намінацыя паводле прафесійнай дзейнасці асобы (*Вітольд Бялыніцкі-Біруля* → *майстра лірычнага «пейзажу настрою» – аўтар – беларускі мастак – жывапісец*).

***Лексіка-граматычныя сродкі сувязі*** – гэта перадусім рознага кшталту анафарычныя элементы: асабовыя, указальныя займеннікі, а таксама словы, што вяртаюць да зместу папярэдніх выказванняў (прыслоўі *тут, там, туды, адтуль* і інш., словы і словазлучэнні з часавым і прасторавым значэннем і пад.), мадальныя словы, злучнікі, часціцы. Гэтыя сродкі выкарыстоўваюцца нароўні (адначасова ці па чарзе) з чыста лексічнымі, напр.:

*На гэтым тыдні беларусам уручаны сертыфікат аб прыналежнасці нашага Мірскага замку да Спісу сусветнай спадчыны. Фігураванне гэтага помніка беларускай архітэктуры ў згада-*

*ным рэестры – без перабольшвання факт нацыянальнага гонару. Таму не дзіўна, што мы так часта хвалімся гэтым і кажам, як гэта пачэсна.*

*Між тым цікава ведаць, што наогул такое Спіс сусветнай спадчыны, якія яшчэ аб'екты занесеныя ў яго разам з нашым Мірскім замкам. Спіс гэты быў створаны ў 1972 годзе згодна з Канвенцыяй па абароне сусветнай культуры і прыроднай спадчыны і з тае пары на працягу ўжо 30 гадоў увесь час папаўняецца. На сёння ў ім каля сямі соцень пазіцыяў. Гэта помнікі культуры і прыроды з болей як сотні краінаў – ад статуі Свабоды да Галапагоскіх выспаў, ад Калізея да Вялікай кітайскай сцяны. Трэба сказаць, кампанія ў Мірскага замку як мае быць!* <...>

(Наша свабода)

У гэтым тэкставым фрагменце выразна прасочваюцца анафарычныя замены (чыстыя ці ў сукупнасці з паўторнай намінацыяй): *Спіс – у ім, нашага Мірскага замку – гэтага помніка; факт нацыянальнага гонару – хвалімся гэтым; Спіс сусветнай спадчыны – Спіс гэты; каля сямі соцень пазіцыяў – гэта помнікі культуры і прыроды*, а таксама кантэкстуальныя сінонімы: *Мірскі замак – помнік беларускай архітэктуры – аб'ект – пазіцыя – помнік культуры і прыроды; Спіс сусветнай спадчыны – рэестр.*

*У старажытных славян многія ўласныя імёны ўтвараліся ад назваў жывёл, раслін, шырока ўжываліся імёны-характарыстыкі: Заяц, Воўк, Дуб, Граб, Сокал, Косы, Рабы, Кульгавы. У пазнейшы час ім на змену прыйшлі новыя імёны, у якіх таксама адчувалася семантыка слоў-характарыстык: Яраполк, Багалеп, Барыслава, Гарыслаў, Уладзіслаў. Страцілі актыўнасць такія імёны ва ўсходніх славян пасля прыняцця хрысціянства, аднак гэты працэс быў павольным, паступовым. Людзі высокіх саслоўяў, у асноўным князі, баяры, адразу пасля прыняцця хрысціянства мелі звычайна два імені. Пасля нараджэння дзіцяці давалася тыповае, найчасцей складанае імя, якое характэрным і досыць ужывальным было яшчэ з часоў язычніцтва (Яраполк, Ізяслаў, Усяслаў, Брачыслаў, Святаполк, Любамір, Мсціслаў і інш.), а пазней, калі дзіця хрысцілі, яно атрымлівала яшчэ адно імя, запазычанае з царкоўнага календара-святцаў.*

(В. Шур. З гісторыі ўласных імёнаў)

Выказванні гэтага звышфразавага адзінства звязаны перадусім словамі і спалучэннямі, што вяртаюць да зместу папярэдніх выказванняў, напр., словазлучэнні і прыслоўі з часавым значэннем: зыходнае *ў старажытных славян* → *у пазнейшы час – пасля прыняцця хрысціянства – з часоў язычніцтва – пасля*, таксама анафарычнымі заменамі: *імёны-характарыстыкі* → *ім; Яраполк, Багалеп, Барыслава, Гарыслаў, Уладзіслаў – такія імёны*, паўторам лексем *імёны, імя* і г. д.

*Пасля нічога не будзе. Усё ёсць сёння. Запамінай кожную дробязь, каб было чым жыць пасля...*

(Л. Галубовіч)

Мініяцюру Л. Галубовіча складаюць усяго тры выказванні, звязаныя між сабой найперш проціпастаўленнем часавых формаў дзеяслова *быць*: *не будзе – ёсць – было*, а таксама прыслоўяў *пасля – сёння,* антонімамі: *нічога – усё* і паўторам прыслоўя *пасля*, якое ўтварае кола, пачынаючы і заканчваючы тэкст.

***Уласна сінтаксічныя сродкі сувязі*** – гэта найперш парадак слоў, непаўната сказаў і эліпсіс, а таксама сінтаксічны паралелізм.

*Азёры прыносяць не толькі матэрыяльную, але і духоўную карысць. Азёры не толькі кормяць навакольны люд, але і натхняюць паэтаў. Свіцязь натхняла Міцкевіча. Возера Нешчарда – аднаго з першых беларускіх пісьменнікаў новага часу, аўтара «Рабункаў мужыкоў» і чатырохтомнага зборніка апавяданняў «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Яна Баршчэўскага.*

(У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі)

У прапанаваным звышфразавым адзінстве відавочны сінтаксічны паралелізм – 1-ы і 2-і сказы, прамы парадак слоў – дзейнік, затым выказнік, а таксама структурная непаўната – 2-і і 3-і сказы (апушчаны дзеяслоў *натхняла*).

Зразумела, што ў канкрэтным тэксце сродкі міжфразавай сувязі выкарыстоўваюцца па-рознаму: можа быць сукупнасць усіх, а можа дамінаваць толькі адзін з іх, што абумоўліваецца тыпам тэксту і інтэнцыямі аўтара, напр.:

*Усе мы нараджаемся простымі і светлымі, як сонечныя промні. Але складанае зямное жыццё змушае нас прымаць яго пакру-*

*частыя формы. I мы – круцімся, віхляем, прагінаемся, укладваючыся ў свае лёсавыя нішы...*

*I толькі на смяротным ложы зноў вяртаемся да першароднай прастаты. Робімся яснымі і зразумелымі, як месячнае святло...*

(Л. Галубовіч. Зацемкі з левай кішэні)

Прыведзены тэкст складаецца з двух абзацаў, што ўтвараюць адно ЗФА, якое ўмоўна можна назваць «Зямное жыццё і чалавек». Тут у наяўнасці сукупнасць сродкаў сувязі: злучнікі *але, і*; паўтор лексем *мы – нас – мы* і пэўных сем: *простымі – прастаты, светлымі – святло*; структурная непаўната выказванняў другога абзаца – апушчаны дзейнік *мы*; кантэкстуальныя сінонімы *зямное жыццё – лёсавыя нішы; простыя і светлыя – ясныя і зразумелыя*; кантэкстуальныя антонімы *зямное жыццё – смяротнае ложа, сонечныя промні – месячнае святло.*

## Віды сувязі ў тэксце

Міжфразавая сувязь у ЗФА – гэта сувязь паміж выказваннямі, што ўтвараюць яго сэнсавае і структурнае адзінства. Міжфразавая сувязь у тэксце аб’ядноўвае іншыя яго кампаненты між сабой: ЗФА, абзацы, фрагменты і г. д., таму адрозніваюць міжфразавую *сувязь кантактную* (спалучае суседнія выказванні, гл. мікратэкст I) і *дыстантную* (спалучае аддаленыя выказванні, мікратэкст II).

I. *На гэты раз бабёр прыпазніўся і паказаўся на вадзе, калі сонца пазалаціла ўжо вяршаліны дубоў над Шчараю. З затокі, не ныраючы і не азіраючыся, быццам пРашываючы густым і тоўстым швом рачную роўнядзь, бабёр пашыбаваў пад другі бераг. А там, на прыбярэжнай пясчанай нешырокай касе, ляжала зялёная, з лісцем, галіна. Бабёр выбраўся, як на ватных ножках, на пясок і адразу пачаў есці. Чамкаў ён гучна і стараючыся. Відаць, падганялі бабра інстынкт і памяць: пачнецца людскі рух – да самага цямна трэба знікнуць, схавацца, сцерагчыся, каб і на вочы людскія не трапіць. Бабёр падсілкоўваўся.*

(Ф. Янкоўскі. Галас і бабёр)

1-ы і 2-і сказы звязаны кантактнай сувяззю праз паўтор лексемы *бабёр*, а таксама праз кантэкстуальныя сінонімы *на вадзе* –

*з затокі*; 2-і і 3-і сказы – праз прыслоўную замену: *бераг – там*; 3-і і 4-ы – праз паўтор адной семы – *пясчанай касе – на пясок*; 4-ы і 5-ы – праз кантэкстуальныя сінонімы: *есці – чамкаць* і займеннікавую замену: *бабёр – ён*; 5-ы і 6-ы – праз замену займенніка назоўнікам: *ён – бабра*; 6-ы і 7-ы – праз паўтор лексемы *бабёр*.

II. *Сцішваецца. І ўсё возера падзялілася на палосы: адна люстраная, а побач ветравая, быццам шырокая сцяжынка, па якой бягуць... не ногі, а самі добрыя душы.*

*І зусім сцішылася. Усё возера стала люстрам. То – хоць плотачка торкала, сяды-тады «ўскідвалася» следам за паплаўком... і трапятала на дне лодкі. А цяпер – хоць бы нюхнула... Можна і не глядзець на паплаўкі.*

(Ф. Янкоўскі. Над Астрашыцкім возерам)

У дадзеным выпадку выказванні першага і другога абзацаў спалучаюцца між сабой дыстантнай сувяззю праз паўтор лексем: *сцішваецца – сцішылася* і *ўсё возера*.

Дыстантнай сувяззю звязваюцца, як правіла, інфармацыйна самыя значныя кавалкі тэксту, а таму найбольш выразна яна і праяўляецца якраз паміж абзацамі, фарміруючы «стрыжань» усяго тэксту і забяспечваючы яго цэласнасць.

Паводле характару сродкаў і механізмаў (спосабаў) іх дзеяння адрозніваюць некалькі тыпаў сувязі: ланцужковую (паслядоўную), паралельную, далучальную, змешаную.

***Ланцужковая сувязь*** праяўляецца тады, калі выказванні чапляюцца адно за адно на ўзор звёнаў ланцужка (спрошчана графічна гэта можа выглядаць так: ○○○). Рэалізуецца такая сувязь або праз адзін сродак, або праз некалькі адначасова:

- праз анафарычныя ці ўказальныя займеннікі, напр.:

*Сёння ў нас цюльпаны ўпрыгожваюць амаль кожны агародчык. А між іншым, першыя звесткі пра іх сустракаюцца ў Персіі. Чароўную кветку ў выглядзе ліхтара ці кубка называлі «дзюльбаш» – «турэцкая чалма», ад якога пазней пайшло слова «цюрман». Ён быў апеты многімі персідскімі паэтамі.* <...>

*Ёсць звесткі, што ў Еўропе гэтая прыгожая кветка з'явілася ў пачатку 50-х гадоў XIV стагоддзя. Цюльпан прывёз у Вену пасланнік аўстрыйскага імператара Фердынанда, які ўбачыў у садзе турэцкага султана ў Канстанцінопалі незнаёмыя кветкі.*

*Закупіўшы партыю цыбулін, ён вярнуўся ў Вену. Так пачалося трыумфальнае шэсце цюльпанаў у Еўропе.*

(Звязда)

● праз паўтор лексемы, якая мяняе функцыі члена сказа, тыпу:

*Усе значныя адкрыцці ўзніклі на мяжы «не можа быць», на мяжы нонсенсу. Нонсенс – неабходны фактар жыцця, неабходны фактар творчасці. Смерць – нонсенс, але жыццё раіцца з ёю.*

(А. Разанаў)

(Варта нагадаць, што акрамя сродку міжфразавай сувязі, лексічны паўтор можа быць адначасова і стылістычным прыёмам з мэтай актуалізацыі ўвагі чытача / слухача на значэнні гэтай лексемы, а разам – зместу ўсяго звязнага маўлення.);

● праз кантэкстуальныя сінонімы, напр.:

*Чалавека заўсёды хвалявау яго лёс. Яшчэ і сёння многія людзі звяртаюцца да варажбітак і да цыганак, каб даведацца пра сваю будучыню. Але і тыя, хто не верыць у варажбу, не могуць не задумвацца пра сваё жыццё, пра таямнічы ланцуг вялікіх і малых падзей, якія вызначаюць важнейшыя яго этапы.*

(Т. Шамякіна. Лёсу тонкае ласо...)

(У гэтым фрагменце сувязь ажыццяўляецца і праз іншы ланцужок: *чалавек – людзі – тыя, хто не верыць у варажбу*);

● праз лексічную непаўнату, напр.:

*Быў поўдзень. Ззяла сонца. Па небе – між дубовых, з зялёнага каракуля шапак плавалі нерухомыя аблачыны. І белыя, і шэрыя. З тых шэрых і пырснуў дождж. Нечакана. Пад сонцам. Сляпы. Пырснуў і хуценька суняўся. А потым зноў разахвоціўся. І сонца ззяла, і залаты дождж імжыў.*

(В. Карамазаў)

Відавочна, што, акрамя адзначаных сродкаў ланцужковай сувязі, ёсць і іншыя, якія «дзейнічаюць» адначасова з асноўнымі. Гэта словы адной лексіка-тэматычнай ці семантычнай групы, кантэкстуальныя антонімы, паўторная намінацыя і інш.

Так, для прыведзенага вышэй тэкставага фрагмента, апроч асноўнага сродку ланцужковай сувязі – структурнай непаўнаты, трэба назваць семантычнае кола слоў ‘прырода’: *сонца, неба, аб-*

*лачыны, дождж*; *<дождж> пырснуў, суняўся, разахвоціўся, імжыў*; лексіка-граматычны сродак – злучнік *а* на пачатку сказа і прыслоўе *потым*, што ўказвае на паслядоўнасць разгортвання падзеі. Прысутнічае тут і дыстантная сувязь праз паўтор слоў: *сонца – пад сонцам – сонца, ззяла сонца – сонца ззяла, дождж*; таксама ёсць паралельная – тры першыя сказы і далучальная сувязь – пяты сказ (гл. пра іх ніжэй).

***Паралельная сувязь*** адзначаецца тады, калі будова сказаў тоесная (графічна гэта выглядае так: ═). Такая сувязь грунтуецца на паралелізме структуры канструкцый, дзе могуць ужывацца:

● паўтор адной і той жа лексемы (часта з яе пачынаюцца выказванні, т. зв. сінтаксічная анафара), напр.:

*Родная мова – гэта мільёны жывых клетачак мозгу, унаследаваных чалавекам ад папярэдзіўшых яго пакаленняў, мільён перажыванняў красы, дабра і зла, згукаў і форм, несчыслёнае багацце душы, каторае адкрываецца толькі пад дотыкам тых самых згукаў, каторай наградзілі іх калісь у душах далёкіх пакаленняў.*

*Родная мова – гэта музыка душы, каторай Навышні Стварыцель адарыў чалавека, гэта натуральны фундамент, на каторым чалавек павінен будаваць дом сваёй сілы духоўнай, свайго розуму, пачуцці дабра і зла, справядлівасці і крыўды, красы і брыдзі.*

(В. Ластоўскі);

● словы адной лексіка-тэматычнай групы, што характарызуюць адзін і той жа аб'ект з розных бакоў (таму тут няма зачаплення выказвання адно за адно, а ёсць аднатыповасць у іх пабудове):

*На горад апускаецца вераснёвы вечар. Прыгожа ўспыхнулі схаваныя ў яшчэ зялёнай навісі дрэў ліхтары. Дзённы тлум паступова спадае. З лёгкім гулам праносяцца перапоўненыя тралейбусы, ледзь чутна шасцяць па асфальце таксі. Горад пачынае вячэрнюю казку.*

(І. Навуменка. Бульба);

● паўтор канструкцыі (сінтаксічны паралелізм):

*Срэбра зрэбнае: яно блізкае простаму людскому жыццю, шэраму на выгляд, шурпатаму навобмацак.*

*Золата аздобнае:* *заўсёды і ўсюды* *яно пачувае* *сябе волатам, якi ўсё можа і якому ўсё дазволена, і тыя прарэхi і дзіркі, што нічым ужо нельга залатаць, латва залатваюцца золатам.*

(А. Разанаў)

***Далучальная сувязь*** назіраецца тады, калі змест наступнага выказвання дапаўняе, дадае інфармацыю да асноўнага (графічна гэта можа выглядаць так □□□), што адбываецца праз пасярэдніцтва злучнікаў *і, ды, ды і, і таму, і тады, і як* і да т. п.), напр.:

*Востраў і праўда быў казачны, прыгожы.*

*І самае галоўнае – неабжыты. Куды ні зірнеш, куды ні пойдзеш – нідзе ніводнай душы. Толькі дрэвы і травы, толькі мятлушкі і птушкі. Ды яшчэ мора, якое ласкава, па-кацінаму падкочвалася да ног адразу, як толькі закаханыя выходзілі на бераг.*

(Я. Сіпакоў. Двое для дваіх);

або праз прыём парцэляцыі:

*Разам са словам – ім, словам, вырваным з цемры невядомасці! – нарадзіўся чалавек. Нарадзіўся, каб з году ў год, з веку ў век дабірацца, дакопвацца да сваёй сутнасці, неспазнанай, неразгаданай ні адразу, ні потым. Каб дакопвацца да схаванай ад яго ісціны. З году ў год. З веку ў век. Прыстасоўваючыся да кароткага чалавечага жыцця.*

(Т. Бондар. Спакуса)

***Змешаная сувязь*** адзначаецца тады, калі пры спалучэнні выказванняў выразна акрэсліваюцца прыметы ланцужковай і паралельнай сувязі, ланцужковай і далучальнай або ўсіх трох адначасова, напр.:

*Адна рэч – чалавекам нарадзіцца. І зусім іншая – чалавекам памерці... Нарадзіцца – якім Бог даў. Памерці – якім Бог прыме...*

(Л. Галубовіч. Зацемкі з левай кішэні)

У прапанаванай мініяцюры 1-ы і 2-і сказы звязаныя далучальнай сувяззю (праз злучнік *і*), ланцужковай (праз структурную непаўнату – апушчана слова *рэч*) і паралельнай (праз паўтор канст-

рукцыі); 3-і і 4-ы сказы аб'яднаныя паралельнай сувяззю (праз сінтаксічны паралелізм і паўтор лексем *якім Бог*), а таксама ланцужковай (праз антанімічнае супастаўленне: *нарадзіцца – памерці*). Ланцужковай дыстантнай сувяззю звязаны 1-ы і 3-і сказы (праз паўтор лексемы *нарадзіцца*), а таксама 2-і і 4-ы (праз паўтор лексемы *памерці*).

Дзеля нагляднасці і падсумавання тэарэтычнага матэрыялу прапануем абагульняльную табліцу (табл. 17).

*Табліца 17*

**ТЫПЫ МІЖФРАЗАВАЙ СУВЯЗІ І СРОДКІ ЯЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ**

| Тып сувязі | Асноўныя сродкі сувязі | Механізм сувязі |
|---|---|---|
| • ланцужковая | – анафарычныя і ўказальныя займеннікі<br>– паўтор лексемы ў розных сінтаксічных функцыях<br>– кантэкстуальныя сінонімы<br>– лексічная непаўната | зачапленне |
| • паралельная | – сінтаксічная анафара<br>– адно тэматычнае кола слоў<br>– сінтаксічны паралелізм | паралелізм |
| • далучальная | – злучнікі *і, ды, ды і, і таму, і тады* і інш.<br>– прыём парцэляцыі | далучэнне |

## ЛІТАРАТУРА

*Акишина*, *1979*: Акишина А. А. Структура целого текста. М.: Типография Ун-та дружбы народов, 1979. Вып. 1. 88 с.; Вып. 2. 80 с.

*Бурак*, *1994*: Бурак Л. І. Складанае сінтаксічнае цэлае // Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн.: БелСЭ, 1994. С. 498–499.

*Долгов*, *Папейко*, *2003*: Долгов Ю. С., Папейко А. А. Абзац как единица лингвистики текста // Текст в лингвистической теории и в методике преподавания филологических дисциплин: Материалы II Междунар. науч. конф. (26–27 марта 2003 г., Мозырь): В 2 ч. Мозырь: УО «МГПУ», 2003. Ч. 1. С. 24–25.

*Дымарская-Бабалян*, *1984*: Дымарская-Бабалян И. Н. Сложное синтаксическое целое как единица сверхфразового уровня. Ереван: Изд-во Ереванского ун-та, 1984. 53 с.

*Дымарская-Бабалян, 1988*: Дымарская-Бабалян И. Н. О связности текста: Семантический и грамматический аспекты. Ереван: Изд-во ЕГУ, 1988. 157 с.

*Левковская, 1980*: Левковская Н. А. В чем различие между сверхфразовым единством и абзацем? // Филологические науки. 1980. № 1. С. 75–78.

*Лосева, 1980*: Лосева Л. М. Как строится текст: Пособие для учителей / Под ред. Г. Я. Солганика. М.: Просвещ., 1980. 94 с.

*Нечаева, 1974*: Нечаева О. А. Функционально-смысловые типы речи (описание, повествование, рассуждение). Улан-Удэ: Бурятское книж. изд-во, 1974. 261 с.

*Реферовская, 1983*: Реферовская Е. А. Лингвистические исследования структуры текста. Л.: Наука, 1983. 215 с.

*Солганик, 1991*: Солганик Г. Я. Синтаксическая стилистика: Сложное синтаксическое целое. М.: Высш. шк., 1991. 182 с.

*Тураева, 1986*: Тураева З. Я. Лингвистика текста: (Текст: структура и семантика). М.: Просвещ., 1986. 127 с.

*Фридман, 1993*: Фридман Л. Г. Границы абзацев и их маркеры // Лингвистика текста: Межвуз. сб. науч. тр. Пятигорск: ПГПИИЯ, 1993. С. 5–15.

# ДАДАТКІ

## МІКРАТЭКСТЫ ДЛЯ МОЎНАГА АНАЛІЗУ З ПРАКТЫЧНЫМІ ЗАДАННЯМІ

### Схема аналізу мікратэксту

1. **Структура тэксту:** колькасць ЗФА, іх межы.

2. Суаднесенасць ЗФА і абзаца.

3. **Мікратэмы** звышфразавых адзінстваў.

4. **Тып рэматычнай дамінанты:**
- *прадметная* (апісанне месца);
- *якасная* (характарыстыка асобы, прадмета);
- *статальная* (апісанне стану);
- *акцыянальная* (апісанне дзеяння);
- *статальна-дынамічная* (апісанне змянення стану);
- *імпрэсіўная* (суб'ектыўна-ацэначнае апісанне ўражання);
- *сінкрэтычная* (адначасовае праяўленне некалькіх дамінант).

5. **Сродкі міжфразавай сувязі:**
- *лексічныя* (лексічныя паўторы, словы адной лексіка-тэматычнай групы, словы з адной семай, сінонімы, антонімы і пад.);
- *лексіка-граматычныя* (анафарычныя і катафарычныя займеннікавыя словы, дамінаванне пэўнай часціны мовы, злучнікі, пабочна-мадальныя словы, парадыгма дзеясловаў у тэксце і пад.);
- *уласна сінтаксічныя* (парадак слоў, непаўната сказаў і эліпсіс, сінтаксічны паралелізм, сінтаксічная анафара і пад.).

6. **Асноўная сувязь:**
- *ланцужковая* (механізм *зачапленне*);
- *паралельная* (механізм *паўтор*);
- *далучальная* (механізм *далучэнне*);
- *змешаная*.

7. **Функцыянальна-сэнсавы тып тэксту:**
- *апавяданне* (статычны аспект);
- *апісанне* (дынамічны аспект);
- *разважанне* (аналітычны аспект).

*Ох, як звініць Белавежа спевамі! Вучоныя абмеркавалі і вырашылі, што белавежскія салаўі самыя галасістыя і багатыя на спевы ў цэлым свеце. Самыя-самыя! А тут жа яшчэ больш за дзвесце відаў птушак. Уяўляеце, што такое веснавы белавежскі канцэрт?!*

(*У. Караткевіч*)

Прапанаваны мікратэкст аб'ядноўвае пяць выказванняў, якія ўтвараюць адно ЗФА, што супадае ў сваіх межах з абзацам.

Тэма гэтага звышфразавага адзінства – «Белавежскія спевы» граматыкалізавана першым двухсастаўным клічным сказам *Ох, як звініць Белавежа спевамі!*

Рэматычная дамінанта – імпрэсіўная, паколькі выказваецца аўтарскае, у нашым выпадку Уладзіміра Караткевіча, стаўленне да спеваў белавежскіх салаўёў і іншых птушак пушчы. Пра суб'ектыўнасць і эмацыянальнасць выказанай інфармацыі сведчаць моўныя сродкі: ужыванне клічных сказаў: *Ох, як звініць Белавежа спевамі!* і *Самыя-самыя!*, а таксама рытарычнага пытання, што завяршае міні-тэкст: *Уяўляеце, што такое веснавы белавежскі канцэрт?!*; выкарыстанне эмацыянальна-ацэначных часціц і выклічніка ў структуры выказвання: *тут* <u>*жа*</u> <u>*яшчэ*</u>, *ох* і непасрэдны зварот да чытача: *уяўляеце*; наяўнасць размоўных канструкцый, што сведчаць пра экспрэсіўнасць выказвання: *Самыя-самыя!* і *А тут жа яшчэ больш за...* , *Уяўляеце, што такое...*

Сродкамі міжфразавай сувязі ў ЗФА з'яўляюцца перадусім лексічныя і сінтаксічныя. Лексічныя сродкі – гэта паўтор лексем са зменай сінтаксічнай функцыі: *спевамі – на спевы*, паўтор лексемы з эмацыянальным узмацненнем: *самыя – самыя-самыя*; паўтор слоў з адной семай *Белавежа – белавежскія салаўі – белавежскі канцэрт*; словы адной тэматычнай групы: *спевы – галасістыя – канцэрт*; *салаўі – птушкі* (родавідавыя адносіны); кантэкстуальныя сінонімы: *спевы – канцэрт*. Сінтаксічныя сродкі прадстаўлены будовай саміх выказванняў: клічныя сказы, няпоўныя сказы. Лексіка-граматычныя сродкі – гэта выкарыстанне анафарычнага прыслоўя *тут*, што вяртае нас да першага сказа, і злучніка *а* на пачатку выказвання, а таксама часава-трывальная фор-

ма дзеясловаў (наяўных: *звініць, уяўляеце* і адсутных: *ёсць*) – цяперашні час, незакончанае трыванне.

Сувязь паміж выказваннямі – ланцужковая.

*Прыказкавая паэзія... Яна прыходзіць да нас разам з дзедавай казкай і ласкавым павучаннем маткі. Яна раскрывае таямніцы жыцця, яго мудрасць і хараство ў дні маленства, калі мы няўмела перагортваем буквар і слухаем сваю першую настаўніцу. Прыказка вучыць думаць і разважаць, даказваць і паказваць, стрымліваца ў хваляваннях. Радавацца першай веснавой зеляніне, любіць і шанаваць росныя сцяжынкі дзяцінства, бацькаўшчыну. У прыказцы жыве і дыхае, скардзіцца і смяецца, упікае і пратэстуе жывая душа і натура працаўніка.*

*Ёсць творы вялікай паэтычнай сілы і маштабнага грамадска-філасофскага гучання. Ёсць «Фауст» Гётэ і «Вайна і мір» Талстога. Ёсць «Новая зямля» Коласа і несмяротныя паэмы Купалы. У адным радзе з лепшымі мастацкімі здабыткамі чалавецтва стаіць і прыказкавая паэзія.*

*Праявы жыцця, яго колеры і пахі не пералічыш, не змесціш у рамкі статыстычных выкладаў і сілагізмаў. Але амаль кожны, нават дробязны будзённа-празаічны, факт можна падвесці пад народную прыказку, высвеціць ёю, асэнсаваць праз яе пераканальны мастацкі вобраз. І гэта прыемна здзіўляе.*

(*М. А. Янкоўскі.* Паэтыка беларускіх прыказак)

Прапанаваны тэкставы фрагмент уключае тры абзацы, аб'яднаныя тэмай «Прыказкавая паэзія» ў адно ЗФА. Тэма атрымала сваё граматычнае ўвасабленне праз канструкцыю назоўнага ўяўлення, з якога пачынаецца мікратэкст.

Сродкі міжфразавай сувязі: анафарычная замена *прыказкавая паэзія – яна*; паўторы, сярод якіх лексічны: *прыказкавая паэзія*; сінтаксічная анафара: *яна... – яна...; ёсць... – ёсць...* ; паўтор са зменай сінтаксічнай функцыі: *прыказка – у прыказцы – пад народную прыказку*; тэматычнае кола слоў: *прыказкавая паэзія, прыказка, творы, паэмы, мастацкія здабыткі, мастацкі вобраз*; *праявы жыцця, кожны факт.* Лексіка-граматычны сродак – парадыгма дзеясловаў: *прыходзіць, раскрывае, вучыць, стаіць* і да т. п. Да ўласна сінтаксічных сродкаў адносім парцэляцыю (1-ы абзац) і далучэнне (апошні сказ).

Сувязь паміж выказваннямі змешаная, але дамінуе ланцужковая дыстантная, што рэалізуецца праз паўтор і анафарычную

замену. Паралельная сувязь прэзентуецца праз сінтаксічную анафару, далучальная праз парцэляцыю і далучэнне.

***Заданне 1****. Вызначце структуру тэкставага фрагмента: колькасць ЗФА, іх мікратэмы, суаднесенасць з абзацам. Укажыце выпадкі граматыкалізацыі тэмы.*

**1.** Чалавек – гэта вір. Глыбокі і цёмны, дна якога не ўбачыць. Не ўбачыць і наогул таго, што дзеецца там, чым жыве таемная глыб гэтага віру.

Мы бачым паверхню яго, пералівы дзівосных хваль – то буйных, віхурна ўзнятых, то дробных і кволых, як пераборы празрыстага ветрыку па струнах ціхае арфы.

Мы бачым толькі паверхню, а ўглыб зазірнуць, пранікнуць туды, дзе таемным бяздоннем звінулася цемра... О, каб пранікнуць туды! Каб разгарнуць гэты вір і ўбачыць усё, усё чыста, да самага дна...

Або сетку закінуць, каб выняць на свет хаця частку таго, што жыве ў таемным бяздонні...

Мо б бліснулі светлым нябачаным ясныя перлы?

А мо там – глей адзін, ціна, пясок?

(*М. Зарэцкі*. Радасць)

**2.** Ах, гэта мележаўская ўсмешка!

Прыязная, іранічная, загадкавая, сарамлівая, кплівая, цёплая, хітраватая, задумлівая, шматфарбная і шматзначная, але заўсёды чалавечная, неабразлівая.

Такой усмешкі ні ў кога не было – адразу і так многа таноў, паўтаноў, адценняў, як у той вясёлцы, што летнім днём перакідваецца праз ціхую задуменную Прыпяць.

Усмешка – водбліск душы. Пустая душа – пустая ўсмешка. У Мележа ўсмешка была таленавітая, шчырая. Яна сагравала прыязнасцю і тады, калі азмрачалася самотай, а бывала і так, што абодва пачуцці адразу афарбоўвалі яе – твар іскрыўся шчаснасцю, а ў вачах таілася туга.

(*А. Асіпенка*)

**3.** ... Стары бабёр выправіўся ў дарогу цёмначы. Толькі недзе далёка на ўсходзе крыху абазначылася светласць на небе, але была яшчэ ноч, кароткая, летняя. Над вадою слаўся туманок,

рэдкі, празрысты, які знікае адразу, як толькі прагляне сонца. Стары бабёр ціха, не плюскануў, выйшаў з-пад вады недалёка ад свае хаткі, доўга прыслухоўваўся, паволі падгрэбваючы да невялікага астраўка. Вылез на яго, сядзеў, прыслухоўваўся і прыглядаўся.

Стары бабёр яшчэ раз азірнуўся на хатку, сышоў з астраўка і паплыў, нячутна, толькі лёгка разыходзілася па вадзе хваля.

Плыў да самага берага, дзе пачыналася тупкае і куды яны, бабры, не любілі выходзіць.

Стары бабёр доўга стаяў на месцы, прыслухоўваўся, потым усё ж, быццам пераступіў мяжу, вылез на бераг, прысеў.

(*А. Жук*. Паляванне на апошняга жураўля)

**4.** Вёска, вясковая праца, вясковая прырода вельмі моцна ўздзейнічаюць на паэтычныя струны, якія схаваны ў кожнай чалавечай душы.

Ідзе снег... Ужо ў адным гэтым сказе – паэзія, бо снег не мае ног і не можа ісці. Снег, сняжынкі могуць падаць, кружыцца, завівацца, але не ісці. А дзесяцігадовы Паша Моніч, лежачы ў начной вясковай хаце, прыслухоўваючыся да таямнічых гукаў зімовай ночы, шчыра верыў, што ў снега ёсць ногі. Ну, не ногі, дык мяккія белыя лапкі. Бо хто ж так асцярожна тупае па саламянай страсе хаты, пад чыімі крокамі парыпвае зледзянелая сцяжынка?

А вясновыя навальніцы... Хіба можа не ўразіць гэты звонкі гром, гэта ўрачыстая і пагрозлівая музыка нябёсаў? Маланкі прапальваюць неба, ад іх робіцца празрыста-светлай самая цёмная ноч. Жыхае маланка, жоўта-залатое святло расцячэцца па небе, па зямлі, па халоднай шыбе. А ты сядзіш, уткнуўшыся носам у гэту шыбу, і так трывожна-соладка на душы, і нейкім няясным прадчуваннем так ные сэрца, што хочацца заплакаць. Хочацца разбіць шыбу, вылезці праз акно на вуліцу, стаць пад мокрай маладой ліпай, якая ад карэння да самай вярхушкі абліта даждджом, абліта зыркім святлом маланкі. <...>

А восеньскія лясы?.. Як назваць гэты цуд, гэту незвычайную сілу бяссільных мёртвых фарбаў? Лісце дрэў памерла, адшумела, зялёны колер ператварыўся ў жоўты, чырвоны, буры, каштанавы, агніста-карычневы, аранжавы... Не злічыць адценняў. І ўсё гэта золата, уся гэта прыгажосць шуміць пад ветрам, трапеча, уздыхае, хвалюецца...

(*Л. Дайнека*. Футбол на замініраваным полі)

***Заданне 2.*** *Кваліфікуйце змест тэкставага фрагмента паводле характару рэматычнай дамінанты* (прадметная, якасная, статальная, акцыянальная, статальна-дынамічная, імпрэсіўная, сінкрэтычная)*, абгрунтуйце такую аднесенасць.*

**1.** Мова першай матчынай калыханкі і апошняга «бывай», мова старадаўніх архіваў і новых школ на Палессі, мова пажаўцелых статутаў і мова кахання... Мова, якая можа ўсё; можа сказаць словы незвычайнай пяшчоты і можа ўдарыць так, што не ўстанеш. Гнуткі, спявучы, адвечна новы інструмент, без якога нельга ўявіць сабе сваё жыццё, як без хлеба, без якога радасць не ў радасць, каханне не ў каханне, бяседа не ў бяседу, сяброўства не ў сяброўства, нянавісць не ў нянавісць.

Няма цябе – і вось няма суцяшэння ў горы. Няма цябе – і вось няма языка, і нельга сказаць слоў радасці. А калі ўбіць сабе ў галаву цалкам дурную думку, што ў нейкім далёкім будучым цябе не будзе, то... нашто нам тады такая будучыня?

(*У. Караткевіч.* Родная мова)

**2.** Вакол пануе непарушны спакой восеньскай ночы. Пахне скошанай травой і сухім, пажоўклым лісцем. Знізу, ад балота, цягне вільгаццю. Паблісквае цёмная, пасярэбраная месяцам вада. Чорныя сілуэты магутных дрэў вылучаюцца ў таямнічым святле месяца. Ціха дрэмлюць красуні-бярозы, асілкі-дубы. Ні гуку не чуваць на гэтым лясістым узвышшы сярод бясконцай балоцістай нізіны.

(*В. Вольскі.* Родны край)

**3.** Гэта была маладая сялянка, высокая, дужая, смуглявая з твару, з агрубелымі рукамі, цяпер яшчэ чыстымі, бо яна толькі што брала ваду і памылася каля студні. Праз грубую смуглявасць яе шчок прабіваўся моцны румянец. Нізкалобая, з малым, задзёртым носам і тоўстымі губамі, плячыстая і з вялікімі, расплясканымі ступакамі – яна не была красуняй, ды ад яе ішлі здароўе, сіла і свежасць. Вопратка жанчыны складалася з кароткай і стракатай спадніцы, з шэраватай, тоўстай кашулі і паласатага, шырокага фартуха з саматканымі, рознакаляровымі махрамі, якімі Хвядора ў некалькі столак апяразвала свой стан. На шыі ў яе паблісквАў медальёнік, а на галаве была хустка з чырвонымі кветкамі, так завязаная на патыліцы, што над ілбом відаць былі дзве шырокія пасмы валасоў, густых і чорных, але парудзелых і без бляску.

(*Э. Ажэшка.* Тадэвуш)

**4.** Гамузам, з нейкім цыганскім гармідарам, на магільнік наляцела вераб'іная чарада. Не паспеўшы сесці, узнялася ў бярозы, але і там затрымалася ўсяго на міг – скінулася за магільнік у бурыя лужыны, так-сяк падагрэтыя кволым сонцам. Шумнула па лужынах – і паляцела на вёску.

Зноў цішыня апанавала магільнікам, узлескам, дарогай, вёскаю. Яна не была, як іншая цішыня, цяжкой, мёртвай. У ёй адчувалася жыццё – лёгкае, радаснае, поўнае таямніц, новых змен, сэнсу. У Валошкавай душы яна яднала зямлю і неба, яго самога – з усім зямным і нябесным.

(*В. Карамазаў*. Пушча)

**5.** Анэта ўстала, як толькі засвятлела на дварэ. Акуратна заслала пасцель, пастаяла пасярод хаты, агледзелася. Шпалеры на сценах, крыху закурэлыя ад старасці, але акуратныя, нідзе не парваныя і не вымурзаныя. Столь хоць і неафарбаваная, з дошак, пацямнелых ад часу, але вымытая старою, нават і ў прыцемках адсвечвала роўнаю жаўцізною, на якой, як птушкі, цямнелі ўкамянелыя за многа год сукі. Вокны завешаны падсіненымі паркалёвымі фіраначкамі, падлога, пафарбаваная сынам гадоў пяць назад, не вышмаргалася нагамі, туманна паблісквала фарбаю, толькі што дошкі высахлі, разышліся, што аж па пальцу шчыліны між імі. Ля сценкі між вокнамі стаялі два крэслы, таксама не цяперашнія, з гнуткага дрэва, а бліжэй к покуці – круглы стол, засланы абрусам з мохрыкамі. На покуці, пад іконаю, вісеў рэпрадуктарчык, таксама стары, з крыху паржавелым металічным абадком, за якім была напята мацера. Анэта ўмылася, памалілася, гледзячы на ікону, падышла да рэпрадуктара, пакруціла за круцёлку, каб чутней было, але радыё не стала гаварыць мацней, мабыць, не хапала моцы ў тых, хто перадаваў.

(*А. Жук*. Халодная птушка)

**6.** Надыходзіла раніца. <...>

Зямля, неба, мяняліся хутка, мянялі настрой і фарбы, быццам позна прачнуліся і цяпер спяшаліся навесці ранішні глянец. Сонца нетаропка паказала з-пад белага туману чырвоную макаўку, узнялося вышэй, зноў быццам прысела на ваду, памылася ў ёй, сцюдзёнай уранні, пачысцела, блішчастым ад расы берагам падкацілася пад стог сена, запаліла яго, пераскочыла на дрэва і яго запаліла таксама.

(*В. Карамазаў*. Пагоннік)

***Заданне 3.*** *Ахарактарызуйце лексічныя, лексіка-граматычныя і ўласна сінтаксічная сродкі міжфразавай сувязі ў ЗФА.*

**1.** Снег... Снег... Снег...

Разам пасыпаўся, як з вялізнага каша. Сняжынкі беленькія, кволенькія замітусіліся мітульгой у гулліва-вар'яцкіх скоках...

– Гэй, беражыся! Дарогу нам! Аблепім, спаўём, беллю пабелім... Усё!

І пабялілі... Зямлю атулілі коўдрай мяккай, пухкай. А на будынкі, на дрэвы – бровы белыя панавесілі, дзядамі сівымі зрабілі...

Людзі хаджалыя твары хаваюць: не хочуць гарэзлівых пацалункаў спрытных сняжынак. Але ці ж ад іх схаваешся – гэткія пройды... Залезуць пад шапку, за каўнер, разліюцца вільгаццю, мыюць чалавека гвалтам... Во якія дасціпныя!..

(*М. Зарэцкі.* Бель)

**2.** Усе рэкі Беларусі дужа прыгожыя. Дняпро з высокім правым берагам і неаглядньмі далячынямі зарэчных паплавоў, паплямаваных дубамі і сінімі люстэркамі старыц. Прыпяць з яе празрыстай цёмнай вадою, астравамі, пратокамі і шапкамі буслянак на прырэчных дрэвах. Дзвіна, сціснутая крутымі ўрвішчамі, зарослымі мачтавым лесам. Ласкавы Нёман, у воды якога глядзяцца старажытныя вежы і густыя лістоўныя пушчы. Нават невялічкая Шчара са сваімі шлюзамі ў цені неабхватных, серабрыстых таполяў. З раптоўным патокам вады, што вырываецца са шлюза і выносіць на сабе плыты з людзьмі, якія рухава і спрытна працуюць шастамі і бусакамі.

(*У. Караткевіч.* Зямля пад белымі крыламі)

**3.** Чалавек не можа ні сама-жыць, ні сама-памерці, ні сама-перайначыцца. Усё гэта магчыма толькі ў кірунку да н е ч а г а , і чым далей яно, гэтае н е ш т а , тым больш істотны і змястоўны чалавечы спосаб жыцця, тым больш чалавек – чалавек.

Каб ісці далей, чалавек мусіць ісці не сабой, а з сябе – удакладняцца, удасканальвацца, станавіцца наступнейшым; гэта – шлях ва ўсё большую свабоду, усё большую адказнасць і ўсё большую неабсяжнасць, на якім нават нягоды і перашкоды па-свойму спрыяюць чалавеку.

І не самі па сабе, а менавіта ў «кірунку да н е ч а г а » магчымы веды, магчыма разуменне, магчыма жыццё і смерць.

А ўсе тыя набыткі, што не сугучны асноўнаму чалавечаму шляху, урэшце аказваюцца цяжарам і зманам і адпадаюць, як з дрэў сухая кара. Нярэдка – разам з самім чалавекам.

(*А. Разанаў*. Зномы)

**4.** Ёсць, выпадаюць такія дні ўлетку, калі пагляду не ўгнацца за небам. То пабягуць аблачыны, каб распачаць сваю спрадвечную гульню і, з дапамогай ветру, яўна дужэйшага, больш вёрткага там, угары, доўга перакідваць, перахоўваць, у самім руху, здаецца, перахоўваць штоміг сонца. То раптам як расплавяцца яны ў сонечным ззянні і адплывуць за далягляд, а ў бела-блакітных промнях яркага святла знікае не толькі гарачае сонца – сама вышыня. То роўнымі, шырокімі хвалямі накоціцца, папаўзе нізка над галовамі смуга і патыхне з-за смугі вільгаццю і зусім летнім халадком. То пачне раскручвацца і, набліжаючыся, расці цёмная, ледзь прыкметная напачатку пляміна недзе на захадзе, і вось ужо наплыве, гасіць святло хмара, каб тут жа праліцца на зямлю кароткім раптоўным дожджыкам і растаць, зноў аддаючы прастор сонцу і ветру.

(*Т. Бондар*. Спакуса)

**5.** Дзелавыя зносіны з’яўляюцца відам маўленчай дзейнасці, якая характарызуецца інфармацыйнай насычанасцю і ўжываннем спецыяльнай лексікі. Першапачатковы і агульнапрыняты сэнс слова «інфармацыя» (лац. *informatio* ‘уяўленне, паняцце, контур’) непасрэдна звязаны са звесткамі, якія адны людзі перадаюць іншым з дапамогай знакаў (вербальных або невербальных, вусных або пісьмовых і інш.), а таксама з самім працэсам перадачы і атрымання пэўных паведамленняў ці ўвогуле з працэсамі камунікацыі ў грамадстве. У наш час, які можна назваць эпохай інфармацыі, у сістэму камунікацыі ўключаны і разнастайныя тэхнічныя сродкі (аўтаадказчыкі, тэлефоны, факсы, камп’ютэры, радыё, АСУ, тэлебачанне, пэйджэры, інтэрнэт, друкавальныя прыборы і іх прадукцыя і г. д.). У сённяшнім жыцці людзей лавінападобная колькасць разнастайных паведамленняў, якія штодня абрынваюцца на чалавека, пільна вымагае ўсебаковага даследавання праблем інфармацыі, бо ад яе дакладнай апрацоўкі, усебаковага ўліку, правільнага, адэкватнага ўспрымання залежыць лёс не толькі пэўнай фірмы, установы і г. д., але і лёс дзяржавы, усяго чалавецтва.

(*Б. А. Плотнікаў*. Кіраўніку аб мове)

***Заданне 4.*** *Кваліфікуйце асноўныя* (праз займеннікі і займеннікавыя словы, праз лексічны паўтор са зменай сінтаксічнай функцыі словаформы, праз кантэкстуальныя сінонімы, праз нулявы знак) *і дадатковыя сродкі ланцужковай сувязі ў мікратэкстах.*

**1.** Ціха, лагодна патрусілася з неба. Потым завіхрылася маладым, жвавым карагодам. У дзівосных, адчайных скоках замітусілася, быццам хацела падражніцца, пашкуматаць трохі счарнеўшую старую зямлю.

І ўрэшце ўзляглася – цяжка, пухка, пластом ваты; захінула, сціснула ў мякка-ўпартых абнімках.

Бель... Першая бель – прывітанне доўгачаканай гасцюхі-зімы...

Весела, радасна спатыкаць першы снег!

(*М. Зарэцкі.* Бель)

**2.** Дзе ўпершыню з'явіўся грэбень, сказаць немагчыма. Але вядома, што ўжо ў Старажытным Егіпце і на Усходзе за валасамі сачылі вельмі старанна. Расчэсвалі іх «падручнымі сродкамі»: калючкамі дзядоўніку, палачкамі і рыбінымі хрыбтамі. З часам прычоскі рабіліся ўсё больш складанымі: валасы падзялялі на тонкія пасмы, кожную заплятаталі ў касу, мудрагеліста ўкладвалі на галаве, і сам сабой узнік момант, калі з'явіўся першы грэбень.

Мінуў час, і грэбень зрабіўся ўпрыгажэннем прычоскі, яго ўколваюць у парыкі і шыньёны. Асаблівым поспехам карыстаўся грэбень у Іспаніі. Дамы двара і жанчыны з народа насілі яркія шалі і карункавыя хусцінкі, у якія ўколвалі высокія чарапахавыя грэбні, і велічыня іх залежала выключна ад фізічнай вынослівасці іспанкі.

Але паступова грэбень пераўтвараецца ў звычайную расчоску. Праўда, у наш час дэкаратыўны грабянец зноў папулярны. Ён зрабіўся той мілай, вясёлай дэталлю, якая ўпрыгожвае ўбранне нашых сучасніц.

(*З. Сіцько.* Грэбень)

**3.** Для беларускай народнай кулінарыі XIX – пачатку XX ст. характэрна шырокае выкарыстанне розных грыбоў. Іх ужывалі адвараныя, смажаныя, тушаныя, марынаваныя, салёныя. Але

найбольш падабалі сушаныя грыбы – баравікі, падбярозавікі, рыжыкі, валуі і г. д. Іх выкарыстоўвалі для заправы першых страў (супоў, капусты, юшкі), дадавалі да тушанай бульбы. З рыжыкаў рабілі рыжыкавае масла для падлівак.

Сушылі грыбы звычайна ў цёплай печы на блясе, засланай саломай. Бляху ставілі ў печ, як правіла, пасля выпечкі хлеба. Сушылі некалькі разоў, потым нанізвалі копамі на ніткі і звязвалі ў вянкі. Перад выкарыстаннем вымочвалі па дванаццаць і болей гадзін у вадзе.

Сушылі таксама грыбы на палатне ў цяні. Перад ужываннем іх замочвалі ў малацэ, і яны амаль не адрозніваліся ад свежых. Грыбы варылі і тушылі, дадаўшы масла ці смятаны.

(*Т. Навагродскі*. Класіфікацыя страў беларускай народнай кулінарыі)

***Заданне 5***. *Кваліфікуйце спосаб ажыццяўлення паралельнай сувязі ў тэкставых фрагментах* (праз лексіка-сінтаксічны паўтор, праз словы адной тэматычнай групы, праз паралелізм сінтаксічных канструкцый) *і назавіце яе асноўныя прыметы.*

**1.** Да чаго прыгожая гэта вясновая раніца! У паветры яшчэ сыра. На лістах вішняку вісяць буйныя кроплі начных туманаў. На платах і на стрэхах ляжыць яшчэ вільгаць. За сялом густа і тучна зеляніццца поле. Загоны перасякаюцца то тонкімі, то шырокімі завілінамі дарог. На пагорку стаіць і яшчэ дрэмле вятрак, але, здаецца, ён ужо сіліцца ўзмахнуць паднятымі крыламі. Узыходзіць сонца. Яно паволі і баязліва паказваецца з-за гарызонта – першыя промні яго кладуцца шырока – густым і нібы цягучым золатам. Над стрэхамі хат вывіваюцца лёгкія празрыстыя дымкі. За імі на небе такое ж самае лёгкае ружаватае воблачка. Здаецца, што яму нудна быць невялічкаму, аднаму на гэтай сіняватай бясконцасці неба, але запрапасціўся недзе свавольнік-вецер, і яно не можа скрануцца... Сонца падымаецца над лесам. Яно слізгае па вяршалінах дрэў і западае ў прагаліны. Лес пачынае дыміцца густымі пахамі. Бесклапотна цвыркаюць птушкі.

(*Я. Скрыган*)

**2.** Я ішоў па прыхожай і здзіўляўся. Якая прыгажосць і як гэта ўсё запушчана чалавечым нядбальствам. Вось цяжкая мэбля

ля сцен – яна рыпіць нават у адказ на крокі. Вось агромністая драўляная статуя святога Юрыя, адно з цудоўных, трохі наіўных стварэнняў беларускага народнага генія – ля ног яе тонкі белы пыл, быццам хтосьці насыпаў мукі: гэту непаўторную рэч сапсаваў шашаль. Вось на столі люстра, таксама выдатная па прыгажосці – вісюлькі яе абабіты больш чым на палову.

Магло б здацца, што тут ніхто не жыве, каб не палалі ў вялізным каміне дровы і не залівалі няпэўным, мігатлівым святлом усю гэтую карціну.

(*У. Караткевіч*. Дзікае паляванне караля Стаха)

***Заданне 6***. *Вызначце далучальную сувязь у мікратэкстах і назавіце яе асноўныя сродкі* (злучнікі, злучальныя словы, часціцы, мадальныя словы, інтанацыя, парадак размяшчэння кампанентаў выказвання, парцэляцыя).

**1.** Трэба многа, вельмі многа ездзіць, сябры. Вы маладыя, і калі будзеце часта «жыць на колах», шмат хадзіць і падарожнічаць, вы паглядзіце многае ў свеце. Але перш за ўсё вам трэба ведаць свой, самы прыгожы для нас край. Ездзіце. З экскурсіямі, да сваякоў або да сяброў. Вы ўбачыце ўсе канцы нашай мілай, ласкавай, няяркай краіны, якая, аднак, зачаруе вас сваёй няўлоўнай прыгажосцю. Убачыце гарады і вёскі, цёмныя волаты замкаў. І азёры з белымі грабянцамі на сіняй вадзе, і старыя каменныя млыны над рэчкамі, што зараслі белай ліліяй, поўню ў азёрнай вадзе і водсвет яе на мокрай зямлі. Будзеце слухаць музыку нашай пявучай мовы і нашы пяшчотныя песні. І ўбачыце зуброў і аленяў. І, галоўнае, пазнаеце свой гасцінны, добры, горды і таленавіты беларускі народ.

(*У. Караткевіч*. Зямля пад белымі крыламі)

**2.** Мроілася разагрэтае сонцам паветра і нібыта цякло да жытнёвага небакраю. А адтуль чорным крылом разгортвалася навальніца. І перад ёй усё заціхала, неяк паспешна, быццам захопленае знянацку, нават паменшалі хвалі на тугаватай роўнядзі калосся. І нідзе ні душы. Толькі светлы палетак і пацямнелая далечыня, як з пясчанага берага глядзіш на цёмнае мора. І перад навальніцаю ўсё на зямлі бытта паменшала, і нават вёска здавалася маленькай, нібы глядзіш на яе з вышыні, з гэтага магутнага чорнага навальнічнага крыла.

У цішыні пачулася, як мякка і глуха, усё роўна бы па жывым целе, ударылі па глыбокім цёплым дарожным пыле першыя кроплі. А потым раптоўна, неспадзявана моцна рвануў вецер – і абрынулася на зямлю ўсё разам: і прыцемень, і суцэльная, як з лубу, сцяна вады, святло сінявcovatых ад лютасці маланак, удары грому, ад якіх хацелася сцяцца ў маленькі-маленькі камячок, бо здавалася, што ты толькі адна засталася на ўсім белым свеце. І жудасна адчуваць, што прапала і ты, і твая прыцемная хаціна ў бясконцай лютасці і нястрыманасці стыхіі. І разам з тым была незразумелая, невытлумачальная, шчымлівая, трывожная радасць гэтай яраснай праяве, усё роўна як і ты частачка гэтае непадуладнай нікому сілы.

(*А. Жук*. Халодная птушка)

***Заданне 7.*** *Вызначце асноўную міжфразавую сувязь* (ланцужковая, паралельная, далучальная, змешаная) *у розных функцыянальна-сэнсавых тыпах мікратэксту* (апавяданне, апісанне, разважанне) *і сродкі яе забеспячэння* (лексічныя, лексіка-граматычныя, уласна сінтаксічныя).

**1.** Гавораць, што на зямлі пакуль яшчэ больш добрых людзей, што дабро ўсё яшчэ перамагае зло...

Аднак людзі чамусьці хлусяць часцей, чым гавораць праўду. Няхай часам і ў імя дабра. Дый сам я, каго знаёмыя лічаць дастаткова шчырым, хлушу часцей, чым гэта *неабходна.*

Найперш мы хлусім сабе пра сябе, пасля – сабе пра іншых і ўрэшце – іншым пра сябе...

Хлусня гэтая як бы дробная, непрыкметная, невызначальная, ні на што не прэтэндуючая, нібы гульня з праўдай у хованкі...

Але па часе, незаўважна для нас саміх, маленькія нашы паўсядзённыя няпраўды ствараюць вакол нас непраўдзівы свет. І паступова гэты свет пачынае здавацца несправядлівым. Зразумела, у дачыненні да нас саміх...

І – нараджаецца зло... Яно жыве, пакуль жывуць людзі. З адным чалавекам яно не памірае. Зло памрэ разам з усімі...

(*Л. Галубовіч*. Зацемкі з левай кішэні)

**2.** Свой шэдэўр Богша стварыў у 1161 годзе.

Крыж шасціканцовы. Ягоная форма сімвалізуе Сусвет, створаны Богам, як вядома, за шэсць дзён. Аснова крыжа – кіпарысавае дрэва, з якога выраблялі асабліва важныя культавыя рэчы.

Рэліквія мае вышыню каля 52 сантыметраў; даўжыня верхняе папярэчкі – 14, ніжняе – 21, таўшчыня – 2,5. Зверху і знізу дрэва закрывала дваццаць адна залатая пластка з каштоўнымі камянямі, арнаментамі і дваццаццю эмалевымі абразкамі, якія нічым не саступаюць сусветна вядомым візантыйскім эмалям.

На верхніх канцах крыжа майстар змясціў паясныя выявы Хрыста, Багародзіцы і Іаана Папярэдніка. У цэнтры ніжняга перакрыжавання – чацвёра евангелістаў: Іаан, Лука, Марк і Мацвей, на канцах – архангелы Гаўрыіл і Міхаіл. Унізе – патроны (нябесныя апекуны) заказчыцы і яе бацькоў: святыя Еўфрасіння Александрыйская, Георгій і Сафія.

(*У. Арлоў*. Таямніцы полацкай гісторыі)

**3.** Чортаў плюшч праз вузкую шчыліну залез на зашклёную кніжную паліцу і абхапіў сваімі бела-зялёнымі прысмочкамі кнігу. Ён прагна ўпіўся ў мяккую вокладку, распіхваючы цесны кніжны шыхт, прабіраўся далей, каб замкнуць кола сваіх драпежных абдымкаў. Спахапіўся я запозна – на факсімільным выданні паэзіі Наталлі Арсенневай «Пад сінім небам» назаўсёды засталіся сляды, здавалася б, такой лагоднай і бяскрыўднай расліны.

Потым я ўжо даведаўся, што навуковая назва плюшча – сцындаптус, што ён з сямейства ліянаў, што чортавым плюшчом яго спрадвеку менавалі ў народзе. А таксама не раілі трымаць у спальнях і паблізу працоўнага месца. А тады, з цяжкасцю адрываючы ад кнігі прысмочкі, гэтак падобныя да васьміногавых, я перажыў нейкі містычны страх, нібы ў самотнай інтэрнацкай келлі прысутнічаў нехта невідочны. Праз некалькі дзён, нягледзячы на тое, што я сумленна працягваў выконваць інструкцыі жонкі (яна адпачывала на Случчыне) наконт паліву ўсяго ейнага батанічнага кутка, чортаў плюшч неяк увесь раптам пабляк, змізарнеў ды пачаў засыхаць. Яго не цікавіла сонечнае святло, яму як бы падсеклі карані, як бы адарвалі ад крыніцы сілкавання.

Разгарнуўшы зборнік Арсенневай, я быў літаральна прыгаломшаны выбухам фарбаў, феерверкам веснавых радасных эмоцыяў:

Неба сіняе, сіняе, сіняе...
Ані межаў у ім, ані дна.
На зямлі ж прыгажуняй-княгіняю
Пазірае мне ў вочы вясна. <...>

І я зразумеў, што вампіры існуюць не толькі ў абрыдлых, як горкая рэдзька, фільмах жахаў і не толькі сярод людзей...

(*М. Скобла.* З гледзішча вечнасці)

**4.** Лета для мяне яшчэ там, у дзяцінстве, назаўсёды прапахла альховай карою, з якой мы рабілі лубкі для ягад, суніцамі, малінаю ды чарніцамі, якімі пахлі нашы рукі, вусны і нават шапкі, у якіх назаўсёды заставаліся пачарнелыя крапінкі ад ягад: калі мы траплялі на ягадную паляну, а браць болей не было куды, добрымі кузаўкамі рабіліся тады гэтыя шапкі, а для грыбоў – сарочкі з завязанымі рукавамі. Лета пахне для мяне печанымі на кастры каласамі, у якіх зерне яшчэ мяккае і салодкае; свежым сенам, якое яшчэ зусім нядаўна было травою і не паспела ў пунях запыліцца.

Лета – гэта ціхая паляна ў лесе, уся прагрэтая паўдзённым сонцам...

Лета – гэта воз казытлівага непаслухмянага сена, збольшага ўвязаны і ўціснуты жэрдзю: ехаць жа недалёка, неяк давязём.

Лета – гэта яшчэ і пах свежай, падварушанай зямлі. Ты ідзеш па баразёнцы за акучнікам, моцна трымаючы яго за ручкі, а твае паабдзіраныя, пасунутыя конскімі капытамі ногі радуюцца халаднаватаму, мяккаму дотыку зямлі. А зямля ў дзяцінстве лечыць усё, залепленыя ёю, хутка загойваюцца і праколы, і парэзы, і апёкі...

(*Я. Сіпакоў*)

***Заданне 8.*** *Зрабіце цэласны аналіз тэкстаў і тэкставых фрагментаў паводле схемы, пададзенай на с. 181–182.*

### 1. Раны

Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – гояцца, і па іх знаку няма. Большыя – гояцца, але па іх астаюцца рубцы.

Гэтак на целе.

Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – гояцца; па іх астаюцца рубцы. Большыя – заўсёды крывавяцца.

Гэтак на сэрцы.

Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя заўсёды крывавяцца. Большыя – залечвае толькі... смерць.

Гэтак на душы.

(*Ядвігін Ш.*)

**2.** Васіль Быкаў – феномен чыста беларускі. Цяжка ўявіць пісьменніка, які б так маштабна думаў пра лёс свайго народа, з такім трагічным напалам пачуцця перажываў бы за тое, што адбываецца на Беларусі, дзе-небудзь у сённяшняй Расіі, на Украіне ці Польшчы. Баюся, што і сама Беларусь не хутка дачакаецца прыходу яшчэ аднаго такога пісьменніка, як Быкаў, бо падобнае здараецца раз на паўстагоддзя. Бліжэйшы па часе Янка Купала, а далей – Кастусь Каліноўскі...

У нас ёсць Быкаў, і значыцца ёсць падставы для гонару сваёй Беларуссю. Быкаў ратуе нас ад сённяшняга прыніжэння і ганьбы, у якой мы сядзім, як у ваўчынай яме, саромеючыся, і небеспадстаўна, называцца ў цывілізаваным свеце, што мы беларусы. Эпоха, калі нам пашанцавала жыць, – гэта эпоха Быкава. Як была раней эпоха Купалы. А яшчэ раней – Скарыны, Ефрасінні Полацкай.

(*М. Тычына*. Пад знакам Быкава)

**3.**

Людзі часта бываюць безразважнымі
І адно пра свой інтарэс дбаюць.
Прабачай ім – што будзе, то будзе.

Калі хочаш людзям дабра,
То цябе абвінавацяць у себялюбстве
І нізкіх намерах.
А ты будзь добры – што будзе, то будзе.

Калі дасягнеш поспеху,
Знойдзеш шмат ілжывых сяброў
І яшчэ больш сапраўдных ворагаў.
Старайся дабіцца поспеху– што будзе, то будзе.

Калі будзеш адкрыты і шчыры,
Людзі пакарыстаюца табой для сябе.
Будзь адкрыты і шчыры – што будзе, то будзе.

А нехта за адну ноч можа
Знішчыць тое, што ты будаваў праз гады.
Будуй сваё – што будзе, то будзе.

Калі знойдзеш спакой і шчасце,
Многія будуць табе зайздросціць.
Будзь шчаслівы – што будзе, то будзе.

Пра дабро, якое чыніш сёння,
Людзі, напэўна, забудуць заўтра.
Рабі дабро – што будзе, то будзе.

Аддавай усё, колькі можаш,
А табе скажуць, што гэтага мала.
Што будзе, то будзе – аддавай колькі можаш.

Бачыш, у астатнім рахунку
Лічыцца толькі тое, што было паміж табой і Богам.
Бо паміж табой ды «імі»
І так ніколі нічога не было.

*Маці Тэрэза*

# ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК

## А


акалічнасць 88, 89
~ дэтэрмінаваная (=сітуант) 92, 93
актант 46, 141, 142
~ аб'ект 143
~ агенс 143
~ адрасат 143
~ інструмент 143
~ каагенс 143
~ партытыў 143
~ сіла 143
~ суб'ект 142
актуалізацыя 130
актуальнае чляненне (=АЧ) 127
~ рэма 127
~ тэма 127
абзац 164
аднасастаўныя сказы 97, 101, 107
~ безасабовыя 11, 104, 167
~ вакатыўныя 111
~ генітыўныя 112
~ дзеяслоўныя 100
~ іменныя 107
~ інфінітыўныя 106
~ назыўныя 110
~ намінатыўныя 108
~ няпэўна-асабовыя 102
~ пэўна-асабовыя 102
азначэнне 85, 90
~ дапасаванае 85
~ недапасаванае 85
~ прэдыкатыўнае 92
апавяданне 159
апісанне 158
апорнае слова 120
аспект сінтаксісу 11, 12
~ лагічны 12
~ логіка-граматычны 12
~ камунікацыйны 12
~ семантычны 12
~ структурны (=фармальны) 12
~ функцыянальны 12


## В


валентнасць 45, 48
~ абавязковая (=аблігаторная) 50
~ актыўная 49
~ лагічная 51
~ неабавязковая (=факультатыўная) 50
~ семантычная (=змястоўная) 51
~ сінтаксічная (=фармальная) 50, 51
~ пасіўная 49
вербацэнтрычная тэорыя (=дзеясловацэнтрычная) 65
выказванне (=фраза) 10, 13, 23, 128
~ аўтасемантычнае 167
~ нейтральнае 128, 129
~ нерасчлянёнае (з нулявой тэмай) 130
~ простае 130
~ расчлянёнае 129
~ са шматступеньчатым АЧ 130
~ сінсемантычнае 167
~ сінтагматычна абумоўленае 130
~ сінтагматычна незалежнае 130
~ экспрэсіўнае 129

выказнік 68, 70
~ просты дзеяслоўны 72
~ просты дзеяслоўны ўскладнены 71
~ просты іменны 70
~ састаўны дзеяслоўны 71, 74
~ састаўны іменны 71, 75
~ складаны 71, 76

## Г

галоўныя члены сказа 68
~ выказнік 68, 70
~ дзейнік 68, 78
~~ колькасны 78, 80

## Д

дадзеная прэдыкатыўная частка 116
~ азначальная (=атрыбутыўная) 123
~ акалічнасная 121
~ выказнікавая 121, 122
~ далучальная 121
~ дапаўняльная 122
~ дзейнікавая 121, 122
дадзены член сказа 84
~ азначэнне 85
~ акалічнасць 88, 89
~ дапаўненне 87, 88
~ дуплексіў 91
~ дэтэрмінант (=дэтэрмінаванае дапаўненне) 92
~ прыдатак 86
~ сінкрэтычны член 85, 90
~ сітуант (=дэтэрмінаваная акалічнасць) 92, 93
далучэнне 135
дапасаванне 35, 78, 80
~ поўнае 36
~ няпоўнае 36
дапаўненне 88
~ дэтэрмінаванае (=дэтэрмінант) 92
~ прамое 88
~ ускоснае 88
двухсастаўны сказ 64
дзейнік 68, 77
дзеяслоў-звязка 75
дыктум 139
дыскурс 16, 148

## З

зваротак 112
звышфразавае адзінства (ЗФА) 163
звязка 71, 75
~ нулявая 75
злучальнае слова (=рэлят) 120
злучнікі 120
~ падпарадкавальныя 120
~ парныя 120, 135
~ простыя 120
~ складаныя 120

## І

іменная частка <састаўнога> выказніка 75
інтанацыйная канструкцыя (=ІК) 131
інтанацыя 131
~ канстатацыі 109
~ незакончанасці 110
інфінітыў 73, 74
~ аб'ектны 75
~ мэты 75
~ суб'ектны 74

## К

каардынацыя (=прэдыкатыўная сувязь) 65, 77, 78, 81
кантамінаванасць 161
канчатак (=флексія) 36
карэлят (=указальнае слова) 120
кіраванне 39
~ беспрыназоўнікавае 39
~ прыназоўнікавае 39
~ моцнае 39
~ слабае 40

## М

мадальнасць 61
~ аб'ектыўная 61
~ верагоднасці 62
~ волевыяўлення 62
~ суб'ектыўная 61

мадэль сказа (=сказ) 13, 57, 58
маўленне 9
мова 9, 13
модус 140

## Н

назоўны тэмы (намінатыўны ўяўлення) 109, 167
намінатыўныя сказы 108
~ апісальныя 108
~ указальныя 108
націск 132
~ лагічны (=сэнсавы) 132
~ эмфатычны 132
няпоўны сказ 98, 114
~ кантэкстуальны 98
~ сітуацыйны 99
~ эліптычны 99
нячленныя сказы (=нечлянімыя, = бессастаўныя) 112

## П

пазіцыя 45, 65
~ выказніка 66, 70
~ дзейніка 68, 69
~ функцыянальна-сінтаксічная 33, 59, 60
парадак прэдыкатыўных частак 120
~ свабодны 120
~ фіксаваны 120
парадак слоў 133
~ адваротны (=інверсія) 12, 134
~ прамы 134
парадыгма 23, 64, 121
~ дзеяслова-выказніка 121
~ сказа 64
парцэлят 135
парцэляцыя 135
паўза 132
паўтор 134, 175, 177
паўторная намінацыя 170
персанальнасць (=асабовасць) 63
прапазіцыя (=дыктумны змест сказа) 139
~ лагічная 139
~ падзейная 139
прымыканне 38
~ іменнае 38
~ уласнае 38
прэдыкат 142
~ акцыянальны 142
~ быццёвы 142
~ рэляцыйны 142
~ статальны 142
~ характарызацыйны 142
прэдыкатыў (=слова катэгорыі стану) 104, 106
прэдыкатыўнасць 60, 109
прэдыкатыўная аснова (=граматычная аснова) 68
прэдыкатыўная частка <складанага> сказа 116
~ галоўная 119
~ даданая 119, 121

## Р

разважанне 160
рэкурэнтнасць (=рэгулярная паўтаральнасць) 166
рэлят (=злучальнае слова) 120
рэма 12, 127
рэматычная дамінанта 154
~ акцыянальная 156
~ імпрэсіўная 157
~ прадметная 155
~ сінкрэтычная 158
~ статальна-дынамічная 157
~ статальная 156
~ якасная 155

## С

семантыка-сінтаксічныя адносіны 27
~ аб’ектныя 28, 123
~ адначасовасці 159
~ азначальныя (=атрыбутыўныя) 27, 123
~ акалічнасныя 29, 124
~~ меры і ступені 125
~~ месца 125

~~ мэты 29, 124
~~ прычыны 29, 124
~~ саступкі 125
~~ спосабу дзеяння 124
~~ уласна акалічнасныя 29
~~ умовы 124
~~ часу 29, 124
~ змешаныя 29
~ камплетыўныя 29
~ колькасныя 29
~ параўнальныя 125
~ паслядоўнасці 160
~ пералічальныя 32
~ размеркавальныя 32
~ прэдыкатыўныя 98
~ спалучальныя 32
~ суб'ектныя 28
~ супастаўляльныя 32
сінкрэтызм 89, 90
сінтаксема 14, 15
~ абумоўленая (=канструкцыйна-абумоўленая) 15
~ звязаная 14, 15
~ свабодная 15
сінтаксіс 9
~ камунікацыйны 12
~ семантычны 12, 138
~ сказа 13
~ словазлучэння (=часцін мовы) 13, 18
~ тэксту 13, 146
~ фармальна-сінтаксічны (=структурны) 11
сінтаксічная анафара 177
сінтаксічная сувязь 31
сінтаксічны паралелізм 177
сірканстант 46
сказ 13, 58
~ аднасастаўны 12, 97
~~ безасабовы 104
~~ вакатыўны 111
~~ генітыўны 112
~~ інфінітыўны 106
~~ намінатыўны 108
~~ назыўны 110
~~ няпэўна-асабовы 102
~~ пэўна-асабовы 102
~ з абагульненым значэннем 103
~ просты 64, 68, 117
~ складаны 116, 117
~~ бяззлучнікавы 118
~~ складаназалежны 118, 119
~~ складаназлучаны 118
~~ камбінаванай будовы (=з рознымі відамі сувязі) 119
склонавы паралелізм 37
складаназалежны сказ 119
~ нерасчлянёнай структуры 123
~ расчлянёнай структуры 124
складаназлучаны сказ 119
словазлучэнне 16, 21, 23
~ дзеяслоўнае 26
~ дэтэрмінацыйнае 20
~ злучальнае (=паратаксічнае) 21
~ іменнае 26
~ непрэдыкатыўнае 21
~ несвабоднае 26
~~ сінтаксічна непадзельнае 26
~~ фразеалагічна непадзельнае 26
~ падпарадкавальнае (=субардынацыйнае, гіпатаксічнае) 20
~ простае 24
~ прыслоўнае 26
~ прэдыкатыўнае 20
~ свабоднае 25
~ складанае 25
~ спалучальнае (=канекцыйнае) 20
словаформа 14
спалучальнасць 45, 48, 52
~ абумоўленая 48
~ адвольная 48
~ дыстантная 48
~ кантактная 48
~ лексічная 49
~ рэферэнтная 48
~ семантычная 49
~ фармальная (=сінтаксічная) 48
спалучэнне слоў 15
сродкі міжфразавай сувязі 169
~ агульныя 169
~ лексіка-граматычныя 171
~ лексічныя 169
~ уласна міжфразавыя 169
~ уласна сінтаксічныя 173

структурная схема 13, 57, 58, 59
~ мінімальная 59
~ пашыраная 59
суб’ект 12, 58, 143
сувязь у словазлучэнні 31
~ апазіцыйная 32
~ аплікацыйная 32
~ асацыяцыйная 32
~ гіпатаксічная (=падпарадкавальная) 31, 32, 33
~~ абавязковая (=аблігаторная) 33
~~ неабавязковая (=факультатыўная) 33
~~ прадказальная 33
~~ непрадказальная 33
~~ дапасаванне 35
~~ кіраванне 39
~~ прымыканне 38
~~ склонавы паралелізм 37
~ дэтэрмінальная 32
~ паратаксічная (=злучальная) 31, 32, 33
~~ адкрытая 33
~~ з’яднанне 32
~~ закрытая 34
~~ пераз’яднанне 32
~~ раз’яднанне 32
сувязь у тэксце 174
~ далучальная 178
~ дыстантная 174
~ змешаная 178
~ кантактная 174
~ ланцужковая (=паслядоўная) 175
~ паралельная 177

## Т

тэкст 16, 146
тэма 12, 127
тэматычная паслядоўнасць 152
~ простая лінейная тэматычная прагрэсія 152
~ тэма-рэматычны ланцужок са скразной тэмай 152
~ тэматычная паслядоўнасць з вытворнымі тэмамі 153
тэмпаральнасць (=часавасць) 60, 62

## Ф

функцыя 9
~ камунікацыйная 9, 22
~ намінацыйная (=назыўная) 9, 19, 20, 21, 22
функцыянальна-сінтаксічная пазіцыя 59
функцыянальна-сэнсавы тып тэксту 158
~ апавяданне 159
~ апісанне 158
~ разважанне 160

## Ч

часціцы 135
член сказа 68, 84
~ галоўны 68
~ дадаены 84
~ марфалагізаваны 89
~ немарфалагізаваны 89

Вучэбнае выданне

**Рамза** Таццяна Расціславаўна

**СІНТАКСІС**
ТЭАРЭТЫЧНЫ КУРС

Вучэбны дапаможнік

Рэдактар *Г. В. Мыцык*
Мастак вокладкі *Л. А. Стрыжак*
Тэхнічны рэдактар *Г. М. Раманчук*
Карэктар *Я. Ф. Харко*
Камп’ютэрная вёрстка *С. М. Ягоравай*

Падпісана да друку 17.10.2003. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Гарнітура SchoolBook. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 11,86.
Ул.-выд. арк. 12,21. Тыраж 100 экз. Зак.

Беларускі дзяржаўны універсітэт.
Ліцэнзія ЛВ № 315 ад 14.07.2003.
220050, Мінск, праспект Францыска Скарыны, 4.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага універсітэта».
Ліцэнзія ЛП № 461 ад 14.08.2001.
220030, Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6.